Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

Ларыса Доўнар

# Кніжная справа ў Мінску

(канец XVIII – пачатак XX стагоддзя)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

УДК 002.2(476-25)"16/19"
ББК 76.1(4Беи)
Д 71

Рэцэнзенты:
*К. Мігань,* доктар габіліт. тэорыі і гісторыі навукі пра кнігу, прафесар Вроцлаўскага ўніверсітэта,
*М. В. Нікалаеў,* доктар філалагічных навук, загадчык аддзела рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі,
*Г. У. Кірэева,* загадчык навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі,
*Т. А. Самайлюк,* вядучы бібліёграф бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

*Рэкамендавана да выдання навукова-тэхнічным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (пратакол № 11 ад 05.12.2013 г.)*

**Доўнар, Л. І.**
Д71 Кніжная справа ў Мінску (канец XVIII – пачатак XX стагоддзя) : манагр. / Ларыса Доўнар ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2015. – 696 с. : іл.

ISBN 978-985-522-138-9.

Манаграфія прысвечана разгляду важнейшых галін кніжнай справы – кнігавыданню, кнігадрукаванню, кніжнаму гандлю, бібліятэчным кнігазборам, якія асвятляюцца як у рэгіянальным, лакальным кантэксце, так і ва ўзаемадзеянні Мінска з іншымі гістарычнымі для Беларусі цэнтрамі.

У выніку даследавання былі ўдакладнены гады дзейнасці мінскіх кнігавыдавецтваў, выяўлены новыя; паказана развіццё кнігагандлёвых сувязяў на працягу XVIII – пачатку XX ст., дадзены характарыстыка і аналіз дзейнасці асноўных мінскіх кнігарняў; разгледжаны праблемныя пытанні гісторыі мінскіх кнігазбораў, колькасныя паказчыкі якіх знайшлі таксама адлюстраванне ў падрыхтаваных табліцах, графіках і дыяграмах.

Праца складаецца з дзвюх частак: навукова-даследчай і навукова-бібліяграфічнай, якія з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі. Першая частка ўключае раздзелы “Кнігавыдавецкая дзейнасць”, “Кніжны рэпертуар”, “Кніжныя сувязі”, цесным чынам звязана з другой часткай – каталогам “Мінскія выданні 1622–1917 гг.”, які налічвае 3133 найменні кніжных друкаў на розных мовах, што выйшлі ў той час у Мінску.

Выданне зацікавіць гісторыкаў кнігі і кніжнай культуры, навукоўцаў бібліятэчна-бібліяграфічнай галіны, краязнаўцаў і іншых даследчыкаў лёсу беларускай духоўнай спадчыны.

**УДК 002.2(476-25)"16/19"**
**ББК 76.1(4Беи)**

**ISBN 978-985-522-138-9**

© Доўнар Л. І., 2015
© УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, 2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Памяці маіх бацькоў
і брата Уладзіміра
прысвячаю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ


**Ад аўтара ..................................................................... 6**

**Кніжная справа Мінска як аб'ект вывучэння ў кантэксце кнігазнаўчых даследаванняў.** ***Уступ*** **................................................ 7**

**Частка I**

**Кнігавыдавецкая дзейнасць**

Перыядызацыя мінскага кнігавыдання ........................ 29
Прыватныя выдавецтвы ........................ 46
Друкарні і літаграфіі ........................ 46
Кнігарні ........................ 59
Выдаўцы ўласных твораў ........................ 62
Выдавецкая дзейнасць грамадскіх арганізацый ........................ 66
Таварыствы друкароў, выдаўцоў ........................ 66
Палітычныя партыі ........................ 67
Навуковыя таварыствы ........................ 68
Культурна-асветныя таварыствы ........................ 69
Дзяржаўныя выдавецтвы ........................ 71
Мінская губернская друкарня ........................ 71
Выдавецтвы дзяржаўных устаноў ........................ 76

**Кніжны рэпертуар**

Галінова-тэматычны склад мінскіх выданняў ........................ 80
Функцыянальнае прызначэнне выданняў ........................ 93
Мова і аўтарства выданняў ........................ 104
Мінскія кніжныя рэдкасці ........................ 113
Нотна-музычныя выданні ........................ 113
Выданні на ідыш «Verlag "Kultur"» ........................ 120

**Кніжныя сувязі**

Кнігавыдавецкія сувязі са сталіцамі ........................ 128
Вільня ........................ 128
Варшава ........................ 134
Пецярбург ........................ 138
Кніжны гандаль у Мінску ........................ 142
Мінскія кнігазборы ........................ 163

**Заключэнне ........................ 189**
**Бібліяграфічны спіс ........................ 195**
**Паказальнік імёнаў ........................ 216**


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Частка II

## Мінскія выданні 1622–1917 гг.
*Каталог*

Уступ ..... 237
Выданні 1622–1794 гг. ..... 239
Выданні 1795–1917 гг. ..... 242
Спіс скарачэнняў ..... 548
Архівы і бібліятэкі ..... 548
Літаратура ..... 549
Паказальнік выдавецтваў ..... 554
Паказальнік імёнаў аўтараў, укладальнікаў, перакладчыкаў, рэдактараў, афарміцеляў ..... 571

*Дадаткі*

1. Табліцы тэматыка-відавой структуры кніжнай прадукцыі, выдадзенай асобнымі выдавецтвамі Мінска ..... 592
2. Табліцы тэматыка-відавой структуры кніжнай прадукцыі ў храналогіі ..... 604
3. Табліца “Мова мінскіх выданняў” ..... 607
4. Табліца “Мінскія кнігавыдавецтвы 1795–1917 гг. па ўладальніцкай прыналежнасці” ..... 609
5. Дыяграмы размеркавання колькасці кніжнай прадукцыі паміж прыватнымі, грамадскімі і дзяржаўнымі выдавецтвамі ..... 616
6. Графік “Дынаміка выдання кніжнай прадукцыі ў 1795–1917 гг.” ..... 620
7. Табліца “Кнігарні” ..... 621
8. Табліцы “Бібліятэкі” ..... 630
9. Ілюстрацыі ..... 654

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Ад аўтара

Манаграфія прысвечана разгляду важнейшых галін кніжнай справы – кнігавыданню, кнігадрукаванню, кніжнаму гандлю, бібліятэчным кнігазборам, якія асвятляюцца як у рэгіянальным, лакальным кантэксце, так і ў ва ўзаемадзеянні Мінска з іншымі гістарычнымі для Беларусі цэнтрамі.

Асновай працы паслужылі матэрыялы дысертацыйнага даследавання аўтара "Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917): кнігазнаўчы аспект" (Мінск, 2005), якія ў значнай ступені былі дапоўнены новымі данымі і распрацоўкамі па гісторыі зараджэння кнігадрукавання ў горадзе, развіцця кніжнага гандлю і фарміравання кнігазбораў; па асобных тэмах, што паглыбляюць і асвятляюць пытанні мінскага нотавыдання і выдавецкую дзейнасць некаторых друкарняў, кнігарняў, арганізацый і таварыстваў.

У выніку даследавання былі ўдакладнены гады дзейнасці мінскіх кнігавыдавецтваў, выяўлены новыя; паказана развіццё кнігагандлёвых сувязяў на працягу XVIII – пачатку XX ст., дадзена характарыстыка і аналіз дзейнасці асноўных мінскіх кнігарняў; разгледжаны праблемныя пытанні гісторыі мінскіх кнігазбораў, колькасныя паказчыкі якіх знайшлі таксама адлюстраванне ў падрыхтаваных табліцах, графіках і дыяграмах.

Манаграфія складаецца з дзвюх частак: навукова-даследчай і навукова-бібліяграфічнай, якія з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі. Першая частка, што ўключае раздзелы "Кнігавыдавецкая дзейнасць", "Кніжны рэпертуар", "Кніжныя сувязі", цесным чынам звязана з другой, базавай, часткай – каталогам "Мінскія выданні 1622 – 1917 гг.", які налічвае 3133 найменні кніжных друкаў на розных мовах, што выйшлі ў той час у Мінску.

Упершыню ў беларускую бібліяграфію ўводзяцца больш за 600 новых найменняў выданняў, з якіх 355 – на рускай мове, 150 – на польскай, 67 – на яўрэйскай (на іўрыце і ідыш), 34 – на лацінскай і польскай мовах, што, у сваю чаргу, можа стаць універсальнай крыніцай навуковых ведаў пры стварэнні нацыянальнага кніжнага рэпертуару. Не прэтэндуючы тым не менш на вычарпальнасць нашых звестак, бібліяграфічных і фактаграфічных, хочацца спадзявацца, што выкананая праца паслужыць на карысць наступным даследаванням гісторыі развіцця кніжнай культуры Беларусі.

Аўтар выказвае шчырую пашану і ўдзячнасць усім, хто меў дачыненне да дадзенай тэмы, падтрымліваючы, кансультуючы па складаных пытаннях, падказваючы і накіроўваючы да тых ці іншых крыніц, – Уладзіміру Мархелю, Яўгеніі Умецкай, Рыгору Рэлесу, Васілю Лявончыкаву, Адаму Мальдзісу, Тамары Самайлюк, Кшыштафу Міганю, Міколу Нікалаеву, Таццяне Рошчынай, Юрыю Лаўрыку, Валерыю Герасімаву, Аляксандру Сцефановічу, Юрыю Вартанаву, Міхаілу Тарэлку, Рыме Чыгіровай, Ліліі Коўкель, Іаане Лісэк, Іагелю Львовічу, Аляксандру Астравуху, супрацоўнікам бібліятэк і архіваў у Беларусі, Літве, Польшчы, Расіі, якія былі ласкавымі і добразычлівымі ў дапамозе і падтрымцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Кніжная справа Мінска як аб'ект вывучэння ў кантэксце кнігазнаўчых даследаванняў. *Уступ*

Актуальнасць даследавання гісторыі кніжнай справы Мінска, як і наогул Беларусі, абумоўлена неабходнасцю стварэння фундаментальнай гісторыі беларускай кнігі, дзе была б адлюстравана як мага паўнейшая карціна з'яўлення мясцовай разнамоўнай кніжнай прадукцыі, а таксама гісторыя бытавання на тэрыторыі Беларусі ў тым ліку і іншамоўнай, немясцовай кнігі. Пэўнай спробай вырашэння гэтай праблемы стала калектыўная двухтомная манаграфія "Гісторыя беларускай кнігі"[1], якая выйшла ў 2009, 2011 гг. Упершыню, дзякуючы намаганням Міколы Нікалаева, у Беларусі з'явілася падобная комплексная праца па гісторыі кніжнай культуры: ад даўніх рукапісных кніг да сучасных, ад іх стварэння да распаўсюджвання і захоўвання, якая адначасова засведчыла і шэраг праблем – тэарэтычных, гістарычных і практычных, што стаяць перад кніжнай культурай Беларусі. На некаторыя даследчыя праблемы беларускага кнігазнаўства, асабліва тэарэтыка-метадалагічнага характару, была звернута ўвага ў вучэбным выданні "Гісторыя беларускай кнгі" (2012)[2], якое, дарэчы, упершыню ахоплівае развіццё беларускай кнігі за такі агромісты адрэзак часу – IX–XXI стст. і, наколькі магчыма (паводле існуючых даследаванняў), паказвае яе шматмоўную і тыпалагічную разнастайнасць.

Адзін са шляхоў, які дае шанц набліжэння да найбольш праўдзівых абрысаў гісторыі кнігі, кніжнай культуры цалкам, – рэгіянальны, лакальны падыход[3]. На нашу думку, без развіцця лакальных кнігазнаўчых даследаванняў – як абагульняльных, так і ў межах прыватных тэм – нельга ўявіць усю паўнату ўкладу, унесенага мясцовымі выдаўцамі, кнігарамі, бібліяфіламі ў развіццё айчыннай культуры і асветы; асэнсаваць ролю кнігі ў сацыяльных пераўтварэннях грамадства. Лакальныя, рэгіянальныя даследаванні кнігі і кніжнай культуры, заснаваныя на мясцовым матэрыяле, узбагачаюць карціну навуковых прац у вызначаных галінах, спрыяюць высвятленню асаблівага, разнастайнага і агульнага ў гісторыка-культурным развіцці Беларусі.

Цалкам пытанні зараджэння і развіцця кніжнай справы ў Мінску не з'ўляліся аб'ектам спецыяльнага навуковага вывучэння, акрамя найбольш раскры-

---

[1] *Нікалаеў М. В.* Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. Мінск : БелЭн, 2009. 423 с. : іл. (Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.] ; т. 1 / М. В. Нікалаеў); Кніжнасць новай Беларусі XIX–XXI стст. / М. В. Нікалаеў [і інш.]. Мінск : БелЭн, 2011. 436 с. : іл. (Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.] ; т. 2 / М. В. Нікалаеў [і інш.]).

[2] *Доўнар Л. І.* Гісторыя беларускай кнігі : вучэб. дапам. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. Мінск : БДУКМ, 2012. 252 с.

[3] *Доўнар Л. І.* Рэгіянальныя даследаванні гісторыі кнігі ў Беларусі: да пытання аб рэгіянальным кнігазнаўстве // Материалы VII Международных книговедческих чтений «Библиотеки и политика открытого доступа к информации и знаниям» (Минск, 10–11 нояб. 2011 г.) / Нац. б-ка Беларуси ; сост. Л. Г. Кирюхина. Минск, 2011. С. 62–71.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тай тэмы, прысвечанай кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску[4]. Адкрытай застаецца таксама праблема ўліку выдавецкай прадукцыі Беларусі ў бібліяграфічных крыніцах, разнамоўны характар якой стаў адной з прычын яе разрозненага бібліяграфавання ў замежных і айчынных каталогах і паказальніках, што таксама адбілася і на агульным стане складання поўнай айчыннай нацыянальнай бібліяграфіі – не вырашанага да сёння пытання.

Колькасць спецыяльных прац, у якіх утрымліваюцца звесткі па гісторыі кнігавыдання ў Мінску ў канцы XVIII – пачатку XX ст., даволі нязначная. З самых ранніх даследаванняў, якія хоць у нейкай ступені маюць адносіны да кнігавыдання ў Мінску, неабходна назваць працу Іаахіма Лялевеля "Bibliograficznych ksiąg dwoje" (1823)[5], у якой указваецца існаванне ў Мінску друкарні І. Стафановіча. Толькі канстатацыяй факту аб выданні ў Мінскай друкарні Дэпартамента часовага літоўскага ўрада (губернскай) паэмы Яна Ходзькі "Litwa oswobodzona" (1812) і друкаванні ў гэтай друкарні на рускай, польскай і лацінскай мовах афіцыйных, нязначнай колькасці іншых выданняў абмяжоўваецца польскі бібліёграф Ежы Бандке ў сваёй фундаментальнай працы па гісторыі друкарняў у Каралеўстве Польскім і Вялікім Княстве Літоўскім (1826)[6].

Што тычыцца першых па часе выхаду расійскіх прац, то іх аўтары толькі пацвярджаюць існаванне ў Мінску друкарняў, але прыведзеныя імі колькасныя даныя не заўсёды адпавядалі рэальнаму стану[7]. Агульным недахопам усіх названых работ з'яўляецца тое, што іх аўтары разглядалі кнігавыдавецкую дзейнасць у Беларусі аднабока: ці як расійскую ў "заходніх губернях", ці як польскую на ўсходніх "крэсах".

Пачатак вывучэння гісторыі кнігавыдання азначанага перыяду ў Беларусі, дзе ўказваліся і мінскія выданні, адносіцца да 1920-х гг.[8] Аўтарам Г. Перліным прыводзяцца лічбы выданняў беларуска-яўрэйскіх друкарняў 1783–1837 гг., у прыватнасці, указваецца колькасць мінскіх выданняў на яўрэйскай мове з 1807 г. да 1837 г. У 1950-я гг. з'явіўся і першы спецыяльны артыкул беларускага даследчыка С. Палееса[9], прысвечаны кнігавыданню ў Мінску ад 1797 г. да сярэдзіны XIX ст. Аднак канспектыўны змест артыкула і недакладнасць некаторых звестак паніжаюць каштоўнасць яго інфармацыі аб дзейнасці прыватных кнігавыдаўцоў І. Стафановіча, З. Прэса, Г. Бланштэйна, Ё. Дворца, братоў Бейліных, Ф. Фалька, Э. Адамовіча.

Пэўныя кароткія звесткі аб кнігадрукаванні ў Мінску ўключаліся і ў раннія агульныя гісторыка-кніжныя даследаванні беларускіх кнігазнаўцаў. Аб за-

---

[4] *Доўнар Л. І.* Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795-1917): кнігазнаўчы аспект : аўтарэф. дыс. … канд. пед. навук / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. Мінск, 2005. 21 с.

[5] *Lelewel J.* Bibliograficznych ksiąg dwoje, w których rozebrane i pomnożone zostały dwa dzieła Jerzego Samuela Bandke "Historja drukarń krakowskich" – tudzież "Historja Biblioteki Uniw. Jagiell. w Krakowie" a przydany Katalog inkunabułów polskich : T. 1–2. Wilno : Druk J. Zawadzkiego, 1823. T. 1. 276 s., 3 tabl.

[6] *Bandkie J. S.* Historya drukarń w Królestwie Polskim i Wielkiem Xięstwie Litewskiem jako i w krajach zagranicznych, w których polskie dzieła wychodziły : T. 1–3. Kraków : Druk. J. Mateckiego, 1826. T. 1. XXXII, 448 s.; T. 2. 351 s.; T. 3. 299 s.

[7] *Семенников В. П.* Дополнительные материалы для истории провинциальных типографий XVIII и начала XIX века и для библиографии книг, в них напечатанных. [Санкт-Петербург, 1913]. 26 с. (Отт. из ж. "Русский библиофил". 1913. Кн. 7).

[8] *Перлін Г.* Да гісторыі яўрэйскага друку на Беларусі // Наш край. Менск, 1927. № 8–9. С. 11–15.

[9] *Палеес С.* З гісторыі друкарскай справы ў Мінску // Беларусь. Мінск, 1957. № 9. С. 26–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раджэнні кнігадрукавання ў Мінску ў XVII ст. разважаў Георгі Галенчанка[10], які пачынаючы з 1960-х гг. даследуе асаблівасці гістарычнага развіцця беларускага кірылаўскага друку XVI – XVIII стст. Сярод кнігазнаўчых прац Яўгеніі Умецкай, прысвечаных гісторыі кнігадрукавання ў Беларусі XIX ст.[11], якія з'явіліся ў 1970–1980-я гг., асаблівую навуковую каштоўнасць мае артыкул да зводнага каталогу "Кніга Беларусі, 1517–1917". У ім аналізуецца змястоўны і відавы склад рускамоўных кніжных выданняў Беларусі, разглядаюцца характэрныя асаблівасці кнігавыдавецкага працэсу ў XIX – пачатку XX ст., а таксама ўтрымліваецца пэўны фактычны матэрыял, у тым ліку і пра кнігавыданне ў Мінску. Пэўным дапаўненнем методыка-бібліяграфічнага характару да гэтага матэрыялу з'яўляецца і артыкул Ніны Ватацы, які таксама быў змешчаны ў дадзеным каталогу да часткі "Выданні на беларускай мове: XIX – пачатак XX ст."[12] Некаторыя з мінскіх выданняў былі ахарактарызаваны Наталляй Бярозкінай – найперш у працы аб ролі друку Беларусі ў распаўсюджанні прыродазнаўчых і тэхнічных ведаў у 1861–1917 гг.[13], а таксама ў вучэбным дапаможніку па гісторыі кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатку XX ст.)[14]. Аднак па-за ўвагай аўтара засталася дзейнасць друкарняў Беларусі па выданні літаратуры на польскай, лацінскай, яўрэйскай і іншых мовах.

У некаторай ступені закраналіся пытанні гісторыі зараджэння мінскага кнігадрукавання ўкраінскімі вучонымі Я. Д. Ісаевічам[15], І. І. Агіенкам[16], В. П. Коласа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[10] *Голенченко Г. Я.*: 1) Библиографический список белорусских старопечатных изданий XVI–XVIII вв. Минск : ГБЛ БССР, 1961. 127 с.; 2) История белорусского книгопечатания XVI – XVIII веков (кирилловского) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Моск. гос. ист.-арх. ин-т. Москва, 1965. 18 с.; 3) Старадрукаваныя кірылічныя кнігі 16–18 стст. // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог / склад. Г. Я. Галенчанка [і інш]. Мінск : БелСЭ, 1986. С. 10–22.

[11] *Умецкая Е. С.*: 1) История книгопечатания в Белоруссии в первой четверти XIX века (1801–1832) : автореф. дис. … канд. ист. наук / АН БССР. Минск, 1977. 27 с.; 2) Казенное книгопечатание в Белоруссии (1797–1832) // Вопросы библиографоведения и библиотековедения / Мин. ин-т культуры. Минск : Изд-во БГУ, 1983. Вып. 4. С. 63; 3) Книгоиздание в Белоруссии в первом тридцатилетии XIX века (1801–1832) // Книговедение : сб. докл. науч. конф., посвящ. началу книгопечатания в Литве и Белоруссии (Вильнюс, 21 ноября 1975 г.). Вильнюс : Вильн. гос. ун-т, 1979. № (7) 14. С. 76–91; 4) Книгопечатание в Гродно в конце XIX в. (1861–1900) // Сборник статей по основным направлениям научно-исследовательской работы. Минск : Мин. ин-т культуры, 1991. Ч. I. С. 93–98; 5) Цензурно-правовое положение книги в Белоруссии (1801–1832 гг.) // Вопросы библиотековедения и библиографоведения : сб. науч. тр. Минск : МГПИ, 1975. С. 45–59; 6) Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог; 7) Кнігавыдавецкая справа ў пачатку XIX ст. // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мінск, 1978. № 1. С. 37–38; 8) Прыватнае кнігадрукаванне ў Беларусі // Тамсама. 1979. № 4. С. 22–24.

[12] *Ватацы Н. Б.* Выданні на беларускай мове: XIX – пачатак XX ст. // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. С. 193–199.

[13] *Березкина Н. Ю.* Роль печати в распространении научных знаний в Белоруссии. 1861–1917. Минск : Наука и техника, 1990. 112 с. : ил.

[14] *Бярозкіна Н. Ю.* Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.). Мінск : Беларус. навука, 1998. 199 с. : іл.; 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2000. 200 с.

[15] *Исаевич Я. Д.* Роль братств в издании и распространении книг на Украине и Белоруссии (конец XVI – XVIII в.) // Книга и графика : сб. посвящен 80-летию чл.-кор. АН СССР А. А. Сидорова. Москва : Наука, 1972. С. 127–136; *Ісаєвич Я.* Українське книговидання: витоки, розвиток, проблеми. Львів : Інститут українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України, 2002. 520 с.

[16] *Огієнко І. І.* Історія українського друкарства. Київ : Либідь, 1994. 448 с.

вай[17], польскімі – А. Кавецкай-Грычовай[18], М. Підлыпчак-Маяровіч[19], Ё. Геткай[20]. Даследаванні гісторыі выдання і распаўсюджання польскай кнігі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., якімі займаліся польскія кнігазнаўцы Я. Кушлейка[21] і Я. Кастэцкі[22], пашыраюць магчымасці метадалагічных падыходаў і ў вывучэнні кніжнай справы Мінска, якая мела шчыльныя кантакты з друкам і кніжным гандлем Польшчы.

Што да прац сучасных расійскіх кнігазнаўцаў, то не толькі кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску, але і наогул Беларусі азначанага перыяду імі не разглядаецца ні ў даследаваннях па ўсеагульнай гісторыі кнігі[23], ні ў даследаваннях па рэгіянальным кнігазнаўстве[24].

Аднак адным з першых сумесных расійска-беларускіх комплексных даследаванняў рэгіянальнай кніжнай культуры стала Міжнародная славяназнаўчая праграма “История книжной культуры Подляшья”, прадстаўленая Юрыем Лабынцавым у 1992 г. на Міжнароднай царкоўна-навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю Праваслаўнай Царквы на Беларусі (сумесны праект Расійскай акадэміі навук і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі). Прапаноўваліся як тэарэтычныя даследаванні, так і стварэнне шматтомнага энцыклапедычнага выдання, “включающего в себя практически полную информацию обо всех сторонах культурного процесса на Подляшье, связанного с рукописной и печатной книжностью на церковнославянском, древнерусском, старобелорусском, староукраинском, белорусском, украинском, русском, польском, латин-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

17 *Колосова В. П.* Иван Вышенский и Павел Домжив-Люткович // Федоровские чтения, 1979. Москва : Наука, 1982. С. 24–34.

18 Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. Wrocław ; Kraków : Ossolineum, 1959. Zesz. 5: Wielkie Księstwo Litewskie / oprac.: A. Kawecka-Gryczowa, oraz K. Korotajowa, W. Krajewski. 272 s. : il.

19 *Pidłypczak-Majerowicz M.* Bazylianie w Koronie i na Litwie: Szkoły i książkie w działalności zakonu. Warszawa ; Wrocław : Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1986. 272 s. (Akta Universitaties ; nr 779).

20 *Getka J.* Polskojęzyczne druki bazyliańskie (XVIII wiek). Warszawa : BEL Studio, 2013. 344 s.

21 *Kuszlejko J.*: 1) Książka polska w Rosji na przełomie XIX i XX wieku. Warszawa : B-ka Narodowa, 1993. 258 s.; 2) Polska książka historyczna w Rosji w latach 1914–1918. Cz. I // Instytucje – publiczność – sytuacje lektury. Warszawa : B-ka Narodowa; In-t Książki i Czytelnictwa, 1990. T. 2. S. 172–194; 3) Cz. II // Ibid. 1992. T. 4. S. 225–242.

22 *Kostecki J.*: 1) Ruch wydawniczy na ziemiach polskich (1877–1886) // Instytucje – publiczność – sytuacje lektury. Warszawa : B-ka Narodowa; In-t Książki i Czytelnictwa, 1992. T. 4. S. 153–224; 2) Drukarnie w Królestwie polskim w latach 70-tych XIX w.: Wielkość i charakter produkcji / M. Rowicka, J. Kostecki // Rocznik Biblioteki Narodowej. Warszawa, 1991. T. XXV. S. 213–234; 3) Trudny proces przenikania: Carska cenzura zagraniczna wobec importu publikacji w języku polskim w latach 1865–1904. Warszawa : B-ka Narodowa, 2011. 352 s. : il., tabl.

23 *Баренбаум И. Е., Шомракова И. А.* Всеобщая история книги : учеб. Санкт-Петербург : С.-Петербург. гос. акад. культуры, 1996. Ч. 1. 168 с.; 1998. Ч. 2. 113 с.; *Шомракова И. А.* Монография по истории книги в России // Книга. Исследования и материалы. Москва : Кн. палата, 1990. Сб. 61. С. 191.

24 *Белов С. В.* Книжная торговля в Петербурге и Москве // Книга в России. 1861–1881 : В 3 т. Москва : Книга, 1991. Т. 3. С. 45–68; *Фролова И. И.* Проблемы провинциальной книги в контексте исследования общероссийской истории книжного дела (На материале второй половины XIX – начала XX в.) // Книга. Исследования и материалы. Москва : Терра, 1995. Сб. 71. С. 205–213; *Фролова И. И., Шпак А. П.* Перспективы исследования истории книжного дела в русской провинции во второй половине XIX – начале XX в. // Книжное дело в России во второй половине XIX – начале XX в. Ленинград : ГПБ, 1990. Вып. 5. С. 140.

ском и литовском языках"[25]. У выніку даследаванняў іх аўтарамі – Ю. Лабынцавым і Л. Шчавінскай – былі апублікаваны манаграфічныя працы, прысвечаныя кніжнай культуры Падляшша[26].

Паступова запаўняецца і беларускае даследчыцкае поле, прысвечанае вывучэнню кнігазбораў, гісторыі бібліятэк Беларусі. З аднаго боку, гэта працы, якія адлюстроўваюць аўтарскі падыход да прадстаўлення ўжо апублікаваных звестак па гісторыі бібліятэк[27], з іншага – навукова-даследчыя[28] і бібліяграфічныя[29] працы, заснаваныя на даследаванні непасрэдна кніжных калекцый.

Што да ўласна гісторыі мінскіх кнігазбораў, у іх ліку царкоўных і манастырскіх бібліятэк, то тут неабходна адзначыць адны з першых публікацый 1960-х гг.

---

[25] *Лабынцев Ю. А.* Международная славяноведческая программа "История книжной культуры Подляшья". Минск : НББ, 1992. С. 10.

[26] Напрыклад: Супрасльский церковнославяно-польский словарь 1722 г. / сост. Ю. А. Лабынцев, Л. Л. Щавинская. Минск : НББ, 1995. 106 с. : ил.; *Щавинская Л. Л.* Литературная культура белорусов Подляшья XV – XIX вв.: Книжные собрания Супрасльского Благовещенского монастыря. Минск : НББ, 1998. 175 с.; *Лабынцев Ю. А., Щавинская Л. Л.* На крайнем западе Востока: Многовековая судьба белорусской духовной культуры Подляшья. Минск : НББ, 2004. 24 с.

[27] *Берёзкина Н. Ю.* Библиотеки и распространение научных знаний в Беларуси (XVI – XX вв.). Минск : Белорус. наука, 2011. 523 с. *Мотульский, Р. С.* Из прошлого в будущее. Библиотеки Беларуси: в 2 ч. Минск : БелЭн, 2011. Ч. 1 : IX – начало XX в. 254 с. (Библиотеки Беларуси).

[28] Напрыклад: *Фурс А.* Бібліятэка Храптовічаў: пошукі, знаходкі, перспектывы // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. Мінск : НББ, 2005. Вып. 7 : Матэрыялы Трэціх Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў "Кніга Беларусі: повязь часоў" (Мінск, 16–17 верас. 2003 г.). Секцыя 2. Беларускія гістарычныя кнігазборы ў часе і прасторы. С. 43–49; *Рошчына Т. І.* Слонім у гісторыі кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага XVIII ст.: Кнігавыданне і кнігазборы // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. 2002. Вып. 5. С. 40–47; *Сільнова Л. Д.* Фрагменты прыватных бібліятэк у фондах НББ // Навукова-даследчая дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на мяжы стагоддзяў / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Л. Г. Кірухіна. Мінск, 2002. С. 71–74; *Цітавец А.* Кнігазбор выданняў друкарні Мамонічаў у фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі // Інфармацыйнае забеспячэнне навукі: праблемы, пошукі, рашэнні: да 75-годдзя з дня заснавання ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа. Мінск, 2000. С. 116–120; *Герасімаў В. М.* Калекцыя "Бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў" у фондах Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. 1998. Вып. 3. С. 16–23; *Стефанович А. В.* Экслибрисы библиотеки Несвижской Ординации Радзивиллов в фондах ЦНБ НАН Беларуси // Тамсама. С. 23–32 : ил.; *Шоцік В. І.* Да гісторыі кнігазбору Пуслоўскіх // Тамсама. С. 45–51.

[29] Напрыклад: Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации = Library of the Radziwills' of Nesvizh Ordynation : каталог изданий из фонда Центральной научной библиотеки им. Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси, XV–XVI века / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Якуба Коласа; сост. А. В. Стефанович, М. М. Лис; ред. библиогр. записей О. М. Дрозд ; редкол. : Н. Ю. Березкина (гл. ред.) [и др.]. Минск : Белорус. наука, 2010. 175 с. : ил.; Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации = Library of the Radziwills' of Nesvizh Ordynation : каталог изданий из фонда Центральной научной библиотеки им. Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси, XVII век / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Якуба Коласа; сост. А. В. Стефанович, М. М. Лис; ред. библиогр. записей О. М. Дрозд, И. Л. Мурашова ; редкол. : Н. Ю. Березкина (гл. ред.) [и др.]. Минск : Белорус. наука, 2012. 629 с. : ил.; *Киреева Г. В., Трифонова Н. Я.* Книги кирилловского шрифта XVI – начала XX в. в собраниях Национального художественного музея Республики Беларусь : альбом-каталог / под науч. ред. Г. Я. Голенченко, Е. В. Карпенко; Нац. худож. музей Респ. Беларусь. Минск : Белпринт, 2012. 168 с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Валянціны Цыбулі[30] і Сямёна Ашаровіча[31]. У пазнейшых працах, сярод іх некалькі абагульняльных па гісторыі бібліятэчнай справы Беларусі такіх беларускіх бібліятэказнаўцаў, як Марыя Пакала[32], Ірма Емец[33], якія падавалі таксама інфармацыю і пра бібліятэкі Мінска, то ў іх амаль не закраналіся пытанні развіцця прыватных збораў. У большасці сваёй публікацыі савецкіх часоў маюць у адносінах да пэўных рэгіёнаў (у тым ліку Мінска) фрагментарны і схематычны характар, аднак карысныя з пункту гледжання гісторыі развіцця даследаванняў, іх метадалогіі.

Новы кірунак у вывучэнні раней не даследаванай гісторыі беларускіх кнігазбораў вызначыўся ў канцы 1990-х – на пачатку 2000-х гг., а асноўнымі "пляцоўкамі" для публікацыі іх вынікаў сталі такія выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, як навуковы зборнік "Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі"[34], матэрыялы міжнародных кнігазнаўчых чытанняў[35]. Большасць артыкулаў прысвячалася даследаванню кніжных калекцый у складзе тых ці іншых дзяржаўных фондасховішчаў Беларусі, аднак і рэгіянальны аспект таксама меў адлюстраванне, у тым ліку і пра мінскія кнігазборы[36].

Апошнім часам значнае асвятленне паводле архіўных матэрыялаў атрымалі манастырскія і царкоўныя бібліятэкі ў працах беларускіх[37] і літоўскіх[38] даследчыкаў. Найбольшая ж колькасць навуковых работ апублікавана польскімі аўтарамі, сярод якіх важкае месца належыць аналітыка-абагульняльным даследаванням[39], дзе закранаецца сярод іншых беларускіх рэгіянальных цэнтраў і Мінск.

---

30 *Цыбуля В. А.*: 1) Первые библиотеки в Минске // Доклады к IX конференции молодых ученых Белорусской ССР (Минск, ноябрь 1967 г.). Минск : АН БССР, 1967. С. 25–30; 2) Первые библиотеки Минска // Неман. Минск, 1968. № 9. С. 182–184.

31 *Ошерович С. О.* К истории библиотечного дела в городе Минске // Библиотечное дело в БССР: (Из истории библиотек республики) : сб. ст. / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина ; ред. Н. М. Колоско, А. Т. Меламед. Минск : [б. и.], 1969. С. 23–36.

32 *Покало М. И.* Библиотеки на территории Белоруссии с древнейших времен до конца XVIII в. // Вопросы библиографоведения и библиотековедения. 1984. Вып. 5. С. 36–54; *Её же.* История библиотечного дела в БССР. Минск : Выш. шк., 1986. 200 с.

33 *Емец И. П.* Краткий очерк развития библиотечного дела в Белоруссии с древнейших времен до Великой Октябрьской социалистической революции // Библиотечное дело в Белоруссии (XVI в. – 1917 г.) : библиогр. указ. Минск : Гос. б-ка БССР, 1983. С. 5–68.

34 Выдаецца з 1995 г.

35 Праводзяцца з 1998 г., матэрыялы выдаюцца з 2000 г.

36 *Доўнар Л. І.* Мінскія кнігазборы XIX стагоддзя // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 3. С. 60–72.

37 *Лаўрык Ю. М.*: 1) Скарбніцы мудрасці: Бібліятэкі іезуіцкіх навучальных устаноў (кан. XVI – пач. XIX ст.) // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 8. С. 87–92; 2) Кнігазборы Пінскага Лешчынскага манастыра // Наша вера. 2007. № 4(42). С. 58–62; 3) Базыльянскія бібліятэкі // Тамсама. 2008. № 2(44). С. 57–63; 4) Кніжныя зборы пры грэка-каталіцкіх святынях // Тамсама. № 3(45). С. 46–51; 5) Касцёльныя кнігазборы // Тамсама. № 4(46). С. 58–62. Таксама гл.: http://media.catholic.by/nv/n40/search.htm?do=search&author=277.

38 *Pacevičius A.* Zaginiony świat książki: biblioteki klasztorne na Litwie pod władzą carów // Wspólnota pamięci. Studia z dziejów ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / red. J. Gwioździk, J. Malicki. Katowice : B-ka Śląska, 2006. S. 243–254; *Idem.* Vienuolynų bibliotekos Lietuvoje 1795–1864 metais: dingęs knygos pasulis. Vilnius : Versus aureus, 2005. 312 p. : il.

39 *Rożycki E.* Materiały źródłowe do dziejów polskiej książki w archiwach i bibliotekach Lwowa, Mińska i Wilna // Roczniki Biblioteczne. 1987. T. 31. S. 305–317; *Bajor A.* Książka i biblioteka klasztorna w Wielkim Księstwie Litewskim – metody i zagadnienia badawcze. Przegląd // Wspólnota pamięci. Studia

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходна адзначыць і такія публікацыі, ажыццёўленыя як у Польшчы, так і Беларусі, прысвечаныя пэўным мінскім кнігазборам, найболей – бібліятэкам каталіцкіх кляштараў, як Уладзіміра Дзянісава[40], Івоны Пятшкевіч[41] і Юрыя Лаўрыка[42]. Асаблівую ўвагу прыцягваюць публікацыі пра "найдаўнейшыя беларускія кніжніцы" Ю. Лаўрыка[43], якія з'яўляюцца, бадай, аднымі з першых спроб абагульнення звестак у ханалогіі існавання прыватных кнігазбораў на тэрыторыі Беларусі, іх сістэматызацыі па ўладальніцкай прыналежнасці і раскрыцці асноўных тэндэнцый развіцця. Нядаўняя манаграфія Ю. Лаўрыка, прысвечаная выдавецкай і кнігазбіральніцкай дзейнасці ў Куцейне ў сярэдзіне XVII ст.[44], прадаўжае традыцыі класічных прац па гісторыі кнігі такіх аўтараў і папярэднікаў, як, напрыклад, Льва Уладзімірава[45] ці Міколы Нікалаева[46], якім характэрны комплексны падыход да гісторыі кнігі: ад яе стварэння да распаўсюджання. Дарэчы, манаграфія літоўскага вучонага Л. Уладзімірава з'яўляецца ў пэўным сэнсе адзінай "усеагульнай гісторыяй кнігі", якая ўключае і гісторыю беларускай кнігі (да XVIII ст.).

З пункту гледжання выкарыстання метадалогіі рэгіянальнага падыходу ў вывучэнні кнігазбораў карыснымі з'яўляюцца і публікацыі беларускай даследчыцы з Кракава Лілії Коўкель пра кнігазборы Гродзеншчыны[47], у прыватнасці

z dziejów ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / red. J. Gwioździk, J. Malicki. Katowice : B-ka Śląska, 2006. S. 243–254; *Miławicki M., o.* Inwentarze i spisy bibliotek dominikańskich skasowanych w guberniach zachodnich Cesarstwa Rosyjskiego w XIX w. Stan źródeł i miejsca ich przechowania // Hereditas Monasteriorum. 2012. Vol. 1. S. 141–172.

40 *Денисов В.* Библиотеки минских католических монастырей XVIII–XIX веков // Kultura książki ziem wscodniego i południowego pogranicza Polski (XVI–XX wiek): paralele i różnice / red. nauk. J. Gwioździk i E. Rożycki. Katowice : Wyd-wo Un-tu Śląskiego, 2004. S. 419–425.

41 *Pietrzkiewicz I.* Zakonnicy i książki. O bibliotekach klasztorów męskich Mińska // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 7. С. 6–24.

42 *Лаўрык Ю.*: 1) Вачыма візітатара: Менскі фарны касцёл і яго кніжныя зборы ў XVIII – пач. XIX ст. // Нашыя святыні : матэрыялы Міжнар. навук. канф. , прысв. 500-годдзю Мінск. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўск. архідыяцэзіі, 220-годдзю Мінск. дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрв. 2008 г. / Польскі Інстытут у Мінску ; рэдкал.: Т. Кандрусевіч [і інш.] ; навук. рэд. Т. Кандрусевіч, А. І. Мальдзіс і М. Каламайска. Мінск : Выд. В. Хурсік, 2009. С. 157–165; 2) Кніжная культура мінскіх бернардзінцаў напрыканцы XVIII ст. // Тамсама. С. 166–172; 3) Бібліятэка менскага канвенту дамініканаў у XVIII ст. // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (Да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 4–5 верас. 2009 г.). Мінск : Беларус. навука, 2010. С. 41–48.

43 *Лаўрык Ю.*: 1) Найдаўнейшыя беларускія кніжніцы // Роднае слова. 2006. № 2. С. 78–81; № 4. С. 80–83; 2) Бібліятэкі на Беларусі ў сярэдзіне XVI – 1-й пал. XIX ст. // Наша вера. 2007. № 2(40). С. 68–71; 3) "Книг вшеляких русских, польских и латинских…" Прыватныя бібліятэкі праваслаўных іерархаў Рэчы Паспалітай канца XVI – 1-й паловы XVII ст. // Роднае слова. 2012. № 3. С. 5–8.

44 *Лаўрык Ю. М.* Кнігі і кнігазборы Куцеінскага манастыра ў сярэдзіне XVII ст. Мінск : Тэхналогія, 2012. 255 с. : іл.

45 *Vladimirovas L.* Knygos istorija: Senovė. Viduramžiai. Renesansas. XVI – XVII amžius. Vilnius : Mokslas, 1979. 544 p. : il.; *Владимиров Л. И.* Всеобщая история книги: Древний мир. Средневековье. Возрождение. XVII век / пер. Н. Л. Владимировой. Москва : Книга, 1988. 322 с. : ил.

46 *Нікалаеў М. В.* Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X – XVIII стагоддзях. Мінск : Мастац. літ., 1993. 239 с.: іл.; *Яго ж.* Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. 423 с. : іл.

47 Напрыклад: *Коўкель Л.* Лёсы прыватных збораў на беларускіх землях пасля паўстання 1830–1831 гг. (На прыкладзе Гродзеншчыны) // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 7: С. 57–68; *Яе ж.* Прыватныя кнігазборы Гродзеншчыны другой паловы XIX ст. (на прыкладзе калекцыі Пуслоўскіх–Красінскіх) // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Бе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

манаграфічная праца “Prywatne księgozbiory na Grodzięszczyznie w pierwszej połowie XIX wieku”, якая выйшла ў кракаўскім друку ў 2005 г.[48] Асноўнай мэтай працы стала “комплексная рэгістрацыя” існаваўшых на гродзенскіх абшарах у азначаны перыяд прыватных калекцый кніг, сістэматызацыя матэрыялаў, якія датычаць іх уладальнікаў, спосабаў фарміравання кнігазбораў, іх структуры і лёсаў.

Комплексны падыход у галіне даследавання кніжнай культуры пэўнага рэгіёна Беларусі адлюстроўвае міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання”, якую з 2008 г. арганізуе Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага. Упершыню ў рэгіянальным кнігазнаўстве Беларусі кніга прадстаўлена ў рэтраспектыве і перспектыве стварэння, бытавання, распаўсюджання, захоўвання; у кантэксце гісторыі і культуры рэгіёна, тэрыторыі[49]. Адной з задач на шляху рэгіянальных кнігазнаўчых даследаванняў з’яўляецца задача “не згубіцца”, не расцерушыць у агульнай масе краязнаўчай інфармацыі веды пра кнігу, а, наадварот, выкарыстоўваючы краязнаўчы матэрыял[50], паглыбляць іх, дадаючы новыя рэгіянальныя асаблівасці ў адзіную карціну гісторыі кнігі Беларусі.

Відавочна, што метадалогія кнігазнаўчых даследаванняў патрабуе і міждысцыплінарнага, кампаратыўнага падыходу, выкарыстання навуковых вынікаў і ўзаемадзеяння з такімі галінамі навук, як культуралогія, гісторыя, філалогія, адукацыя, філасофія, мастацтвазнаўства і інш. Адлюстраваных толькі ў кнігазнаўчай літаратуры звестак па даследуемай тэме кніжнай справы ў Мінску яшчэ недастаткова, каб мець магчымасць скласці поўнае ўяўленне аб выбраным перыядзе. Тым большае значэнне для раскрыцця пытання маюць, у першую чаргу, працы як агульнагістарычнага характару, так і даследаванні па галіновай гісторыі: адукацыі, літаратуры, мастацтва, рэлігіі, філасофіі Беларусі. Крыніцазнаўчы характар маюць публікацыі адпаведнага гістарычнага перыяду – гэта матэрыялы па гісторыі Віленскай вучэбнай акругі І. Карнілава[51], нарысы з гісторыі жыцця Мінска, яго навучальных устаноў і кнігавыдавецкай дзей-

ларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы рэсп. навук. канф. (Гродна, 5–6 снеж. 1997 г.) / адказ. рэд. І. П. Крэнь. Гродна : [б. в.], 1998. С. 205–210.

[48] *Доўнар Л.* [Рэцэнзія] // Беларускі гістарычны агляд. Т. 12, сш. 1–2 (22–23). Снежань 2005. С. 299–315. Рэц. на кн.: *Kowkiel L.* Prywatne księgozbiory na Grodzięszczyznie w pierwszej połowie XIX wieku. Kraków : Wyd-wo Nauk. Akad. Pedag., 2005. 221 s., ill., mapa.

[49] Берасцейскія кнігазборы : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. “Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання” (Брэст, 30–31 кастр. 2008 г.) / Брэсц. абл. б-ка імя М. Горкага ; склад. А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька ; пад агул. рэд. М. В. Нікалаева. Брэст : Паліграфіка, 2010. 463 с. : іл.; Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання : матэрыялы і даклады ІІ Міжнар. навук.-практ. канф. (Брэст, 31 мая – 3 чэрв. 2012 г.) / Брэсц. абл. выкан. камітэт; Брэсц. абл. б-ка імя М. Горкага; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; склад. А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька ; пад агул. рэд. М. В. Нікалаева. Брэст : БрДУ, 2013. 464 с. : іл.

[50] Напрыклад: *Подлипский А.* Книга в Витебске: (книгоиздательство, библиотеки и книголюбы Витебска): Дооктябрьский период / Витеб. обл. б-ка ; Витеб. краевед. фонд им. А. Сапунова. Витебск : Обл. укрупн. тип., 1999. 64 с.

[51] *Корнилов И.* Русское дело в Северо-Западном крае: материалы для истории Виленского учебного округа преимущественно в муравьевскую эпоху / И. Корнилов. Санкт-Петербург : Тип. А. П. Лопухина, 1901. 420, VIII с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці В. Г. Краснянскага[52], А. І. Мілавідава[53], М. Адо[54], П. Афонскага[55], М. Брэнштайна[56] і інш.

Пра кніжнае жыццё горада сведчаць публіцыстычныя, мемуарна-дакументальныя матэрыялы вызначанага перыяду. Так, дзейнасць некаторых польскіх культурна-асветных асяродкаў горада XIX – пачатку XX ст. атрымала асвятленне ва ўспамінах Г. Багіньскага[57], Я. Івашкевіча[58], З. Кавалеўскай[59], Т. Корзана[60], В. Макоўскага[61], А. Валіцкага[62], Э. Вайніловіча[63], Л. Жыцкай[64] і інш. Гісторыка-культурныя нарысы пра Мінск[65] і публіцыстычныя артыкулы аб кнігавыданні ў тагачаснай перыёдыцы (“Kurjer Wileński”, “Минские губернские ведомости”, “Виленский календарь”, “Nad Świsłoczą” і інш.) таксама служаць дадатковай крыніцай інфармацыі.

---

52 *Краснянский В. Г.* Минский департамент Великого Княжества Литовского (Эпизод из истории войны 1812 г.). Санкт-Петербург : Сенатская тип., 1902. 72 с.

53 *Миловидов А. И.* Судьба русской книги в Северо-Западном крае в связи с его культурной историей. Санкт-Петербург : Тип. Меркушева, 1903. 34 с.

54 *Адо Н.* Краткий исторический очерк Минской мужской гимназии. Минск : Тип. И. и В. Тасьман, 1903. Ч. 1 (до 1831 года). 234 с.

55 Триста лет в православии: (Исторический очерк трехсотлетия существования Минского Екатерининского собора) / сост. П. Афонский. Минск : Электротип. С. А. Некрасова, 1913. 72 с.

56 *Brensztejn M.* Informator o Towarzystwach naukowych, oświatowych, artystyczno-popularnych, filantropijnych, wzajemnej pomocy, sportowych i klubach na Litwie i Rusi Białej. Wilno : Druk J. Zawadzkiego, 1914. VIII, 315, III s.

57 *Bagiński H.* Z dziejów Towarzystwa Wiedzy Wojskowej (Z 50-tą rocznice powstania Tow. Polskiej WW) // Przegląd Historyczny. Warszawa, 1968. N 2 (46). S. 413–417.

58 *Iwaszkiewicz J.* Mińsk / pod red. H. Mościckiego. Warszawa ; Poznań : Wyd-wo Zeszytowe, 1920. 36 s. (Co to jest Polska? XIV).

59 *Kowalewska Z.* Obrazki Mińskie z ubiegłego stulecia: 1851 – do połowy 1863. Wilno : Nakł. Księgarni J. Zawadzkiego, 1912. 126 s.; *Eadem.* Rok 1863 w Mińszczyznie // Kalendarz miński na r. 1918. Mińsk : Polska Macierz Szkolna Ziemi Mińskiej, 1917. S. 18–24.

60 *Korzon T.* Mińsk w połowie XIX wieku : ze wspomnień osobistych. Mińsk : [s.n.] ; Wilno : E. Nowicki, 1908. 20 s. (Адбітак: Kalendarz Miński na rok przestępny 1908).

61 *Makowski W.* Wspomnienia starego księgarza na tle osobistych przeżyć. Młodym kolegom po fachu w 52-ą rocznice pracy swojej. Cz. 2. Rok 1879–1893 // Przegląd Księgarski. Warszawa, 1925. N 7. S. 186–193; N 8. S. 220–222; Cz. 3. Rok 1893–1915 // Ibid. N 10. S. 316-319; N 11. S. 337-340; N 15–16. S. 414–417; N 19. S. 494–496; Cz. 4. 1915–1920 // Ibid. N 20. S. 519–521; N 22. S. 565–567; N 23–24. S. 604–609; *Idem.* Wspomnienia Wacława Makowskiego o Elizie Orzeszkowej // Twórczość. Warszawa, 1956. N 1. S. 125–135.

62 *Walicki A.* Stanisław Moniuszko. Warszawa : Druk. J. Korzeniewskiego, 1873. 140 s.

63 *Woyniłłowicz E.* Wspomnienia 1848–1928. Wilno : Druk. J. Zawadzkiego, 1931. Część pierwsza. 365 s.

64 *Życka L., Łęska M.* Działalność popowstaniowa polaków ziemi Mińskiej: (Materiały i wspomnienia). Warszawa : Wydano nakł. Koła Przyjaciół Uchodźców z Mińszczyzny, 1939. 312 s.

65 Напрыклад: *Сыракомля У.* Мінск: Беглы агляд сучаснага стану Мінска / пер. з пол. Х. Лялько. Мінск : Голас Радзімы, 1992. 118 с. : іл.; Mińsk // Kalendarz ilustrowany “Kuriera Litewskiego” na rok 1909. Wilno : Nakł. “Kurjera Litewskiego”, [1909]. S. 144–154; *Chmara A., Jelski A.* Mińsk // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa : Nakł. W. Walewskiego; Druk. “Wieku” etc., 1885. T. VI. S. 453–474.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

Даследаванні беларускіх вучоных па гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. М. В. Біча[66], М. Ф. Болбаса[67], В. І. Галубовіча[68], А. М. Лютага[69] і інш. – значная аргументаваная база аналізу сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця горада ў дадзены перыяд[70]. Дапаўняюць карціну гістарычныя працы ў галіне асветы А. А. Гурэцкага[71], У. С. Пасэ[72]; філасофіі – А. А. Біралы[73], У. М. Конана[74], М. І. Крукоўскага[75], Т. М. Фёдаравай[76]; рэлігіі – В. В. Грыгор'евай, У. І. Навіцкага, А. М. Філатавай[77]; культуры і мастацтва – А. І. Ахвердавай[78], А. Л. Капілава[79], Л. Лыча[80], С. Немагай[81], В. Скарабагатава[82] і інш. Асаблівую навуко-

---

[66] *Біч М. В.* Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст.: Гістарычныя асаблівасці, узаемаадносіны з іншымі народамі / АН Беларусі ; Беларус. камітэт славістаў. Мінск : Нар. асвета, 1993. 349 с.

[67] *Болбас М. Ф.*: 1) Промышленность Белоруссии: 1860–1900. Минск : Изд-во БГУ, 1978. 312 с.; 2) Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861). Минск : Изд-во БГУ, 1966. 268 с.; 3) Прамысловасць дарэвалюцыйнай Беларусі / аўт.-склад. М. Ф. Болбас. Мінск : БелСЭ, 1988. 321 с.

[68] Эканамічная гісторыя Беларусі / пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. Мінск : Экаперспектыва, 1993. 287 с.

[69] *Лютый А. М.* Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. Минск : Наука и техника, 1987. 179, [2] с.

[70] Гісторыя Мінска / пад рэд. чл.-кар. НАН Беларусі У. А. Бабкова. Мінск : БелЭн, 2006. 696 с. : іл.; Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. Мінск : Універсітэцкае, 1998. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. 416 с.

[71] *Гурецкий А. А.* Политика царизма в области образования в Белоруссии в конце XVIII – первой четверти XIX в. (1772–1825) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Белорус. гос. пед. ун-т. Минск, 1998. 20 с.

[72] *Поссе В. С.* Просвещение в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. : автореф. дис. … канд. ист. наук / АН СССР. Минск : Наука и техника, 1964. 20 с.

[73] *Бирало А. А.* Философские проблемы в науке эпохи Просвещения в Белоруссии и Литве. Минск : Изд-во БГУ, 1979. 160 с.

[74] *Конан У. М.*: 1) Праблемы рускай культуры ў Беларусі: па матэрыялах перыядычнага друку канца XIX – пачатку XX ст. // Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пачатку XX ст. : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 150-годдзю з дня нараджэня І. Я. Рэпіна і 100-годдзю знаходжання мастака на Беларусі / Віцеб. абл. краязн. музей; Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны; Віцеб. маст. школа ; Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна. Віцебск : Віцеб. абл. краязн. музей, 1995. С. 5–13; 2) Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в.. Минск : Наука и техника, 1985. 200 с.

[75] *Крукоўскі М. І.* Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. Мінск : Універсітэцкае, 2000. 192 с.

[76] *Федорова Т. Н.* Развитие общественно-политической и эстетической мысли в Белоруссии (по материалам газеты "Минский листок" 1886–1902 гг.) : автореф. дис. … канд. филос. наук. / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1962. 16 с.

[77] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.] ; навук. рэд. У. І. Навіцкі. Мінск : Экаперспектыва, 1998. 340 с.

[78] *Ахвердава А.* Пачынальнікі беларускага піянізму // Мастацтва Беларусі. Мінск, 1985. № 2. С. 68; *Яе ж.* Фларыян Міладоўскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мінск, 1980. № 3. С. 38–39.

[79] *Капилов А. Л., Ахвердова Е. И.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков. Минск : Ин-т совр. знаний, 2000. 144 с. : ил.

[80] *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. Мінск : Экаперспектыва, 1996. 454 с.

[81] *Немагай С. М.* Выганічы–Дудзічы–Замосце: музычныя масты // Ельскія чытанні : матэрыялы канферэнцыі "Шляхецкая культура Беларусі XIX – пачатку XX ст." (Дудуткі, 27 крас. 2013 г.) / уклад. Д. Ільініч ; пад рэд. Л. І. Доўнар. Мінск : Кнігазбор, 2013. С. 40–52.

[82] *Скорабагатаў В.* Зайгралі спадчынныя куранты: цыкл нарысаў з гісторыі прафесійнай музычнай культуры Беларусі. Мінск : Тэхналогія, 1998. 154 с. (Вяртанне ; кн. 5).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вую значнасць маюць працы З. В. Шыбекі, прысвечаныя культурнаму генезісу Мінска[83].

Найбольш беларуская кніга XVIII – пачатку XX ст. з'яўлялася аб'ектам даследавання ў беларускім літаратуразнаўстве[84]. Новыя фактаграфічныя і крыніцазнаўчыя звесткі пра кнігавыданне і кніжныя рэдкасці Мінска ўнесены такімі вучонымі, як С. Х. Александровіч[85], І. С. Бас[86], Г. В. Кісялёў[87], А. І. Мальдзіс[88], У. І. Мархель[89], Р. М. Семашкевіч[90] і інш. Іх працы па распрацоўцы кніжнай спадчыны Беларусі служаць грунтоўнай крыніцай кнігазнаўчых ведаў, якія могуць выкарыстоўвацца і ў даследаванні беларуска-польскіх, беларуска-ўкраінскіх і беларуска-рускіх кніжных сувязяў. Неабходна таксама адзначыць і адзіную спецыяльную літаратуразнаўчую працу польскага даследчыка Тадэвуша Зянкевіча, прысвечаную літаратурнаму жыццю Мінска ў XIX – пачатку XX ст.[91], якая

83 *Шыбека З. В.*: 1) Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя). Мінск : ЭўраФорум, 1997. 292 с. : іл.; 2) Мінск у складзе Расійскай імперыі (культурны генезіс будучай сталіцы) // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый" (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. С. 196–199 (Беларусіка=Albaruthenica ; кн. 21); 3) Минскъ сто гадоў таму. Мінск : Беларусь, 2007. 304 с. : іл.

84 Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. / НАН Беларусі , Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. 2-е выд. Мінск : Беларус. навука, 2006. Т. 1 : Даўняя літаратура, XI – першая палова XVIII стагоддзя. 910 с.; 2007. Т. 2 : Новая літаратура, другая палова XVIII – XIX стагоддзе. 582 с.; Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст. / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. 2-е выд., дапрац. Мінск : Выш. шк., 1998. 560 с.; История белорусской дооктябрьской литературы / редкол.: В. В. Борисенко [и др.]. Минск : Наука и техника, 1977. 640 с.; *Карский Е. Ф.* Белорусы : [в 3 т.]. Петроград : Рос. гос. акад. тип.,1922. Т. 3: Очерки словесности белорусского племени, [вып.] 3. Художественная литература на народном языке. 18, 454 [2] с., [4] л. портр.

85 *Александровіч С.* Гісторыя і сучаснасць: літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск : Беларусь, 1968. 256 с.; *Яго ж.* Пуцявіны роднага слова: Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. 248 с.

86 *Бас І. С.* Літаратуразнаўчыя эцюды: (Пра беларускіх пісьменнікаў і культурных дзеячаў другой паловы XIX – пачатку XX ст.). Мінск : Мастац. літ., 1977. 222 с. : іл.; *Яго ж.* Падарожжа ў літаратурнае мінулае: літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск : Беларусь, 1971. 232 с.

87 *Кісялёў Г.* Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі. Мінск : Мастац. літ., 1994. 303 с. : іл.; Пачынальнікі: з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў. Мінск : Навука і тэхніка, 1977. 543 с. : іл.

88 *Мальдзіс А. І.*: 1) Календары, выдадзеныя ў Беларусі ў XVIII ст. // Книговедение в Белоруссии. Минск : ФБАН БССР, 1977. С. 65–68; 2) Из истории издательской деятельности Э. Ожешко // Литература славянских народов : сб. ст. Москва : АН СССР, 1963.Вып. 8. / отв. ред. И. М. Шептунов. С. 249–251; 3) Кнігадрукаванне Беларусі ў XVIII стагоддзі // Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Минск : ФБАН БССР, 1974. С. 130–151; 4) На скрыжаваннях славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII – XVIII ст.). Мінск : Навука і тэхніка, 1980. 352 с.; 5) Падарожжа ў XIX стагоддзе: З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры. Мінск : Нар. асвета, 1969. 208 с.; 6) Творчае пабрацімства. Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX ст. Мінск : Навука і тэхніка,1966. 159 с.; 7) Традыцыі польскага асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Мінск : Навука і тэхніка,1972. 47 с.

89 *Мархель У. І.* Кнігазбор Сыракомлі // Книговедение в Белоруссии. Минск : ФБАН БССР, 1977. С. 69–107; *Яго ж.* Крыніцы памяці: Старонкі беларуска-польскага літаратурнага сумежжа. Мінск : Мастац. літ., 1990. 222 с.

90 *Семашкевіч Р. М.* Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX – пачатак XX ст.). Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. 134 с.

91 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku w XIX i na początku XX wieku (do roku 1921). Olsztyn : Wyższa szkoła pedagogiczna, 1997. 235 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выйшла ў 1997 г. і ўтрымлівае шматлікія факты з гісторыі кнігавыдання і кнігараспаўсюджання ў горадзе. Асабліва падрабязна разглядаецца перыяд 1905–1920 гг.

Вялікае значэнне для выяўлення мясцовых выданняў маюць матэрыялы беларускай, польскай і расійскай бібліяграфій. Каштоўнейшай крыніцай з'яўляецца шматтомная бібліяграфічная праца Эстрайхераў[92] "Bibliografia polska". 34 тамы, аб'яднаныя ў чатыры часткі, змяшчаюць амаль поўны пералік польскай кнігі з 1455 г. да 1900 г. (выданне запачаткавана ў 1872 г.[93]), адлюстроўваюць у тым ліку значную колькасць беларускіх выданняў, з якіх звыш 100 улічаны ўпершыню. Асноўная прыкмета, узятая за аснову складання бібліяграфічнага дапаможніка Каралем Эстрайхерам (старэйшым), – гэта прыналежнасць да польскай кнігі, у першую чаргу – па мове незалежна ад месца выдання, а таксама ўлічаны кнігі замежных аўтараў на замежных мовах, калі яны мелі краязнаўчы характар. Галоўным недахопам дадзенай крыніцы з'яўляецца адсутнасць навукова-дапаможнага апарату, і выяўленне кніг, выдадзеных, напрыклад, на тэрыторыі Беларусі, неабходна ажыццяўляць шляхам суцэльнага прагляду. Такім чынам за перыяд з 1790 г. да 1900 г. было выяўлена 75 мінскіх выданняў на польскай, рускай і лацінскай мовах. Захаваліся прынцыпы бібліяграфавання і ў працягу названай працы, якую ўзяла на сябе Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве. "Новая" нацыянальная рэтраспектыўная бібліяграфія Польшчы адлюстроўвае выданні за 1901–1939 гг. (да 2014 г. з'явілася 16 тамоў)[94] і таксама, трэба спадзявацца, прынясе пэўныя дапаўненні і ў кніжны рэпертуар Беларусі, на што паказваюць і 9 мінскіх выданняў 1906–1917 гг., зафіксаваных ў адпаведных тамах дадзенай працы.

Найбольш даступнымі крыніцамі бібліяграфічнага пошуку мінскіх выданняў на польскай і лацінскай мовах з'яўляюцца "Белоруссия в печати XVIII столетия", "Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия" і "Белоруссия в печати 1917–1939 гг." М. Васілеўскай[95]. Асноўныя бібліяграфічныя крыніцы выяўлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[92] Эстрайхер (Estreicher) Караль (1827–1908) – польскі бібліёграф і гісторык кнігі. У 1872–1908 гг. выдаў 22 тамы сваёй асноўнай працы "Bibliografia polska". Выданне працягвалі яго сын Станіслаў (1869–1939), дзякуючы якому ў 1910–1939 гг. выйшлі т. 23–33, і ўнук Караль-малодшы – у 1951 г. выдаў т. 34, а таксама запачаткаваў другое выданне "Bibliografii Polskiej XIX stulecia" (т. 1–9, літары A-G, 1959–1970).

[93] *Estreicher K.* Bibliografia polska. Część 1: XIX stólecie. Kraków : Wyd. Akad. Umiejętności; druk. Un-tu Jagel., 1872. T. 1. 523, 48, III s.; 1874. T. 2. 634 s.; 1876. T. 3. V, 608 s.; 1878. T. 4. IV, 629 s.; 1880. T. 5. 335 s.; 1881. T. 6. II, 577 s.; 1882. T. 7. 292 s.; Część 2: Chronologicznie zestawienie. 1885. T. 10. VIII, 489, XXVIII s.; 1890. T. 11. IV, 400, 187 s.; Część 4. Kraków : Nakł. spółki księgarzy polskich, druk W. L. Anczyca, 1906. T. 1. 415 s.; 1907. T. 2. 403 s.; 1911. T. 3. 475 s.; 1916. T. 4. 652 s. Таксама гл.: http://www.estreicher.uj.edu.pl.

[94] Bibliografia Polska, 1901–1939 / Biblioteka Narodowa. Wrocław [ect.] : Zakład Narodowy im. Ossolińskich Wyd-wo, 1986. T. 1. 549 s.; 1991. T. 2. 689 s.; 1993. T. 3. 623 s.; 1998. T. 4. 706 s.; 2002. T. 5. 593 s.; 2005. T. 6. 656 s.; 2006. T. 7. 746 s.; 2006. T. 8. 662 s.; 2007. T. 9. 733 s.; 2009. T. 10. 751 s.; 2009. T. 11. 734 s.; 2009. T. 12. 707 s.; 2010. T. 13. 691 s.; 2012. T. 14. 748 s.; 2013. T. 15. 696 s.; 2014. T. 16. 678 s. : il. – Таксама гл.: http://www.bn.org.pl/katalogi-i-bibliografie/bibliografia-narodowa/bibliografia-polska-1901-1939.

[95] *Василевская М. А.*: 1) Белоруссия в печати XVIII столетия : библиогр. указ. на иностр. яз. / сост. М. Василевская ; редкол.: А. П. Грицкевич, А. И. Мальдис, З. А. Корень. Минск : ГБЛ БССР, 1985. 288 с.; 2) Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия : библиогр. на иностр. яз. Минск : ГБЛ БССР, 1980. Ч. 1 / сост. М. Василевская ; под ред. А. П. Грицкевича. 408 с.; 3) Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия : библиогр. на иностр. яз. Минск : ГБЛ БССР, 1983. Ч. 2 / сост. М. Ва-

беларускамоўных і рускамоўных кніжных выданняў Мінска – зводны каталог “Кніга Беларусі, 1517–1917”[96], “Летапіс беларускага друку” Ю. І. Бібіла[97], а таксама бібліяграфічны паказальнік “Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст.”[98] Дапаўненнем да названых крыніц служыць каталог Расійскага дзяржаўнага архіва ў С.-Пецярбурзе “Русские официальные и ведомственные издания XIX – начала XX века”[99], у які ўвайшлі і адпаведныя выданні Беларусі. Аднак у большасці сваёй зварот да падобных матэрыялаў пры ажыццяўленні пошуку па тапаграфічнай прыкмеце патрабуе таксама іх франтальнага прагляду. Названыя айчынныя бібліяграфічныя працы ўжо на сённяшні час могуць мець істотныя дапаўненні, бо пры іх складанні былі дапушчаны даволі значныя пропускі не столькі з-за адсутнасці фактаграфічнай інфармацыі, колькі з-за адпаведных ідэалагічных падыходаў.

Складаным, але не немагчымым, выглядае шлях па выяўленні мінскіх выданняў на яўрэйскіх мовах – іўрыце і ідыш. Адной з галоўных бібліяграфічных крыніц аб пачатку яўрэйскага кнігадрукавання ў Мінску застаецца каталог Самуэля Вінера “Bibliotheca Friedlandiana”[100], складзены на аснове прыватных калекцый яўрэйскай літаратуры з С.-Пецярбурга і Мінска. У 2–6 тамах каталогу прыводзяцца бібліяграфічныя запісы васьмі мінскіх выданняў на іўрыце. Пэўныя звесткі можна атрымаць з бібліяграфічных каталогаў І. Беняко-

---

силевская ; под ред. А. И. Мальдиса. 418 с.; 4) Белоруссия в печати1917–1939 гг. : библиогр. указ. / сост. М. Василевская ; науч. ред.: А. И. Мальдис, А. П. Грицкевич. Минск : АН БССР, 1990. (Научно-реферат. бюллетень (зарубежная литература) ; № 77–78). Ч. 1. 193 с.

96 Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. 615 с. : іл. Таксама гл.: Кніга Беларусі. 1517–1917 : зводны каталог [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі, НДА кнігазнаўства ; склад. Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч; склад. электрон. выд. Г. У. Кірэева, А. А. Суша, К. В. Языковіч; адк. рэд. Г. У Кірэева. Электронныя тэкставыя, графічныя даныя і праграма (196 Мбайт). Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2006. 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

97 *Бібіла Ю. І.* Летапіс беларускага друку. Менск : Беларус. дзярж. б-ка, 1929. Ч. 2: Паасобныя выданьні на беларускай мове (з дадаткам проклямацый і адозваў 1863 і 1905 г.), 1835–1916 гг. 39, [1] с.; *Яе ж.* Летапіс беларускага друку. Менск : Беларус. дзярж. б-ка, 1927. Ч. 3: 1917–1924, сш. 1: Выданьні на беларускай мове. 56, [VIII] с.; *Бибило Ю. И., Мерина Ф. А.* Летопись печати БССР. Минск : ГБЛ БССР, 1969. Ч. 3: 1917–1924, тетр. 2: Издания на русском, польском, еврейских языках. 115 с.

98 Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст. : бібліягр. паказ. / склад. Г. Р. Сянькевіч [і інш.] ; пад рэд.: С. В. Снапкоўскай (адказ. рэд.) [і інш.]. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1995. Ч. 1. 173 с.; Ч. 2. 205 с.

99 Русские официальные и ведомственные издания XIX – начала XX века : каталог / сост. Е. К. Авраменко [и др.] ; Рос. гос. архив. Санкт-Петербург : БЛИЦ, 1995. Т. 1. 273 с.; 1995. Т. 2. 192 с.; 1996. Т. 3. 287 с.; 1996. Т. 4. 351 с.

100 *Wiener S.* Bibliotheca Friedlandiana : Catalogus librorum impressorum hebraeorum in Museo Asiatico Imperialis Academiae Scientiarum Petropolitanae Asservatorum. Petropoli : Commissionaires de l`Academie Imperiale des Sciences, 1893. 1893. Fasc. 1. 126, [4] s.; 1895. Fasc. 2. 223, [3] s.; 1897. Fasc. 3. 315, [3] s.; 1902. Fasc. 4. 449, [3] s.; 1904. Fasc. 5. 559, [3] s.; 1918. Fasc. 6. 630, [2] s.; 1918. Fasc. 7. S. IV, 631–658; Bibliotheca Friedlandiana : каталог еврейских книг (изданных до 1892 г.) библиотеки Института востоковедения АН СССР / сост. И. Г. Бендер ; под ред. П. К. Коковцова. Москва ; Ленинград : АН СССР; Ин-т востоковедения, 1936. Вып. 8. С. 659–696.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ба[101], Д. Хвольсана[102] і М. Розенфельда[103]. Яўрэйскай тэматыцы прысвечаны і паказальнікі літаратуры на рускай мове Л. М. Брамсана[104], В. Я. Кельнера і Д. А. Эльяшэвіча[105], у якіх упершыню адлюстраваны некаторыя мінскія выданні на рускай мове, не ўлічаныя ў айчыннай бібліяграфіі.

Бібліяграфічныя дапаможнікі служаць і пачатковымі арыенцірамі для даследаванняў гісторыі бібліятэк Мінска – "Библиотечное дело в Белоруссии (XVI в. – 1917 г.)"[106], а таксама "Асвета і педагагічная думка на Беларусі са старажытнасці да пачатку XX ст."[107], у якіх найбольшае інфармацыйнае напаўненне маюць рубрыкі, прысвечаныя бібліятэкам навучальных устаноў (свецкім і духоўным), а таксама публічным бібліятэкам. Больш сціпла прэзентуюцца бібліятэкі ведамасныя і спецыяльныя, і, нарэшце, зусім нязначнае асвятленне маюць прыватныя кнігазборы.

Хоць нярэдка толькі бібліяграфічныя крыніцы, якія ўтрымліваюць апісанні інвентароў, вопісаў і каталогаў кнігазбораў, могуць з'яўляцца адзінымі сведкамі ў пазнанні кніжнай культуры мінулага. Так, паводле слоў Караля Гламбёўскага: "Даўнія бібліятэчныя інвентары, якія даследуюцца не ў адзінкавых асобніках, але ў цэлай сваёй ацалелай масе, складаюць дасканалую крыніцу для пазнання духоўнага развіцця цэлых культурных асяродкаў у тых межах, з якіх паходзяць"[108].

Праблемы, якія паўстаюць перад даследчыкамі кнігазбораў Беларусі, звязаны ў значнай ступені з тым, што гісторыя бібліятэк – гэта ў асноўным гісторыя іх перамяшчэнняў і страт[109], пра што сведчыць і карпатлівая праца па ўз-

---

[101] *Benjacob I. A.* Ozar ha-sepharim: Thesaurus Librorum Hebraicorum Tam Impressorum Quam Manu Scriptorum : bibliographie der gesammten hebraeischen Literatur mit Einschluss der Handschriften (bis 1863) = Оцар Га-Сефарим. Сокровище книг : библиография всеобщей еврейской письменности со включением рукописей (до 1863 г.) в алфавитном порядке / сост. И. А. Бенякоб, [прим. М. Штейншнейдера]. Wilna : J. Benjacob, 1880. 678, XXXII, 2 s.

[102] Catalog Hebraischen Bűcher in der Bibliothek des Professors D. Chwolson. Wilna : Buchdruckerei der Wittwe & Gebr. Romm, 1897. 158 s.

[103] *Rosenfeld M.* Hebrew printing from its beginning until 1948: A gazetteer of printing, the first books and their dates with photographed titell-pages and bibliographical notes. 147 s.

[104] Систематический указатель литературы о евреях на русском языке со времени введения гражданского шрифта (1708 г.) по декабрь 1889 г. / сост. Л. М. Брамсон. Санкт-Петербург : Типолитогр. А. Е. Ландау, 1892. 568 с., VIII с. (Особое прил. к ж. "Восход").

[105] Литература о евреях на русском языке, 1890–1947 : книги, брошюры, оттиски статей, органы периодической печати : библиогр. указ. / Петербург. еврейский ун-т ; Рос. нац. б-ка ; сост. В. Е. Кельнер, Д. А. Эльяшевич. Санкт-Петербург : Академ. проект, 1995. 680 с.

[106] Библиотечное дело в Белоруссии (XVI в. – 1917 г.) : библиогр. указ. / сост. Л. Н. Новицкая. Минск : Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина, 1982. 194 с.

[107] Асвета і педагагічная думка на Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст. : бібліягр. паказ. : у 2 ч. / склад. Г. Р. Сянькевіч [ і інш.] ; пад рэд.: С. В. Снапкоўскай (адказ. рэд.) [і інш.]. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1995. Ч. 1. 173 с.; Ч. 2. 205 с.

[108] Цыт. па: *Migoń K.* Dawne katalogi biblioteczne jako źródło wiedzy o kulturze książki // Roczniki Biblioteczne. Warszawa, 2005. T. 49. S. 302.

[109] *Рошчына Т. І.* Перамешчаныя беларускія кнігазборы. Старадрукі з беларускіх гістарычных калекцый у сховішчах замежных краін // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. 2006. Вып. 8. С. 167–197.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наўленні буйнейшых у свой час гістарычных кніжных калекцый, да прыкладу, Радзівілаў[110], Храптовічаў[111], Сапегаў[112] і г. д.

Тое, што было зафіксавана ў інвентарных вопісах і друкаваных каталогах дае шанц на іх узнаўленне хоць бы ў бібліяграфічнай форме. І ў гэтым выпадку можна спрабаваць скласці адпаведнае ўяўленне аб тым, што куплялі, што чыталі, што збіралі і захоўвалі ў мінулым, якімі шляхамі кнігі траплялі ў Беларусь і куды перамяшчаліся. З гэтага пункту гледжання варты ўвагі ў “Bibliografji Polskiej” Караля Эстрайхера том XV – „Katalogi”[113], у якім, да прыкладу, зафіксаваны “Katalog Xiąg znaydujących się w Mińsku w Xięgarni Antoniego Muszyńskiego sporządzony w roku 1805” (S. 117), а таксама прадстаўлены шэраг кнігагандлёвых і кнігавыдавецкіх каталогаў Юзафа Завадскага (S. 259–269), фірма якога з'яўлялася галоўным пастаўшчыком кніжнай прадукцыі на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст., асабліва да 1864 г., у тым ліку і ў Мінск.

Пры вывучэнні гісторыі распаўсюджання і бытавання кнігі на тэрыторыі Беларусі абавязковымі крыніцамі з'яўляюцца грунтоўныя навукова-бібліяграфічныя дапаможнікі, створаныя такімі польскімі даследчыкамі, як Ядвігай Рудніцкай і Уршуляй Пашкевіч. Працы не толькі дэманструюць адпаведную рэтраспекцыю, тэрытарыяльны ахоп, але і змяшчаюць каштоўнейшую бібліяграфічную інфармацыю.

Праца Я. Рудніцкай “Bibliografia katalogów księgarskich wydanych w Polsce do końca wieku XVIII” ахоплівае перыяд з 1672 г. да 1800 г. Усяго аўтарам уключана ў бібліяграфію 980 кнігагандлёвых каталогаў, у тым ліку што выйшлі ў Варшаве – 506, Гданьску – 183, Кракаве – 105, Торуні – 49, Львове – 34, Вільні – 9, Познані – 6, Эльбланзе – 4, Калішы – 2, Сандаміры – 2, Бердычаве, Браневе, Чанстахове, Любліне, Супраслі, Всхове – па адным[114]. Як месца выдання, так, і, можа, найперш для Беларусі, мае значэнне распаўсюджанне кнігагандлёвых каталогаў на яе тэрыторыі. І ў дадзеным выпадку, нават чытаючы толькі назвы занатаваных каталогаў, можна выявіць цікавыя фактаграфічныя даныя, якія сведчаць аб іх прызначэнні для жыхароў Гродна, Мінска[115], Нясвіжа, Навагрудка, Супрасля, Свіслачы, Вільні, Заслаўя, Зэльвы – 19 каталогаў.

---

[110] *Рощина Т. И.* Проект «Radziviliana»: проблемы и пути реализации // Программа ЮНЕСКО “Память мира”: деятельность б-к, архивов, музеев по сохранению док. наследия: материалы междунар. конф., Минск, 30 нояб. – 1 дек. 2006 г. / Нац. б-ка Беларуси; сост. Г. В. Киреева. Минск, 2007. С. 136–141.

[111] Библиотека Хрептовичей: книжное собрание рода Хрептовичей / Нац. б-ка Беларуси, Нац. б-ка Украины им. В. И. Вернадского; сост. Л. Г. Кирюхина, Л. А. Дубровина; под науч. ред. Л. Г. Кирюхиной, Т. И. Рощиной. Электрон. текстовые данные. Минск : НББ, 2009. 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). Загл. с этикетки диска.

[112] Сапегиана: книжное собрание рода Сапег = Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў / Нац. б-ка Беларуси; Рос. нац. б-ка; сост. Л. Г. Кирюхина, К. В. Суша; под науч. ред. Н. В. Николаева, Т. И. Рощиной; авт. ст. Н. В. Николаев, Н. Н. Проневич. Электрон. текстовые, графические данные и программа (1,73 Мб). Минск : НББ, 2011. 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM). Загл. с этикетки контейнера.

[113] Bibliografia Polska Karola Estreichera / Un-t Jagieloński. Wyd. drugie. Kraków : Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1991. T. 15: Katalogi. 274 s.

[114] *Rudnicka J.* Bibliografia katalogów księgarskich wydanych w Polsce do końca wieku XVIII. Warszawa, 1975. S. 10. (Prace Instytutu Bibliograficznego BN ; nr 9).

[115] Напрыклад: Katalog niektorych książek polskich znayduiących się wraz z niektoremi łacińskiemi, niemieckiemi francuzkiemi etc.: u Michała Grölla księgarza nadwor: J. K. Mci. w Warszawie, Dubnie,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ролю і значэнне "здабытых з бяспамяцтва" крыніц, таксама і бібліяграфічных, у раскрыцці новага вобразу кніжнай культуры на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай (найболей гэта і ёсць тэрыторыя Беларусі) выразна акрэсліла Барбара Бяньkоўска: "Аказваецца, што не толькі вялікія гарады, але цэлыя ўсходнія тэрыторыі пакрывала густая сетка дынамічных бібліятэк, адрозных – зразумелая рэч – па важнасці і па характары. Нават у мясцовасцях, якія з'яўляліся толькі пункцікамі на дакладнейшых мапах (альбо цалкам не пазначаныя на іх), жылі, а часам толькі існавалі, малыя, слабыя, але канкурыруючыя паміж сабой бібліятэчныя адзінкі, а па ўсёй тэрыторыі вандравалі тысячы абменных камплектаў кніг. Абрысаваўся пейзаж кніжнай культуры неспадзяванай інтэнсіўнасці, маляўнічасці і дынамікі, поўны ідэйных узлётаў і адначасова супярэчнасці, канфліктаў і горычы штодзённых бедаў. Далейшыя даследаванні, безумоўна, дапоўняць яго фактамі і высновамі, але падстава ўяўляецца падрыхтаванай"[116] (пераклад наш. – *Л. Д.*).

Сёння гэту падставу, аснову, за якой стаіць агромістая, не ў адзін дзесятак гадоў, карпатлівая навукова-бібліяграфічная праца Уршулі Пашкевіч, складаюць восем комплексных рэтраспектыўных выданняў (12 тамоў) – бібліяграфічных паказальнікаў і даведнікаў, якія з'явіліся на працягу 1990–2006 гг. Інвентарным вопісам і каталогам бібліятэк з беларускіх земляў прысвечаны чатыры выданні (у 6 тамах), якія ахопліваюць гістарычны перыяд існавання кнігазбораў з XVI ст. да 1939 г.[117] Прадстаўленыя бібліягрфічныя крыніцы – гэта каштоўнейшы матэрыял для гісторыі бібліятэк Беларусі як у тэрытарыяльным ахопе беларускіх населеных пунктаў, так і ў значэнні сабраных першакрыніц – інвентарных вопісаў і каталогаў бібліятэк розных дзяржаўных і рэлігійных устаноў, арганізацый, прыватных кнігазбораў. Так, напрыклад, у апошніх выданнях 2000 і 2006 гг. У. Пашкевіч адлюстраваны адпаведна найбольшыя колькасныя паказчыкі па Беларусі – гэта 420 населеных пунктаў з 738[118], пра бібліятэчныя зборы якіх свед-

Mińsku, Nowogrodku podczas kontraktow; w Zelwie y Swisłoczy podczas jarmarkow, w Poznaniu, Łucku, Lublinie, Grodnie, w składach tegoż. Warszawa : [Druk. M. Grölla], 1790. 12°. 96 s.; Suplement do katalogu książek znayduiących się podczas kontraktow roku 1790 w Mińsku i Nowogrodku w Księgarni Michała Grölla. [Warszawa : Druk. M. Grölla, 1790]. 8°. 12 s. nlb.

[116] *Bieńkowska B.* Wstęp // Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej : Informator / red. nauk. Barbara Bieńkowska ; oprac. Urszula Paszkiewicz [i in.]. Poznań : Bogucki, 1998. S. 20–21.

[117] *Paszkiewicz U.*: 1) Bibliografia inwentarzy i katalogów księgozbiorów polskich i założonych w Polsce do 1939 roku. Warszawa : Wyd-wo Un-tu Warszawskiego, 1990. Cz. 1: Księgozbiory instytucjonalne w układzie topograficznym. 286 s.; Cz. 2: Księgozbiory prywatne w układzie abecadłowym nazwisk właścicieli. 204 s.; 2) Rękopiśmienne inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej. Spis za lata 1553–1939. Warszawa : Wyd-wo DiG, 1996. 96 s. (Polskie dziedzictwo kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo); 3) Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej : Informator / red. nauk. Barbara Bieńkowska. Poznań : Bogucki, 1998. 800 s. (Polskie dziedzictwo kulturalne. Seria B : Wspolne dziedzictwo); 4) Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej (spis za lata 1510–1939). Warszawa : Wyd-wo DiG, 1998. 260 s. (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo); 5) Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 1. Warszawa : Wyd-wo DiG, 2000. 301 s. (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo); 6) Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2. Poznań : Bogucki ; Wyd-wo Naukowe, 2006. 636 s. (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo).

[118] *Paszkiewicz U.* Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2. S. 9, 636.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

чаць ужо тысячныя паказчыкі (усяго зафіксавана 2064 рукапісныя дакументы і 87 друкаваных, сярод якіх пераважаюць крыніцы XVIII – пачатку XX ст.)[119]. Том другі, а дакладней – дадатак 2 (suplement 2), што пабачыў свет у 2006 г., змяшчае агульны для двух тамоў навукова-дапаможны апарат, а таксама характарыстыку сабраных матэрыялаў, пададзеную як у прадмове, так і ў выглядзе некалькіх графічных дыяграм. Неабходна адзначыць, што кожнае наступнае пасля 1990 г. выданне з'яўляецца пэўным дапаўненнем папярэдняга, таму іх выкарыстанне ў пошукавай працы даследчыка вымагае прагляду ўсіх тамоў.

Уражвае як колькасны аб'ём першакрыніц – інвентарных вопісаў і каталогаў бібліятэк, так і корпус дакументаў па іх выяўленні ў шматлікіх фондасховішчах розных краін, шырыня крыніцазнаўчай інфармацыі. Сярод асноўных аўтары вылучаюць такія групы крыніц інфармацыі, як даведкавыя, бібліяграфічныя, афіцыйныя, статыстычныя, бібліялагічныя і навуказнаўчыя, рэгіянальныя і лакальныя манаграфіі, справаздачы аб дзейнасці арганізацый, успаміны, публікацыі ў прэсе – асабліва спецыяльнай, уладальніцкія пазнакі, архіўныя дакументы, якія ў комплексе і паадзінкава раскрываюць невядомую гісторыю бытавання кнігі і кнігазбораў у тым ліку ў Беларусі (і ў Мінску).

Нягледзячы на аб'ёмістасць адных і фрагментарнасць іншых апублікаваных матэрыялаў, сярод якіх адшукваецца і складаны аб'ект нашага даследавання – "кніжны Мінск", іх апрацоўка дала магчымасць значна дапоўніць даныя па гісторыі кнігавыдання, распаўсюджання, збіральніцтва ў горадзе і адпаведных яго сувязях з іншымі рэгіёнамі. Аднак без выкарыстання першакрыніц – архіўных матэрыялаў – гэтыя даныя выглядалі б усё ж даволі скупымі.

Асноўнай базай архіўных дакументаў у раскрыцці і напаўненні зместу па тэме паслужылі фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, дзе захоўваецца разнастайны фактычны матэрыял аб кніжнай справе як Беларусі, так і Мінска. У прыватнасці, звесткі аб адкрыцці, абсталяванні, фінансаванні і кадрах друкарняў і кнігарняў Мінска адлюстроўваюцца ў дакументах фонда Мінскага губернскага праўлення (Ф. 299), Канцылярыі мінскага генерал-губернатара (Ф. 295), Мінскай гарадской управы (Ф. 1), Мінскай губернскай друкарні (Ф. 456). Звесткі аб выдавецкай дзейнасці асобных устаноў і таварыстваў змяшчаюцца ў адпаведных фондах: Упраўлення Лібава-Роменскай чыгункі (Ф. 2414), Мінскага губернскага статыстычнага камітэта (Ф. 21), Таварыства мінскіх урачоў (Ф. 502), Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (Ф. 51), Духоўнай кансісторыі (Ф. 136) і інш. Зберагліся вопісы і інвентарныя кнігі шэрагу бібліятэчных збораў Мінска (Ф. 69, 124, 136, 458, 473, 483, 797, 1781 і інш.). Некаторым фактычным матэрыялам па тэме валодаюць Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва – гэта, да прыкладу, фонды Палееса (Ф. 382) і таварыства "Минчук" (Ф. 3); Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (Ф. 322), Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне (Ф. 1–2).

Шматлікія і разнастайныя звесткі па цэнзурнай практыцы кнігавыдання і кнігараспаўсюджання ўтрымліваюцца ў дакументах Віленскага цэнзурнага камітэта (Ф. 1240), Канцылярыі віленскага генерал-губернатара (Ф. 378) і інш. – Гістарычны архіў Літвы ў Вільнюсе, а таксама Расійскі дзяржаўны архіў ў С.-Пе-

[119] *Paszkiewicz U.* Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2. S. 635.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цярбурзе (Ф. 772) і Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі ў Маскве (Ф. 1165). Асаблівую цікавасць маюць пастановы, цыркуляры, прадпісанні, дакладныя запіскі, рапарты цэнзараў аб прагледжаных кнігах, пісьмы мінскіх губернатараў у "сталіцы" і інш. Пэўная частка матэрыялаў архіўных фондаў за 1795–1917 гг., якая знаходзіцца ў Польшчы ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве (у прыватнасці, акты органаў улады, устаноў і грамадскіх інстытутаў (II), акты сем'яў і прыватных асоб (III) – архіў Прозараў і Ельскіх, архіў Пшэздзецкіх), таксама служыць крыніцай для выяўлення кніжных зацікаўленняў і сувязяў іх уладальнікаў. Трэба сказаць, што крытыка-бібліяграфічныя, публіцыстычныя, мемуарныя, эпісталярныя і іншыя дакументы – сведкі эпохі, якія захоўваюцца як у беларускіх, так і замежных архівах, у рукапісных фондах бібліятэк, патрабуюць далейшага і больш глыбокага вывучэння.

Асаблівую каштоўнасць для нашага даследавання ўяўляюць самі мінскія кніжныя выданні 1795–1917 гг. Знаёмства са зместам прадмоў і непасрэдна з тэкстам дало магчымасць выявіць іх тэматыку, функцыі і крыніцазнаўчую каштоўнасць. Некаторыя мінскія выданні, у якіх змяшчалася інфармацыя бібліяграфічнага характару, паслужылі важкай крыніцай для далейшых пошукаў і знаходак. Храналагічны бібліяграфічны паказальнік "Мінскія выданні 1622–1917 гг.", які складае другую частку нашай манаграфіі, паслужыць пэўным дапаўненнем вядомых бібліяграфічных крыніц. Уключаныя мінскія выданні за 1622 г. (адно), 1790–1794 гг. (18), 1795–1917 гг. (3112) – цалкам 3131 бібліяграфічны запіс – гэта каля 600 не ўлічаных у беларускай бібліяграфіі кніжных выданняў, з якіх больш за 400 адлюстроўваюць раней невядомыя кніжныя выданні і ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.

Таксама нельга не адзначыць, што грунтоўнай асновай для тэарэтычнага асэнсавання тэмы нашага даследавання сталі працы расійскіх, польскіх і беларускіх вучоных у галіне кнігазнаўства. У першую чаргу неабходнай базай навуковага інструментарыя з'яўляецца назапашаны тэарэтычны вопыт у галіне рэгіянальнага кнігазнаўства – гэта важкія метадалагічныя распрацоўкі А. С. Мыльнікава[120], А. А. Грачыхіна[121], Б. Бянькоўскай[122], М. В. Шабалiной[123], А. М. Маславай[124] і інш., якія абгрунтавалі неабходнасць і эфектыўнасць прымянення рэгіянальнага падыходу ў кнігазнаўстве, бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве. Прапаноўваючы выкарыстанне менавіта сістэмна-рэгіянальнага падыходу, А. С. Мыльнікаў, да прыкладу, звяртаў увагу на тое, што дадзеная

[120] *Мыльников А. С.* О культурно-исторических аспектах регионального книговедения // Книга. Исследования и материалы. 1992. Сб. 64. С. 12–13; *Его же.* О советской концепции всеобщей истории книги // Там же. Сб. 50. С. 131.

[121] *Гречихин А. А.* Региональный аспект развития государственной системы НТИ // Региональные аспекты информационно-культурологической деятельности : тез. докл. Междунар. науч. конф., Краснодар–Новосибирск, 16–18 сент. 1998 г. Краснодар : Краснодар. гос. акад. культуры и искусств, 1998. С. 44–46.

[122] *Bieńkowska B.* Badania regionalne w historiografii książki // Studia o książce: Międzyuczelniane zeszyty naukowe resortu nauki i szkolnictwa wyższego. Wrocław [etc.] : Zakład Narodowy im. Ossolińskich ; Wyd-wo PAN, 1988. T. 17. S. 17–33.

[123] *Шабалина М. В.* Книговедение: опыт региональных изысканий : учеб.-метод. пособие. Москва : Либерея-Бибинформ, 2006. 160 с. (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 50).

[124] *Маслова А. Н.* Краеведение и библиотека : избр. статьи. Санкт-Петербург : Профессия, 2010. 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадалогія патрабуе сукупнага разгляду грамадскіх, гнасеалагічных і асобасных фактараў, якія забяспечваюць сістэмнае адзінства даследуемых катэгорый культуры, і разгляду іх як сістэмы ў межах пэўнага рэгіёна[125]. Гэта, у сваю чаргу, прадвызначае храналагічны і прасторавы зрэз аналізуемай з'явы культуры (яе аналіз у маштабе асобнага рэгіёна ў пэўную эпоху ў межах краіны ці групы краін), а сёння і з улікам ужо існуючых распрацовак у галіне кніжнай культуры[126]. Канцэптуальныя падыходы і распрацоўкі ў галіне рэгіянальнага кнігазнаўства І. І. Фраловай[127] і Б. Бянькоўскай[128] дазволілі вызначыць ролю і значэнне даследаванняў лакальнага ахопу. Метадалагічныя кірункі і погляды С. П. Амілянчука[129], І. Я. Барэнбаума[130], А. І. Барсука[131], А. А. Белавіцкай[132], М. П. Ельнікава[133], К. Міганя[134], І. Г. Маргенштэрна[135], Г. М. Швяцовай-Водкі[136] і

---

125 *Мыльников А. С.* О культурно-исторических аспектах регионального книговедения. С. 12–13.

126 *Мігань К.* Кніжная культура – спроба акрэслення паняцця як навуковай катэгорыі / пер. з пол. Ларысы Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац / склад. Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. Мінск : БДУКМ, 2011. Вып. 3. С. 17–39.

127 *Фролова И. И.* Заключение // Книга в России. 1861–1881 : в 3 т. Москва : Книга, 1991. Т. 3. С. 128–133; *Ее же.* Проблемы провинциальной книги в контексте исследования общероссийской истории книжного дела (На материале второй половины XIX – начала XX в.) // Книга. Исследования и материалы. 1995. Сб. 71. С. 205–213; *Фролова И. И., Шпак А. П.* Перспективы исследования истории книжного дела в русской провинции во второй половине XIX – начале XX в. // Книжное дело в России во второй половине XIX – начале XX в. Ленинград : ГПБ, 1990. Вып. 5. С. 140.

128 *Bieńkowska B.* Badania regionalne w historiografii książki. S. 17–33.

129 *Омилянчук С. П.* О некоторых нетрадиционных методах современной теории общего книговедения // Книга в меняющемся мире : Седьмая науч. конф. по проблемам книговедения. Секция теоретических проблем книговедения : тез докл. / РАН ; Совет по истории мировой культуры. Москва : ВКП, 1992. С. 21–23; *Его же.* Типология в системе науки о книге // Книговедение и его задачи в свете актуальных проблем советского книжного дела : Вторая Всесоюз. науч. конф. по проблемам книговедения : тез. докл. / АН СССР, Науч. совет по истории мировой культуры ; Гос. б-ка СССР; Всесоюз. кн. палата. Москва : ГБЛ СССР, 1974. С. 64–76.

130 *Баренбаум И. Е.*: 1) Книговедение в системе наук // Книга. Исследования и материалы. 1985. Сб. 50. – С. 72–83; 2) Книжные связи как фактор международного и межнационального культурного общения (Историография. Источники. Проблематика) // Там же. 1994. Сб. 69. С. 18–26; 3) Соотношение теории, истории, методики и практики книжного дела (Историко-прогностический обзор) // Там же. 1994. Сб. 68. С. 5–18.

131 *Баренбаум И. Е., Барсук А. И.* К вопросу о методах книговедческих дисциплин // Книга. Исследования и материалы. 1974. Сб. 29. С. 20–45.

132 *Беловицкая А. А.* Книговедение. Общее книговедение : учеб. / Моск. гос. ун-т печати. Москва : МГУП, 2007. 393 с.

133 *Ельников М. П.* Методология книговедения (Предпосылки формирования) // Книга. Исследования и материалы. 1993. Сб. 66. С. 39–62; *Его же.* Познание книги как системы: (Методол. аппарат) // Книга в меняющемся мире : Седьмая науч. конф. по проблемам книговедения. С. 13–14.

134 *Мигонь К.* 1) Наука о книге. Очерк проблематики : пер. с пол. Москва : Книга, 1991. 198 с.; 2) Nauka o książce. Zarys problematyki. – Wrocław [ect.] : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1984. 320 s.; 3) Национальная (этническая) книга в Европе конца XIX – начала XX века // Knygotyra. – Vilnius, 2009. – T. 52. – P. 186–196.

135 *Моргенштерн И. Г.*: 1) Книга в информационном обществе: (Особенности функционирования) // Книга в меняющемся мире : Седьмая науч. конф. по проблемам книговедения. С. 16–18; 2) Книжное дело в единстве – главный объект книговедения // Книга. Исследования и материалы. 1982. Сб. 44. С. 5–27; 3) Проблемы типологии современной книги // Там же. 1975. Сб. 30. С. 38–54.

136 *Швецова-Водка Г. Н.*: 1) Книга и документ: соотношение понятий // Книга. Исследования и материалы. 1994. Сб. 68. С. 19-37; 2) Книговедческая типология литературы в свете теории общественного сознания // Современные проблемы книговедения, книжной торговли и пропаганды

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

іншых прадстаўнікоў сістэмна-тыпалагічнага і функцыянальнага падыходаў у кнігазнаўстве былі ўзяты за аснову ў вызначэнні падставовых тэрміналагічных паняццяў. Пэўны разнабой у трактаванні агульнатэарэтычных асноў тыпалогіі ў кнігазнаўстве быў зняты дзякуючы даследаванням Э. В. Гольцавай[137] і А. А. Грачыхіна[138], погляды якіх сталі асновай для выбару тыпалагічных прыкмет пры характарыстыцы галінова-тэматычнага і відавога складу мінскіх выданняў, а таксама замацаванай у сучасных стандартах[139] тэрміналогіі. Прыватныя распрацоўкі ў галіне перыядызацыі гісторыі кнігі і тыпалогіі кнігавыдавецтваў В. І. Харламава[140], тыпалогіі кніжных сувязяў Д. А. Эльяшэвіча[141] і тыпалогіі рэлігійнай кнігі Т. А. Самайлюк[142] паслужылі аўтарытэтнай базай у вызначэнні асноўных кірункаў тэарэтычнага даследавання па тэме.

У сукупнасці паказаныя ў кантэксце разнастайных канцэптуальных падыходаў крыніцы – значная навуковая падстава, якая дазваляе паказаць стан і развіццё кніжнай справы Мінска ў канцы XVIII – пачатку XX ст., раскрыць тыпалагічны склад і змест кніжнага рэпертуару, вызначыць месца і ролю кнігі ў грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

книги. Москва : Моск. полигр. ин-т, 1987. Вып. 4. С. 27–35; 3) Типология книги // Книга. Исследования и материалы. 1983. Сб. 46. С. 40–59; 4) Функциональная сущность и свойства книги // Там же. 1995. Сб. 71. С. 69–96.

137 Типология изданий / В. С. Агриколянский [и др.] ; рук. авт. кол. Э. В. Гольцева. Москва : Кн. палата, 1990. 231 с.

138 *Гречихин А. А.*: 1) Библиотипология как научное направление: Особенности становления и развития в российском книговедении : моногр. Москва : МГУП, 2004. 432 с.; 2) Проблема критерия в современной типологии книги // Книга. Исследования и материалы. 1987. Сб. 54. С. 50–73; 3) Современные проблемы типологии книги. Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1989. 254 с.; 4) Типологическая модель русской книги на начальном этапе ее развития // Проблемы рукописной и печатной книги. Москва : Наука, 1976. С. 25–52.

139 Выданні. Асноўныя віды. Тэрміны і азначэнні : СТБ ГОСТ 7.60-2005 = Издания. Основные виды. Термины и определения : выданне афіцыйнае (ГОСТ 7.60-2003, IDT). Уведз. 20.01.05. Мінск : Дзяржстандарт, 2005. 54 с.

140 *Харламов В. И.* О некоторых дискуссионных вопросах историко-книжной науки (Объект. Категории. Междисциплинарные связи. Периодизация. Методы) // Книга. Исследования и материалы. 1989. Сб. 58. С. 89–103.

141 *Эльяшевич Д. А.* Теория и типология книжных связей : автореф. дис. … канд. филол. наук / Ленингр. гос. ин-т культуры. Ленинград, 1988. 16 с.

142 *Самайлюк Т. А.* Да пытання тыпалогіі рэлігійнай кнігі // Матэрыялы Першых кнігазнаўчых чытанняў (Мінск, 15 верас. 1998 г.) / склад. Т. І. Рошчына. Мінск : НББ, 2000. С. 35–39.

# Частка I

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Кнігавыдавецкая дзейнасць**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Перыядызацыя мінскага кнігавыдання

Пад мінскім кнігавыданнем мы будзем разумець мясцовую гарадскую грамадскую дзейнасць, накіраваную на падрыхтоўку і выпуск кніг, брашур і некаторых іншых відаў неперыядычных выданняў, у іх ліку серыяльных выданняў, выданняў, што прадаўжаюцца (напрыклад, календары, памятныя кнігі і інш.), а таксама нотных выданняў, якія друкаваліся ў форме кніг і брашур (кніжных выданняў).

Мінскае кнігавыданне з яго першых крокаў, а гэта, па звестках даследчыкаў, XVII – XVIII стст., і да актыўнай дзейнасці ў XIX – пачатку XX ст. застаецца яшчэ даволі адносна вывучанай і асветленай з’явай, асабліва што да перыяду зараджэння мінскага кнігадрукавання. Прэтэндэнтамі на ролю пачынальнікаў мінскага кнігадрукавання з’яўляюцца ўніяцкая друкарня пры Свята-Духавым мужчынскім кляштары (магчыма, дзейнічала на пачатку[143] ці ў другой палове XVII ст.[144]) і друкарня праваслаўнага брацтва пры манастыры Святых Пятра і Паўла (магчыма, існавала ў 20–30-я гг. XVII ст.[145]).

Найбольш верагоднай, пакуль, выглядае гіпотэза пра дзейнасць у Мінску на пачатку XVII ст. рухомай друкарні *Паўла Люткові ча (Дамжыва Лютковіча-Целіцы)* († каля 1634 г.), іераманаха, ігумена розных манастыроў (у Беларусі і Украіне), сябра Віленскага і аднаго з арганізатараў Мінскага праваслаўнага брацтва, вандроўнага друкара-выдаўца, пісьменніка[146].

Патрэбы ва ўласным кнігавыданні ў Мінску на пачатку XVII ст. былі ў значнай ступені звязаны з сацыяльна-палітычнымі і рэлігійнымі фактарамі. У 1565–1569 гг. завяршаецца фарміраванне Менскага ваяводства і горад становіцца яго цэнтрам, значнай адміністрацыйнай адзінкай Вялікага Княства Літоўскага. Не-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

143 *Николай, архимандрит.* Историко-статистическое описание Минской епархии. Санкт-Петербург : Тип. духов. ж. “Странник”, 1864. С. 94; *Дзянісаў У. М.* Комплекс базыльянскіх манастыроў у Мінску // Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці : зб. арт. / АН БССР, Ін-т мастацтвазн., этнагр. і фальклору ; рэд. С. В. Марцэлеў. Мінск : Навука і тэхніка, 1984. С. 118–126. Таксама: *Яго ж.* Мінск (Менск). Царква Святога Духа [Электронны рэсурс]. URL: http://www.radzima.org/be/minsk/7084.html.

144 *Лісейчыкаў Д.* Уніяцкія парафіі Мінска ў XVII–XIX стст. // Нашыя святыні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвеч. 500-годдзю Мінск. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўс. архідыяцэзіі, 220-годдзю Мінск. дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрв. 2008 г. / Польскі Ін-т у Мінску ; рэдкал.: Т. Кандрусевіч [і інш.]; навук. рэд. Т. Кандрусевіч, А. І. Мальдзіс і М. Каламайска. Мінск : Выд. В. Хурсік, 2009. С. 138–150. Таксама: http://www.arche.by/by/page/science/15117.

145 Триста лет в православии: (Исторический очерк трехсотлетия существования Минского Екатерининского собора) / сост. П. Афонский. Минск : Электротип. С. А. Некрасова, 1913. С. 24.

146 *Колосова В. П.* Иван Вышенский и Павел Домжив-Люткович // Федоровские чтения, 1979. Москва : Наука, 1982. С. 24–34; *Ее же.* Новые данные к биографии Павла Домжив-Лютковича // Федоровские чтения, 1982. Москва : Наука, 1987. С. 115–121; *Огієнко І. І.* Історія українського друкарства. Київ : Либідь, 1994. С. 172–175, 233–245; *Доўнар Л. І.* Павел Дамжыў-Лютковіч і пачаткі кнігавыдання ў Мінску // Матэрыялы X Міжнар. кнігазнаўчых чытанняў “Кніжная культура Беларусі XVI – XVII ст.: да 440-годдзя выдавецкай дзейнасці Мамонічаў” (Мінск, 17–18 крас. 2014 г.) / НББ ; склад. Г. У. Кірэева, Т. А. Сапега, А. А. Суша. Мінск, 2014. С. 193–199.

абходнасць у друкаваным слове ўзмацнялася і ў выніку рэлігійнага змагання, якое распачалося пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. паміж праваслаўнымі і ўніятамі.

Асяродкам супрацьдзеяння ўніі ў горадзе стаў праваслаўны манастыр Святых Пятра і Паўла. Першы ігумен Петра-Паўлаўскага манастыра – Павел Лютковіч[147], паводле ўкраінскіх даследчыкаў, паходзіў «із села Лютків (нині Монастирського району Львівської області), а його предки належали до вигнаних з Чехії Фердинандом І Габсбургом переселенців, які не захотіли змінити "старослов'янський обряд"»[148]. Прыкладна ў канцы XVI – першыя гады XVII ст. адбыўся пострыг Дамжыва Лютковіча-Целіцы ў манахі Кіева-Пячорскай лаўры. З Свята-Духавым манастыром пры Віленскім праваслаўным брацтве звязана яго дзейнасць як актыўнага ўдзельніка антыўніяцкага руху. У 1609 г. ён быў пасланы ад брацтва на сейм у Варшаву, арганізоўваў акцыі супраць епіскапа Іпація Пацея ў Навагрудку[149]. Важным сродкам барацьбы стала і друкаванае слова, да прадукавання якога Павел таксама далучаецца ў Вільні. У 1610 г. разам з Лявонціем Карповічам ён выпусціў палемічны і самы рэзанансны ў той час твор Мялеція Смятрыцкага на польскай мове "Трэнас, альбо Лямант усходняй царквы" (плач) – "Θρηνος to iest Lament iedyney S. powszechney apostolskiey Wschodniey Cerkwie", дзе ад імя праваслаўнай маці-царквы, якая сімвалізавала прыгнечаную радзіму, аўтар заклікаў беларускі і ўкраінскі народы да аб'яднання супраць каталіцкай экспансіі. У адказ кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт ІІІ выдаў загад аб канфіскацыі друкарні і арышце выдаўцоў[150]. На два гады трапіў за краты Лявонцій Карповіч, друкарня была перанесена ў Еўе, пакінуў Вільню і Павел[151]. Акрамя рэдакцыйна-літаратурнай дзейнасці ў еўінскай друкарні, па даручэнні Віленскага Свята-Духава брацтва ў 1611–1617 гг. ён займаецца арганізацыяй дзейнасці філіі брацтва ў Мінску, будаўніцтвам Петра-Паўлаўскага манастыра, а з 1613 г. па 1617 г. з'яўляецца яго ігуменам.

Цікава, што адным з уплывовых фундатараў-заснавальнікаў праваслаўнага манастыра і брацтва ў Мінску быў князь Багдан Мацвеевіч Агінскі[152], у маёнтку якога ў Еўі працавала друкарня віленскага Свята-Духава манастыра. Дзякуючы заможным апекунам праваслаўнае брацтва Іаана Хрысціцеля, заснаванае пры Петра-Паўлаўскім манастыры, як адзначаюць гісторыкі, ужо ў 1613 г. "дабілася дазволу ўлад аднавіць дзейнасць у горадзе праваслаўнай 3-класнай школы (аднačасова былі адкрыты друкарня і шпіталь)"[153]. Непасрэдным кіраўніком школы з'яўляўся ігумен, а на той час – гэта Павел Лютковіч.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

[147] *Николай, архимандрит.* Историко-статистическое описание Минской епархии. С. 86.

[148] *Колосова В. П.* Иван Вышенский и Павел Домжив-Люткович. С. 24–34; *Ее же.* Новые данные к биографии Павла Домжив-Лютковича. С. 115–121

[149] *Николай, архимандрит.* Историко-статистическое описание Минской епархии. С. 30.

[150] *Колосова В. П.* Новые данные к биографии Павла Домжив-Лютковича. С. 116–117.

[151] *Кралюк П.* Книга – путь к спасению. Первопечатник Павел-Домжив-Люткович-Телица и его сподвижник Сильвестр [Электронны рэсурс]. URL: http://www.day.kiev.ua/ru/article/istoriya-i-ya/kniga-put-ko-spaseniyu.

[152] *Ісаєвич Я.* Українське книговидання: витоки, розвиток, проблеми. С. 202.

[153] *Самусік А. Ф.* Мінскія брацкія школы як атрыбут сістэмы гарадскога самакіравання // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права) :

Той факт, што Павел Люткові́ч у 1618 г. пачаў самастойную выдавецкую дзейнасць, заснаваўшы ўласны друкарскі варштат, з якім ён і яго паплечнік іерадыякан Сільвестр вандравалі па Украіне і па/праз Беларусь, хоць і не вырашае адназначна пытанне, але не выключае таго, што першапачатковым месцам іх працы, ці правільней – працягам пасля Вільні і Еўя, мог быць менавіта Петра-Паўлаўскі манастыр у Мінску. Калі дапусціць, што абсталяванне для друку было набыта ў Еўі (ці Вільні), а на ўкраінскія землі, “певне, до Угорців Люткович приїхав вже з готовою друкарнею”[154], то верагоднай выглядае іх прысутнасць з друкарняй у Мінску прыкладна з 1613 г. да 1617 г. Аднак, як відаць, у горадзе склаліся неспрыяльныя ўмовы для друкароў[155]: з аднаго боку, узмацняецца ціск уніятаў на праваслаўных, з іншага – неабходны былі сродкі на друкарскую дзейнасць.

Мінскія ўніяты, заснаваўшы кляштар і адкрыўшы “тэалагічную ўстанову ў Мінску” (каля 1615 г.)[156], якая ў хуткім часе стала пераўзыходзіць нават Троіцкую семінарыю ў Вільні, таксама маглі мець уласную друкарню ці ў той самы час – у 1616 г.[157], ці пазней – каля 1650 г., пасля ажыццяўлення пастановы 4-й кангрэгацыі базыльянскага ордэна (1626 г.) аб заснаванні ў Мінску адмысловай уніяцкай духоўнай семінарыі[158]. Як сцвярджае Дзмітры Лісейчыкаў, “… у сярэдзіне XVII ст. тут [у Мінску] існавала некалькі парафіяльных цэркваў і кляштараў, працавала духоўная семінарыя, дзейнічала друкарня”[159]. Праўда, базыльянскіх выданняў XVII ст., якія маглі быць надрукаваны ў Мінску, да гэтага часу не выяўлена.

Захавалася толькі “Казанне на памінанні па спачыўшым яго міласці пане Аляксандры Фёдаравічы Шэптыцкім”[160] – “Казанье на чиненю памяти по зешлом его милости пану Александрови Федоровичу Шептицком, през отца Павла Домжива Лютковича игумена менского отправованое месяца декабря 20 в року 1622”[161], якое было надрукавана ў Мінску, магчыма, падчас другога прыезду ігумена ў горад.

матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4–5 верас. 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2010. С. 30.

154 *Огієнко І. І.* Історія українського друкарства. С. 173.

155 Пра што сведчыць, да прыкладу, “скарга іераманаха Паўла (Дамжывы) на мяшчанаў м. Менска за выгнаньне з манастыра Пятра і Паўла і абрабаваньне царквы” ў Слонімскі гродскі суд ад 30 студзеня 1614 г. – дакумент апублікаваны Вольгай Бабковай у часопісе “Праваслаўе” (1996. № 4. С. 65–66).

156 *Марозава С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / пад навук. рэд. У. М. Конана ; Гродзен. дзярж. ун-т імя Я. Купалы. Гродна : ГрДУ, 2001. С. 91.

157 “Захаваліся звесткі аб манастырскай друкарні пачатку XVII ст. Відавочна, яна доўга не функцыянавала …” (*Дзянісаў У. М.* Комплекс базыльянскіх манастыроў у Мінску. С. 125).

158 Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленскаго учебнаго округа. Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1900. Т. 12. С. 31.

159 *Лісейчыкаў Д.* Уніяцкія парафіі Мінска ў XVII–XIX стст. // Нашыя святыні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысв. 500-годдзю Мінск. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўс. архідыяцэзіі, 220-годдзю Мінск. дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрв. 2008 г. / Польскі Ін-т у Мінску ; рэдкал. Т. Кандрусевіч [і інш.] ; навук. рэд. Т. Кандрусевіч, А. І. Мальдзіс, М. Каламайска. Мінск : Выд. В. Хурсік, 2009. С. 146–147. Таксама гл.: URL: http://www.arche.by/by/page/science/15117.

160 Пераклад паводле: *Нікалаеў М. В.* Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. 2009. С. 233.

161 Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. С. 96.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З прац украінскіх даследчыкаў вынікае, што Павел Люткові са сваёй рухомай друкарняй у 1618–1620 гг. па запрашэнні Аляксандра Шаптыцкага працаваў на Львоўшчыне (в. Угорцы), дзе выдаў тры кнігі[162]. У канцы 1621 г., пасля смерці фундатара А. Ф. Шаптыцкага, ён разам з Сільвестрам вяртаецца ў Мінск[163]. У гэты час ігуменам Петра-Паўлаўскага манастыра з'яўляўся Гедэон[164], але, магчыма, узнікшыя праблемы па завяршэнні будаўніцтва манастыра з-за супрацьдзеяння ўніятаў патрабавалі падтрымкі і яе мог аказаць Павел Люткові ці ён сам таксама шукаў падтрымкі сваёй выдавецкай справе. Праўда, ёсць і зафіксаваная версія прычыны ад'езду друкароў з Угорцаў – гэта татарскі напад. Змешчана ўласна друкарамі ў выданні "Казання" 1622 г.[165]

Мінск, аднак, у чарговы раз не паспрыяў сталай выдавецкай дзейнасці Паўла Лютковіча – тут усё большую сілу набіраў уніяцкі рух. Таму ізноў праваслаўныя друкары вымушаны былі шукаць іншы прытулак, якім становіцца Валынь, дзе ў 1625–1629 гг. Павел Люткові і Сільвестр выпусцілі наступныя пяць выданняў: пры падтрымцы Грыгорыя Святаполк-Чацвярцінскага (у в. Чацвяртня[166] і ў Луцку[167]) і Адама Урсул-Рудзецкага (у в. Чорная[168]). Павел Люткові з'яўляўся не толькі выдаўцом, але і аўтарам некаторых палемічных твораў, прадмоў, вершаў на гербы асоб, якім прысвячаліся тыя выданні. З 1628 г. выконваў абавязкі ігумена новазаснаванага манастыра ў в. Чорная, займаўся таксама настаўніцкай дзейнасцю у школе Луцкага праваслаўнага брацтва, куды пасля яго смерці і трапіў друкарскі варштат. З дзевяці вядомых надрукаваных Паўлам Лютковічам кніг, сем дайшлі да нашага часу[169], сярод іх – "менскае" "Казанне", якое сёння захоўваецца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве[170].

Складальнікі "Собрания древних грамот и актов Минской губернии" (1848) пацвярджаюць існаванне друкарні ў Мінску пры манастыры Пятра і Паўла[171] каралеўскім прывілеем ад 18 сакавіка 1633 г. "братству Менскому церкви Светых Апостол Петра и Павла <…> з подписом руки Нашое до которого и печат

---

[162] Гл. працы Я. Ісаевіча і І. Агіенкі.

[163] *Кралюк П.* Книга – путь к спасению. Первопечатник Павел-Домжив-Люткович-Телица и его сподвижник Сильвестр [Электронны рэсурс]. URL: // http://www.day.kiev.ua/ru/article/istoriya-i-ya/kniga-put-ko-spaseniyu.

[164] Собрание древних грамот и актов Минской губернии, православных монастырей и по разным предметам. Минск : Губ. тип., 1848. № 51. С. 87–88.

[165] *Ісаєвич Я.* Українське книговидання: витоки, розвиток, проблеми. С. 203.

[166] "Псалтырь" (1625).

[167] "Плач по свято умершему… Иоанну Васильевичу пресвитеру" (1628) – паэтычны зборнік; "Эпидикион, или Стихи скорбные на погребение Василисы Яцкивны" Сцяпана Палумеркавіча (1628) – вершы.

[168] "Часослов" (1629), "Диалог, или Разговор человека больного или умирающего ли со своим духом" (1629) – пераклад [Паўла Дамжыва Лютковіча?] з польскай мовы твора каталіцкага ксяндза Станіслава Рэшкі.

[169] *Огієнко І. І.* Історія українського друкарства. С. 244.

[170] Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. С. 96.

[171] Собрание древних грамот и актов Минской губернии, православных монастырей и по разным предметам. С. XII.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нашу великого Князства Литовского привесит велели <…> дан в Кракове на Сейме валном Коронации Нашои року тысеча шестсот тридцат третего месеца марца осьмнадцатого дня <…> Vladislaus Rex <…> до книг кгродских вечистых Воеводства Менского ест актыкован и уписан (Из Книги Минского Гродского Суда за 1650 год)"[172]. Паводле прывілея, дазвалялася "школы для науки людеи хрестиянских и деток их будовати <…> До того друкарню для друкованя вшеляких книг и захованя в них людей годных як духовных так светских позволено"[173]. Праўда, на думку польскіх даследчыкаў, "być może, było to automatyczne powtórzenie z przywileju wileńskiego i bractwo wcale nie zamyślało o uruchomieniu warsztatu"[174]. Па-свойму "расчытаў" прыведзены тэкст з граматы архімандрыт Мікалай: "В 1650 г. король Владислав VI дал свою привилегию братству, училищу, типографии и гошпиталю Минского Петро-Павловского монастыря. Печатались ли какие именно книги в этой типографии – это также неизвестно (Собр. М. Гр. гр. 62 и 123)"[175]. І да сёння невядомы ні самі мінскія выданні гэтага часу, ні іншыя архіўныя звесткі адносна дзейнасці друкарні Мінскага праваслаўнага брацтва нават як філіі Віленскага. Мінскія братчыкі, тым не менш, маглі падтрымліваць выданне пэўных твораў Віленскага брацтва (як у Вільні, так і ў Еўі), карысталіся іх прадукцыяй (напрыклад, для брацкай школы)[176]. Верагодна, што і друк "Казання" 1622 г. мінскага ігумена Паўла Лютковіча таксама мог быць падтрыманы брацтвам і яго фундатарамі.

Да пачатку XVIII ст. адносіцца яшчэ адна выдавецкая ініцыятыва, якая была выказана і нават абгрунтавана мінскай інтэлігенцыяй у 1707 г., – гэта неабходнасць мясцовага друку (газеты) і распаўсюджвання праз пошту бясплатных перыядычных выданняў[177]. Ініцыятыва, аднак, не была ажыццёўлена, бо падчас працяглай Паўночнай вайны (1700–1721) хоць і абвастрылася такая патрэба зносін, але яе рэалізацыя, відаць, аказалася не простай справай.

З іншага боку, магчыма, дадзеная ініцыятыва ўзнікла "не на пустым месцы" і пад ўвагу мог брацца ўжо існуючы ў горадзе друкарскі варштат? Ды і звесткі аб пачатку дзейнасці *друкарні ордэна базыльянаў* аўтары артыкула пра Мінск у "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" таксама адносяць цалкам, без усялякіх удакладненняў, да XVII ст.[178] Аднак у вядомых бібліяграфічных працах выданні мінскай друкарні ордэна базыльянаў зафіксаваны толькі як выданні XVIII ст. Агульныя звесткі аб выдавецкай прадукцыі базыльянскіх друкарняў у Вільні, Супраслі, Мінску, Львове, Пачаеве датуюцца 1628–1800 гг. – гэта ўсяго 1080 кніг, якія выходзілі ў асноўным на польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай мовах, 40 % – свецкая літаратура[179].

---

172 Тамсама. С. 257–258.

173 Тамсама. С. 256.

174 Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. Zesz. 5: Wielkie Księstwo Litewskie / Kawecka-Gryczowa A., Korotajowa K., Krajewski W. Wrocław ; Kraków : Ossolineum, 1959. S. 168.

175 *Николай, архимандрит.* Историко-статистическое описание Минской епархии. С. 30

176 *Галенчанка Г. Я.* Старадрукаваныя кірылічныя кнігі 16–18 стст. // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. С. 17.

177 *Слука А. Г.* Беларуская журналістыка : вучэб. дапам. : у 3 ч. Мінск : Выд-ва БДУ, 2000. Ч. 1. С. 60.

178 Мінск // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1999. Т. 5. С. 152.

179 *Пазднякоў В.* Базыльяне // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. Мінск : БелЭн, 2005. Т. 1. С. 279.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паводле К. Эстрайхера, сем мінскіх выданняў 1790–1791 гг. дакладна пазначаны ў бібліяграфічных запісах як друкі "Bazylianów" і яшчэ не менш як тры – 1790, 1792 і 1794 гг., – таксама ўлічаныя польскім бібліёграфам, пададзены без назвы друкарні ці выдаўца.

Спіс мінскіх выданняў пад тытулам "Друкарня базыльянаў (потым друкарня пры Губернскім праўленні)" прыведзены А. І. Мальдзісам, мае храналагічны ахоп у межах 1790–1799 гг. і налічвае ўсяго 15 назваў ці "14 пэўных пазіцый"[180]. М. Васілеўская дадае яшчэ тры апісанні за 1789, 1790, 1792 гг.[181]

Польская даследчыца М. Підлыпчак-Маяровіч адзначае дзейнасць друкарні ордэна базыльянаў у Мінску ў межах 1790–1793 гг. і прыводзіць толькі шэсць выданняў, улічаных К. Эстрайхерам[182]. Сем "прадуктаў" гэтай друкарні за 1790–1791 гг. налічыла Ё. Гетка, выказаўшы, аднак, думку[183], што працаваў базыльянскі варштат амаль да канца XVIII ст. У якасці аргумента служыць надрукаваная ў Мінску ў 1797 г. аповесць "Miłość na doświadczeniu", узноўленая з супрасльскага базыльянскага выдання 1786 г. Сапраўды, дадзенае выданне па сваім мастацкім афармленні вельмі нагадвае папярэднія выданні друкарні базыльян. Такім чынам, паводле Ё. Геткі, атрымліваецца 8 выданняў на польскай мове, якія выпусцілі мінскія базыльяне[184].

Аднак аўтар чамусьці не заўважае тры наступныя друкі: 1791 г. – "Bramin natchniony" Роберта Додслі ў перакладзе з англійскай мовы на польскую Францішка Букатага, "Mowa" Тадэвуша Абранпальскага; 1793 г. – "Rozmowa Sylli z Eukratesem", якія дакладна выйшлі ў базыльянскай друкарні ў Мінску і сёння захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве[185] (гл. ч. II: Каталог, а таксама ілюстрацыі*).

Па меркаванні ж У. Дзянісава[186], базыльянская друкарня, якая кароткі час існавала пры манастыры на пачатку XVII ст., паўторна ўзнавіла сваю працу толькі ў 1790 г. Тут даследчык спасылаецца на публікацыю 1864 г. па гісторыі Мінскай епархіі архімандрыта Мікалая, у працы якога чытаем параграф 71 пра "бывший Минский Св. Духов мужской монастырь": "В 1790 году Польский король Станислав Август дозволил учредить типографию при сем монастыре"[187]. Але ці быў гэта "спецыяльны ўказ на паўторную арганізацыю друкарні"?

---

[180] *Мальдзіс А. І.* Кнігадрукаванне Беларусі ў XVIII стагоддзі // Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Минск : ФБАН БССР, 1974. С. 144–145.

[181] *Василевская М. А.* Белоруссия в печати XVIII столетия : библиогр. указ. на иностр. яз. / редкол.: А. П. Грицкевич, А. И. Мальдис, З. А. Корень. Минск : ГБЛ БССР, 1985. 288 с.

[182] *Pidłypczak-Majerowicz M.* Bazylianie w Koronie i na Litwie: Szkoły i książkie w działalności zakonu / Warszawa ; Wrocław : Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1986. S. 219–220. (Akta Universitaties ; nr 779).

[183] У якасці гіпотэзы прыводзілася яшчэ А. І. Мальдзісам. "У 1790 г. убачыла свет першая прадукцыя мінскай друкарні (усяго 14 пэўных пазіцый). Спачатку яна належала ўніяцкаму ордэну базыліянаў, а потым, з 1793 г. ці 1797 г., – губернскаму праўленню" (*Мальдзіс А. І.* Кнігадрукаванне Беларусі ў XVIII стагоддзі. С. 133).

[184] *Getka J.* Polskojęzyczne druki bazyliańskie (XVIII wiek). S. 50–51, 271.

[185] Выяўлены паводле бібліяграфічных звестак навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

* Тут і далей у круглых дужках спасылкі на наша выданне – частку другую, дадаткі, ілюстрацыі.

[186] *Дзянісаў У. М.* Комплекс базыльянскіх манастыроў у Мінску. С. 125.

[187] *Николай, архимандрит.* Историко-статистическое описание Минской епархии. С. 94.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патрабуюць далейшага даследавання непасрэдныя “сведкі” з XVIII ст., асабліва самі друкаваныя выданні[188]. Пад пытаннем два з іх, што датуюцца 1786[189] і 1789[190] гг., але ці былі яны прадукцыяй мінскіх базыльян, ці не, магчыма, пакажа час. Адначасова гэтыя выданні маюць непасрэднае дачыненне да Мінска. Назва першага “Propositiones theologicæ ex Tractatibus…” сведчыць, што “Выбраныя тэзы па тэалогіі паводле трактатаў <…>, якія ў мінскім Канвенце падчас правінцыяльнай Капітулы Правінцыі Літоўскай ордэна кармелітаў Усіх святых публічна абараніў бр. Мікалай Вайткевіч, выпускнік Курсаў Св. Тэалогіі пры віленскім кляштары пад кіраўніцтвам а. Бенедыкта Рымкевіча, магістра Св. Тэалогіі і Яе ж прафесара”.

Другое выданне – гэта пераклад, выкананы вядомым пісьменнікам і філосафам з Міншчыны Ігнатам Быкоўскім з французскай на польскую мову, мастацкага твора Канстанта д’Арвіля “Ema y Lemozow”. Праўда, толькі ў адной бібліяграфічнай крыніцы, М. Васілеўскай[191], гэты твор аказаўся зафіксаваным як друк мінскі, але іншыя вядомыя нам крыніцы такога выдання аповесці “Ema y Lemozow” за 1789 г. не паказваюць. У 1787 г., як занатаваў сам І. Быкоўскі, “W Grodnie zaś <…> zostały wydrukowane dwie powieści przeze mnie podane, to jest Kokietka, czyli Przypadki Irysy, druga Ema i Lemozow. Powieść rosyjska”[192].

У ліку ранейшых датаваных выданняў мінскіх базыльян, якія не толькі дакладна ідэнтыфікуюцца паводле бібліяграфічных крыніц, але і фізічна захава-

---

[188] *Доўнар Л. І.* Выданне рэлігійных кніг у Мінску ў XIX – пачатку XX ст. // VIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 23–26 мая 2002 г.). Мінск: БДУК, 2003. С. 58–67.

[189] *Rymkiewicz, Benedictus.* Propositiones theologicæ ex Tractatibus De Virtutibus Theologicis, Ecclesia, Summo Pontifice, Conciliis, Authoritate Patrum, DEO uno, Trino, Incarnatione Verbi, Gratia, Vera Religione, Sacramentis in genere, Selectæ quas In Conventu Minscensi Sub tempus Capituli Provincialis Provinciæ Litvanæ Omnium Sanctorum Ordinis Carmelitarum A. R. O. Publice Defendendas suscepit Fr. Nicolaus Woytkiewicz S. Th. Cursor Studij Viln: Alumnus, cui præerit Pr. Benedictus Rymkiewicz S. Th. Mgr: Ejusdemque Professor. Anno Domini 1786. Die 17 Septemberis. 4°. Пер. з лат.: Рымкевіч Бенедыкт. Выбраныя тэзы па тэалогіі паводле трактатаў: Пра вартасці багаслоўя, пра Царкву, пра Найвышэйшага Пантыфіка, пра Саборы, пра аўтарытэт Айцоў, пра Адзінага Бога, пра Тройцу, пра Увасабленае Слова, пра Божую ласку, пра Сапраўдную веру, пра Таемствы ў цэлым, якія ў мінскім Канвенце пад час правінцыяльнай Капітулы Правінцыі Літоўскай ордэна кармелітаў Усіх святых публічна абараніў бр. Мікалай Вайткевіч, выпускнік Курсаў Св. Тэалогіі пры віленскім кляштары пад кіраўніцтвам а. Бенедыкта Рымкевіча, магістра Св. Тэалогіі і Яе ж прафесара. Бібліягр.: НДАК. BN. XVIII. 2.446.

[190] [*Contant d’Orville, André Guillaume*, 1730?–1800]. Ema y Lemozow : powieść rossyiska / przez Ign. Bykowskiego. [Mińsk, 1789]. Бібліягр.: Василевская. 1985. С. 211. № 1464; E. T. XIII. S. 478–479. Гл. таксама: http://www.estreicher.uj.edu.pl/staropolska; НДАК.

[191] У М. Васілеўскай аўтарства аповесці “Ema y Lemozow” пададзена пад прозвішчам Poisson (Пуасон), а гэта яшчэ адзін аўтар (Анжаліка дэ Гомез Пуасон, Gomez (de) Angelika Poisson, 1684–1770) і іншага твора – “Какетка” (“Kokietka czyli przypadki Irysy: powieść moralna”), які таксама перакладаўся І. Быкоўскім і неаднаразова друкаваўся ў 1787 г. у Гродне (як “Kobieta czyli przypadki Irysy: powieść moralna” і, магчыма, разам з аповесцю “Ema y Lemozow”), у 1788 г. – у Варшаве (як асобнае выданне, так і “на пару” з названым творам Канстанта д’Арвіля). Гл.: http://www.estreicher.uj.edu.pl/staropolska.

[192] Życie Ignacego Bykowskiego porucznika wojsk rosyjskich przez niego samego napisane w r. 1806 // Mikulski T. Ze studiów nad Oświecieniem : zagadnienia i fakty. Wrocław : Państwowy Instytut Wydawniczy, 1956. S. 489.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліся, гэта таксама творы Ігнацыя Быкоўскага, надрукаваныя ў 1790 г.: 1) пераклад з французскай мовы на польскую і адзінае мастацкае выданне мінскіх базыльян – "Batchmendy, powieść perska" (аўтар – Фларыян Жан-П'ер дэ Клары); 2) філасофскі твор на польскай і лацінскай мовах і адзіны, мінскі базыльянскі друк, са зместам якога можна пазнаёміцца ў Беларусі[193], – "Kwestya podana do rozwiązania, czyli Dusza bardziey bywa wzruszona przez roskosz; czyli też przez smutek?". Як можна даведацца з кароткай абвесткі, змешчанай у апошнім названым выданні, "… i inne dzieła tegoż Authora w krótce wyidą z Druku".

Магчыма, да такіх "dzieł" мінскіх базыльян можна было б аднесці яшчэ адно ідэнтыфікаванае выданне філасофскай тэматыкі, надрукаванае ў 1793 г., – "Rozmowa Sylli z Eukratesem"[194] , на тытуле якога было адзначана, што гэта пераклад з французскай мовы на польскую, але аўтар перакладу не названы. Не называе дадзены твор і сам І. Быкоўскі, пералічваючы свае ўласныя[195].

У выніку ж навукова-бібліяграфічных пошукаў удалося вызначыць месцазнаходжанне 9 выданняў мінскіх базыльян, два з якіх – "Rozgraniczenie normalne w W. X. Litewskim" (1791) і "Laudum Przeswietnego Wojewodztwa Mińskiego" (1792) – не маюць пазнакі месца друку і адрозніваюцца тэхнікай друку (напрыклад, больш дробным шрыфтам) ад астатняй кніжнай прадукцыі. Таму патрабуюць больш глыбокага вывучэння, як і 9 іншых выданняў, ідэнтыфікаваных толькі паводле бібліяграфічных крыніц.

Па сабраных (і папярэдніх) бібліяграфічных звестках аб выданнях мінскіх базыльянаў 1790–1794 гг., якіх налічваецца 18 назваў, складваецца наступная карціна: першынство належыць свецкай літаратуры, сярод якой афіцыйных выданняў – 11 назваў і гэта выданні, якія можна аднесці да галіны права; па асвеце і педагогіцы – тры, па філасофіі – два, па аднаму выданню прыпадае на мастацкую літаратуру і рэлігію; 16 з іх – на польскай мове, адно – на польскай і на латыні; адно – на рускай мове (гл. ч. II: Каталог).

У 1795 г., калі быў зачынены Свята-Духаўскі кляштар[196], дзе, відавочна, і размяшчалася базыльянская друкарня, яе абсталяванне перайшло губернскаму праўленню, і з гэтага часу пачалася ўжо дзейнасць Губернскай друкарні[197]. Першапачаткова выкарыстоўваліся менавіта старыя шрыфты і матэрыялы для мастацкага аздаблення выданняў, таму і складваецца ўражанне, што гэта маглі быць базыльянскія друкі, як названая "Miłość na doświadczeniu" (1797). Пазней, ў першай палове XIX ст., тыя самыя элементы – віньеткі, канцоўкі – можна знайсці ў друках і І. І. Стафановіча, былога тыпографа Мінскай губернскай друкарні.

Такім чынам, першы друкарска-выдавецкі вопыт Мінска ў XVII ст. і пад канец XVIII стст., у вытокаў якога знаходзяцца дзве хрысціянскія плыні – праваслаўныя і ўніяты, быў накіраваны пераважна на спраўджванне адпаведных рэлігійных і найболей афіцыйных замоваў, на патрэбы мінскай грамадскасці ў справе арганізацыі дзяржаўнага кіравання і асветы і быў, аднак, эпізадычным

193 У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі захоўваецца копія выдання.

194 Захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

195 Гл.: Życie Ignacego Bykowskiego porucznika wojsk rosyjskich przez niego samego napisane w r. 1806. S. 473–516.

196 *Лісейчыкаў Д.* Уніяцкія парафіі Мінска ў XVII–XIX стст. С. 140.

197 НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 98.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і нязначным. Адначасова гэты перыяд можа адпавядаць этапам зараджэння і станаўлення кнігавыдання ў горадзе.

Прыступаючы да разгляду гістарычнага перыяду – 1795–1917 гг., звернемся да абгрунтавання і характарыстыкі кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску ў азначаны час, вылучыўшы пэўныя этапы развіцця. Нельга не пагадзіцца з беларускім гісторыкам Генадзем Сагановічам, што "ўсялякі падзел гістарычнага часу адносны і ўмоўны, ён ідэйны, існуючы толькі ў галаве даследчыка, аднак дзяленне гэтае патрэбна для лепшага разумення мінулага", што нераўнамернасць і спецыфіка развіцця народаў і рэгіёнаў вымагае выпрацоўкі перыядызацыі як формулы іх гістарычнага шляху: "І задачай тут ёсць як мага больш тонкае вызначэнне яго храналагічных каардынатаў", каб гэта спрыяла, а не замінала разуменню[198]. Таму, прымяняючы комплексны крытэрый[199], у склад якога ўвайшлі галоўныя, асноўныя і спецыфічныя крытэрыі, паспрабуем паказаць асаблівасці другога перыяду – перыяду станаўлення і развіцця мінскага кнігавыдання і тым самым пацвердзіць прапануемую для яго перыядызацыю.

Галоўныя крытэрыі – гістарычныя – звязаны з вылучэннем перыяду 1795–1917 гг. у гісторыі Беларусі і развіцці яе культуры як гістарычнага перыяду Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. 1795-ы год з'яўляецца канцавой датай трох падзелаў Рэчы Паспалітай – з аднаго боку. З іншага – хоць Мінск і ўвайшоў у склад Расійскай імперыі ў 1793 г., аднак толькі ў 1795 г. у горадзе адкрываюцца намесніцкае праўленне, палаты, земскія суды, прыказ грамадскага апекавання, дваранская апека, губернскі і гарадавы магістраты і інш. У 1796 г. на тэрыторыі Беларусі была праведзена адміністрацыйная рэформа, у сувязі з якой утварылася Мінская губерня з губернскім цэнтрам у Мінску[200]. Як сведчаць некаторыя знойдзеныя намі архіўныя даныя, з 1795 г. пачалася кнігавыдавецкая дзейнасць Мінскай губернскай друкарні, якая была створана на аснове друкарні мінскіх базыльянаў[201]. Пацвярджаецца факт дзейнасці Губернскай друкарні не з 1797 г., як прынята лічыць[202], і яе выданнямі, першыя з якіх (на сёння) датуюцца 1795 г. (гл. ч. II: Каталог). Такім чынам, беручы пад увагу рэальны ход гістарычных падзей, якія прынеслі значныя змены ў жыццё горада, паўплывалі на яго адміністрацыйна-дзяржаўны статус і таксама на працэс кнігавыдання, пачаткам азначанага перыяду мы вылучаем 1795 г.

Асноўныя крытэрыі – сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурна-асветныя. Прымяненне сацыяльна-эканамічных крытэрыяў дазваляе паказаць рост насельніцтва і яго склад у Мінску, развіццё прамысловасці і эканомікі ад мяшчанска-купецкай да капіталістычнай, пераўтварэнне Мінска ў вядучы гандлёва-прамысловы і банкаўскі цэнтр; палітычных – уплыў рэвалюцыйных і ваенных падзей 1830-х гг., 1863–1864 гг., 1870–1880-х гг., 1905–1907 гг., 1914–

---

198 *Сагановіч Г.* У пошуках Сярэднявечча // Беларускі Гістарычны Агляд. Менск, 1997. Т. 4, сш. 1–2 (6–7). С. 3, 17.

199 *Доўнар Л. І.* Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917) : кнігазнаўчы аспект. С. 3.

200 Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. Мінск : Універсітэцкае, 1998. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. С. 264.

201 НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 98.

202 *Умецкая Я. С.* Мінская губернская друкарня // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1986. Т. 3. С. 561.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

1917 гг.; культурна-асветных – аб стане і развіцці культурна-асветных, адукацыйных устаноў і нацыянальна-этнічных супольнасцяў у горадзе, якія ўплывалі на патрэбы чытацкай аўдыторыі.

Спецыфічныя (кнігавыдавецкія) крытэрыі – гэта крытэрыі, якія дазваляюць непасрэдна разгледзець дзяржаўную палітыку ў галіне друку, структуру кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў, функцыянальныя асаблівасці і тэматыку кнігавыдавецкага рэпертуару, характэрныя асаблівасці кнігавыдання.

У выніку выкарыстання комплекснага крытэрыю правамерна вылучыць тры этапы мінскага кнігавыдання: першы – 1795–1864 гг., другі – 1865–1904, трэці – 1905–1917 гг.

Характарызуючы *першы этап, 1795–1864 гг.,* неабходна нагадаць пра сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя фактары, пад уздзеяннем якіх знаходзілася і кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску. У 1797 г. у Мінску налічвалася 5,8 тыс. жыхароў, што было ўсё ж меншай колькасцю ў адносінах да ўзроўню першай паловы XVII ст.[203] Аднак паступова Мінск становіцца адным з буйнейшых гарадоў Беларусі. Даволі дынамічна павялічвалася колькасць яго насельніцтва: у 1811 г. – 11,2 тыс. чалавек, у 1850 – 22,5 тыс.[204], у 1861 г. – 26,8 тыс. чал., што адпавядала, як адзначае гісторык М. В. Біч, тэндэнцыі росту гарадскога насельніцтва Беларусі на працягу першай паловы XIX ст., яе лічбы перавысілі нават паказчыкі Украіны і Расіі[205]. Хуткі рост гарадскога насельніцтва тлумачыцца пераважна не эканамічнымі, а палітычнымі фактарамі, найперш прымусовым высяленнем яўрэяў з вёсак і панскіх маёнткаў у гарады і мястэчкі. Што тычыцца этнічнага складу гарадскога насельніцтва Беларусі ў першай палове XIX ст., то гістарычныя крыніцы пра гэта не сведчаць. Аднак можна паказаць адносна поўныя звесткі аб канфесійным складзе гарадскога насельніцтва Мінскай губерні на канец XVIII – пачатак XIX ст.: яўрэі – 50,5 %, праваслаўныя – 38,4, уніяты – 5,4, каталікі – 4,8 %. У 1858 г. у Мінску засведчылі свае адносіны да веравызнання 11,9 тыс. яўрэяў, 6,9 тыс. католікаў, 3,5 тыс. праваслаўных і інш.

Гарадская мяшчанска-купецкая прамысловасць, якая ўяўляла сабой выключна ручную вытворчасць у форме рамяства, простай кааперацыі адзінкавых мануфактур, знаходзілася пад ціскам феадальна-прыгонніцкай сістэмы. “Велізарныя падаткі і павіннасці на карысць феадальна-прыгонніцкай дзяржавы амаль цалкам паглыналі прыбыткі нават заможнай часткі гараджан і даходы гарадоў”[206]. Гэта адмоўна адбівалася на сацыяльна-эканамічным развіцці гарадоў. І ўсё ж у сярэдзіне XIX ст. у гарадах Беларусі з’яўляюцца першыя фабрыкі, пачынае выкарыстоўвацца вольнанаёмная праца (да 45 % у 1860 г.), што сведчыла ўжо аб развіцці капіталістычных адносін[207].

У галіне асветы дзейнічалі ўстановы дзвюх розных сістэм: сістэма расійскіх школ, сістэма польскіх школаў, што засталася пасля Адукацыйнай камісіі, а таксама манастырскія ўніяцкія і каталіцкія навучальныя ўстановы. Можна было атрымаць адукацыю адпаведна на польскай, расійскай, яўрэйскай, фран-

203 Мінск // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1999. Т. 5. С. 152.

204 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1077. Арк. 109.

205 *Біч М. В.* Гісторыя Беларусі: Канец XVIII ст. – 1917 г. Мінск : Нар. асвета, 1993. С. 58

206 Тамсама. С. 63.

207 Тамсама. С. 55, 60.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цузскай і нямецкай мовах. У 1803–1804 гг. у Расіі пачалася рэформа ў сістэме адукацыі, якая ў Беларусі расцягнулася на многія гады[208].

Пасля стварэння Міністэрства народнай асветы Мінск увайшоў у склад Віленскай навучальнай акругі[209]. У гэты час у горадзе існавалі Мінская губернская гімназія, дваранскае пяцікласнае вучылішча, двухкласная прыходская школа, духоўнае вучылішча, Мінская духоўная семінарыя, Рыма-каталіцкая духоўная семінарыя, прыватны жаночы пансіён, школа для пачатковай адукацыі дзяўчынак, яўрэйскае казённае вучылішча, прыватная дзявочая школа. З 1847 г. у Мінску дзейнічала першая ў Расіі пачатковая школа для яўрэйскіх хлопчыкаў.

Ужо нават на пачатку XIX ст. (у 1812 г.) Мінск, паводле ўспамінаў некаторых сучаснікаў, "был лучшим после Вильны городом в белорусско-литовском крае; среди жителей было много интеллигентных семейств, одинаково свободно объяснявшихся как по-французски, так и по-немецки"[210].

У 1812 г. на польскай мове ў Мінску выходзіла першая "Tymczasowa gazeta Mińska" ("Часовая Мінская газета"), з 1838 г. – рускамоўная газета "Минские губернские ведомости", у 1863 г. выдаваўся першы мінскі рускамоўны часопіс "Фотографические иллюстрации". З 1788 г. у Мінску дзейнічаў прыватны тэатр, які ставіў спектаклі на польскай мове. У 1846 г. на яго аснове створаны гарадскі рускі тэатр. У 1840–1850-я гг. па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам В. Дуніна-Марцінкевіча нараджаўся беларускі нацыянальны тэатр. У 1830-я гг. у горадзе закладвалася першая публічная бібліятэка[211].

"У ліку палітычных рэформ, праведзеных царскімі ўладамі ў пачатку XIX ст., была рэформа друку і кнігавыдавецкай справы"[212]. Згодна з урадавымі загадамі ад 31 сакавіка 1801 г. і 9 лютага 1802 г. была, па сутнасці, скасавана кацярынінская забарона вольнага (прыватнага) друку, якая дзейнічала ў 1783–1796 гг., і было дазволена прыватнае кнігадрукаванне[213]. Цэнзура перадавалася ўніверсітэтам вучэбных акруг[214], а агульнае кіраўніцтва здзяйсняла Міністэрства народнай адукацыі. Адпаведна прынятаму ў 1804 г. статуту аб цэнзуры[215], на цэнзурныя камітэты ўніверсітэтаў ускладалася задача цэнзуравання кніг свецкага зместу. Гэта быў параўнальна ліберальны цэнзурны статут, які садзейнічаў стварэнню спрыяльных умоў для развіцця прыватнага кнігадрукавання. Так у Мінску ўзнікаюць першыя прыватныя друкарні: І. Лімы і С. Зымеля (у 1807 г.), З. Прэса (у 1818 г.), І. Стафановіча (у 1819 г.), Г. Бланштэйна (у 1832 г.), Ф. Фалька (у 1845 г.), Ё. Дворца (у 1850 г.), Э. Адамовіча (у 1855 г.). У прыватны кніга-

---

208 Тамсама. С. 78–79.

209 Асвета // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1993. Т. 1. С. 206.

210 *Краснянский В. Г.* Минский департамент Великого Княжества Литовского (эпизод из истории войны 1812 г.). Санкт-Петербург : Сенат. тип., 1902. С. 8.

211 *Миловидов А. И.* Судьба русской книги в Северо-Западном крае в связи с его культурной историей. С. 23.

212 *Умецкая Я. С.* Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. С. 275.

213 Полное Собрание Законов Российской Империи. Санкт-Петербург : Тип. II Отд. Собств. Его Импер. Велич. Канц., 1830. Т. 26. № 19807.

214 Тамсама. 1830. Т. 27. № 20597, § 30.

215 Сборник постановлений и распоряжений по цензуре с 1720 по 1862 год. Санкт-Петербург : Тип. Морского м-ва, 1862. С. 85–95.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдавецкі працэс уключаюцца таксама ўладальнікі мінскіх кнігарняў – браты Бейліны (у 1850-я гг.), А. Валіцкі (у 1859–1863 гг.); выдаўцы-аўтары – В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Чапялінькі.

У 1795–1864 гг. прыватныя прадпрыемствы былі асноўным тыпам кнігавыдавецтваў (70 %), якія займалі вядучае становішча ў мінскім кнігавыданні. Колькасць выдадзенай імі кніжнай прадукцыі склала 75 %. Поспехі прыватнага кнігадрукавання ў Мінску ў 1850–1860-х гг. засведчылі бóльшую канкурэнтаздольнасць прыватнага друку перад дзяржаўным. Кніжная прадукцыя, выдадзеная дзяржаўнымі выдавецтвамі (25 %), куды ўваходзілі Мінская губернская друкарня, Мінская гімназія і Мінскі губернскі статыстычны камітэт, склала 23 %. Мінская губернская друкарня, стаўшы фактычна пераемніцай друкарні ордэна базыльянаў, прадоўжыла ў горадзе кнігадрукаванне. З 1795 г. да 1807 г. яна была адзінай дзеючай у Мінску друкарняй, дзякуючы якой выйшлі ў свет першыя мінскія навуковыя, вучэбныя і літаратурна-мастацкія кнігі. На трэцім месцы быў грамадскі тып выдавецтваў (5 %), прадстаўлены Мінскім таварыствам дабрачыннасці, кнігавыдавецкая прадукцыя якога склала 2 %.

На першым этапе было выдадзена не менш як 234 найменні кніжнай прадукцыі: з іх 146 – на польскай мове, 21 – на рускай, 16 – на іўрыце, 2 – на беларускай, 2 – на латыні, 1 – на нямецкай, а таксама – на лацінскай і польскай мовах – 35, на польскай і рускай – 3, на беларускай і польскай – 3, на рускай, польскай, старабеларускай, лацінскай – 1, на нямецкай, рускай, польскай – 2, на польскай і царкоўнаславянскай – 1, на іўрыце і ідыш – 1. З іх 34,3 % складалі рэлігійныя выданні, 20,6 – па мастацтве, 12,9 – па мастацкай літаратуры, 8,2 – па адукацыі, 7,3 – па сацыяльна-эканамічных пытаннях, 7,3 % – па гісторыі. Відавы склад уключаў у асноўным рэлігійныя выданні (33,5 %), для вольнага часу (18,5), літаратурна-мастацкія (14,2) і вучэбныя выданні (12,4 %).

Аднак рэпрэсіі, якія царскі ўрад увёў пасля паўстання 1863–1864 гг., рэзка змянілі сітуацыю як у культурным асяроддзі мінскай інтэлігенцыі, так і ў мінскім кнігавыданні. Рэпрэсіі супраць носьбітаў ідэй вызвалення сталі рэпрэсіямі і супраць усяго польскага і нацыянальнага. Водгукам на паўстанне 1863–1864 гг. стала забарона польскага шрыфту. Дазволенымі прызнаваліся рускі і заходнееўрапейскія[216]. Пад строгі царскі кантроль трапілі друкарні, кнігарні і бібліятэкі. Амаль уся паліграфічная і выдавецкая база была пераарыентавана на выпуск рускамоўнай літаратуры, а кнігарні і бібліятэкі – на яе распаўсюджванне. Разам з загадам аб забароне польскага друку (1864) адбывалася ўвядзенне ў дзеянне з красавіка 1865 г. "Временных правил о цензуре". Паводле гэтага цэнзурнага статута, «паліграфічныя прадпрыемствы аддаваліся пад кантроль чыноўнікаў для асобых даручэнняў пры губернскіх уладах – інспектараў, у абавязкі якіх уваходзіла "папярэджанне і спыненне тайнага кнігадрукавання"»[217]. Ад папярэдняй цэнзуры вызваляліся Пецярбург і Масква, але не правінцыя, дзе папярэдняя цэнзура ажыццяўлялася агульнай і ведамаснай цэнзурамі. Друк трапіў пад строгі кантроль карнай цэнзуры, які выконвала

[216] *Миловидов А. И.* Судьба русской книги в Северо-Западном крае в связи с его культурной историей. С. 31.

[217] *Умецкая Я. С.* Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. С. 282.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэцяе аддзяленне[218]. Дадзеныя фактары прадвызначылі пачатак ужо другога этапу.

*Другі этап, 1865–1904 гг.,* характарызуецца наступнымі сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі і культурнымі зменамі. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. царскі ўрад пачаў ажыццяўляць, хаця і са значным спазненнем у параўнанні з самой Расіяй, шэраг буржуазных рэформаў (сялянскую, судовую, земскую, гарадскую, школьную) і ў "неблаганадзейным" Паўночна-Заходнім краі. Фактычна толькі ў 1870 г. у Мінску было адменена ваеннае становішча, на якім знаходзіўся горад з красавіка-верасня 1863 г.[219] Правядзенне гэтых рэформаў дало новы імпульс развіццю капіталістычных адносін. Дадатна паўплывала на сацыяльна-эканамічнае становішча горада будаўніцтва Лібава-Роменскай і Маскоўска-Брэсцкай чыгунак (1870-я гг.), узвядзенне новых заводаў і фабрык (1870–1890-я гг.). У 1895 г., паводле даных гісторыкаў, у Мінску налічвалася 18 фабрык і заводаў, столькі ж мануфактур[220]. Працягваецца далейшы рост насельніцтва. Як адзначае З. Шыбека, з 1885 г. Мінск па колькасці жыхароў (58,4 тыс. чал.) выходзіць на лідзіруючае месца сярод губернскіх гарадоў Беларусі[221]. У 1873 г. у горадзе пачаў дзейнасць Мінскі камерцыйны банк, адкрылі свае аддзяленні і іншыя банкі. У 1890 г. працавалі 583 гандлёвыя ўстановы. На пачатку XX ст. у галіне гарадской прамысловасці ствараюцца акцыянерныя таварыствы і сіндыкаты. Выгаднае становішча горада спрыяла "фарміраванню беларускага нацыянальнага рынку ўвогуле. Мінск жа станавіўся яго натуральным цэнтрам"[222]. У 1900 г. Мінск меў самы буйны гандлёвы абарот у Беларусі (у яе сучасных межах)[223].

У галіне ж асветы дзейнічалі, напрыклад, у 1893 г. чатыры сярэднія і 13 пачатковых школ. Актыўна развівалася сетка медыцынскіх устаноў (у 1890 г. у горадзе было 8 лячэбных устаноў). У 1890 г. пабудаваны Мінскі гарадскі тэатр. Засноўваецца і адкрываецца значная колькасць мінскіх грамадскіх таварыстваў, Мінская публічная бібліятэка імя А. С. Пушкіна. У 1880-х гг. пачынаюць выходзіць газеты "Минский листок" і "Северо-Западный календарь", вакол якіх збіраецца кола аматараў беларускай культуры і гісторыі (М. Доўнар-Запольскі, Я. Лучына, А. Слупскі). Пачынаючы з канца XIX ст. можна адзначыць існаванне ў Мінску рускага асяродка культуры, якім становяцца перыядычныя выданні, музеі, бібліятэкі, таварыствы, а "культуррэгентамі выступаюць рускія чыноўнікі"[224]. Вялася ў Мінску і польская культурна-асветніцкая дзейнасць, з якой былі звязаны Я. Лучына, З. Савіцкая, Б. Адамовіч, І. Вяржбіцкі, Д. Бохан, В. Макоўскі.

---

[218] *Патрушева Н. Г.* Цензурная реформа в России 1865 г. : автореф. дис. … канд. ист. наук / Ленингр. гос. ун-т. Ленинград, 1990. 18 с. Таксама гл.: http://www.opentextnn.ru/censorship/russia/dorev/libraries/book/?id=875.

[219] Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1910 год. Минск : Губ. тип., 1909. С. 121.

[220] Мінск // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1999. Т. 5. С. 154.

[221] *Шыбека З.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя). Мінск : ЭўраФорум, 1997. С. 62.

[222] Тамсама. С. 73.

[223] Тамсама. С. 123.

[224] Тамсама. С. 199–200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значнае месца займаў у горадзе і яўрэйскі культурны асяродак, сканцэнтраваны найбольш вакол сінагог, навучальных устаноў і таварыстваў[225].

Такім чынам, за Мінскам паступова замацоўваецца статус важнага культурнага цэнтра Беларусі. Менавіта ў гэты час у горадзе ствараюцца грамадскія таварыствы, якія адыгралі значную ролю ў навуковым і культурным жыцці горада: Таварыства мінскіх урачоў, Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі, Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі, Мінскае таварыства аматараў вытанчаных мастацтваў, Мінскі царкоўны гісторыка-археалагічны камітэт і інш.

Рэзкі спад у дзейнасці прыватнага кнігавыдання другой паловы 1860-х– пачатку 1870-х гг., калі ў Мінску працуе, па сутнасці, адна прыватная друкарня Ё. Дворца (Дворжаца) і агульная колькасць выданняў адпавядае прыкладна ўзроўню пачатку XIX ст., змяняецца паступальным ростам выпуску кнігавыдавецкай прадукцыі і развіццём кнігавыдавецкай сферы. Новы ўздым мінскага кнігавыдання можна ўжо адзначыць у апошняй трэці XIX ст., калі ў Мінску значна ўзрастае і пашыраецца паліграфічная база, узнікаюць новыя друкалітаграфіі: 1874 г. – Б. І. Саламонава, 1878 – І. І. Тасьмана, 1892 – Н. М. Нахумава, 1892 – Д. Форына, 1898 – І. Каплана, 1898 – Ш. А. Соськіна, 1899 – П. Кліёрынай, 1901 – І. Х. Шапіры, 1902 г. – С. А. Някрасава; 1894–1904 гг. – прадаўжае дзейнасць сямейнае прадпрыемства Дворжацаў – гэта паравая друкалітаграфія Х. Я. Дворжаца. Усяго ў гэты час у Мінску дзейнічала 12 друкарняў, друкалітаграфій і літаграфій. Акрамя таго, мінскае кнігавыданне традыцыйна падтрымлівалі выдаўцы-кнігары: 1863–1894 гг. – З. Савіцкая, 1883–1914 – В. Фрумкін, 1887–1917 – Ё. Фрэнкель, 1898–1908 – Я. Філіповіч-Дубовік, 1900–1917 гг. – В. Макоўскі. Значна пашырылася кола выдаўцоў дзяржаўных структур. Акрамя дзейнасці ў гэты перыяд Губернскай друкарні, Мінскага губернскага статыстычнага камітэта, можна яшчэ назваць: Мінскую гарадскую думу, Мінскую губернскую ўправу па справах земскай гаспадаркі, Мінскі губернскі камітэт па справах земскай гаспадаркі, Мінскае акцызнае ўпраўленне, Упраўленне Лібава-Роменскай чыгункі, Мінскую гімназію і некаторыя іншыя ўстановы ў галіне адукацыі, гарадской гаспадаркі, аховы здароўя. Заявілі аб сабе як кнігавыдаўцы і грамадскія ўстановы і таварыствы: Таварыства мінскіх урачоў, Таварыства сельскай гаспадаркі, Мінскае дабрачыннае таварыства, Таварыства ўзаемнага крэдыту і шэраг іншых спажывецкіх, прамысловых, крэдытных, дабрачынных і рэлігійных таварыстваў (больш за 70). Вылучаецца і кола выдаўцоў-аўтараў уласных твораў: С. А. Кацэнеленбоген, І. А. Бамштэйн, Д. Бохан, М. Лаўроў (Крайчык) і інш. Праўда, выдавецкая дзейнасць шэрагу з іх была кароткачасовай, напрыклад: друкарняў – Ш. А. Соськіна, І. Х. Шапіры, Ц. Мазо; кнігарняў – З. Савіцкай, Я. Філіповіч-Дубовіка.

На другім этапе адзначаецца відавочны колькасны рост кніжнай прадукцыі – у пяць разоў у параўнанні з першым (1795–1864); пашырэнне тэматыкі выданняў і змена яе акцэнтаў. У галіне мінскага кнігавыдання бясспрэчнай дамінантай становяцца кнігі на рускай мове: 97,7 % (1176 выд.), выданні на польскай мове склалі 1,5 % (18), на польскай і на латыні – 0,2 % (2), на латыні –

[225] Тамсама. С. 203.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

0,2 % (2), на французскай – 0,4 (5 выд.). Беларускамоўныя выданні адсутнічалі. На першыя пазіцыі выходзяць выданні сацыяльна-эканамічнай, сельскагаспадарчай і рэлігійнай тэматыкі. З'яўляюцца выданні тэхнічныя і псіхолага-педагагічныя. Змяніліся таксама акцэнты і ў функцыянальнай структуры мінскіх выданняў гэтага перыяду. Першынство належыць афіцыйным, рэлігійным, даведкавым і навукова-папулярным выданням. Значна скарацілася выданне літаратурна-мастацкіх твораў. З'явіліся новыя выданні вытворча-практычнага і масава-палітычнага характару.

Значныя змены ў мінскім кнігавыданні, што адбываюцца ў 1865–1904 гг., звязаны з развіццём кнігавыдавецтваў грамадскага тыпу (45 %). Агульная колькасць выдадзенай імі кніжнай прадукцыі склала 34,5 %. Дамінуючае становішча занялі Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі і Таварыства мінскіх урачоў. Кнігавыдавецкая прадукцыя прыватных выдавецкіх прадпрыемстваў (35 %) склала 40,5 %. Дзяржаўны тып выдавецтваў займаў трэцяе месца (21 %). Кніжныя выданні дзяржаўных прадпрыемстваў у агульным патоку склалі 25 %.

*Трэці этап мінскага кнігавыдання, 1905–1917 гг.,* вызначаецца ў першую чаргу рэвалюцыйнымі заваёвамі свабоды друку і надзвычай хуткімі тэмпамі развіцця. Як адзначаецца шэрагам даследчыкаў, Мінск у 1913 г. становіцца вядучым гандлёва-прамысловым і банкаўскім цэнтрам Беларусі[226]. Так, колькасць насельніцтва ў 1913 г. у Мінску сладала 106,7 тыс. чалавек. У горадзе працавалі 104 заводы і мануфактуры, 1333 гандлёвыя прадпрыемствы, 23 бальніцы, 62 навучальныя ўстановы (у тым ліку з 1914 г. настаўніцкі інстытут), выдаваліся 24 перыядычныя выданні.

Новыя змены, унесеныя ў кнігавыданне падзеямі 1905 г., зрабілі магчымым ажыццяўленне друку на мясцовых мовах, дзякуючы чаму кнігавыданне набыло дэмакратычны і разнамоўны характар, узмацнілася беларускамоўная плынь у кнігавыданні. Гэтыя фактары сталі асноўнымі для таго, каб вылучыць наступны, трэці, этап – 1905–1917 гг. «24 лістапада 1904 г. уступілі ў дзеянне "Часовыя правілы аб друку", якія разам з указамі ад 18 сакавіка і 26 красавіка 1906 г. абвясцілі адмену агульнай і духоўнай цэнзуры. Пачаўся новы – адраджэнскі, "нашаніўскі" – этап беларускага кнігадрукавання»[227]. Незвычайны ўздым выдавецкай справы назіраўся і па ўсёй Расіі. "Настоящее наводнение началось не раньше, как с 17 октября 1905 года <…> С этого самого момента пошла настоящая книжная горячка, началась небывало напряженная писательская и издательская работа. Ожили и размножились книжные магазины, вдруг развернулся и вырос небывало огромный круг читателей, и не прошло и нескольких месяцев и даже недель, как Россия, по числу названий и экземпляров вновь выходящих книг заняла первое место на всем земном шаре"[228].

Пачынаючы з 1905 г. бачны значны колькасны рост кніжных выданняў і ў Мінску: 1905 г. – 86 выд.; 1906 г. – 111; 1907 г. – 91; 1908 г. – 87; 1909 г. – 124; 1910 г. –

---

226 Мінск // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5. С. 155.

227 *Герасімаў В. М.* Гісторыя цэнзуры друку на Беларусі: стагоддзе за стагоддзем // Матэрыялы Першых кнігазнаўчых чытанняў (Мінск, 15 верас. 1998 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. Мінск : НББ, 2000. С. 32.

228 *Рубакин Н. А.* Книжный прилив и книжный отлив // Современный мир. Санкт-Петербург, 1909. № 12. С. 2–3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

109; 1911 г. – 154; 1912 г. – 158; 1913 г. – 210; 1914 г. – 224; 1915 г. – 116; 1916 г. – 76; 1917 г. – 120 выд. Мінск, як другі пасля Вільні выдавецкі цэнтр беларуска-літоўскіх зямель, даваў асноўны прырост кнігавыдавецкай прадукцыі[229]. Аднак большасць кніжнага рэпертуару складалі афіцыйныя выданні розных устаноў і таварыстваў. Яскравае таму пацвярджэнне – названая літаратура ўтварала асноўную частку ў складзе кніжнай прадукцыі, выдадзенай вядучымі мінскімі друкарамі гэтага перыяду: Тасьманы – 89 %; І. Каплан – 60; Я. А. Грынблат – 81; Б. І. Саламонаў – 76; Я. Ш. Гатоўскі і М. Х. Юршчык – 60; Ліўшыц і Баршай – 58; А. Д. Перскі – 69; Д. Форын – 61 %. Актыўнае развіццё сацыяльна-эканамічнай сферы, асабліва ў 1905–1914 гг., прывяло да папаўнення яе новымі суб'ектамі, якія, у сваю чаргу, станавіліся патэнцыяльнымі заказчыкамі для мінскіх друкарняў, – гэта дзяржаўныя органы ўлады (Мінская губернская ўправа па справах земскай гаспадаркі, Мінская павятовая земская ўправа), установы ў галіне адукацыі і асветы (Мінскае сямікласнае камерцыйнае вучылішча, Мінская яўрэйская жаночая прафесійная школа, Мінскае яўрэйскае рамеснае вучылішча, Мінскае ніжэйшае культурна-тэхнічнае вучылішча, Мінская гарадская гандлёвая школа), установы ў галіне гарадской гаспадаркі, эканомікі, прамысловасці; грамадскія ўстановы (спажывецкія, прамысловыя, крэдытныя таварыствы, палітычныя партыі, культурна-асветныя таварыствы, навуковыя таварыствы, дабрачыннасці, спартыўныя, ахоўныя, рэлігійныя); прыватныя ўстановы. Выконваючы іх заказы, мінскія выдавецтвы мелі стабільную забяспечанасць працай. З ростам заказчыкаў адбываўся і рост прыватных друкарняў: з 12 на другім этапе – да 24 на трэцім; рабіліся спробы наладжвання прафесійных выдавецтваў і таварыстваў. У працэс кнігавыдання ўключаліся рэдакцыі газет. Буйнейшыя тыпографы займаліся выданнем газет, з`яўляліся іх рэдактарамі-выдаўцамі.

У 1905–1917 гг. пачынаюць узнікаць выдавецкія і кнігагандлёвыя таварыствы: яўрэйскае – «Выдавецтва "Культура"» – «Verlag "Kultur"» (1905–1906), беларускія – "Мінчук" (1907–1909), "Саха" (1914–1915), "Лучынка" (1914), "Вясёлка" (1915), "Вольная Беларусь" (1917–1918), польскія – "Выдавецкая суполка" – "Spółka Wydawnicza" (1916–1918), "Таварыства польскіх ведаў вайсковых" – "Towarzystwo Polskiej Wiedzy Wojskowej" (1917), асноўнай мэтай дзейнасці якіх было нацыянальна-культурнае адраджэнне, што праявілася ў моўным і тэматычным складзе рэпертуару, у функцыянальным прызначэнні іх выданняў. Легальны статус атрымаў шэраг выдавецтваў палітычных партый: мінскага камітэта "Союза 17 октября" (1906), мінскай арганізацыі Беларускай сацыялістычнай грамады (1905, 1917), мінскіх арганізацый РСДРП "Социал-демократ" і "Звезда" (1917), кожная з якіх тым самым вырашала свае партыйныя, палітычныя задачы, займаючыся выданнем у асноўным прапагандысцкай літаратуры (пераважна на рускай мове).

Працягваюць дзейнасць, папаўняючы новай тэхнікай свае прадпрыемствы і ствараючы новыя працоўныя месцы, буйнейшыя мінскія друкары І. і В. Тасьманы, Б. І. Саламонаў, Л. Г. Дворжац, С. А. Някрасаў, І. Каплан, Н. М. Нахумаў. Узнікаюць таксама новыя друкарні: 1905 г. – Рубенчыка, 1906 – Я. Ш. Гатоўскага і М. Х. Юршчыка, 1906 – Б. Бляхава, 1907 – Фельдмана і Перскага, 1910 – Ліўшыца і Баршая, 1910 – М. Л. Зысьмана, 1913 – Я. А. Грынблата, 1913 – Е. Ш. Сляпяна,

229 *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова. С. 128.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

1916 – Друкарня інвалідаў, 1917 г. – Л. Б. Шэйнэмана. Тэндэнцыя стварэння выдавецкіх суполак распаўсюдзілася і на некаторыя друкарскія прадпрыемствы, што можна растлумачыць як супрацьстаянне канкурэнтнай барацьбе, якая патрабавала большых капіталаўкладанняў. Колькасна выпуск кніжнай прадукцыі дасягае ў 1914 г. свайго апагею (224 назвы). За 1905–1917 гг. у Мінску было выдадзена 53,2 % (1666 назваў) ад усёй кніжнай прадукцыі 1795–1917 гг. Асноўную масу складалі выданні на рускай мове – 91,5 %, вядучымі тэматыкамі якіх былі сацыяльна-эканамічная, сельскагаспадарчая і медыцынская. Функцыянальную накіраванасць асноўнай кнігавыдавецкай прадукцыі вызначала пераважная большасць афіцыйных, даведкавых, рэлігійных і навуковых выданняў.

Адметнай асаблівасцю мінскага кнігавыдання на дадзеным этапе стала з'яўленне як кніг на беларускай мове, так і беларускіх выдавецкіх суполак. Праўда, гэта былі толькі першыя крокі ў адраджэнні беларускамоўнага кнігавыдання, якое ў Мінску, як і па ўсёй Беларусі, на працягу 1795–1917 гг. не мела значных поспехаў. І нават калі ў час самай адчувальнай для Мінска русіфікатарскай палітыкі выходзілі некаторыя польскамоўныя выданні (1879–1900-я гг.), то асобных беларускамоўных кніжных выданняў не было (ці невядома, што былі). У час дазволу друку на мясцовых мовах, пачынаючы з 1905–1906 гг., актыўна ў параўнанні з беларускамоўнымі выданнямі (19) друкуюцца ў Мінску яўрэйскамоўныя (50) і польскамоўныя (54).

Для дадзенага этапу характэрныя найбольшая актывізацыя, далейшае развіццё і канцэнтрацыя прыватнага кнігавыдання (30 %), рост выпуску яго прадукцыі (46,2 %). Адпаведна колькасць грамадскіх арганізацый і таварystваў складае 53 %, а выдадзеная імі кніжная прадукцыя – 27,5 %, дзяржаўных – адпаведна 17 і 26,3 %.

Аднак ваенныя дзеянні Першай сусветнай вайны і рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. унеслі свае змены ў жыццё горада: гэта не толькі рост насельніцтва за кошт вайскоўцаў і бежанцаў (да 250 тыс. чал.), але і статус Мінска як прыфрантавога горада, які знаходзіўся на ваенным становішчы з 1915 г. У гэты час адбываюцца адчувальныя змены і ў кнігавыданні горада: рэзкі колькасны спад выпуску кніжнай прадукцыі; яго нестабільнасць; падпарадкаванне ваеннай цэнзуры; пашырэнне ваеннай і рэвалюцыйнай тэматыкі.

Вызначаныя асноўныя этапы мінскага кнігавыдання ў некаторай ступені з'яўляюцца ўмоўнымі. Але іх вылучэнне спрыяе аналізу, характарыстыцы, паказу дынамікі і якасных змен мінскага кнігавыдання. У сваю чаргу, кожны з трох этапаў можа быць падзелены ў адпаведнасці з іншымі крытэрыямі. На этапе 1795–1864 гг. мэтазгодна, на нашу думку, улічыць матэрыяльную форму і змест мінскіх выданняў і выдзеліць так званы "дадуніна-марцінкевічаўскі час", або 1795–1840 гг., і "дуніна-марцінкевічаўскі час", або 1841–1864 гг. Правамерна выдзеліць і такія крытэрыі, як дынаміка выхаду выдавецкай прадукцыі і арганізацыя дзейнасці выдавецтваў. Так, на этапе 1865–1904 гг. выдзяляюцца 1865–1888 гг. і 1889–1904 гг.; а на этапе 1905–1917 гг. – 1905–1914 гг. і 1915–1917 гг. Названыя спецыфічныя крытэрыі звязаны непасрэдна з якаснымі і колькаснымі крытэрыямі выдання кніжнай прадукцыі, аднак і імі даследчык можа не абмяжоўвацца, а выдзяляць і іншыя, у адпаведнасці з якімі будзе будаваць сваю мадэль даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Прыватныя выдавецтвы**

*Друкарні і літаграфіі*

Пачатак XIX ст. стаў для Мінска часам зараджэння прыватнага кнігадрукавання. Адна з першых прыватных друкарняў – гэта яўрэйская друкарня, заснаваная ў Мінску, як зазначыў Г. Перлін, у 1807 г. Пацвярджаецца яе дзейнасць і выданнем рэлігійнага твора на іўрыце “עין יעקב”[230]. [1808] (“Вока Якава”). Адпаведна датаванае 1808 г., пад якім і зафіксавана ў бібліяграфічным дапаможніку М. Розенфельда “Hebrew printing from its beginning until 1948”[231]. Аднак бібліяграфічныя звесткі аб першай яўрэйскай кнізе, надрукаванай у Мінску, на жаль, пададзены без указання друкарні ці друкара. Яшчэ адно выяўленае апісанне наступнага мінскага выдання зафіксавана ў рускамоўнай транслітэрацыі як “Мидраш хахамим” (1809 г.), таксама ідэнтыфікавана толькі па месцы выдання[232]. Існаванне ж прыватнага друку ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. у Мінску пацвярджаецца і наступнымі бібліяграфічнымі знаходкамі – гэта чатыры рэлігійныя выданні 1809–1816 гг. на іўрыце, у выхадных даных трох з іх утрымліваюцца звесткі аб уладальніках друкарні ці ўсё ж выдаўцах (?), якімі выступаюць *Іегуда Ліма і Сімха Зымель* (гл. ч. II: Каталог).

Безумоўна, калі б былі выяўлены самі выданні, то можна было б з большай верагоднасцю сцвярджаць аб іх прыналежнасці да адпаведнай друкарні, бо, як стала вядома з рапарту мінскага грамадзянскага губернатара Германа Іванавіча Родзінга (Родзіна[233]), датаванага 5 кастрычніка 1811 г., міністру паліцыі, пецярбургскаму ваеннаму губернатару Аляксандру Балашову, у Мінску на той час існавалі дзве друкарні: адна губернская, а другая ўтрымлівалася “мещанином *Лейбою Лейбовичем Гурвичем*” і была абсталявана двума станамі, як і губернская[234]. Аднак пакуль ніводнае з выяўленых мінскіх выданняў гэта не пацвярджае, але і наогул не абвяргае.

Адзінае, што можна сказаць пэўна, – прыватная друкарская ініцыятыва ў Мінску нарэшце ў пачатку XIX ст. была запачаткавана, а ўжо праз дзясяцігоддзе, у 1820-я гг., атрымала далейшае развіццё і запатрабаванасць у горадзе. У гэты час адзначаецца дзейнасць наступных прыватных друкароў: 1818–1835 гг. – Зымеля Прэса[235] і 1819–1850 гг. – Івана Стафановіча.

Што да друкарні І. Стафановіча, то Я. С. Умецкая прыводзіць даты яе дзейнасці ў 1821–1848 гг., у 1817–1848 гг. – Н. Ю. Бярозкіна[236]. Крыніцы XIX ст., такія,

---

230 *Перлін Г.* Да гісторыі яўрэйскага друку на Беларусі // Наш край. 1927. № 8–9. С. 12.

231 *Rosenfeld M.* Hebrew printing from its beginning until 1948. С. 35. N 244.

232 Паводле адбітка: [Зал К. Витрина XX. Витрина XXX–XXXI. Шкафы и витрины XXXII–XXXIV: Издания на еврейском языке] / печ. по распор. Императорского Русского Технического Общества. [Санкт-Петербург] : Тип. Шрейдера, [б. г.]. [1 л.]. – Падаецца ў спісе пад № 77.

233 *Смородский А. П.* Столетие Минской губернии : [1793–1893. Историко-статистическая записка] : приложение к Памятной книжке Минской губернии на 1893 год / сост. секр. Мин. губ. стат. ком. А. П. Смородский. 2-е изд., испр. и доп. Минск : [Мин. губ. стат. ком.], 1893 (Типолит. Р. Дворжец). С. 75: “Д[ействительный] с[татский] с[оветник] Герман Иванович фон Родин (1806–1812)”.

234 ГАРФ. Ф. 1165. Д. 245. Л. 3, 45.

235 *Умецкая Е. С.* Книгоиздание в Белоруссии в первом тридцатилетии XIX века (1801–1832) // Книговедение : сб. докл. науч. конф. Вильнюс, 1979. № 7(14). С. 79.

236 *Бярозкіна Н. Ю.* Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – XX стст.). 2000. С. 81.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як “Bibliograficznych ksiąg dwoje” I. Лялевеля[237] ці “Słownik geograficzny Królestwa Polskiego”[238], наогул не ўносяць дакладнасці, адпаведна ўказваючы толькі, што друкарня І. Стафановіча з’яўляецца новай і адначасова дзеючай (у 1823 г.) ці “przed rokiem 1822 powstała”. 1822 годам адзначаны і першыя вядомыя кніжныя выданні друкара.

З архіўных матэрыялаў можна даведацца, што *Іван Іосіфавіч Стафановіч* з дваран, член Мінскага губернскага праўлення ў 1798 г. паступіў на службу ў Губернскую друкарню, стаўшы адным з трох яе супрацоўнікаў. У тым самым годзе – з 15 мая – І. Стафановіч стаў на чале казённай Мінскай друкарні[239]. За гады службы ён быў узнагароджаны рознымі чынамі і служыў калежскім рэгістратарам (з 1802 г.), губернскім сакратаром (з 1806 г.)[240]. Апошні чын І. Стафановіча (з 1809 г. да 1819 г.) на казённай службе – чын калежскага сакратара. Працаваў ён у Губернскай друкарні і “пры французах” у 1812 г.[241], і пасля іх таксама заставаўся яе галоўным друкаром.

У ліпені 1819 г. І. Стафановіч звольніўся са службы і заняўся адкрыццём сваёй друкарні[242], якая, па нашым меркаванні, і была дазволена Мінскай гарадской паліцыяй ужо ў 1819 г. Звесткі з атэстата, выдадзенага І. Стафановічу ў жніўні 1819 г. аб службе ў Мінскай губернскай друкарні, былі выкарыстаны Мінскай управай паліцыі ў 1825 г. для прадстаўлення іх губернатару, які, у сваю чаргу, паведамляў у Віленскае ўніверсітэцкае праўленне аб добранадзейнасці названага друкара, які, “имея заведенную типографию в городе Минске, просит позволения на содержание оной и печатание в оной сочинений, одобренных цензурным комитетом”[243]. З улікам таго, што дазвол пацвярджаўся кожныя два гады, можна пагадзіцца з меркаваннем аб магчымым пачатку яго дзейнасці ў 1819 г. Працягвалася праца І. Стафановіча да пачатку 1850 г., калі выйшла адно з апошніх яго выданняў – “Directorium”[244] (гл. Дадат. 1, табл. 1.2). Таксама на пачатку 1850 г. друкарня І. Стафановіча была прададзена Ёкелю Дворцу[245].

І. Стафановіч стаў першым сярод прыватных мінскіх друкароў, які выпусціў менавіта рускамоўныя выданні, а таксама вызначыўся і тым, што надрукаваў у 1833 г. першую ў горадзе кнігу мініяцюрнага фармату[246] – памерам 9х12 см – “Подарок благонравным ученикам и ученицам на новый 1834 год, или Нравоучительные детские повести, служащие к образованию ума и сердца” Андрэя

[237] *Lelewel J.* Bibliograficznych ksiąg dwoje… S. 228.

[238] *Chmara A., Jelski A.* Mińsk // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa : Nakł. W. Walewskiego; Druk. “Wieku” [etc.], 1885. T. 6. S. 455.

[239] НГАБ. Ф. 299. Воп. 7. Спр. 15. Арк. 351.

[240] Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 193. Арк. 15.

[241] Часовая мінская газета. 1812 год : пер. з пол. мовы / аўт. праекта В. Хурсік ; пад рэд. Я. Анішчанкі. Мінск : Выд. В. Хурсік, 2008. С. 178.

[242] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 193. Арк. 15.

[243] Тамсама. Арк. 10.

[244] ЦГИА СПб. Ф 775. Оп. 1. Д. 62. Л. 100. – паводле “Ведомости о рассмотренных книгах в 1850 г. и выданных билетах на их выпуск” у студзені 1850 г. І. Стафановічам атрыманы білет на выданне.

[245] Тамсама. Арк. 307.

[246] *Доўнар Л.* Першая мінская кніга-малютка – урокі паслухмянасці і дабрыні // Бібліятэчны свет. 1998. № 3(8). С. 21.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паўлава[247]. З 1824 г. дзякуючы друкарні І. Стафановіча ў Мінску пачаў амаль штогод выходзіць "Directorium", касцёльны каляндар, прызначаны для Мінскай дыяцэзіі. Да 1850 г. было выпрадукавана 24 названыя выданні. Дарэчы, вызначалі іх тыя самыя сціплыя друкарскія ўпрыгожванні – віньеткі, канцоўкі, характэрныя для выданняў мінскіх базыльян, пазней заўважаныя на пачатковым этапе дзейнасці і Губернскай друкарні.

Асноўная частка мінскай кніжнай прадукцыі друкара *Зымеля Прэса* датавана 1826–1835 гг. Акрамя прыватнай друкарні, Зымель Хацкелевіч Прэс па кантракту загадваў Мінскай губернскай друкарняй (прыкладна з 1818 г.). Як сведчаць архіўныя матэрыялы Мінскага губернскага праўлення за 1831 г., З. Х. Прэс "праз усе 12 гадоў" утрымліваў нават за свой кошт некаторую частку штата Губернскай друкарні[248]. Відаць, пачатак дзеяння кантракта з Губернскай друкарняй паслужыў для даследчыкаў і пачатковай датай дзейнасці прыватнай друкарні Прэса. Менавіта на перыяд загадвання казённай друкарняй прыпадае і самая актыўная кнігавыдавецкая дзейнасць прыватнай друкарні З. Прэса. Цікава, што 1829 – 1830 гадамі датуюцца не менш як чатыры–пяць яго выданняў, на тытульных лістах якіх месцам друку паказана Узда[249], а ў "Słowniku geograficznym" А. Ельскі падае З. Прэса менавіта як уздзенскага друкара[250]. Магчыма, што мы маем адзін з апошніх прыкладаў рухомай друкарні і дзейнасці "мабільнага" (лац. *mobilis* – рухомы) друкара, што існавалі за кошт сродкаў і на патрэбы мясцовых мецэнатаў-католікаў. Відавочным прыкладам можа быць уздзенскае "Штодзённае набажэнства" – "Officium albo codzienne nabożeństwo", што "przedrukowane w powiecie Ihumeńskim w dobrach J. WW. Tadeusza i Waleryi hr. Zawiszów. W Uzdzie u Z. Pressa, 1830" (E. 1881–1900. T. 3. S. 286)[251].

Аднак у 1835 г. мінскі мешчанін Зымель Хацкелевіч Прэс па распараджэнні Губернскага праўлення быў адхілены ад друкарскай дзейнасці, а найперш ад утрымання і загадвання казённай друкарняй, і не толькі па прычыне заканчэння кантракта[252]. Выявіўся недахоп у абсталяванні друкарні, які ён павінен быў пакрыць, але і гэта хутчэй было адгаворкай, бо больш сур'ёзным было парушэнне З. Прэса ў справе друку на польскай мове забароненага цэнзур-

---

[247] Паўлаў Андрэй – рускі пісьменнік і перакладчык, настаўнік, правёў у Беларусі і Літве каля пятнаццаці гадоў свайго жыцця.

[248] НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 96–100.

[249] Pieśni nabożne na święta uroczyste według porządku Kościoła Świętego Rzymsko-Katolickiego na cały rok zebrane z przydatkiem nowych pieśni i przedrukowanych. Uzda : [s.n.], 1829 (Uzda : Z. Press) (BN. I 292.787); Złoty ołtarzyk wonnego kadzenia przed stolicą Bożą to jest modlitwy rozmaite które duch gorący na wonność Panu Bogu słodkości chwały Jego ofiarować może z przydatkiem niektórych pieśni przedrukowany. W Uzdzie : w drukarni Z. Pressa, 1830 (BN. I 1.576.920); Ewangelia Pana naszego Jezusa Chrystusa na niedziele i wszystkie uroczyste święta całego roku według obrządku kościoła św. rzyms.-kat. rozporządzona, z przydatkiem ewangelii o męce P. N. J. Chr., o świętych Patronach korony Pols., W. X. Lit. o fundatorach zakonnych, tudzież i nauką od parochów do ludu swego mówić sie zwykłą. Uzda : druk. Z. Pressa, 1830 (E. 1881–1900. T. 1. S. 377); Przykłady historyi z nauki chrześciańskiéj wielce pożyteczne i przykładne. I historya o św. Grzegorzu Papieżu. W Uzdzie, 1830 (E. T. 7. S. 67).

[250] *Jelski A.* Uzda // Słownik geograficzny [Электронны рэсурс]. URL: http://dir.icm.edu.pl/pl/Slownik_geograficzny/Tom_XII/867.

[251] Выданне выяўлена і захоўваецца ў Нацыянальным музеі ў Кракаве (Muzeum Narodowe w Krakowie. Sygn.: XIX, 5499). Дадзеныя звесткі прадастаўлены аўтару сп. Л. Коўкель.

[252] НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 812. Арк. 1396–1402.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным камітэтам выдання "Pieśni nabożne na święta uroczyste według porządku kościoła ś. rzymsko-katolickiego na cały rok zebrane i z przydaniem nowych pieśni przedrukowane" (1826, 1830). За ўзор паслужыў віленскі асобнік 1825 г. друкарні місіянераў. У выданні, як адзначалася, "находятся песни неблагонамеренные и несогласные с теперешним политическим состоянием здешнего края, распространение коих <…> могло бы произвести вредное действие"[253]. Аднак на "Pieśni nabożne" была звернута ўвага толькі ў 1832 г., пасля "доноса" ў Дэпартамент духоўнай цэнзуры Міністэрства ўнутраных спраў[254]. Тады і мінскаму губернатару прыйшлося правесці адпаведную работу: выявіць, хто друкуе, – гэта быў З. Прэс, і хто гандлюе, – Бейліны.

Прашэнне З. Прэса аб дазволе прыватнага друку ад 1833 г. у Віленскі цэнзурны камітэт было, відаць, задаволена толькі на кароткі тэрмін[255], бо пасля праверкі 1834 г. казённай друкарні, якую ў гэты час яшчэ ўтрымліваў З. Прэс, яго выдавецка-друкарская дзейнасць у Мінску закончылася. Апошнім выданнем стала "Nauka cyztania piśma polskiego dla małych dziatek z różnem nabożeństwem i katechizmem katolickim" (1835) (гл. ч. II: Каталог і Дадат. 1, табл. 1.1). У 1838 г. у афіцыйнай частцы "Минских губернских ведомостей" было апублікавана "Извещение" ад Мінскага губернскага праўлення, у якім аб'яўлялася, што "минскому Еврею Зымелю Прессу, по решению Правительствующего Сената, вовсе запрещено содержание типографии, и отпечатанные в его типографии кантычки, содержащие песни, должны быть изъяты из народного обращения"[256]. І яшчэ на працягу года мясцовыя жандармы расшуквалі шкодныя выданні "Pieśń nabożnych" і высылалі знойдзеныя асобнікі ў Дэпартамент духоўных спраў МУС[257]. Так скончылася дзейнасць З. Прэса, які, відаць, меў на мэце ў гэтай справе свой фінансавы інтарэс, рызыкнуўшы заняцца друкам забароненых выданняў.

Пад прыкрыццём рэлігійных выданняў, якія складалі асноўную частку ў рэпертуары першых мінскіх друкарняў З. Прэса (малітоўнікі, чытанкі, песеннікі), і І. Стафановіча (касцёльныя календары-служэбнікі, казанні), як бачна, напярэдадні лістападаўскага паўстання 1831 г. выпускаліся і антыўрадавыя тэксты.

Выступаючы ў кнігавыдавецкім працэсе ў асноўным у якасці друкароў і выканаўцаў заказаў іншых выдаўцоў, прыватных, дзяржаўных і грамадскіх, І. Стафановіч і З. Прэс далучыліся да выдання вучэбнай, літаратурна-мастацкай, навукова-папулярнай і афіцыйнай літаратуры, большасць сярод якой склалі выданні на польскай і лацінскай мовах.

У 30-я гг. XIX ст. у Мінску было прадоўжана выданне кніг на іўрыце мінскім мешчанінам *Гершонам Эліяшам Іцхакавічам Бланштэйнам (Блаштэйнам),* які звяртаўся з прашэннем дазволіць "завести в г. Минске Вольную типографию для книгопечатания на российской, польском и еврейском диалектах"[258]. Аднак атрымаў дазвол толькі на адкрыццё яўрэйскай друкарні (у 1832 г.),

[253] Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 417. Арк. 1, 4–4адв.
[254] Тамсама. Арк. 1–3.
[255] Тамсама. Арк. 16.
[256] Минские губернские ведомости. 1838. Ч. офиц. Разд. II. № 18 (6 мая).
[257] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 417. Арк. 27–29.
[258] Тамсама. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 220. Арк. 152.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бо “в учреждении русской и польской типографий в городе Минске, – як лічылі царскія ўлады, – не предвидится никакой надобности”[259]. Асноўнымі выданнямі Бланштэйна былі папулярныя сярод насельніцтва календары לוח [משנות תקצ״ז, צ״ד, צ״ו, צ״ח]… (6 выданняў) і рэлігійная літаратура (7 выданняў) (гл. ч. II: Каталог). Пасля забароны яўрэйскага кнігадрукавання[260] друкарня Бланштэйна, праўдападобна, у канцы 1836 г. спыніла сваю дзейнасць. Адным з апошніх выданняў стала кніга, прысвечаная лекавым раслінам, назва якой захавалася паводле архіўных дакументаў Віленскага цэнзурнага камітэта ў рускамоўнай транслітэрацыі – “Сефер Алим Литеруфа, т. е. Лекарственные листья” (1836), “… представлялась в цензуру от Минского рабина Лифшица и к перепечатанию одобрена Апреля 17-го текущего 1836 г. Но как же эта новоотпечатання книга пущена в свет каким-то Минским типографщиком Гершоном Ицхаковичем без позволения цензуры …”[261]. Яе пошук з мэтай “изъятия” як забароненай і пакарання друкара Г. І. Бланштэйна праводзіўся ў Мінску ажно ў 1839 г. Аднак на той час, паводле звестак мінскага губернатара, ужо “типография Блонштейна закрыта в Минске за неисполнение сего предписания”[262].

Нягледзячы на забарону яўрэйскіх выданняў, у пачатку 1850-х гг. у горадзе можна заўважыць выхад у свет у літаграфіі *Ф. Фалька* гравіраваных твораў – партрэтаў і выяў на тэмы яўрэйскага жыцця з подпісамі на іўрыце[263]. Што тычыцца дзейнасці літаграфіі Ф. Фалька, якая акрэсліваецца 1845–1858 гг., то яна набыла вядомасць дзякуючы выданню ў 1848 г. “по указанию начальства и под руководством Архитектора карты Минской Губернии, с изображением: уездных и заштатных городов, местечек, пригородков, слобод, сел, погостов, церквей, монастырей, пустынь и деревень, которые заключают в себе даже менее 5 дворов”[264]. Пошукі месцазнаходжання выдання пакуль вынікаў не далі. Як выглядала мапа, што змяшчала і якую мела каштоўнасць, можна даведацца толькі з “Объявления”, змешчанага ў “Минских губернских ведомостях” за 1849 г.: “На ней подробно и со всею точностью обозначены: фольварки и хутора, корчмы, господские дома и мызы, почтовые станции, а также дороги: почтовые, большие и малые; мельницы – ветряные, водные и пильные, разного рода фабрики и заводы, равно крепости, редуты и малые укрепления; распределены также границы губернские и уездные. К карте приложен масштаб”. Інфармуючы грамадства Міншчыны пра новае выданне і значнасць працы Ф. Фалька, рэдактар газеты заклікае да яго набыцця кожным адукаваным памешчыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[259] Тамсама. Арк. 155.

[260] О цензуре Еврейских книг и о Еврейских типографиях. 1836 г., окт. 27: Высочайше утвержю положение Комитета Министров, распубликованное 27 ноября // *Леванда В. О.* Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев, от Уложения Царя Алексея Михайловича до настоящего времени, от 1649–1873 г.: извлечение из Полных Собраний Законов Российской Империи / сост. и издал В. О. Леванда. Санкт-Петербург : Тип. К. В. Трубникова, 1874. № 334; Положение о еврейских типографиях // LVIA. F. 378. Ap. BS 1846. B. 1071.

[261] ЦГИА СПб. Ф. 772. Оп. 1. Д. 912. Л. 1.

[262] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 417. Арк. 30адв.

[263] ЦГИА СПб. Ф. 772. Оп. 1. Д. 2574. Л. 97, 213.

[264] Объявление / [З. Редактор] // Минские губернские ведомости. Минск, 1849. Отд. 2-й. Ч. неоф. 18 февр. (№ 7). С. 12; 4 марта (№ 9). С. 6.

У наступныя 10 год у літаграфіі Ф. Фалька выраблялiся ілюстраваныя буквары, насценны каляндар, узоры каліграфіі. "Таму мы, – як адзначае У. Сыракомля, – з добрым намерам рэкамендавалі віленскім выдаўцам звяртацца да пана Фалька з рознымі патрэбамі"[265]. Высока ацаніўшы працу літаграфіі, аўтарытэтны літаратар тым не менш даволі крытычна ставіўся да паасобных выданняў. Ілюстрацыі па малюнках Карнэлія Бжэскага да "Нарona" В. Дуніна-Марцінкевіча, як адзначае Г. Кісялёў, былі раскрытыкаваны Сыракомлем з-за дрэннага іх выканання літаграфіяй Фалька.

Сярод выданняў, выкананых у літаграфіі Ф. Фалька, якое значна павышае яго ролю ў мінскім кнігавыданні, з'яўляецца ілюстраваны буквар – "Abecadło" – на польскай, нямецкай і расійскай мовах (паводле выяўленых бібліяграфічных даных друкаваўся ў 1852, 1854, 1856, 1857 гг. і, магчыма, у 1858 г.). Першае выданне буквара было здзейснена сумесна з варшаўскім выдаўцом Генрыкам Натансонам. Сярод вядомых самых ранніх выданняў літаграфіі, 1845 г., ёсць і ноты – гэта "Pierwsze proby muzykalne ofiarowane St. Moniuszce" К. Марцінкевіч[266].

Відавочна, што не ўся выдавецкая прадукцыя Ф. Фалька зафіксавана ў бібліяграфічных дапаможніках (К. Эстрайхера, М. Васілеўскай), як і толькі часткова, у асноўным дзякуючы працам Г. Кісялёва, А. Мальдзіса, Я. Умецкай, асветлена дзейнасць Ф. Фалька. Магчыма, далейшыя навукова-бібліяграфічныя пошукі дапоўняць спіс выданняў Ф. Фалька, а таксама будуць знойдзены непасрэдна самі выданні (гл. Дадат. 1, табл. 1.3).

У пачатку 1850 г. у Мінску пачаў кнігавыдавецкую дзейнасць віленскі мешчанін *Ёкель Дворац*[267] (ён жа ў архіўных дакументах – "Янкель Дворжец" ці "Элля Янкель Абрамов Дворжец"), які набыў друкарню ў І. Стафановіча[268] і разгарнуў даволі значную выдавецка-друкарскую дзейнасць (гл. Дадат., табл. 1.4). З 1851 г. Дворац пераязджае на сталае месцажыхарства ў Мінск[269]. Яго накладам, менавіта як выдаўца, выйшлі творы В. Дуніна-Марцінкевіча на беларускай і польскай мовах: у 1855 г. – "Wieczernice i Obłąkany", у 1857 г. – "Dudar białoruski, czyli wszystkiego potrosze". Сумесна з мінскімі кнігарамі братамі Бейлінымі ажыццявіў у 1855 г. выданне "Нарona" В. Дуніна-Марціневіча і "O udoskonaleniu moralnem" Ю. Герандэ. Акрамя В. Дуніна-Марцінкевіча, актыўна супрацоўнічаў Ё. Дворац з такімі аўтарамі-выдаўцамі, як Х. Прушыньска, М. Лойка, Ф. Чапяліньскі, Л. Вечар (Шчарбовіч) і інш.

Выдавецка-друкарская дзейнасць Ёкеля Дворца вызначаецца больш разнастайнай тэматыкай: рэлігійная, мастацкая, адукацыйна-педагагічная, філалагічная, краязнаўчая, сельскагаспадарчая літаратура, сярод якой першынство належыць мастацкай літаратуры. Па словах У. Сыракомлі можна меркаваць аб стане мінскага кнігавыдання ў гэты час: "Віншуем горад Мінск з тым, што ў ім абуджаецца літаратурны рух. Браты Бейлінавы і Ё. Дворац варушацца над вы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

265 Цыт. па: *Кісялёў Г.* Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі. С. 181.

266 *Ахвердава А.* Пачынальнікі беларускага піянізму // Мастацтва Беларусі. 1985. № 2. С. 68 : іл.

267 Kurier Wileński. 1860. N 71. S. 761; НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 467. Арк. 307–313.

268 *Chmara A., Jelski A.* Mińsk // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa : Nakł. W. Walewskiego; Druk. "Wieku" [etc.], 1885. T. 6. S. 455.

269 НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 467. Арк. 310.

даннем кніг; увогуле някепская друкарня апошняга адпавядае мясцовым літаратурным патрэбам ...”[270]

Нават казённая Мінская губернская друкарня вымушана была замаўляць ў прыватнай друкарні Дворца друкаваную прадукцыю, неабходную для дзяржаўных устаноў Міншчыны. Мінскі губернатар пісаў: “От сих Присутственных мест и военных учреждений Дворжец пользуется, если небольшими, то по крайней мере не меньшими доходами против Губернской Типографии”[271]. Мінскія прыватныя друкарні і літаграфіі (Дворца, Адамовіча) мелі большы попыт, чым маламагутная ў 1855–1860-я гг. Губернская друкарня, якая аказалася без дзяржаўных датацый, а яе кіраўніцтва абвінавачвала ў падрыве сваёй дзейнасці прыватныя друкарні[272]. Прыватнае кнігадрукаванне ж паступова паказвала сваю большую канкурэнтаздольнасць і замацоўвалася ў Мінску на вядучых пазіцыях у параўнанні з дзяржаўным і грамадскім.

Да 1855–1860-х гг. адносіцца і пачатак арганізацыі дзейнасці друкалітаграфіі *Эмерыка Леапольдавіча Адамовіча,* мастака, вучня Яна Дамеля[273]. Пасведчаннем ад 13 мая 1858 г. Э. Адамовіч, настаўнік малявання Мінскай гімназіі, калежскі сакратар, які, як сведчаць архіўныя дакументы, ужо ў 1855 г. валодаў прыватнай літаграфіяй і выконваў замовы Мінскай духоўнай кансісторыі[274], атрымаў дазвол і на адкрыццё друкарні, якая, аднак, пачала сваю дзейнасць толькі ў 1864 г.[275] Магчыма, да гэтага часу адносіцца выпуск “biblijki, pierwszego wyrobu w zakładzie p. Adamowicza”[276]. У артыкуле з “Kuriera Wileńskiego” за 1860 г. паведамляецца таксама, што друкарня Э. Адамовіча кожны дзень працуе і адчынена, вырабляе глобусы (польскія і рускія), малюнкі, “biblijki dla ludu (?) i dzieci”, а ў літаграфіі – этыкеткі для віна, фабрык, цыгарэт, аптэк[277].

Матэрыялы па гісторыі Віленскай вучэбнай акругі змяшчаюць некаторыя звесткі Віленскага цэнзурнага камітэта з 1854 г. па 1865 г. аб дазволе друку ў тым ліку 45 мінскіх твораў: “у Дворжеца 26, у Адамовича 12 и Фалька 7”[278]. Аднак нам удалося адшукаць толькі 6 выданняў, якія адзначаны як надрукаваныя ў літаграфіі або друкарні Э. Адамовіча (гл. Дадат. 1, табл. 1.5).

Знойдзеныя творы друку з’яўляюцца сумеснай выдавецкай працай Э. Адамовіча і, у асноўным, Аляксандра Валіцкага. Сярод гэтых выданняў вылучаюцца літаратурна-мастацкія – “Konkurenci: komedja-operetka” (1861) М. Лапіцкага, нотна-музычныя – “Michasiowi i Johasi: czteroręczny Polonez na Fortepian” (1860) Ф. Міладоўскага і вучэбныя – “Elementarz ścienny” (1862) уласна А. Валіцкага. Вядома, што Э. Адамовіч, які займаўся друкам школьных геаграфічных мапаў,

---

270 Цыт. па: *Кісялёў Г.* Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі. С. 181.

271 НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 505. Арк. 602.

272 Тамсама. Арк. 604–608 адв.

273 *Zieliński J.* Próba biografii Bogusława Adamowicza // Pamiętnik Literacki / In-t Badań Literackich PAN. Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1983. LXXIV, z. 3. S. 294.

274 НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 26477.

275 Тамсама. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 9194. Арк. 1–2.

276 Mińsk z nad Swisłoczy / Antoni z Pohosta // Kurier Wileński. Wilna, 1860. N 71, 9 września. S. 761.

277 Ibid.

278 *Корнилов И.* Русское дело в Северо-Западном крае: материалы для истории Виленского учебного округа преимущественно в муравьевскую эпоху. С. 286.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узораў каліграфічнага пісьма, партрэтаў[279], маляваў і сам (напрыклад, выканаў партрэт А. Міцкевіча[280]), рабіў фотапартрэты. Супрацоўніцтва з А. Валіцкім спрыяла яшчэ аднаму кірунку яго дзейнасці – нотадрукаванню.

Паводле С. Палееса[281], дзейнасць Э. Адамовіча адзначана толькі да 1863 г., але, як сведчаць архіўныя дакументы, у студзені 1874 г. уладальнік мінскай друкарні звяртаецца да мінскага губернатара з прашэннем аб перадачы свайго невялікага прадпрыемства сыну Івану, які меў намер прадоўжыць справу[282]. У сваю чаргу, у красавіку–чэрвені гэтага ж года дваранін Іван Эмерыкавіч Адамовіч перадае ці, дакладней, прадае сваю друкарню ўжо іншаму ўладальніку – мінскаму мешчаніну Берку Лейбе Іцкаву Саламонаву або, як адзначаецца ў пазнейшых дакументах, Берку Ісаакавічу Саламонаву, які, атрымаўшы пасведчанне на вядзенне друкарскіх работ, займаецца яе тэхнічным удасканаленнем, а кіраўніцтва друкарняй ажыццяўляе Ісаак Пупкін[283]. Паступова Б. І. Саламонаў[284] выводзіць сваё прадпрыемства на вядучыя пазіцыі ў мінскім кнігадрукаванні.

У друкалітаграфіі *Беркі Ісаакавіча Саламонава* за перыяд яе дзейнасці (1874–1917) надрукавана не менш як 318 кніжных выданняў (да 1905 г. – 227). Гэта выданні разнастайнай тэматыкі: сацыяльна-эканамічныя, рэлігійныя, па адукацыі і асвеце, гісторыка-краязнаўчыя, юрыдычна-прававыя, па філалогіі, бібліяграфіі, медыцыне, сельскай гаспадарцы, матэматыцы, псіхалогіі, тэхніцы, гідратэхніцы, па мастацкай літаратуры, мастацтвазнаўстве, геаграфіі, літаратуразнаўстве, прыродазнаўстве.

На пачатку сваёй друкарскай дзейнасці Б. І. Саламонаў паспрабаваў прадоўжыць традыцыі і выкарыстаць паліграфічныя магчымасці былой друкалітаграфіі Э. Адамовіча, пра што сведчаць сем нотна-музычных твораў Міхала Грушвіцкага – паланэз “Dla godowej uroczystosci”, “Emilie: polka”, “Mania-polka”, “Quatre Mazourkas Originales”, “Ty! Spiewek”, а таксама апрацаваная музыка Міхала Ельскага “Mazourka de Salon”, “Valse pari à Madame Helene Komar” (усе надрукаваны з дазволу Віленскай цэнзуры ў 1879 г.)[285]. Дадзеныя выданні – з’ява для таго часу выключная, бо балансуе на мяжы забароненага (польская мова і шрыфт) і дазволенага (еўрапейская – французская мова і шрыфт). Пасля 1867 г. гэта першае ўзнаўленне друку на польскай мове ў Мінску, якое адлюстроўвае пэўныя змены ў грамадскім жыцці і яго запатрабаванні незалежна ад цэнзурнага ўціску.

Асноўнае ж месца ў выдавецка-друкарскім рэпертуары Б. І. Саламонава займаюць рускамоўныя выданні, сярод якіх значная колькасць належыць сацыяльна-эканамічнай літаратуры (28,6 %). Актывізацыя кнігавыдавецкіх замоваў сацыяльна-эканамічнай тэматыкі была звязана з адкрыццём і дзейнасцю ў Мінску шматлікіх грамадскіх, дзяржаўных, прыватных устаноў. Адным з ак-

[279] *Палеес С.* З гісторыі друкарскай справы ў Мінску. С. 27.
[280] *Zieliński J.* Próa biografii Bogusława Adamowicza. S. 294.
[281] Тамсама.
[282] НГАБ. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 9194. Арк. 6 адв.
[283] Тамсама. Арк. 12–25.
[284] У адным з дакументаў 1904 г. названы саратаўскім купцом 1-й гільдыі – гл.: НГАБ. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 3806. Арк. 866.
[285] *Немагай С. М.* Выганічы–Дудзічы–Замосце: музычныя масты. С. 52.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўнейшых друкароў, з якімі яны супрацоўнічалі, і быў Б. І. Саламонаў. Кола яго кнігавыдавецкіх сувязяў ахоплівала болей як 30 такіх замоўцаў – гэта Мінская гімназія, Мінская гарадская ўправа, Мінская епархія, Мінскі грамадскі сход, Мінскае таварыства дабрачыннасці, Мінскае таварыства дапамогі бедным яўрэям, Акцызнае таварыства фабрыкі запалак "Молния", Мінскае таварыства дапамогі навучэнцам і г. д. Значная колькасць удзельнікаў такога супольнага кнігавыдання яшчэ, аднак, не забяспечвала разнастайнасць у функцыянальным прызначэнні гэтых друкаў. Іх асноўную частку складалі штогадовыя справаздачы аб дзейнасці або іншыя афіцыйныя выданні, сярод якіх можна вылучыць статуты, пратаколы, каштарысы, даклады.

Аб'ёмная частка выданняў Б. І. Саламонава адносілася да рэлігійнай літаратуры (26,4 %), сярод якой – вучэбныя выданні настаўніка Закона Божага Ф. І. Міткевіча; папулярныя – прамовы і словы епіскапа Яўгенія, протаіерэя Андрэя Юрашкевіча, святара Яўгенія Варанцова; навуковыя – дакументальныя матэрыялы рэлігійных дзеячаў архіепіскапаў Віктара Садкоўскага, Антонія Зубко, Георгія Каніскага. На трэцяй пазіцыі ў кнігавыдавецкай тэматыцы друкалітаграфіі – выданні па адукацыі афіцыйнага характару (7,5 %).

Тры названыя вядучыя пазіцыі ў выдавецкай дзейнасці Б. І. Саламонава адпавядалі асноўным тэндэнцыям у развіцці тагачаснага грамадства і вызначаліся як сацыяльна-эканамічным фактарам, так і рэлігійным, і ідэалагічным. На змену польскаму ўплыву прыйшла палітыка русіфікацыі, якая абапіралася на рэлігію і адукацыю, што яскрава адбілася на выданнях Б. І. Саламонава.

Тым не менш па друках, якія выйшлі з-пад прэсаў Б. І. Саламонава, можна прасачыць, напрыклад, асноўныя тэндэнцыі развіцця гісторыка-краязнаўчых даследаванняў, пра што сведчаць творы А. П. Смародскага, М. І. Андэрсана, П. А. Аляксандрава, Я. А. Варанцова, М. І. Вержбаловіча, Я. А. Альбоўскага, А. І. Мілавідава і інш. Прыклады высокай выдавецка-паліграфічнай якасці паказваюць такія друкі Б. І. Саламонава, як "Гражданский процесс" (у 6 т.) і "Русское гражданское судопроизводство" (у 2 т.) В. Л. Ісачанкі – у галіне права; працы А. В. Шалковіча ("Конспект синтаксиса русского языка", 1880; "О создании частей речи", 1880), М. П. Каралёва ("К учебнику русской грамматики-фонетики", 1886; "Синтаксис", 1890; "Этимология русского языка", 1893); С. К. Ліхтэрмана ("Ключ и пособие к методу Берлитца английского языка", 1903) – у галіне філалогіі; бібліяграфічныя выданні І. Пастарнацкага "Хронология и систематический указатель статей, напечатанных в Минских епархиальных ведомостях (1868–1897 гг.)" (1899–1900. Ч. 1–2); кніжныя каталогі бібліятэк (Лібава-Роменскай чыгункі, Мінскага грамадскага сходу, Мінскай духоўнай семінарыі, Івана Каладзеева) і кнігарняў (В. Б. Фрумкіна, Б. В. Гадлеўскага). Увогуле ж можна адзначыць, што тэматыка выданняў друкалітаграфіі Б. І. Саламонава была ўніверсальнай (гл. Дадат. 1, табл. 1.7).

Друкарня *Равекі Мордухавай Дворжац* прадоўжыла сямейную справу Ёкеля Дворца (Янкеля Дворжаца) і заставалася адным з вядучых прыватных друкалітаграфскіх прадпрыемстваў Мінска ў 1880–1890-я гг.[286] Пацвярджэннем служаць выданні "Памятной книжки Минской губернии", якая друкавалася

[286] Памятная книжка Минской губернии на 1892 високосный год. Минск : Мин. губ. стат. ком., 1891. 408 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў 1880–1886 гг. менавіта ў Р. Дворжац, а таксама "Памятной книжки Минской дирекции народных училищ" (1891, 1892). Вядомы таксама дазвол на пацвярджэнне дзейнасці друкалітаграфіі ўжо ад 1895 г., яго атрымалі нашчадкі – сыны Дворжаца, а менавіта Зэльман-Элья Янкелеў Дворжац, які выступаў ад імя і іншых нашчадкаў[287]. Друкалітаграфія супрацоўнічала з Мінскім таварыствам сельскай гаспадаркі, што вызначыла і замацавала адпаведную спецыялізацыю і ў далейшай працы *Хаіма Якаўлевіча Дворжаца* – 1894–1904 гг., яго жонкі *Леі Гдалеўны Дворжац* – 1904–1913 гг. Дарэчы, яшчэ ў 1898 г. мінскі купец 2-й гільдыі Х. Я. Дворжац, уладальнік не толькі друкарні ў Мінску, але і фабрыкі запалак у Мазыры, выступіў адным з хадайнікаў стварэння «Товарищества типо-литографии и фабрики спичек "Молния"»[288]. Хаця ў адкрыцці названага таварыства было адмоўлена, але спроба была адной з першых у Мінску ў галіне стварэння кааператыўнага тыпаграфскага таварыства.

У 1912–1913 гг. абсталяванне друкарні Л. Г. Дворжац было распрададзена іншым мінскім друкарам[289] – Я. А. Грынблату, Б. Л. Каплану, А. Г. Данцыгу. Відаць, большая частка друкарні трапіла да Грынблата, бо толькі ў выхадных даных яго выданняў, пачынаючы з канца 1913 г., значылася, што гэта былая друкарня Дворжац. На працягу сваёй дзейнасці друкарня вызначылася спецыялізацыяй па выпуску, акрамя сельскагаспадарчай, яшчэ юрыдычнай і сацыяльна-эканамічнай літаратуры (гл. Дадат. 1, табл. 1.9, 1.26).

Друкалітаграфія *Тасьманаў* таксама дзейнічала як сямейнае прадпрыемства ў 1878–1917 гг. Заснавана мінскім мешчанінам Іллём-Абрамам Ісаакавічам Тасьманам (у архіўных дакументах – "Елля Ицков Тасьман") на аснове сумеснага з мінскім купцом 2-й гільдыі Самуілам Меяровічам Фідэрфонам прадпрыемства (1878–1881)[290]. 18-гадовы стаж працы ў Мінскай губернскай друкарні, спачатку па найму, потым стала[291], дзе Ілля Тасьман друкаваў, набіраў і трымаў першую карэктуру па ўсіх выданнях, якія друкавала Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі[292], а таксама тры гады сумеснай працы з Фідэрфонам дазволілі яму атрымаць афіцыйнае пасведчанне на адкрыццё ўласнага прыватнага прадпрыемства. Дзейнасць друкарні Іллі Тасьмана пачалася з яе тэхнічнага абсталявання. У 1882 г. набыты ў Коўне ў Ф. М. Ліціца два літаграфічныя станкі[293], у 1891 г. – адна машына хуткадруку ў І. Гольдберга ў С.-Пецярбурзе і адна машына ў Свідэрскага ў Ляйпцыгу, два бастонскія прэсы (адзін куплены ў Я. Фаянса ў Варшаве), берлінскі літаграфскі ручны станок і рэзальная машына[294].

Перыядычна да тыпаграфскіх работ далучаліся камерцыйныя кампаньёны Тасьмана: З.-А. Д. Мейлаховіч – мастак і друкар з Гродна; Ш. А. Левін – былы наборшчык Мінскай губернскай друкарні, якія ўтваралі часовыя друкарскія таварыствы. У 1893 г. у наборшчыкі да І. Тасьмана і Ш. Левіна паступіла ўжо 12 чала-

---

287 НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 865. Арк. 182.
288 Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6447. Арк. 1–5.
289 Тамсама. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4817. Арк. 29.
290 Тамсама. Воп. 1. Спр. 3397. Арк. 1–6.
291 Тамсама. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 2621. Арк. 1–3.
292 Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3395. Арк. 6.
293 Тамсама. Спр. 3398. Арк. 12.
294 Тамсама. Спр. 6784. Арк. 7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

век[295], што можа быць сведчаннем арганізацыі малога тыпаграфскага прадпрыемства.

Друкалітаграфія І. Тасьмана выступала і як выдавецкае прадпрыемства "Тасьмана и сыновей" у 1897–1913 гг., часцей – як "Типо-литография И. и В. Тасьман" у 1900–1915 гг., калі выйшлі і ўласныя наклады друкароў (у 1909–1910 гг.). Прадаўжальнікамі справы Іллі Тасьмана сталі яго сыны Вульф і Ісаак. Іх прадукцыя датуецца 1906–1916 гг. ("В. и И. Тасьман").

Тасьманы імкнуліся пашыраць сваю дзейнасць за межы Мінска, сістэматычна хадатайнічалі перад начальнікамі Віленскай, Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай, Чарнігаўскай губерняў аб адкрыцці там друкарняў[296]. Як нам стала вядома, згодна з пасведчаннем 1895 г. сын Іллі Тасьмана, Вульф Тасьман, утрымліваў друкарню у г. Краляўцы Чарнігаўскай губерні. Неабходнасць пашырэння дзейнасці за межы Мінска В. Тасьман тлумачыў канкурэнцыяй у працы з дзвюма мінскімі друкалітаграфіямі – Дворжаца і Саламонава. У сувязі з тым, што яго чатыры вялікія друкалітаграфскія машыны зусім бяздзейнічаюць[297], ён вымушаны шукаць іншыя месцы для размяшчэння сваёй друкарні. Аднак адкрыць яшчэ адну друкарню было вельмі складанай справай, якую Тасьман змог ажыццявіць часткова, адкрыўшы філіял (або аддзяленне) сваёй друкарні толькі ў Мінску.

У дзейнасці фірмы Тасьманаў былі спробы развіцця ўласнага кнігагандлю, калі пры друкалітаграфіі ў 1899 г. была адкрыта кнігарня, праца якой мела часовы характар і не атрымала пэўнага адлюстравання ў дакументах ці іншай літаратуры. Тасьманы з'яўляліся таксама выдаўцамі і рэдактарамі мінскіх газет "Северо-Западный край"[298], "Минский Голос"[299]. У сувязі з гэтым у 1915 г. Вульф Тасьман, рэдактар-выдавец газеты "Минский Голос", спрабаваў арганізаваць "контору для продажи газет и журналов"[300].

За гады сваёй дзейнасці сямейная фірма Тасьманаў надрукавала не менш як 313 выданняў – другая пазіцыя сярод прыватных друкарняў. Да 1905 г. выйшла 117 выданняў. Як і друкалітаграфія Б. І. Саламонава, значная колькасць прадукцыі тут выпушчана сумесна з іншымі дзяржаўнымі, грамадскімі і прыватнымі выдавецтвамі, якія прадстаўлены больш чым 40 установамі: Мінскай гарадской управай, Мінскай губернскай управай па справах земскай гаспадаркі, Мінскай павятовай земскай управай, Мінскім таварыствам урачоў, Мінскім ваенна-санітарным камітэтам, Мінскім гарадскім крэдытным таварыствам і інш. У асноўным гэта былі выданні сацыяльна-эканамічнай тэматыкі, функцыяй якіх было асвятленне і інфармаванне аб дзейнасці названых прадпрыемстваў. У працы друкалітаграфіі можна таксама вылучыць пэўную спецыялізацыю – гэта выданні медыцынскай, юрыдычнай і сельскагаспадарчай тэматыкі (гл. Дадат. 1, табл. 1.10).

У 1908–1909 гг. Вульф Ільіч Тасьман стаў адным з заснавальнікаў "Товарищества Минчанин", якое ўзяло на сябе выданне штодзённай грамадска-палі-

295 Тамсама. Спр. 5416. Арк. 85.
296 Тамсама. Спр. 6787. Арк. 4–8.
297 Тамсама. Воп. 1. Спр. 5416. Арк. 85.
298 Тамсама. Спр. 8146. Арк. 5.
299 Тамсама. Ф. 300. Воп. 1 сч. Спр. 66. Арк. 891.
300 Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 9057. Арк. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычнай і літаратурнай газеты "Минское Эхо", праіснаваўшай, аднак, даволі кароткі час, крыху болей года, цягам якога, з 12 мая да 3 кастрычніка 1909 г., правы на выданне газеты належала выключна В. І. Тасьману[301].

Валодаючы пэўнымі сродкамі (часткова прыватнымі дамамі), а таксама шырокім колам заказчыкаў, названыя друкалітаграфіі Б. І. Саламонава, Дворжацаў, Тасьманаў ужо ў 1904 г. мелі значную колькасць рабочых[302]: Дворжацы – 80, Тасьманы – 61, Саламонаў – 58. Большасць уладальнікаў друкалітаграфій асабіста ўзначальвалі працу сваіх прадпрыемстваў, некаторыя, як Лея Дворжац[303], Ілля Каплан[304], наймалі вопытных кіраўнікоў. Аднак удзел у кнігавыдавецкім працэсе нават буйнейшых друкалітаграфій заключаўся ў рэалізацыі сумесных з іншымі ўстановамі выданняў. Выключэнне складалі асабіста выкананыя наклады друкароў Тасьманаў. Большасць друкарняў гэтага перыяду (Каплана, Нахумава, Някрасава, Форына) пачыналі сваю дзейнасць, а іншыя (Кліёрынай, Соськіна, Шапіра, Рубенчыка) знаходзіліся ў даволі цяжкім матэрыяльным становішчы, былі вымушаны весці канкурэнтную барацьбу шляхам штучнага зніжэння цэн на заказы і шукаць дзе б ні было работы, а таму, напэўна, не грэбавалі выкананнем не зусім легальных заказаў[305]. Іх кнігавыдавецкая дзейнасць была кароткачасовай, эпізадычнай і цалкам падпарадкоўвалася кан'юнктуры рынку.

Адной з буйнейшых друкарняў у 1902–1917 гг. была электрадрукалітаграфія *Севярына Андрэевіча Някрасава,* прафесійнага фатографа, члена Рускага фатаграфічнага таварыства. Атрымаўшы ў 1890–1891 гг. дазвол мець пры пераплётнай майстэрні ў Мінску рускія, французскія, нямецкія і славянскія шрыфты, развіў сваё прадпрыемства да буйной на той час друкарні, у якой пачынаючы з 1902 г.[306] стаў выконваць, акрамя пераплёту, друк высакаякасных ілюстрацый і мастацкае афармленне друкаваных прац, рэпрадукцыі. Аднак нам вядома толькі адно такое ілюстраванае выданне, надрукаванае і выдадзенае С. Някрасавым у 1904 г., – "Виды г. Минска: альбом" (Ч. I). Аўтарам змешчаных у альбоме 23 здымкаў архітэктурных помнікаў г. Мінска з'яўляўся сам выдавец. Асноўная тэматыка кніжных выданняў Някрасава – рэлігійная (45,9 %), палітычная (10,6), гістарычная (13,1) і сацыяльна-эканамічная (8,2 %). Значнасць у выдавецкім рэпертуары рэлігійнай тэматыкі была звязана з дзейнасцю Някрасава як выдаўца "Минских епархиальных ведомостей". У гэтых выданнях асвятляліся тэмы рэлігіі і навукі, праваслаўя і каталіцызму, праваслаўя і ўніяцтва. Пэўнае месца займала літаратура пра рэлігійных дзеячаў. Нязначную колькасць складалі малітвы, прамовы і словы, вучэбныя выданні. Сярод рэлігійных выданняў пераважалі адбіткі або дадаткі да "Минских епархиальных ведомостей", "Братского листка", "Минского слова", якія мелі папулярны характар.

Замоўцамі і выдаўцамі рэлігійнай літаратуры ў электрадрукалітаграфіі С. А. Някрасава былі Мінская епархія, Мінскае праваслаўнае народнае брацтва

[301] Тамсама. Воп. 1. Спр. 7705. Арк. 40–45.
[302] Тамсама. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 31. Арк. 22–25.
[303] Тамсама. Спр. 7461а. Арк. 3 зв.
[304] Тамсама. Спр. 94. Арк. 3–4.
[305] Тамсама. Спр. 7461 а. Арк. 4.
[306] Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 4845. Арк. 1–16.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Св. Крыжа, Мінскае праваслаўнае Св.-Мікалаеўскае брацтва, Царкоўна-прыходскае папячыцельства пры Мінскім кафедральным саборы, Мінскі царкоўны гісторыка-археалагічны камітэт, Мінскі губернскі статыстычны камітэт. Гістарычная тэматыка прадстаўлена навукова-папулярнымі выданнямі, папулярнымі і навуковымі. Аднак і ў гістарычных выданнях Някрасава таксама вылучаецца рэлігійная тэматыка, што дае яшчэ адну падставу для пацвярджэння спецыялізацыі ў дзейнасці прадпрыемства (гл. Дадат. 1, табл. 1.19).

Спецыялізацыя ў кнігавыдавецкай дзейнасці прасочваецца і ў рабоце друкалітаграфіі *Іллі Каплана* (з 1898 г.), які супрацоўнічаў з Мінскім таварыствам урачоў і выдаваў літаратуру па медыцыне; друкалітаграфіі *Якава Абрамавіча Грынблата* (з 1904 г.) – прадоўжыў традыцыйныя сувязі друкарні Дворжацаў з Мінскім таварыствам сельскай гаспадаркі, вызначыўшыся тым самым у выданні сельскагаспадарчай літаратуры; друкалітаграфіі *Яўсея Шэпшалевіча Гатоўскага і Меера Хаімавіча Юршчыка* (з 1906 г.) – выданне матэматычнай (вучэбнай) літаратуры; *Неваха Моўшавіча Нахумава* (з 1893 г.) – мастацкай і вучэбнай літаратуры на беларускай мове; *Ліўшыца-Баршая* (з 1910 г.) – мастацкай літаратуры на рускай мове; *Меера Лейбавіча Зысьмана* (з 1910 г.) – мастацкай літаратуры на яўрэйскай мове; кнігарні-выдавецтва *Вацлава Макоўскага* (з 1900 г.) – мастацкай літаратуры на польскай мове.

Яскравым прыкладам дынамічнага развіцця друкарскага варштату з'яўляецца электрадрукалітаграфія мінскага мешчаніна *Неваха Моўшавіча Нахумава,* які пасля 12-гадовай тыпаграфскай працы (у 1883–1885 гг. – наборшчыкам у Іллі Тасьмана) атрымаў у 1892 г. дазвол і пасведчанне "содержать в Минске машину для печатания общежитейских и домашних предметов, а также машину для тиснения каучуковых штемпелей"[307]. Праз год Нахумаў звяртаецца з просьбай дазволіць адкрыць "хуткадрукарскае прадпрыемства", якое толькі з 1896 г. набывае статус друкарні. З архіўных дакументаў, а менавіта з "выписки из книги для записи работ, которые выполняются в типографии Н. М. Нахумова за 1896 год, пронумерованной и скреплённой", можна меркаваць, што дзейнасць Нахумава насіла напачатку толькі паліграфічны характар. У "пячатні" друкаваліся "тальныя кніжкі на дровы", "бланкі для даверанасцей", "каштарысы кніжных магазінаў", "запрашальныя білеты", "квітанцыі", "вясельныя білеты", "візітныя карткі"[308] і інш. Праз два гады праз пасрэдніцтва словалітні Б. Эрленбаха ў С.-Пецярбурзе Нахумаў набывае яшчэ адну нямецкую машыну хуткадруку і зноў звяртаецца з просьбай аб дазволе адкрыць "тыпаграфскае прадпрыемства", які і атрымлівае ў пачатку 1899 г.[309] Набываючы абсталяванне для друкарні, у 1903–1904 гг. Нахумаў здолеў нарэшце заявіць аб сабе як аб кнігадрукару, уладальніку друкалітаграфіі, у якой налічвалася 16 рабочых[310].

З 1905 г. – гэта ўжо электрадрукалітаграфія, найбольш актыўны час дзейнасці якой у галіне кнігадрукавання прыпадае на 1913–1917 гг. Нахумаў стаў адным з першых мінскіх друкароў, які сумесна з мінскімі рэдакцыямі-выдавецтвамі "Саха", "Лучынка", "Вясёлка", "Вольная Беларусь" пачаў выдаваць кнігі на

307 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 5418. Арк. 3–33.

308 Тамсама. Спр. 5418. Арк. 37 адв.

309 Тамсама. Арк. 134–142.

310 Тамсама. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 3806. Арк. 651.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай мове. Сярод іх – сельскагаспадарчыя: “Гадоўля кролікаў (трусоў)” (1914) А. Вілецкага, “Найвялікшы наклад у гаспадарцы” (1914); мастацкія: зборнік польскіх апавяданняў у перакладзе Тэрэзы Гардзялкоўскай “Што б не здарылася – вытрываю” (1914), “Беларускія жарты” (1915), “Дзіцячая чытанка” (1917), “Сцэнічныя творы” (1917) Я. Коласа, «Літаратурны зборнік “Вольнае Беларусі”» (1917); грамадска-палітычныя: “Мэморыя прадстаўнікоў Беларусі на III-яй канферэнцыі”, пададзены і перакладзены на беларускую мову Б. Эпімах-Шыпілам (1917), “Аўтаномія Беларусі” (1917) Я. Лёсіка. Прыярытэты ў кнігавыдавецкім рэпертуары Н. М. Нахумава складалі сацыяльна-эканамічныя выданні (26,9 %) і выданні па мастацкай літаратуры – 23,1 %, паводле функцыянальнага прызначэння – літаратурна-мастацкія, вучэбныя і навукова-папулярныя – па 19,2 %, што адрознівала яго ад іншых мінскіх друкароў, у якіх на першым месцы былі афіцыйныя выданні (гл. Дадат. 1, табл. 1.16).

Такім чынам, асноўныя кірункі кнігавыдання сталі своеасаблівым адлюстраваннем тэндэнцый развіцця тагачаснага мінскага грамадства, што ў сваю чаргу вызначыла спецыялізацыю мінскіх друкарняў. Тэхнічнае развіццё і ўдасканаленне абсталявання друкарняў спрыялі пашырэнню выдавецкіх паслуг. Дзейнасць мінскіх друкарняў звычайна пачыналася з выканання дробных замоў з выкарыстаннем адной тыпаграфскай машыны ці ручнога станка, пазней, у большасці сваёй, маламагутныя прыватныя друкарні развіваліся да друка- і электрадрукалітаграфічных прадпрыемстваў з розным спектрам тыпаграфскіх паслуг – Б. І. Саламонава, І. І. Тасьмана, С. А. Някрасава, Н. М. Нахумава, Д. Ш. Форына, І. Каплана, Я. А. Грынблата. Буйнейшыя з іх былі сямейнымі прадпрыемствамі – Дворжацаў, Тасьманаў; іншыя перапрадаваліся – І. Х. Шапіры, Ц. Мазо, Кліёрынай, Бляхава (гл. Дадат. 1).

### *Кнігарні*

З другой паловы 1850-х гг. уладальнікі мінскіх кнігарняў далучаюцца да разнастайных кнігавыдавецкіх праектаў. Сярод першых былі браты Бейліны – *Г. Бейлін і С. Бейлін*[311]. Як адзначыў “Kurier Wileński”, менавіта дзякуючы кніжнаму гандлю, а ў мінскай кнігарні Бейліных (Гіршы і Шымона. – *Л. Д.*) налічвалася да 5 тыс. тамоў найноўшых твораў сучасных пісьменнікаў, Бейліны мелі цесныя выдавецкія сувязі з варшаўскімі (І. Унграм, С. Оргельбрандам), віленскімі (А. Сыркіным), мінскімі (Ё. Дворцам) друкарамі. Вынікам іх супрацоўніцтва сталі сумесныя кнігавыдавецкія праекты: у 1855 г. – два з Ё. Дворцам, у 1858 і 1859 гг. – з А. Сыркіным і С. Оргельбрандам. Кнігавыдавецкая дзейнасць Бейліных была накіравана на падтрымку мясцовых аўтараў, сярод якіх В. Дунін-Марцінкевіч, А. Плуг, У. Сыракомля, М. Шышка. Бейліны спрабавалі вырашыць адначасова як камерцыйныя інтарэсы, выдаючы менавіта мастацкую літаратуру, так і асветныя.

Асаблівай з’явай у кнігавыданні гэтага перыяду сталі менавіта мастацкія творы В. Дуніна-Марцінкевіча на беларускай мове, надрукаваныя ў Мінску лацінкай, у ліку іх “Hapon: powieść białoruska z prawdziwego zdarzenia, w języku

[311] История белорусской дооктябрьской литературы / АН БССР, Ин-т литературы им. Я. Купалы ; ред. В. В. Борисенко, Ю. С. Пширков, В. А. Чемерицкий. Минск : Наука и техника, 1977. С. 320.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

białoruskiego ludu napisana" (1855). Фінансаванне выдання ажыццявіў Гірш Бейлін. Яшчэ і ў 70 – 80-я гг. XIX ст. адзначаецца дзейнасць у Мінску кнігарні Бейлiных – Ёселя і Мордуха[312]. Аднак пазнейшы перыяд у дзейнасці кнігарні, відаць, быў звязаны толькі з кніжным гандлем.

Кнігарня *Аляксандра Валіцкага.* Асноўным выдаўцом нотна-музычнай літаратуры, як правіла, уласным накладам, у 1860-я гг. у Мінску быў Аляксандр Валіцкі, літаратар, музычны крытык, супрацоўнік варшаўскага часопіса "Ruch muzyczny", віленскай газеты "Kurier Wileński", а таксама ўладальнік мінскай кнігарні[313]. А. Валіцкі падтрымліваў сувязі з такімі літаратарамі, як В. Дунін-Марцінкевіч, А. Кіркор, У. Сыракомля, і кампазітарамі – Д. Стафановічам, С. Манюшкам, Ф. Міладоўскім, Ю. Сікорскім і інш.

У выданні нотна-музычнай літаратуры ён наладзіў прафесійныя кантакты з прадпрыемствамі па іх друку не толькі ў Мінску (літаграфія Э. Адамовіча), але і ў Варшаве (друкарня-штыхарня Г. Гебетнера і Р. Вольфа, літаграфія У. Отта), а найболей – у Ляйпцыгу (літаграфія і штыхарня К. Г. Родэра). Як сведчыць польскі вучоны У. Тамашэўскі, паслугамі ляйпцыгскай штыхарні Родэра ў XIX ст. карысталіся і вядучыя выдаўцы нотна-музычнай літаратуры з Варшавы[314]. Тэхніка глыбокага друку дазваляла шматразовае выкарыстанне зробленых матрыц у залежнасці ад попыту на той ці іншы музычны твор. Да адкрыцця ўласнай штыхарні кнігавыдавецкая фірма Гебетнера з Варшавы таксама друкавала свае нотныя выданні ў Ляйпцыгу. У канкурэнтнай барацьбе ў галіне нотадрукавання выходзілі на першыя месцы менавіта спецыялізаваныя прадпрыемствы, такія як Родэра ў Ляйпцыгу, Гебетнера і Вольфа ў Варшаве, у якіх былі і даволі высокія аўтарскія ганарары[315].

У планах А. Валіцкага-выдаўца было ажыццяўленне друку каля 50 нотна-музычных твораў, якія прэзентавалі песні, аперэты, танцавальную музыку С. Манюшкі, Ф. Міладоўскага, В. Пшыборы, А. Грунера, К. Лады, А. Бартэльса (гл. Дадат. 1, табл. 1.6).

Неабходна адзначыць, што А. Валіцкі ўдзяляў значную ўвагу рэкламе сваіх выданняў, выкарыстоўваючы пры гэтым самі ж выданні. Прыкніжныя бібліяграфічныя спісы ў выглядзе абвесткі, "што выйшла і што хутка выйдзе", ці каталогу музычных нот[316] у такіх выданнях, як "Konkurenci" (1861) М. Лапіцкага, "Do Basi" (1862) С. Манюшкі, "Listek rózany" (1862) А. Грунера і інш., дапамаглі зрабіць дапаўненні да характарыстыкі выдавецкай дзейнасці. Адносна высокая дынаміка нотавыдання ў параўнанні з іншымі тыпамі літаратуры мела першапрычыну менавіта ў патрэбе культурнага развіцця Мінска, на якое значны ўплыў зрабіў і сам А. Валіцкі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

312 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3396. Арк. 146; НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 2810. Арк. 34.

313 *Мальдзіс А. І.* Валіцкі Аляксандр // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мінск : БелСЭ, 1984. Т. 1. С. 565.

314 *Tomaszewski W.* Warszawskie edytorstwo muzyczne w latach 1772–1865 / B-ka Narodowa ; In-t Książki i Czytelnictwa. Warszawa : B-ka Narodowa, 1992. S. 97–100. (Z Dziejów Kultury Czytelniczej w Polsce ; 5).

315 Ibid. S. 118.

316 "Katalog nut muzycznych wydanych nakładem Aleksandra Walickiego w Mińsku".

Асветніцкім мэтам служыў укладзены і надрукаваны ў 1862 г. у Э. Адамовіча накладам А. Валіцкага "Elementarz Ścienny" ("Насценны Буквар"). У лісце да Адама Плуга ад 17 верасня 1862 г. А. Валіцкі дзякуе сябру за водгук у газеце пра "Elementarz" і зазначае, што ўжо "20 000 exempl. sprzedałem, nie dawszy ani jednego księgarzom"[317]. Адначасова, як можна заўважыць, важным быў і камерцыйны падыход да справы.

Прадоўжыла традыцыі кнігара-выдаўца А. Валіцкага яго сястра *Зоф'я Савіцкая*, якая стала з лютага 1863 г., пасля высылкі брата ў Тамбоў, уладальніцай кнігарні ў Мінску[318]. З. Савіцкай належаць наклады выданняў на польскай мове: у 1881 г. – "Dwa Bogi, dwie drogi" Ю. Крашэўскага (у 2 т.), у 1889 г. – "W mieście i na wsi" К. Дарэўскай-Вярыга. Выданні здзейснены сумесна, адпаведна з Ю. Сікорскім, друкаром і выдаўцом з Варшавы, і У. Анчыцам – з Кракава. Як адзначана ў дадатковым томе, suplemencie, да "Słownika pracowników książki polskiej", у 1884 г. З. Савіцкая выдала ўласным накладам яшчэ і «"książkę gwiazdkową" 21 powiastek dziecinnych oprac. przez pisarzy Mińszczyzny»[319]. Названыя мастацкія творы сталі пэўнай падзеяй у культурным жыцці Мінска, дзе, як занатавала Э. Ажэшка, "… наша мэта – узбуджэнне інтэлектуальнага руху…"[320] Неабходна адзначыць, што творы былі выдадзены ў час, калі дзейнічала забарона на польскамоўны друк.

У канцы 1894 г. кнігарня З. Савіцкай[321] была набыта Багуславам Адамовічам, а ў 1898 г. перайшла да наступнага ўладальніка *Яна Філіповіча-Дубовіка*, які таксама спрабаваў падтрымліць яе выдавецкія традыцыі[322]. Пачаткам выдавецкай працы сталі ў 1898 г. паэтычныя творы мінчукоў, а менавіта "Melodye" Б. Адамовіча (выдадзены сумесна з варшаўскім друкаром Каўтзам) і "O brzasku" Ю. Вяржбіцкага (сумесна з кракаўскім друкаром У. Анчыцам). Вядомы яшчэ два выданні, надрукаваныя дзякуючы накладу кнігарні; гэта таксама польскамоўныя творы: "Studia muzyczne" (1899) М. Ельскага і "Przyczyny chorob roslin hodowlanych w pokoju i sposób ich leczenia" (1900) Я. Ляскоўскага[323] (гл. Дадат. 1, табл. 1.17).

З 1900 г., а асабліва ў 1905–1917 гг., актыўнай была кнігавыдавецкая дзейнасць *Вацлава Макоўскага*, уладальніка філіі віленскай кнігарні ў Мінску. Яшчэ ў 1879–1882 гг. В. Макоўскі браў удзел у працы віленскай суполкі "E. Orzeszkowa i S-ka", дзейнасць якой па сутнасці была нелегальнай, скіраванай на распаўсюджванне польскамоўных твораў. Пад кіраўніцтвам Элізы Ажэшкі В. Макоўскаму і яшчэ аднаму супрацоўніку суполкі У. Хэлміньскаму ўдалося выдаць 20 выданняў, якія, як лічыць А. І. Мальдзіс, у значнай ступені садзейнічалі

[317] AGAD. III. Archiwum Przezdzieckich. B–1430. Aleksander Walicki do niewiadomego. 1862. L. 2.

[318] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku … S. 88.

[319] *Treichel I.* Sawicka Zofia // Słownik pracowników książki polskiej : suplement / pod red. I. Treichel. Warszawa ; Łódź : Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1985. S. 191.

[320] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku … S. 89.

[321] Прададзена пасля смерці Аляксандра Валіцкага.

[322] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku … S. 88.

[323] Ibid.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіццю культуры і на беларускіх, літоўскіх землях[324]. Пасля закрыцця выдавецкай суполкі ў 1882 г. В. Макоўскі, у сувязі з непаўналеццем сыноў Фелікса Завадскага, да 1893 г., а значыць да адкрыцця ўласнай кнігарні ў Вільні, узначальваў знакамітую фірму[325] па выданні і распаўсюджванні друкаванай прадукцыі. Такім чынам, быў набыты значны вопыт у галіне кніжнай справы.

Філія віленскай кнігарні В. Макоўскага ў Мінску, падтрымліваючы наклады выданняў у сумесных праектах, далучылася да выпуску і распаўсюджвання асабліва твораў мастацкіх (вершы Ю. Вяржбіцкага, аповесці, гавэнды, казкі А. Глінькага, аповесці і ўспаміны В. Макоўскага, зборнік-прысвячэнне А. Міцкевічу і Т. Зану) і гістарычных (У. Загорскага, К. Скірмунт). Друк кніжных выданняў ажыццяўляўся пераважна ў Вільні, а таксама ў Варшаве і Кракаве. Сталым заставалася супрацоўніцтва з буйнейшай варшаўскай фірмай Гебетнера і Вольфа[326], у якой В. Макоўскі атрымаў свой першы прафесійны вопыт[327].

Усяго вядома каля 30 кніжных выданняў на польскай мове, ажыццёўленых В. Макоўскім у 1901–1915 гг. ад імя віленскай і мінскай кнігарняў. Выданні вызначаюцца даволі высокай паліграфічнай якасцю выканання.

Пэўны ўклад у развіццё кнігавыдавецкага працэсу ў Мінску ў канцы 1880-х – 1917 гг. унесла кнігарня *Ёселя Фрэнкеля*, які засяродзіўся на выданні вучэбнай і даведкава-інфармацыйнай літаратуры. З'яўляючыся распаўсюджвальнікам вучэбных выданняў, Фрэнкель добра разумеў і адчуваў патрэбы ў гэтай літаратуры, а развіццё матэматычнай школы ў Мінскай гімназіі дазволіла выпусціць шэраг выданняў мясцовых матэматыкаў (С. А. Казлоўскага, М. К. Лаўрова). Накладам кнігарні выходзілі бібліятэчныя кніжныя каталогі, календары і даведнікі (гл. Дадат. 1, табл. 1.18). Выданнем выключна кніжных каталогаў займалася ў 1883–1914 гг. кнігарня і бібліятэка *Вульфа Фрумкіна.*

Далучэнне мінскіх кнігарняў да выдавецкай дзейнасці сведчыла аб іх актыўнай ролі ў фарміраванні і распаўсюджванні кніжнай культуры. Яны, безумоўна, з'яўляліся цэнтрамі культурнага жыцця і распаўсюджвання прагрэсіўных ідэй мясцовай інтэлігенцыі. Тут перасякаліся творчыя, асветныя і камерцыйныя інтарэсы аўтараў, выдаўцоў, чытачоў. Нездарма некаторыя друкары засноўвалі свае кнігарні (Тасьман, Саламонаў, Левін), а кнігары ставілі друкарскія станкі і адкрывалі чытальні (Фрумкін, Фрэнкель), удзельнічалі ў сумесным кнігавыданні з іншымі друкарамі. Кнігагандлёвыя і кнігавыдавецкія інтарэсы былі тэматычна, функцыянальна і камерцыйна цесна звязаны.

### *Выдаўцы ўласных твораў*

Не менш як 20 мінскіх аўтараў-выдаўцоў уласных твораў вызначыліся ў выпуску іх накладаў у 1795–1917 гг. Адным з першых трэба назваць *Ігната Лега-*

324 *Мальдис, А. И.* Из истории издательской деятельности Э. Ожешко // Литература славянских народов : сб. ст. Москва : АН СССР, 1963. Вып. 8. / отв. ред. И. М. Шептунов. С. 249–251.

325 *Sowiński J.* Polskie drukarstwo. Historia drukowania tzpograficynego i sztuki typograficznej w Polsce w latach 1473–1939. Wyd. 2, poprawione i rozszerzone. Wrocław : Tart, 1996. S. 112.

326 *Lewandowski S.* Poligrafia Warszawska 1870–1914. S. 139–143.

327 *Makowski W.* Wspomnienia starego księgarza na tle 52-letnich osobistych przeżyć… Cz. 2 : 1879–1893. S. 222.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*товіча,* паэта-сатырыка, перакладчыка, прафесара Мінскай гімназіі, бібліёграфа[328]. Ім былі падрыхтаваны і выдадзены ў Мінску дзве кнігі – гэта ўласны твор "Wiersz na obchód imienin Giecewicza gub[ernatora] Mińskiego" – 1822 г., верш-прысвячэнне, а таксама пераклад з нямецкай мовы навукова-папулярнага твора XVII ст. Яна Германа па сельскай гаспадарцы "Ziemianin, albo Gospodarz Inflandski" – 1823 г. (друк ажыццёўлены І. Стафановічам).

Каштоўныя звесткі змешчаны ў "Przedmowie wydawcy" да апошняга з названых выданняў. Прадмова напісана і падпісана ад імя менавіта выдаўца – "Ignacy Legatowicz Naucz: w Gymn: Min:". У прадмове І. Легатовіч прадставіў звесткі з гісторыі перакладу працы Я. Германа на польскую мову (1673 г., 1791 г.) і яе друку ў Слуцку і Вільні. Адзначыўшы вялікую рэдкасць карыснага для гаспадаркі выдання, ён таксама гаворыць пра неабходнасць удасканалення перакладу, асаблівасці ўласнага перакладу і друку выдання. Падае выдавец і цікавую гісторыю з'яўлення названага твора ў Мінску: "Zdobyłem się na edycyą, na jaką w Mińsku zdobydż[ć] się można. Pierwsze sześć arkuszy niegodziwie drukował żyd maiący tu nikczemną drukareńkę i aręduiący rządową drukarnię: ten wybrawszy zgóry umowioną ode mnie sobie należność, przestał nareszcie kończyć, tak, że musiałem inaczey szukać drukarni. Początek, koniec i okładkę dorobił Stefanowicz"[329]. З прыведзеных слоў І. Легатовіча яскрава паўстае даволі бедная карціна пачаткаў друкарскай працы ў горадзе, а з таго і нядобрасумленнасць у дзейнасці некаторых з друкароў, у дадзеным выпадку гаворка ідзе пра Зымеля Прэса, які ўзяўся, аднак не давёў друк перакладу І. Легатовіча да канца, тым не менш скарыстаўшы сродкі выдаўца.

Найбольш значным і адметным сярод аўтараў-выдаўцоў з'яўляецца *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.* Яго выдавецкая дзейнасць заключалася ў зборы накладу і грашовых сродкаў на выданне сваіх беларуска-польскіх мастацкіх твораў, якія яму ўдалося надрукаваць у Мінску і Вільні ў 1846–1859 гг. У Мінску выйшла шэсць кніг (у 1854, 1855, 1856, 1857 гг.), чатыры з іх, што змяшчалі тэксты пісьменніка на беларускай мове, дайшлі да нашага часу, два выданні зафіксаваны толькі ў бібліяграфіі – "Wiersze różne"* (1854), "Błogosłowiona rodzina" (1856). Захавалася некалькі асобнікаў забароненага (ужо пасля выхаду ў свет) выдання 1859 г. перакладу першай часткі "Pana Tadeusza" А. Міцкевіча на беларускую мову, якое мы лічым мінска-віленскім выданнем, аргументуючы гэта тым, што асноўныя сродкі на выданне ў віленскай друкарні А. Сыркіна былі сабраны Дунінам-Марцінкевічам на Міншчыне (на с. 117–120 выдання змяшчаецца спіс падпісчыкаў), аўтарам перакладу і выдаўцом выступаў В. Дунін-Марцінкевіч. Наклады выданняў сваіх твораў у Мінску В. Дунін-Марцінкевіч атрымліваў і ад мінскага друкара Ё. Дворца – 1850–1857 гг., кнігарні братоў Бейліных – 1855 г., постаці якіх знайшлі адлюстраванне ў вершаваных творах паэта.

---

328 *Умецкая Е. С.* Книгоиздание в Белоруссии в первом тридцатилетии XIX века (1801–1832). С. 80–82.

329 *Legatowicz I.* Przedmowa wydawcy // Herman Jan z Neydenburku. Ziemianin, albo Gospodarz Inflandski w roku M.D.C.LXII. do druku podany, a teraz z niemieckiego na polski język przetłumaczony w roku 1671 i powtórnym razem w druk podany w Słucku w Drukarni roku 1673. Mińsk : [I. Legatowicz], 1823 (W drukarni Nowej J. Stefanowicza). S. 5.

* Гл. ч. II: Каталог.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачатак 1860-х гг. адзначаны ўдзелам у кнігавыданні такіх аўтараў-выдаўцоў, як *Л. Шчарбовіч* (Людамір Вечар), *Ф. Чапяліньскі, А. Валіцкі.* Усе названыя аўтары выпусцілі свае літаратурна-мастацкія творы ў мінскіх друкароў Ё. Дворца і Э. Адамовіча за ўласны кошт.

У 1865–1904 гг. у мінскім кнігавыданні назіраецца ўключэнне ў выдавецкі працэс аўтараў-выдаўцоў не толькі літаратурна-мастацкага кірунку (паэтаў, пісьменнікаў, мастацтвазнаўцаў), але і матэматыкаў – *С. А. Кацэнеленбогена*, *М. Лаўрова*; мовазнаўцаў – *С. Валіцкага*, *В. Бекю;* археолагаў – *Г. Татура*; краязнаўцаў – *І. А. Бамштэйна*.

Выдаўцом твораў мастацкай літаратуры ў гэты час выступае *Дарафей Бохан*, паэт і перакладчык на рускую мову (у асноўным з польскай мовы), рэдактар і супрацоўнік шэрагу мясцовых перыядычных выданняў. У 1898 г. яго накладам выйшаў зборнік вершаў "Колосья". Рыхтаваўся да выдання на рускай мове шэраг кніг: 1) "Собрание сочинений в новых переводах русских писателей" А. Міцкевіча (пад рэдакцыяй Д. Бохана); 2) раман Марсэля Прэво "順шетта" ў перакладзе з французскай "Е. Бохан" (выданне Д. Бохана); творы самога Д. Бохана: 1) зборнік уласных вершаў "Первые песни" (1895–1897); 2) крытычны эцюд "С. Я. Надсон как выразитель идей и стремлений современного общества", 3) "Русское духовенство и его роль в деле образования народного миросозерцания", 4) "Очерки истории русской поэзии с древнейших времен до наших дней", 5) "Польские поэты в биографиях и образцах". Аднак, акрамя аб'явы аб выданні гэтых твораў у кнізе паэтычнага перакладу са стараславянскай мовы "Игорь князь Северский"[330] (Мінск, 1897), аўтарам якога таксама быў Д. Бохан, мы не маем пра іх іншых звестак.

У 1904 г., калі «К. Кастравіцкі (К. Каганец) падаў міністру ўнутраных спраў просьбу дазволіць выдаваць у Мінску беларускую газету "Палессе", рэдактарам меўся быць Бохан[331]». Газета, як вядома, не з'явілася.

У мінскіх перыядычных выданнях змяшчаліся таксама публікацыі Д. Бохана, прысвечаныя пытанням друку, у тым ліку беларускага. Да прыкладу, у адной з рэцэнзій "Голоса провинции" (1906. 5 верас.) ім вітаўся выхад у свет газеты "Наша Доля".

Актыўна займаўся выданнем сваіх твораў *Аляксандр Ельскі*, пісьменнік, публіцыст, краязнавец, бібліёграф. Першыя з іх, што выйшлі ў Мінску, былі перакладамі з польскай мовы на рускую прац па псіхалогіі Ю. Ахаровіча – 1876, 1877 гг. Неабходна адзначыць, што ў 1895, 1896, 1900 гг. А. Ельскі выдаваў свае беларускамоўныя творы ў С.-Пецярбурзе, а ў 1906 і 1908 гг. – у Вільні. Да распаўсюджвання іх былі прыцягнуты мінскія кнігарні, напрыклад, Б. Адамовіча і Я. Філіповіча-Дубовіка. У 1907 г. у Мінску А. Ельскі выдаў кнігу на польскай мове, прысвечаную дзейнасці Мінскай дыяцэзіі, яе гісторыі.

Далучыўся да выдавецкай дзейнасці ў Мінску ў канцы 1870-х гг. кампазітар *Міхал Грушвіцкі*. Дарэчы, малодшая сястра А. Ельскага Станіслава была замужам за М. Грушвіцкім, а сам кампазітар часта наведваўся ў Замосце, аглядаў знакамітыя бібліятэку і музей Аляксандра Ельскага. У "Кнізе для запісу..." на-

330 "Слова пра паход Ігаравы".

331 *Конан У. М.* Бохан Дарафей Дарафеевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1994. Т. 2. С. 62.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведвальнікаў бібліятэкі пакінуў свой запіс (ад 15 лістапада 1882 г.), выказаўшы «шкадаванне, што ён не мастак і не можа "зрабіць копій з каштоўнага збору, каб, апублікаваўшы ў якім-небудзь ілюстраваным часопісе, увекавечыць іх для шырокіх колаў"»[332].

Памяці кампазітара А. Ельскі прысвяціў і выдаў брашуру[333], у якой занатаваў старонкі з музычнага жыцця Міншчыны XIX ст., адзначыў такія творы М. Грушвіцкага, як музыка да "Дзядоў" А. Міцкевіча і да "Вясковага лірніка" У. Сыракомлі. Таму не будзе перабольшваннем, калі адзначым, што да выдавецкай дзейнасці і Ельскі і Грушвіцкі ставіліся (а магчыма, і абмяркоўвалі пытанне) з разуменнем ролі друкаванага слова, друкаванага твора.

Сем нотных мінскіх выданняў М. Грушвіцкага, якія выйшлі ў 1879 г. у друкалітаграфіі Б. І. Саламонава, – гэта танцавальныя творы: паланэзы, мазуркі, вальсы, полькі – для фартэпіяна з прысвячэннем розным асобам, напрыклад Эміліі Гнаіньскай – "Emilie : polka pour piano", Міхалу Ельскаму – "Mazourka de Salon pour piano", Хелене Комар – "Valse pari". На шасці з іх пазначана, што надрукаваны за кошт аўтара або з'яўляюцца яго ўласнасцю. Гэтыя звесткі могуць служыць пацвярджэннем укладу ўласных сродкаў кампазітара ў друк нот і іх распаўсюджанне.

Аўтарамі-выдаўцамі былі таксама медыкі – *А. М. Рагачэўскі* ("Гомеопатия в деле лечения туберкулёза костей и суставов" – 1911 г.), *Л. Бельнік* ("Врачебный указатель" – 1913 г.); чыноўнікі – *І. Г. Даронін* ("Памятка ходока и переселенца на 1911 год" – 1911 г.).

У кнігавыдавецкім працэсе ў 1905–1917 гг. бралі ўдзел і *выдавецтвы газет і часопісаў*: сярод рускамоўных газет – *"Северо-Западный край"* (выдала, да прыкладу, пераклады Д. Бохана "Из польской поэзии"); *"Голос провинции"*; сярод польскамоўных перыядычных выданняў – *"Straży im. Maryi"* і *"Nad Świsłoczą"*.

Актыўная выдавецкая дзейнасць з сярэдзіны 1870-х гг. характэрна *прыватным непрафесійным (не кнігавыдавецкім) прадпрыемствам* – гэта прыватныя медыцынскія і навучальныя ўстановы, прамысловыя і эканамічныя прадпрыемствы, якія ўдзельнічалі ў выпуску ў асноўным афіцыйнай літаратуры сацыяльна-эканамічнай тэматыкі. Для прыкладу возьмем найбольш актыўнага выдаўца – *Мінскі камерцыйны банк*, які за 1875–1912 гг. выдаў каля 30 сваіх штогадовых справаздач. Аналагічная карціна па складу выданняў назіраецца і ў іншых прыватных прадпрыемствах і ўстановах. Напрыклад, у галіне медыцыны – гэта "Устав родильного дома и амбулатории для приходящих больных имени графав Хрептовичей, учрежденных графиней Екатериной Павловной Хрептович-Бутеневой в им. Щорсах" – 1910 г.; у галіне адукацыі – "Отчет бесплатных вечерних курсов русской грамоты для взрослых еврейских девушек при частном училище Д. И. Левидовой" – 1899 г.; у галіне прамысловасці – «Правила внутреннего распорядка лесопильного завода в имении "Соломоречье"» – 1898 г.

[332] *Мархель У. І.* "Кніга для запісу…", або 234 аўтографы // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. "Універсітэты Ельскіх" (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага). Мінск, 7 кастр. 1999 г. / Беларус. ун-т культуры. Мінск : Ковчег, 1999. С. 20.

[333] Як новая знаходка, адшуканая ў Вроцлаве ў "Асалінэуме", падаецца ў выданні: *Мальдзіс А.* Таямніцы старажытных сховішчаў. Да гісторыі беларускай літаратуры XVII–XIX стагоддзяў. Мінск : Мастац. літ., 1974. С. 128–129.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Выдавецкая дзейнасць грамадскіх арганізацый

*Таварыствы друкароў, выдаўцоў*

*Мінская Польская выдавецкая суполка.* Аб існаванні ў 1916 г. у Мінску выдавецкай суполкі – "Polskiej Spółki Wydawniczej" – гаворыць польскі даследчык Т. Зянкевіч, сцвярджаючы, што яна займалася "drukowaniem podręczników, także do nauki literatury polskiej"[334]. У склад мінскай Польскай выдавецкай суполкі ўваходзіў віленска-мінскі кнігар-выдавец Вацлаў Макоўскі, з успамінаў якога пра кнігавыдавецкую дзейнасць у час Першай сусветнай вайны даведваемся, што суполка была заснавана ў лістападзе 1916 г. У яе "ўвайшлі мясцовыя кнігары палякі – для сумеснага выдання школьных падручнікаў". Аўтар пералічвае шэсць з выдадзеных суполкай вучэбных кніг[335]. Хоць гэтыя даныя і патрабуць удакладнення (ці сапраўды яны былі надрукаваны ў 1916 ці 1918 г[336]), мы ўсё ж рызыкнулі ўключыць іх як выданні 1916 г. – гэта чыстапісанне Л. Жыцкай, чытанка І. Янкоўскай, буквар Я. Варанецкай, граматыка (?) Пашкевіч, геаграфія (?) Валовіча, (?) арыфметыка А. Кунцэвіча (гл. ч. II: Каталог).

*Таварыства "Минчук",* дзейнасць якога пачалася са снежня 1906 г. і, па нашых меркаваннях, доўжылася да 1909 г., было першай спробай стварэння ў Мінску беларускай выдавецкай арганізацыі. Таварыства выпусціла сумесна з віленскім выдавецтвам "Наша Ніва" апавяданне Э. Ажэшкі "Гедалі" ("Gedali") (надрукавана ў Вільні ў друкарні Марціна Кухты ў 1907 г. кірыліцай і лацінкай); рыхтавала да друку кнігу вершаў Янкі Купалы "Жалейка" (надрукавана ў Пецярбурзе ў 1908 г.). Сваю задачу "издания и распространения книг и газет, полезных и доступных белорусскому населению"[337], таварыства не змагло рэалізаваць у поўным аб'ёме. Аднак, на нашу думку, фінансавыя сродкі "Минчука" накіроўваліся ў першую чаргу на падтрымку беларускага выдавецтва "Наша Ніва" ў Вільні.

Наступнымі па часе беларускімі выдавецтвамі ў Мінску былі выдавецтвы часопісаў "*Саха*" (1913–1915)[338] і "*Лучынка*" (1914), стварэнне якіх было ініцыявана з Вільні Аляксандрам Уласавым і Алаізай Пашкевіч (Цёткай). Дзейнасць "Сахі" і "Лучынкі" ў сувязі з ваеннымі падзеямі была непрацяглай. "Саха" выпусціла пяць навукова-папулярных сельскагаспадарчых выданняў, "Лучынка" – адно выданне зборніка апавяданняў для дзяцей. Адзначым, што хаця рэдактарам-выдаўцом "Сахі" і "Лучынкі" быў Аляксандр Уласаў, аднак да супрацоўніцтва ў кнігавыданні прыцягваўся шэраг асоб і ўстаноў. Так, кіраўніком сельскагаспадарчай часткі "Сахі" быў вучоны-аграном Э. Сакалоўскі[339], а "Лу-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

---

334 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku … S. 91.

335 *Makowski W.* Wspomnienia starego księgarza na tle 52-letnich osobistych przeżyć. Młodym kolegom po fachu. Cz. 4. 1915–1920 // Przegląd Księgarski. Warszawa, 1925. N 20. S. 519–521; N 22. S. 565–567; N 23–24. S. 520.

336 Паводле ўспамінаў Л. Жыцкай і М. Ленскай, па ініцыятыве польскай рады Міншчыны былі створаны Таварыства падтрымкі польскай перыёдыкі і чытання, а таксама Польская выдавецкая суполка з уласнай друкарняй, якая ў 1918 г. друкавала патрэбныя школьныя падручнікі. Гл.: *Życka L., Łęska M.* Działalność popowstaniowa polaków ziemi Mińskiej: (Materiały i wspomnienia). S. 182.

337 БДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 39. Арк. 3.

338 *Ліс А. С.* "Саха" // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва : у 5 т. 1987. Т. 4. С. 652.

339 *Бярозкіна Н. Ю.* Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.). 1998. С. 137.

чынкай" фактычна кіравала А. Пашкевіч, фундавала і тлумачыла выданні на беларускую мову Тэрэза Гардзялкоўская.

Спробай калектыўнага супрацоўніцтва па выданні беларускай літаратуры была дзейнасць выдавецтва *"Вясёлка"* (1915), якое выдала адну кнігу ("Беларускія жарты"), а таксама выдавецтва *"Вольная Беларусь"* (1917–1918), што вызначылася найбольшай колькасцю літаратуры на беларускай мове, якую надарылася выдаць у 1917 г., – шэсць назваў. Сярод аўтараў "Вольнае Беларусі" былі Б. Эпімах-Шыпіла, Я. Лёсік, Я. Колас. У выдавецтве "Вольная Беларусь" упершыню ў Мінску выйшлі на беларускай мове "Дзіцячая чытанка" і паэма "Тарас на Парнасе". Выдавецтва супрацоўнічала з друкарнямі Нахумава і Грынблата. Ажыўленне беларускага кнігавыдання ў 1917 г. у Мінску засведчыла яго запатрабаванасць і ўзмацненне пазіцый у гарадскім асяроддзі.

Акрамя беларускамоўных і польскамоўных выдавецкіх таварыстваў, у 1905–1906 гг. дзейнічала мінскае кніжнае «Выдавецтва *"Культура"*» – «"Verlag *"Kultur"*», якое займалася выданнем яўрэйскамоўнай літаратуры. Упершыню нам сталі вядомы 39 выданняў выдавецтва на ідыш і іўрыце, якія прадстаўлены арыгінальнымі і перакладнымі літаратурна-мастацкімі і масава-палітычнымі творамі (гл. Дадат. 1, табл. 1.27). «Выдавецтва "Культура"», стаўшы адным з першых выдавецкіх таварыстваў у Мінску, выконвала функцыі яўрэйскага інфармацыйна-культурнага цэнтра, мела цесныя сувязі з друкарнямі Варшавы і Кракава.

### *Палітычныя партыі*

Адным з ранніх выдаўцоў сярод палітычных партый у Мінску з'яўляецца *"Чёрный передел"* – нелегальная друкарня народавольніцкай арганізацыі ў горадзе, заснаваная ў 1881 г. пасля разгрому пецярбургскай. "У выданні і распаўсюджванні нелегальнай народніцкай літаратуры значнае месца займала Беларусь і беларусы, якія вучыліся ў вышэйшых навучальных установах Пецярбурга і іншых гарадоў Расіі"[340]. Паводле беларускіх даследчыкаў, у Мінску ў 1881 г. народнікі выдалі дзве пракламацыі, тры нумары газеты "Чёрный передел" і чатыры нумары газеты "Зерно"[341].

Ва ўспамінах А. Бонч-Асмалоўскага, народавольца-чорнапераздзельца, гаворыцца, што ў 1905 г. была арганізавана дзейнасць трох нелегальных друкарняў: у Мінску, Бабруйску, Гомелі, якія, як ён зазначыў, называліся "Зьвёздачкамі"[342] (друкарня ў Мінску была арганізавана А. Бонч-Асмалоўскім). "Да абвяшчэння кастрычніцкага маніфесту ў іх было надрукавана каля 40 пудоў нелегальнай літаратуры, большай часткай – розных пракламацый…"[343] Аднак дадзеныя выданні не знайшлі адлюстравання ў бібліяграфічнай літаратуры і застаюцца невядомымі.

340 *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 52.
341 История белорусской дооктябрьской литературы. С. 350.
342 *Бонч-Асмалоўскі А.* Эпоха 1905 году : Мае ўспаміны // Полымя. 1925. № 6. С. 177.
343 Тамсама. С. 187.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Выдавецтва Мінскай арганізацыі Беларускай сацыялістычнай грамады.* З канца 1905 г. у Мінску пачала дзейнічаць падпольная друкарня Грамады[344]. Сярод першых выданняў – улётка праграмы партыі, пракламацыі, адозвы. У снежні 1905 г. Беларуская сацыялістычная грамада выпусціла ў перакладзе на беларускую мову свой "Маніфест" з заклікам да фінансавага байкоту антынароднага рэжыму[345]. Выдавецкая дзейнасць Грамады ў Мінску была адноўлена толькі ў 1917 г., калі выйшлі з друку праграмныя дакументы партыі. Яе выданні, паводле выхадных звестак, друкаваліся ў прыватнага друкара Грынблата і ў Друкарні інвалідаў. Вядомы пяць выданняў Грамады за гэты год.

"Агітацыйная і прапагандысцкая праца, якая засноўвалася на нацыянальнай спэцыфіцы краю – улёткі, брашуркі, легальны друк, была рэактывам у справе абуджэньня нацыянальнае сьвядомасці беларусаў, была тым тлом для надзвычай высокага пафаснага публіцыстычнага ўзроўню беларускай паэзіі пачатку нашага стагодзьдзя. Можна лічыць, што тагачасная беларуская літаратура падпарадкоўвалася прынцыпам партыйнай літаратуры – вольнай ад ліхвярства і залежнай ад разьвіцьця беларускага нацыянальнага і сацыяльнага руху"[346].

Найбольш актыўна дзейнічала ў 1917 г. кнігавыдавецтва *"Звезда" пры Мінскім камітэце РСДРП* (гл. Дадат. 1, табл. 1.28). У выданнях серыі "Библиотека пролетария" прапагандаваліся ідэі сацыял-дэмакратычнай партыі бальшавікоў. Вядомы чатыры выданні з названай серыі (№ 6, 7, 8, 9), сярод якіх тры апавяданні М. Горкага. Можна меркаваць, што брашуры выдавецтва, пазначаныя "РСДРП. № 1" або (№ 2, 14, 15, 19, 21), таксама належалі да той самай серыі. Відавочныя прагалы нумароў серыі ці нявыяўленыя выданні пад гэтымі нумарамі даюць падставу лічыць, што іх колькасць была значна большай. Усяго ўлічанымі аказаліся 19 выданняў.

Кнігавыдавецкая дзейнасць іншых палітычных партый у Мінску – "Союза 17 октября" (1905–1906), "Поалей-Цион" (1906), "Социал-демократ" (1917) – была нязначнай (вядомы толькі адзінкавыя выданні).

Агульнай тэндэнцыяй у друкарскай працы тых ці іншых рэвалюцыйных арганізацый было тое, што яны практыкавалі часовы захоп легальных прыватных друкарняў і выданне ў іх масавым тыражом улётак[347], якія і з'яўляліся асноўнай партыйнай выдавецкай прадукцыяй.

### *Навуковыя таварыствы*

*Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі*, створанае ў 1876 г., у сваім статуце зафіксавала права "издавать свой журнал" па праграме, якая павінна быць прадстаўлена папярэдне на зацвярджэнне ўраду ва ўстаноўленым парадку, або, калі знойдзе гэта зручным, у адным з існуючых выданняў Міністэрства дзяр-

344 *Біч М. В., Рудовіч С. С.* Беларуская сацыялістычная грамада // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1993. Т. 1. С. 410.

345 Тамсама. С. 410, 412–413.

346 *Бяляцкі А.* Літаратура і нацыя. Мінск : Арт Гейзер, 1991. С. 28.

347 Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. Мінск : Беларусь, 1994. Ч. 1 / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.]. С. 390.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жаўных маёмасцяў (§ 22 “Устава Минского Общества сельского хозяйства”. 1876. С. 10). Рэдагаваў выдавецкую прадукцыю прэзідэнт таварыства.

За перыяд 1876–1917 гг. таварыства заняло дамінуючае становішча сярод іншых грамадскіх арганізацый, што праявілася ў актыўнай выдавецкай дзейнасці, у выніку якой з’явілася 260 выданняў, што асвятлялі разнастайныя кірункі дзейнасці таварыства: арганізацыйныя пытанні сельскай і лясной гаспадаркі; жывёлагадоўлі, конегадоўлі, броварства, садаводства, агародніцтва, пчалярства. Таварыства спрыяла развіццю і ўкараненню навуковых метадаў гаспадарання, друкуючы асобнымі выданнямі навуковыя даклады, якія чыталіся на яго пасяджэннях, а таксама “Труды” таварыства (1903, 1908, 1912) і “Результаты коллективных опытов” (1915).

З 1900 г. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі заснавала фонд імя Э. Вайніловіча на навуковыя стыпендыі[348]. На 1901 г. таварыства налічвала 675 сяброў[349], сярод якіх былі і багатыя землеўласнікі. Супрацоўніцтва з таварыствам у кнігавыданні ў асноўным такіх мінскіх друкарняў, як Дворжаца і Грынблата, забяспечвала іх фінансавую стабільнасць. А ўплывовасць, культурна-асветная і навуковая дзейнасць таварыства падтрымліваліся і яго кнігавыданнем (гл. Дадат. 1, табл. 1.29).

*Таварыства мінскіх урачоў.* У выдавецкай дзейнасці Таварыства мінскіх урачоў, аднаго з першых мінскіх навуковых таварыстваў (1867–1914), можна вызначыць тры асноўныя кірункі: выданне афіцыйнай, навукова-папулярнай і навуковай літаратуры (гл. Дадат. 1, табл. 1.30), у якой абагульняліся вынікі медыка-тапаграфічнага і санітарна-статыстычнага апісання гарадоў і мястэчак Мінскай губерні (63 выданні). У таварыстве праводзіліся чытанні дакладаў, падрыхтаваных урачамі (напрыклад, В. Л. Лунцам, І. Ц. Офенбергам), якія потым друкаваліся асобнымі навуковымі выданнямі. Супрацоўніцтва мінскіх друкарняў Каплана, Тасьмана і Губернскай друкарні з Таварыствам мінскіх урачоў уплывала на фарміраванне іх адпаведнай спецыялізацыі.

*Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі.* Адной з задач Таварыства было распаўсюджванне прыродазнаўча-гістарычных і геаграфічных ведаў, якое ажыццяўлялася шляхам чытання дакладаў па медыцыне, геалогіі, глебазнаўстве, флоры і фаўне Беларусі, праблемах зберажэння прыродных багаццяў[350]. Кароткачасовае існаванне таварыства (1912–1915) не дало магчымасці разгарнуць значную выдавецкую дзейнасць. Вядомы два выданні Таварыства: “Устав” (1912), а таксама “Известия Минского общества любителей естествознания, этнографии и археологии” (1914. Вып. 1.), якія выйшлі ў друкарні Д. Форына.

### *Культурна-асветныя таварыствы*

Дзейнасць культурна-асветных арганізацый і таварыстваў, такіх як *Мінскае музычнае таварыства* (1880–1884, 1912–1917), *Таварыства аматараў мас-*

[348] *Woyniłłowicz E.* Wspomnienia 1848–1928. Wilno : Druk. J.Zawadzkiego, 1931. Część pierwsza. S. 68.
[349] Ibid. S. 40.
[350] *Шыбека З.* Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5. С. 169.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*тацтва* (1898–1906), была запланавана на даволі шырокую культурна-асветную працу, аднак выдавецкаму кірунку было адведзена вельмі нязначнае месца. Толькі статут Мінскага музычнага таварыства 1880 г. уключаў параграфы – выдаваць "за собственный счет по соглашению с авторами или их наследниками лучшие музыкальные сочинения русских композиторов", а таксама сведчыў аб намеры "издавать одобренные цензурою сочинения и руководства, касающиеся музыкального искусства"[351]. Аднак гэтыя намеры, відаць, так і засталіся толькі намерамі.

Пацвердзіць статутны пункт за нумарам 4 – "wydawanie, wspieranie i rozszerzanie polskich podręczników oraz czasopism pedagogicznzch i ludowych"[352] паспрабавала польскае таварыства *"Oświata"* і выпусціла гістарычнае апавяданне Ф. Бернатовіча "Pojata, córka Lizdejki" (1908). Два выданні на польскай мове ажыццявіла *"Polska Macierz szkolna ziemi Mińskiej"* – каляндар і ўказанні для настаўніц народных школ (1917).

Выдзяляецца выдавецкай дзейнасцю таварыства для распаўсюджвання польскіх вайсковых ведаў – *Towarzystwo Polskiej Wiedzy Wojskowej* (1917–1919). Яно было заснавана ў 1917 г. пад кіраўніцтвам Генрыка Багіньскага. Пачаўшы сваю дзейнасць у Кіеве, таварыства арганізавала выданне кніг і брашур у серыі "Biblioteka Wiadomości Wojskowych". Летам 1917 г. рэдакцыя таварыства была перанесена ў Мінск, дзе да канца 1917 г. выйшлі 40 нумароў з названай серыі і была заснавана новая – "Książnica zołnierza polskiego im.Tadeusza Kosciuszki". Мінскія выданні таварыства – вучэбная (па ваеннай справе і па радыётэхніцы); даведкавая і масава-палітычная літаратура (гл. ч. II: Каталог).

Каля 40 таварыстваў *дабрачыннасці, сацыяльнай і медыцынскай дапамогі* Мінска і часткова Мінскай губерні вызначыліся ў выданні больш за 230 асобнікаў статутаў і справаздач. Восем выданняў 1894, 1895, 1897 гг. – гэта тры навуковыя выданні "Трудов" Мінскага ваенна-санітарнага таварыства, адно навукова-папулярнае выданне па гісторыі Мінскага дабрачыннага таварыства (1911) і чатыры даведкава-інфармацыйныя выданні – тры Мінскага дабрачыннага таварыства і адно Мінскага епархіяльнага папячыцельства (1903).

Найбольшую актыўнасць як у грамадскай, так і ў выдавецкай сферы праявіла *Мінскае таварыства дабрачыннасці* (1811–1915). На яго ліку 46 выданняў, асноўную частку якіх складаюць афіцыйныя выданні сацыяльна-эканамічнай тэматыкі. Мінскім таварыствам дабрачыннасці адным з першых былі складзены і выдадзены статыстычныя звесткі аб "духоўным і свецкім стане абывацеляў" Мінскай губерні (1811); накладам Таварыства выдаваўся на польскай мове "Kalendarz Miński" (1906, 1908). Колькаснымі паказчыкамі вызначаюцца таксама *Мінскае мясцовае ўпраўленне Таварыства апекавання аб раненых і хворых воінах* (17 выданняў – справаздачы), *Мінскае таварыства дапамогі навучэнцам* (16 выданняў – статут і справаздачы); *таварыствы дапамогі бедным і хворым яўрэям* (12 выданняў – статуты і справаздачы).

Выдавецкая прадукцыя *спартыўных і ахоўных таварыстваў*, якія бралі ўдзел у мінскім кнігавыданні, не адрозніваецца разнастайнасцю. Гэта такса-

351 Устав Музыкального общества в г. г. Минске. Минск : Скоропечатня Р. Дворжец, 1880. С. 5–6.

352 Statut polskiego towarzystwa "Oświata" w Mińsku. Wilno : Druk. E. Nowickiego,1907. S. 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ма статуты, справаздачы, інструкцыі, правілы. Сярод азначаных таварыстваў вылучаецца па выдавецкай дзейнасці *Мінскае вольна-пажарнае таварыства* (1889–1912). На яго рахунку 22 выданні, сярод якіх большасць складаюць справаздачы, у іх ліку дзве гістарычныя справаздачы аб дзейнасці таварыства (1892, 1906). Неабходна адзначыць, што шэраг аналагічных пажарных таварыстваў дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай губерні, што адпаведна засведчана і выданнямі ў Мінску іх статутаў і справаздач. *Мінскае таварыства аматараў спорту* (1892–1898), *Польскае спартыўна-гімнастычнае таварыства "Sokoł"* (1907–1915), *таварыства ахоўвання бедных хворых яўрэяў "Мішмерас-Хейлім"* (1912–1914) адзначыліся таксама выданнямі ўласных статутаў і справаздач.

Да *рэлігійных таварыстваў і ўстаноў*, якія ўдзельнічалі ў мінскім кнігавыданні, адносім Мінскую дыяцэзію, Мінскую епархію, Мінскую епархіяльную вучылішчную раду, чатыры мінскія праваслаўныя брацтвы, Галоўную і Харальную сінагогі, малітоўную школу, Талмуд-Тору і Мінскае таварыства харугваносцаў. Па нашых падліках, колькасць іх выданняў за 1867–1915 гг. склала 136 пазіцый. У першай палове XIX ст. спрыяла друку рэлігійных выданняў у Мінску Мінская дыяцэзія (не менш як 54 выданні).

Найбольшай колькасцю выданняў вызначаецца *Мінская епархія* – 72. Яны ўяўляюць сабой, па-першае, афіцыйныя матэрыялы – справаздачы аб царкоўна-прыходскіх школах граматы Мінскай епархіі (15 выд. 1886–1914 гг.), справаздачы Мінскага епархіяльнага завода свечак (6 выд. 1908–1914 гг.), акты дэпутатаў духавенства Мінскага епархіяльнага з'езда (1884, вып. 1, 2), апісанні цэркваў і прыходаў Мінскай епархіі (1878–1879, вып. 1–9.), матэрыялы для гісторыі Мінскай епархіі (6 выд. 1892–1894 гг.); па-другое, даведкава-інфармацыйныя – спісы асоб, якія служылі ў духоўных установах Мінскай епархіі (7 выд. 1901–1908 гг.); склад епархіяльнага ўпраўлення (1904, 1905); памятныя кніжкі Мінскай епархіі (1886, 1901). Выданні *Мінскай епархіяльнай вучылішчнай рады* (19) – справаздачы (11) і ведамасці аб царкоўных школах (8).

Вылучаюцца ў выдавецкай дзейнасці і такія мінскія праваслаўныя брацтвы, як *Кірыла-Мяфодзіеўскае* (16 выд.), *Свята-Мікалаеўскае* (16), *Казанскай прывакзальнай царквы* (9), *Народнае брацтва ў імя жыватворнага Крыжа Гасподняга* (9 выд.). 30 выданняў з іх – справаздачы таварыстваў, 5 – статуты, 2 выданні – па параўнальным багаслоўі (1908, 1914), 1 – зборнік прамоў (1913), 1 выданне – працы з'езда братчыкаў (1911).

## Дзяржаўныя выдавецтвы

### *Мінская губернская друкарня*

*Мінская губернская друкарня* (1795–1917). Датай адкрыцця губернскай друкарні ў Мінску лічыўся 1797 г. Аднак у матэрыяле, які змясціў "Kurier Wileński" за 1860 г. (N 71. S. 761), прыводзіцца назва выдання Мінскай губернскай друкарні 1796 г.: "Odezwa o spisie ludności za Najwyższym rozkazem Jej Cesarskiej Mości Katarzyny II-ej". Папярэднікам яго можа быць і друк за 1795 г., зафіксаваны ў бібліяграфічнай працы К. Эстрайхера – "Przepisy urządzające gubernią Mińską względem spisu ludności" (T. IX. S. 684). Адказ на пытанне, на наш погляд, даюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі – гэта запісы ў справах Мінскага губернскага праўлення за 1831 г., на якія ўпершыню ўдалося натрапіць: "… бывшими в Минске Ксендзами Базилианами которых кляштор, по Высочайшему повелению обращен в Грекороссийскую Церковь, показана Типография славянских и польских литер с одним станком, учреждена в 1790 году за присоединением здешнего Края к российской державе в 1795 г., оная типография взята в ведомство Губернского Начальства, коим оставлена при Губернском Правлении, цена ее в то время простиралась на серебро, до 436 [руб.], в 1798 году произведена переделка из словянских на гражданские, <…> польских испортившихся литер, с умножением оных, и добавлением другого станка купленного в Москве…"[353] Такім чынам, гісторыя Губернскай друкарні ў Мінску пачынае свой адлік ужо ў 1795 г.

Дзейнасць Мінскай губернскай друкарні першай трэці XIX ст. часткова была даследавана Я. С. Умецкай[354]. У разгледжаны перыяд друкарняй, абсталяванай двума ўсяго станкамі, было выпрадукавана крыху болей 20 выданняў – 24. Аднак да з'яўлення прыватных варштатаў гэта была адзіная друкарня, якая працавала на патрэбы губернскага горада.

У 1800 г. у ёй налічвалася 2 наборшчыкі, 2 тэрадоршчыкі (друкары) і адзін пераплётчык[355]. Падчас руска-французскай вайны, у 1812 г., Мінская губернская друкарня становіцца Друкарняй дэпартамента – урадавай друкарняй, кіраўніцтва якой ажыццяўляў яе супрацоўнік – І. І. Стафановіч. Яму было даручана пераліць рускія шрыфты на польскія і французскія і займацца выпускам бюлетэняў аб ваенных дзеяннях французскага войска, заклікаў, пракламацый. На гэты час прыпадае і выданне першай газеты ў горадзе, якой стала "Tymczasowa gazeta Mińska" ("Часовая Мінская газета"), выйшла 25 нумароў[356].

З наступных архіўных дакументаў вядома, што ў 1818 г. для падтрымкі Мінскай губернскай друкарні Міністэрства фінансаў Расійскай імперыі выдаткавала 2400 рублёў адзінаразовай дапамогі на "исправление типографии" і па 350 рублёў штогадовага ўтрымання[357]. Прыкладна ў гэты ж час Мінскае губернскае праўленне заключае кантракт з прыватным мінскім друкаром Зымелем Хацкелевічам Прэсам, які бярэ на сябе ўтрыманне друкарні з чатырма наборшчыкамі, перанаборшчыкам і памочнікам[358]. Такім чынам, казённая друкарня, якая знаходзілася пры Губернскім праўленні для "тиснения бумаг на российском и польском диалектах"[359], стала казённа-камерцыйным прадпрыемствам. Губернскае начальства калі-нікалі таксама выказвала зацікаўленасць справамі

[353] НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 98.

[354] *Умецкая Е. С.*: 1) История книгопечатания в Белоруссии в первой четверти XIX века (1801–1832). С. 15–16; 2) Казенное книгопечатание в Белоруссии (1797–1832). С. 63; 3) Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. С. 278–279.

[355] Белоруссия в эпоху феодализма : сб. документов и материалов : в 3 т. Минск : Изд-во АН БССР, 1961. Т. 3: Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX века (1772–1861) / ред. В. В. Чепко, В. Н. Жигалов. С. 106.

[356] Часовая мінская газета. 1812 год: пер. з пол. / пад рэд. Я. Анішчанкі. Мінск : Выд. В. Хурсік, 2008. 184 с.

[357] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 129. Арк. 96.

[358] Тамсама. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 96.

[359] Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 359. Арк. 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

друкарні. Так, у 1831 г. мінскім губернатарам графам С. Г. Строганавым была прызнана неабходнасць тэхнічнага ўдасканалення друкарні, а таксама – “иметь для надзора вообще по типографии особого смотрителя, с жалованьем по 100 серебром в год, пять наборщиков, 1 перенаборщика, 1 мальчика”[360].

З 1833 г. Віленскі цэнзурны камітэт пачынае справу ў адносінах “содержателя Минской казенной типографии Пресса” аб друку без дазволу цэнзуры кнігі пад загалоўкам “Pieśni nabożne” ў яго прыватнай друкарні ў 1826 і 1830 гг.[361] Арганізаваная ў 1834 г. рэвізія Губернскай друкарні выявіла недахопы ў яе абсталяванні, якія Зымель Хацкелевіч Прэс павінен быў не толькі кампенсаваць, але і па распараджэнні Мінскага губернскага праўлення 1835 г. канчаткова развітацца з утрыманнем казённай друкарні і загадваннем ёю.

Адной з ранніх справаздач Мінскай губернскай друкарні, якая захавалася ў НГАБ, з’яўляецца справаздача мінскага грамадзянскага губернатара “о приходе и расходе и остатке сумм по типографии” за 1846 г., з якой відаць, што ў Мінскай губернскай друкарні ўжо быў, як таго патрабаваў губернатар, “смотритель” (ён жа начальнік Газетнага стала), а таксама – 2 яго памочнікі, 6 наборшчыкаў, 4 іншыя служачыя і 5 хлопчыкаў (вучняў). На ўсіх служачых у год прыходзілася “жалованья” ў памеры 1268 руб. 20 кап. У дадатку да справаздачы прыкладзены каштарысы “Деньгам, полученным от разных мест и лиц в число типографских сумм по Минскому губернскому правлению”, дзе пералічаны каля 50 заказчыкаў – дзяржаўных устаноў Мінскай губерні. Найбольшыя заказы паступалі з Мінскага павятовага казначэйства, Мінскай гарадской думы, Мінскай палаты дзяржаўных маёмасцяў, Слуцкага гарадавога магістрата, Навагрудскага гарадавога магістрата, Рэчыцкай гарадской думы, Мазырскай гарадской думы і інш.

У справаздачы губернатара за 1850 г. адзначаецца, што “… казенная типография преимущественно занята печатанием указов, циркуляров и ведомостей и другими подобными официальными работами, частными же весьма мало. Состояние типографии удовлетворительно”. Аднак прыбытак друкарні прыносілі менавіта прыватныя замовы. Так, у тым самым 1850 г. ён склаў больш за 3 тыс. руб. серабром. Пры Мінскай губернскай друкарні існавала бібліятэка з фондам у 2265 кніг[362]. Пад канец 1859 г. Мінскім губернскім праўленнем было прызнана, што друкарня, якой з 1855 г. не выдзялялася з казны неабходнай сумы, прыйшла “в расстроенное положение, станки и машины ее требуют починки и нового устройства, а буквы – или перелития или покупки новых”[363].

І хаця прыбытак Мінскай губернскай друкарні паступова ўзрастаў і ўжо за 1859 г. склаў больш за 5 тыс. руб., у падрыве дзейнасці друкарні абвінавачваліся прыватныя друкарні[364], пра што засведчыў наступны запіс. “Частная типография еврея Дворжеца и другая с литографией, вновь открытая чиновником Адамовичем, поставлены в такое положение, что, независимо означенных присутственных мест и воинских учреждений, все частные лица, а в особенности

[360] Тамсама. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 100.

[361] Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 417. Арк. 16.

[362] Тамсама. Спр. 1077. Арк. 35–35 адв.

[363] Тамсама. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 505. Арк. 604 адв.

[364] Тамсама. Арк. 602–603, 608 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

купечество и аптеки, обращаются к ним с своими заказами; Губ. тип. при таких обстоятельствах не имеет решительно от них никакого дохода”[365].

Канкурэнтнае змаганне з прыватнымі друкарамі патрабавала набыцця і новага абсталявання. У 1861 г. на ўладкаванне Мінскай губернскай друкарні былі “выписаны из известной Типографии и Словолитни Селивановского (з Масквы. – *Л.Д.*) разного рода литеры новых шрифтов с бордюрами, цветными линейками и другими украшениями, в большом и малом размере, с новым для печатания аппаратом, кроме того, приобретена для отлиграфирования из фабрики Шембера в Вильне автографическая машина, по которой в короткое время заготавливаются несколько сот экземпляров, а всего оригинала может быть отпечатано 10000 и более <…>. Со стороны Губернского Правления приняты меры, чтобы заказы исполнялись немедленно… по ценам значительно низшим, нежели в частных типографиях”[366]. Аб тэхнічных новаўвядзеннях і новай тарыфнай плаце за паслугі было змешчана паведамленне ад імя віцэ-губернатара ў “Минских губернских ведомостях” (Отд. II. Ч. неофиц. К № 13 Марта 31 дня 1861).

Шэраг наступных архіўных дакументаў за перыяд з 1862 г. да пачатку XX ст. прадстаўлены “Книгой на записку прихода и расхода бумаги Минских губернских ведомостей”, “Книгой бумаг и разных бланков, печатаемых в Минской губернской типографии”[367], “Книгами о приходе и расходе специальных средств”[368], “Делами о лицах, служащих в Минской губернской типографии”[369], “Списками лиц, коим выданы награды и пособия”[370], “Сметами и отчетами”[371], “Реестрами расходов”[372], “Счетами”[373]. Сёння, зразумела, па гэтых дакументах рэвізію Мінскай губернскай друкарні не правядзеш, але ўсё ж яны даюць магчымасць прасачыць не толькі фінансавы бок дзейнасці прадпрыемства, але і якім чынам адбываліся рост і развіццё прадпрыемства, шырыліся яго сувязі: са словалітнямі, папяровымі фабрыкамі і крамамі Масквы і С.-Пецярбурга[374], Вільні, Ляйпцыга[375].

Уздым дзейнасці друкарні прыходзіцца на пачатак XX ст. – гэта 1907–1914 гг., калі за адзін год выпускалася такая ж колькасць выданняў, як за першае трыццацігоддзе. Стабільнасць у дзейнасці Мінскай губернскай друкарні можна адзначыць ужо пачынаючы з другой паловы 1860-х гг., якая выяўлялася ў штогадовым друку ад двух да шасці кніжных выданняў. На пачатку 1890-х гг. Мінская губернская друкарня налічвала ў сваім складзе да 30 супрацоўнікаў[376].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[365] Тамсама. Арк. 602 адв.–603.
[366] Тамсама. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 1270. Арк. 64–64 адв.
[367] Тамсама. Ф. 456. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1–29; Спр. 262. Арк. 1; Спр. 264.
[368] Тамсама. Воп. 1. Спр. 264; Спр. 267. Арк. 1–115, 321; Спр. 268; Спр. 276.
[369] Тамсама. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 15204. Арк. 1–85.
[370] Тамсама. Спр. 15931; Ф. 456. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 29–31; Спр. 16.
[371] Тамсама. Ф. 456. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 5–78.
[372] Тамсама. Арк. 253–305.
[373] Тамсама. Спр. 10, 11.
[374] Тамсама. Спр. 276. Арк. 5–41; Спр. 10.
[375] Тамсама. Спр. 8, Арк. 1–4.
[376] Тамсама. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 3806. Арк. 29–31.

Па неабходнасці пры павелічэнні заказаў на друк, павялічваўся наём рабочых[377]. Асноўны прыбытак Мінская губернская друкарня атрымлівала менавіта за прыватныя друкарскія работы, а таксама за аб'явы, якія друкавала ў "Минских губернских ведомостях"[378].

Заказчыкамі паліграфічных вырабаў Мінскай губернскай друкарні былі фабрыкі і заводы г. Мінска (каля 40) і Мінскай губерні – гэта скураныя, піваварныя, кафельныя, шпалерныя, цагляныя, крухмальныя, тытунёвыя і іншыя фабрыкі і заводы[379], а таксама мінскія друкалітаграфіі Х. Я. Дворжаца, Б. І. Саламонава, І. І. Тасьмана[380]. Кнігавыдавецкая прадукцыя ў друкарні замаўлялася ўрадавымі ўстановамі (валаснымі і мяшчанскімі праўленнямі губерні, паліцэйскімі ўстановамі), прыватнымі асобамі і ўстановамі.

Каб дасягнуць найбольшай прадукцыйнасці, Мінскай губернскай друкарні неабходна было весці планамерную, разлічаную па часе работу. Толькі, як адзначыў яе кіраўнік М. Ю. Вагнер, "какая может быть планомерность в работе Губернской типографии, если она находится почти во власти учреждений, пользующихся бесплатно услугами ее и допускающих самый невозможный произвол по отношению к типографии, каждый, даже писец из этих учреждений, считает своим правом распоряжаться Губернской типографией. Вместо того чтобы присылать заказы на потребность всего года и в начале года, когда Типография не так обременена работой, заказы присылаются ежедневно и по несколько раз на день в продолжение целого года <…>; к концу же года, когда типография наиболее бывает занята платными работами, присылка заказов еще усиливается. Требования о скорейшем исполнении таких заказов сопровождается просьбами, угрозами жаловаться и сваливанием вины на типографию в случае несвоевременности исполнения бумаги за неимением бланков. Все такие спешные работы нарушают порядок, вносят в дело хаос, остановку в работе и причиняют большой убыток, так как с машины приходится снимать начатые печатные формы, разрушая пристройку, а наборные материалы приходится извлекать из форм, уже набранных, но еще не отпечатанных, т. е. налаженное дело приходится разрушать, чтобы потом вновь его делать"[381].

Тым не менш дзяржаўны статус друкарні абавязваў цвёрда трымацца вызначанага кірунку. "В то время как всё вокруг типографии вертелось в вихре освободительного движения (1905 г. – *Л. Д.*), всё бастовало, всё безобразничало, бастовали даже правительственные учреждения, Губернская типография, осажденная революционерами, неуклонно исполняла свои обязанности, работая даже по ночам, т. к. вследствие забастовки и беспорядков работа в типографии увеличилась"[382].

Па даных Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі, Мінская губернская друкарня ў 1906 г. з усіх 70 губернскіх друкарняў па атрыманні прыбытку

[377] Тамсама. Арк. 305 адв.
[378] Тамсама. Арк. 25.
[379] Тамсама. Ф. 456. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 1–2.
[380] Тамсама. Арк. 197–353.
[381] Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7675. Арк. 25–26.
[382] Тамсама. Арк. 30–31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выйшла на трэцяе месца, уступаючы толькі Пермскай і Віленскай[383]. Менавіта з гэтага часу адзначаецца яе новы і даволі значны ўдзел у кнігавыданні. Такія фактары, як своечасовае тэхнічнае пераабсталяванне і фінансава прыбытковая ўстойлівасць, зрабілі Мінскую губернскую друкарню канкурэнтаздольным прадпрыемствам. Пік кнігадрукавання ў 1914 г. для друкарні, як і для шэрагу іншых прадпрыемстваў, змяніўся на рэзкі спад. Аб'ектыўнымі таму прычынамі сталі абставіны Першай сусветнай вайны, што асабліва негатыўна адбілася на казённых выдавецтвах.

За час дзейнасці Мінская губернская друкарня выпрадукавала не менш за 409 найменняў кніжных выданняў, што склала 13,2 % ад ўсёй кнігавыдавецкай прадукцыі Мінска 1795–1917 гг. Выданні друкарні да 1845 г. выходзілі ў асноўным на польскай мове, адзінкавыя – на латыні, а таксама з тэкстамі на рускай мове. Пазней асноўнай кніжнай прадукцыяй сталі рускамоўныя выданні, якія склалі 91,4 % (374 выд.) ад усёй выдадзенай друкарняй прадукцыі. Адпаведна на польскай мове – 5,4 % (22 выд.); з польскімі і рускімі тэкстамі – 1,5 % (6 выд.); з польскімі і лацінскімі, рускімі і лацінскімі – 1,7 % (7 выд.). Аналіз рэпертуару выданняў дазваляе зрабіць вывад, што, выконваючы заказы на афіцыйныя выданні грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага зместу, друкарня выдавала таксама гісторыка-краязнаўчыя, медыцынскія, сельскагаспадарчыя, рэлігійныя і мастацкія кнігі (гл. Дадат. 1, табл. 1.31).

Першыя кнігі ў Мінску грамадзянскім шрыфтам, першыя навуковыя і вучэбныя выданні былі заслугай і Мінскай губернскай друкарні. "Минские губернские ведомости", "Памятные книжки Минской губернии", "Обзоры Минской губернии", якія друкаваліся ў Мінскай губернскай друкарні, сёння справядліва лічацца важкімі гісторыка-краязнаўчымі крыніцамі.

У выніку комплекснага вывучэння архіўных дакументаў і выдавецкай прадукцыі Мінскай губернскай друкарні можна адзначыць, што гэта была першая губернская друкарня на тэрыторыі Беларусі не толькі па часе заснавання, але і якая на працягу сваёй дзейнасці з 1795 г. па 1917 г. утрымлівала першынство сярод іншых губернскіх друкарняў Беларусі па колькасці выдадзенай прадукцыі, імкнулася, у тым ліку дзякуючы актыўнаму развіццю прыватнага друку, быць канкурэнтаздольным прадпрыемствам.

### *Выдавецтвы дзяржаўных устаноў*

*Мінскі губернскі статыстычны камітэт.* Загадам Сената ад 20 снежня 1834 г. ва ўсіх губернскіх гарадах Расійскай імперыі засноўваліся статыстычныя камітэты[384], пры якіх былі створаны выдавецкія аддзелы па падрыхтоўцы падрабязных гістарычных, тапаграфічных, прамысловых, сельскагаспадарчых апісанняў губерні. У 1863 г. быў адкрыты Мінскі губернскі статыстычны камітэт. У яго склад уваходзілі губернатар (старшыня), памочнік старшыні, неадменныя і сапраўдныя члены, сакратар.

---

383 Тамсама. Арк. 25–26.

384 Полное Собрание Законов Российской Империи. Санкт-Петербург : Тип. II Отд. Собств. Его Импер. Велич. Канц., 1835. Т. 9. Отд. II. Приложение. Стб. 7684.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абавязкі па выдавецкай дзейнасці выконваў сакратар статыстычнага камітэта. За гады сваёй дзейнасці губернскі статыстычны камітэт у Мінску, які фактычна выконваў задачы цэнтра мясцовага краязнаўства (гл. Дадат. 1, табл. 1.32), падрыхтаваў і выдаў з 1863 г. па 1917 г. 53 выпускі "Памятных книжек Минской губернии", 36 выпускаў "Обзоров Минской губернии" (за 1877, 1879, 1880, 1881, 1883–1913 гг.), спісы землеўладальнікаў і населеных месцаў Мінскай губерні, нарысы аб Мінскай губерні ў фізіка-геаграфічным і статыстыка-эканамічных адносінах, манаграфічныя працы.

*Друкалітаграфія Упраўлення Лібава-Роменскай чыгункі* (1879–1917). Лібава-Роменская чыгунка, пабудаваная ў 1870-я гг. акцыянерным таварыствам, у 1891 г. была выкуплена казной і стала дзяржаўнай[385]. Камерцыйная дзейнасць Лібава-Роменскай чыгункі спрыяла развіццю шырокай сацыяльнай сферы і адкрыццю ўласных бальніц, цэркваў, школ, бібліятэк, таварыстваў, а таксама друкалітаграфіі. Напачатку, з 1879 г., гэта была толькі літаграфія таварыства служачых Лібава-Роменскай чыгункі[386]. Выданні ў большасці сваёй былі накіраваны на забеспячэнне жыццядзейнасці чыгункі. Гэта былі зборнікі распараджэнняў, правілы руху на чыгунцы, палажэнні, інструкцыі, а таксама справаздачы па эксплуатацыі чыгункі. Акрамя афіцыйных выданняў сацыяльна-эканамічнай тэматыкі, актыўна вялася падрыхтоўка да друку розных даведкавых матэрыялаў. Выдавецкая дзейнасць Упраўлення Лібава-Роменскай чыгункі мела на мэце вырашэнне пэўных працаёмкіх задач чыгункі, а ўвядзенне ў эксплуатацыю друкалітаграфіі толькі пацвердзіла новыя патрэбы, якія яна ў стане была вырашаць самастойна (гл. Дадат. 1, табл. 1.33).

У структуры мясцовых *органаў улады* не было спецыяльна выдзеленых выдавецтваў, аднак аб выдавецкай дзейнасці некаторых устаноў сведчыць менавіта іх сістэматычная кніжная прадукцыя. Таму правамерна вылучыць наступныя дзяржаўныя органы ўлады, якія ўдзельнічалі ў кнігавыданні, – гэта Мінская гарадская дума (у 1881–1913 гг.), Мінская гарадская ўправа (1892–1917), Мінская губернская ўправа па справах земскай гаспадаркі (1903–1916), Мінскі губернскі камітэт па справах земскай гаспадаркі (1903–1912), Мінская павятовая земская ўправа (1912–1917). Кніжныя выданні органаў улады насілі афіцыйны характар і тэматычна падзяляліся на сацыяльна-эканамічныя, сельскагаспадарчыя, медыцынскія, па адукацыі. Неабходна адзначыць выдавецкую дзейнасць Мінскай гарадской думы, якая тым самым спрыяла развіццю мясцовай ініцыятывы, гаспадаркі і культуры Мінска[387]. На яе сродкі ўтрымліваўся Мінскі статыстычны камітэт, выдаваліся распарадчыя дакументы і пастановы. Выдавецкая дзейнасць органаў улады сведчыла аб зацікаўленасці органаў кіравання развіццём прагрэсіўных метадаў гаспадарання[388].

У выдавецкім працэсе ўдзельнічалі і *ўстановы адукацыі* – гэта Мінская гімназія (у 1803–1917 гг.), асноўнай кніжнай прадукцыяй якой былі справаздачы і правілы, вучэбныя праграмы на польскай і рускай мовах; друкаваліся ў Мін-

[385] *Філякоў У.* Лібава-Роменская чыгунка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1997. Т. 4. – С. 360–361.

[386] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3396. Арк. 144.

[387] *Несцярэнка А. І.* Гарадская дума // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1994. Т. 2. С. 481.

[388] *Самуэль С.* Земская ўправа // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1996. Т. 3. С. 445.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скай губернскай друкарні, у І. Стафановіча, Б. І. Саламонава і Тасьманаў. Слаба абазначыліся ў кнігавыданні Мінска дзяржаўныя *ўстановы ў галіне суда і права* (Мінскі акружны суд), а таксама дзяржаўныя *ўстановы ў галіне здароўя і догляду* (Мінская яўрэйская бальніца і багадзельня, Мінскі гарадскі санітарны камітэт) і інш.

*Камітэт Заходняга фронту Усерасійскага земскага саюза* ў 1917 г., выкарыстоўваючы магчымасці іншых друкарняў, а потым і сваёй, спрабаваў наладзіць выданне "Вестника" камітэта, а таксама некаторай даведкавай і масава-палітычнай літаратуры (5 выд.).

Такім чынам, кнігавыдавецкая дзейнасць у Мінску ў 1795–1917 гг. адзначана небывалым раней ростам прыватнай і грамадскай ініцыятывы, якая стала асноўнай рухаючай сілай кнігавыдання. З канца XIX ст. пачынаецца працэс канцэнтрацыі тыпаграфскай і літаграфскай справы, стварэння прыватных выдавецтваў, выдавецкіх суполак. Адпаведна з нашымі падлікамі, колькасць выдадзенай кніжнай прадукцыі за перыяд з 1795 г. па 1917 г. размяркоўваецца наступным чынам: прыватныя кніжныя выдавецтвы – 1723 выд.; грамадскія – 1195; дзяржаўныя – 996 выд., што і вызначыла будову нашай тыпалагічнай схемы (гл. Дадат. 5, дыягр. 5.4), у аснове якой ляжыць лагічны прынцып развіцця формаў уласнасці. Неабходна адзначыць цесную функцыянальна-сістэмную сувязь паміж усімі формамі ўласнасці і іх узаемадзеянне ў сумесных выдавецкіх праектах. У сваю чаргу, кожны з вызначаных тыпаў кнігавыдавецтваў: прыватныя, грамадскія, дзяржаўныя – мае сваю структуру (гл. Дадат. 4).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Кніжны рэпертуар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Галінова-тэматычны склад мінскіх выданняў

Мінскія выданні азначанага перыяду сваім зместам прэзентуюць розныя галіны ведаў – гэта прыродазнаўства, тэхніка, сельская гаспадарка, медыцына, гісторыя, эканоміка, палітыка, права, ваенная справа, адукацыя, бібліятэчная справа і бібліяграфія, мовазнаўства, мастацкая літаратура, літаратуразнаўства, мастацтва і мастацтвазнаўства, псіхалогія і філасофія.

Колькасна самая значная галінова-тэматычная група мінскіх выданняў 1795–1917 гг. – гэта ***сацыяльна-эканамічныя выданні*** (1288 выд., або 41,5 %), якія прадстаўляюць статыстыку (50 выд.), фінансы (304), кіраванне (74), эканоміку (178), гарадскую (60) і земскую гаспадаркі (216), грамадскую (221) і дабрачынную дзейнасць (165 выд.). Трэба адзначыць, што на першым, пачатковым, этапе мінскія выданні сацыяльна-эканамічнай тэматыкі (гл. Дадат. 2., табл. 2.1) былі прысвечаны і адлюстроўвалі, у асноўным, адміністрацыйную (кіраўнічую), грамадскую і дабрачынную дзейнасць, як, напрыклад, “Przedpisanie jenerał gubernatora hrabiego Gudowicza, z kopją ukazu rządzącego senatu z dnia 7 marca 1799 r. o wyborach dworzańskich” (1799) ці “Zdanie sprawy Towarzystwa Mińskiego Dobroczynności” (1830).

Пачынаючы з 1870-х гг. кола сацыяльна-эканамічнай літаратуры пашыраецца, што было звязана ў першую чаргу з адкрыццём і дзейнасцю новых дзяржаўных і грамадскіх устаноў (Мінскай гарадской думы, Мінскай гарадской і губернскай земскай упраў, Мінскага губернскага статыстычнага камітэта, Мінскага вольна-пажарнага таварыства, Мінскага камерцыйнага банка, Мінскага таварыства ўзаемнага крэдыту, Мінскага таварыства ўзаемнага ад агню страхавання і г. д.).

Выданне сацыяльна-эканамічнай літаратуры ў Мінску, разнастайнасць яе тэматыкі сталі таксама прыкметай развіцця прамысловасці, эканомікі, гандлю, камерцыі, фінансаў у Мінску і Мінскай губерні. Так, калі ў 1865–1904 гг. мінскія выданні сацыяльна-эканамічнай тэматыкі складалі 34,9 % (420 выд.) ад агульнай колькасці выдадзеных у гэты перыяд у горадзе кніг (гл. Дадат. 2, табл. 2.2), то ў 1905–1917 гг. іх колькасць вырасла болей чым у два разы, налічвалася 851 выд. (51,1 %) (гл. Дадат. 2, табл. 2.3). З адкрыццём у Мінску земскай управы (губернскай і павятовай) развіваецца і кнігавыданне адпаведнай тэматыкі, звязанай з кіраваннем і асвятленнем стану земскай гаспадаркі (14 выд. на другім этапе і 202 – на трэцім). Вядучыя пазіцыі займаюць як на другім, так і на трэцім этапах выданні па фінансах (адпаведна – 139 і 165 выд.). Па дынаміцы іх друку можна прасачыць актывізацыю дзейнасці ў Мінску крэдытных, ашчадных, камерцыйных, страхавых і іншых фінансавых таварыстваў і ўстаноў, і асабліва камерцыйнага банка, асноўным клопатам якіх было назапашванне і развіццё капіталаўкладанняў у мясцовую эканоміку.

Мінскія выданні сацыяльна-эканамічнай тэматыкі, як можна заўважыць, сведчаць, што разам з забеспячэннем фінансавай стабільнасці ў горадзе дбалі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб дабрачыннасці – гэта яскрава адбілася на выданнях пра дабрачынную і грамадскую дзейнасць: адпаведна 71 і 69 выд. на другім этапе; 87 і 133 – на трэцім. Сярод мінскіх выданняў сацыяльна-эканамічнай тэматыкі на другім (64 выд.) і асабліва на трэцім этапе (114 выд.) пачынаюць вылучацца выданні па эканоміцы. На трэцім этапе ў названай тэматыцы з'яўляюцца выданні, у якіх аналізавалася дзейнасць асобных фабрык і заводаў. Як на другім, так і на трэцім этапах актыўна працуе Мінскі губернскі статыстычны камітэт. Вынікам яго дзейнасці сталі выданні па статыстыцы (адпаведна 20 і 30 выд. на другім і трэцім этапах). "Памятные книжки" и "Обзоры губернии" мы разглядаем у комплексе гістарычнай тэматыкі.

***Сельская гаспадарка*** (369 выд., або 11,9 %). Адным з вядучых кірункаў у мясцовым кнігавыданні 1795–1917 гг. заставалася і сельскагаспадарчая тэматыка. Праўда, другое месца ў галінова-тэматычным складзе кнігавыдавецкага патоку горада крыху адрознівае сітуацыю ад агульнай статыстыкі па Беларусі таго часу, дзе сельскагаспадарчыя выданні знаходзяцца на трэцім месцы. Адначасова мінскія выданні падмацоўваюць дадзеныя паказчыкі, дадаючы больш за 90 найменняў да вядомай на гэты час (273 выд.[389]) колькасці выданняў па сельскай гаспадарцы ў Беларусі.

Асноўная роля ў выданні сельскагаспадарчай кнігі належала Мінскаму таварыству сельскай гаспадаркі. Так, калі ў 1795–1864 гг. у Мінску былі выдадзены ўсяго толькі чатыры сельскагаспадарчыя кнігі (2 %), то ў 1865–1904 гг. сельскагаспадарчая тэматыка ў мінскай выдавецкай практыцы дала самы значны колькасны рост – 204 выданні, або 17 %, у 1905–1917 гг. – гэта 161 выданне, або 9,6 % (гл. Дадат. 2, табл. 2.1–2.3). Павелічэнне выдання кніг сельскагаспадарчай тэматыкі было звязана і са значнымі зменамі ў дзяржаўнай палітыцы – рэформай 1861 г., вызваленнем ад прыгону, што патрабавала новых падыходаў у землекарыстанні, рабіла вострай неабходнасць вывучэння перадавога вопыту ў галіне сельскай гаспадаркі.

Паводле зместу большасць мінскіх сельскагаспадарчых выданняў размяркоўваецца наступным чынам: агульныя пытанні сельскай гаспадаркі (213 выд.), лесаводства (34), жывёлагадоўля і конегадоўля (39), агранамічныя пытанні (29), садаводства, агародніцтва і пчалаводства (13 выд.). Развіццё розных галін сельскай гаспадаркі адлюстравалася ў выданні адпаведнай літаратуры, што было ў значнай ступені звязана з дзейнасцю такіх аддзяленняў пры Таварыстве сельскай гаспадаркі, як лясное, па рабочай конегадоўлі, па жывёлагадоўлі, агранамічнай секцыі.

Найбольшую падгрупу мінскіх сельскагаспадарчых выданняў складаюць кнігі *па агульных пытаннях*. Сюды ўвайшлі выданні, якія асвятляюць дзейнасць Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (1865–1904 гг. – 103 выд.; 1905–1917 гг. – 71 выд.); пытанні зямельнай рэформы (адпаведна – 12 і 13 выд.). Вылучаюцца таксама выданні па агульных пытаннях арганізацыі сельскагаспадарчай дзейнасці, арганізацыі і правядзенні ў Мінску сельскагаспадарчых выставак, пытаннях сельскагаспадарчай адукацыі, якія абмяркоўваліся на пасяджэннях Таварыства. Прыкладна на адным колькасным узроўні ў мінскім кнігавыданні

[389] Тамсама. С. 287.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаходзіліся і такія тэматычныя падгрупы, як сельскагаспадарчыя выданні *па жывёлагадоўлі і конегадоўлі* (адпаведна – 21 і 16 выд.), *лесаводству* (адпаведна – 30 і 4 выд.), а таксама *па агранамічных пытаннях* (адпаведна – 8 і 21 выд.). Па жывёлагадоўлі і конегадоўлі (4), а таксама па пытаннях садаводства (6 выд.) выдаваліся матэрыялы, у якіх выказвалася заклапочанасць і рабіліся захады па арганізацыі курсаў і атрымання адукацыі ў адпаведных галінах. Выходзілі працы па вывучэнні замежнага вопыту ў галіне сельскай гаспадаркі.

***Рэлігія*** (368 выд., або 11,8 %). Выданне мінскай рэлігійнай кнігі звязана з гісторыяй і дзейнасцю праваслаўнай і каталіцкай хрысціянскіх канфесій у асноўным, ў некаторай ступені – іўдзейскай. У 1795–1864 гг. мінскія рэлігійныя выданні складалі 34,3 % ад агульнай колькасці выдадзенай у гэты час кніжнай прадукцыі. Гэта былі, у асноўным, каталіцкія рэлігійныя кнігі, а таксама кнігі па іўдаізме (11 выд.) і адна па праваслаўі. Паступова ў выданні рэлігійнай кнігі назіраецца спад: у 1865–1904 гг. – 13,8 %, у 1906–1917 гг. – 7,3 %. Пачынаюць пераважаць друкаваныя праваслаўныя выданні: у 1865–1904 гг. – гэта ўжо 157 праваслаўных выданняў, тры каталіцкія і шэсць па іўдаізме; у 1905–1917 гг. – 86 праваслаўных, 10 каталіцкіх і 25 па іўдаізме. Аднак як колькасна, так і па мэтавым, чытацкім прызначэнні мінская рэлігійная кніга развівалася, поўнячы і пашыраючы свой змест мясцовай тэматыкай.

У адпаведнасці з вядомымі класіфікацыямі[390] і распрацоўкамі па сістэматызацыі рэлігійнай кнігі Т. А. Самайлюк[391] мінскія выданні па рэлігіі можна прадставіць у выглядзе спецыфічных, менавіта тэматыка-відавых комплексаў. Кнігі па рэлігіі, выдадзеныя ў Мінску, вылучаюцца, у першую чаргу, у два канфесійныя раздзелы, якія адпаведна прадстаўлены наступнымі комплексамі: *хрысціянства* – біблейская гісторыя, хрысталогія, патрыстыка, гісторыя Царквы, багасловіе, літургіка, богаслужэбныя кнігі, царкоўныя спевы, гамілетыка, кананічнае права, мастацкія творы; *іўдаізм* – біблейская гісторыя, гісторыя іўдаізму, багасловіе, рытуальныя абвінавачванні, равінская літаратура, рэлігійныя спевы.

Разгледзім спачатку найбольш колькасны комплекс мінскай рэлігійнай кнігі, звязаны з хрысціянствам. Асноўную частку дадзенага комплексу складаюць выданні па *гісторыі Царквы*. У ім вылучаюцца выданні па гісторыі Праваслаўнай царквы (170 выд.): працы агульнага характару і творы, прысвечаныя дзейнасці рускіх пастыраў (Дзмітрыя Растоўскага, мітрапаліта Святагорца Дыянісія). Асноўную частку мінскіх выданняў па гісторыі Праваслаўнай царквы складаюць кнігі і брашуры па гісторыі Праваслаўнай царквы ў Беларусі, сярод якіх некалькі выданняў агіяграфічных кніг, прысвечаных беларускім святым Кірылу Тураўскаму, Еўфрасінні Полацкай, Соф'і Слуцкай, Гаўрыілу Слуцкаму. У шматлікіх мінскіх рэлігійных выданнях адлюстроўвалася гісторыя Мінскай епархіі, дзейнасць мінскіх архіепіскапаў; гісторыя храмаў Мінскай епархіі. Знач-

[390] Универсальная десятичная классификация. 2. Религия / разработка корпорации С.-Петербургской духовной академии. Санкт-Петербург, 1996. 46 с. (Машинопись); Православие : библиогр. указ. кн. на рус. и церк.-слав. яз. за 1918–1993 гг. / сост. Н. Ю. Бутина, К. К. Тарасов ; науч. ред. и введ. протоиерея В. В. Асмуса. Москва : Изд-во Православ. Свято-Тихонов. богослов. ин-та : Рос. гос. б-ка, 1999. 512 с.; *Фунтикова С. П.* Православные библиотеки: Прошлое и настоящее : учеб. пособие. 2-е изд., доп. и перераб. Москва : МГУКИ, 2002. 256 с.

[391] *Самайлюк Т. А.* Да пытання тыпалогіі рэлігійнай кнігі. С. 35–39.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная колькасць выданняў прысвечана гісторыі духоўных навучальных устаноў (59 выд.): Мінскай духоўнай семінарыі, духоўным вучылішчам і царкоўна-прыходскім школам.

Мінскія выданні па гісторыі Каталіцкай царквы не адрозніваюцца такой разнастайнасцю, як выданні па гісторыі Праваслаўнай царквы. Гэта тры выданні, першае з іх – адозва, складзеная Я. Ходзькам, "Do duchownego i świeckiego stanu"(1811); другое і найбольш значнае – нарыс гісторыі Мінскай дыяцэзіі А. Ельскага (1907); трэцяе – кароткі ілюстраваны нарыс па гісторыі Івянецкага касцёла (1909) – усе прысвечаны Мінскай каталіцкай епархіі.

Адным са шматлікіх раздзелаў мінскіх рэлігійных выданняў з'яўляецца *гамілетыка*, прадстаўленая пропаведзямі (казаннямі) і пастырскімі пасланнямі. Каталіцкія казанні былі прымеркаваны да ўрачыстых актаў узвядзення на пасаду мінскага біскупа М. Ліпскага (1833), прыняцця манаства К. Залютынскай і П. Свентаржыцкай (1800), жалобных набажэнстваў па Аляксандры I (1825), асвячэння мінскіх могілак (1800). Праваслаўныя пропаведзі адлюстроўвалі падзеі заснавання, адкрыцця храмаў, часоўняў, таварыстваў. У іншых выпадках гэта былі пропаведзі пасля прывядзення да прысягі міравых суддзяў; наказы вайскоўцам; прамовы перад паніхідай; словы на асвячэнні храмаў, на царкоўныя і свецкія святы, словы пра фізічнае і маральнае здароўе. На пачатку XIX ст. у Мінску была зроблена спроба выдання пастырскіх пасланняў, аўтарам якіх быў першы біскуп Мінскай дыяцэзіі Якуб Дэдэрка.

Сярод *богаслужэбных кніг*, выдадзеных у Мінску, а гэта ў асноўным каталіцкія рэлігійныя кнігі, колькасна вылучаюцца дырэкторыумы, або касцёльныя календары (выйшла з 1824 г. да 1866 г. 38 выданняў); службы Госпаду і Багародзіцы; афіцыумы, або інструкцыі; набажэнствы; малітоўнікі; асобныя малітвы. Неабходна адзначыць, што сярод мінскіх каталіцкіх рэлігійных выданняў былі і забароненыя цэнзурай – "Złoty Ołtarzyk Wonnego Kadzenia Przed Stolicą Bożą: to jest modlitwy rozmaite" (1825)[392].

Да тэмы *хрысціянскай біблейскай гісторыі* мінскія выдаўцы прыступілі ў 1877 г., калі пачала выдавацца "Священная история Ветхого Завета в простых рассказах для детей младшего возраста" Ф. І. Міткевіча (мела 19 перавыданняў). У 1878 г. была надрукавана і "Священная история Нового Завета".

*Багаслоўе* прадстаўляюць адзінкавыя мінскія выданні: па дагматычным, параўнальным і маральным багаслоўі; па аскетыцы. Па *царкоўных спевах* вядомы шэсць выданняў, тры з якіх на польскай мове: "Pieśni nabożne" (1826, 1830); "Pieśń poranna"(1860), а тры – на рускай: "Сборник церковных песнопений" з перакладам іх на рускую мову У. Успенскага (1908, 1909) і "Православные молитвы и песнопения" (1909).

Мінскія выданні па іўдаізме былі першапачаткова прадстаўлены кнігамі *па біблейскай гісторыі* на іўрыце: "סדר הגדה של פסח עם פירוש..." ("Агада Пасхальная з тлумачэннем") (1816, 1833); "בית ישראל..." ("Дом Ізраіля") (1836) – крыніцы да каментарыя з Мідраша, Міхільты, Вавілонскага і Іерусалімскага Талмуда. Асноўная іх частка была надрукавана да канца 1830-х гг. *Па гісторыі іўдаізму ў Беларусі* можна адзначыць толькі такія мінскія выданні, як справаздачы аб дзейнасці

392 LVIA. F. 1241. Ap. 1. B. 17. P. 29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінскай Талмуд-Торы (1898–1914), справаздачы аб дзейнасці праўлення малітоўнай школы “Бес Гамедраш” у Мінску (1902–1914). Некаторыя выданні па іўдаізме прысвячаліся *рытуальным* абвінавачванням, *агульным даследаванням па іўдаізме.* Для мінскіх выданняў па іўдаізме характэрны параўнальныя даследаванні. *Равінская літаратура*, гамілетычная, заняла крыху больш значнае становішча ў мінскай выдавецкай дзейнасці, чым іншыя, што адпавядала стану і ў хрысціянскіх выданнях гэтага жанру. Занатаваны сінагагальныя словы Іх Вялікасцям Мікалаю II і Аляксандры Фёдараўне з выпадку каранавання 1896 г., пры адкрыцці ў Мінску харальнай сінагогі ў 1906 г., аб ліквідацыі прычын дрэннага становішча яўрэяў у Расіі (1908 г.). Вядома адзінае выданне для *рэлігійных спеваў* на іўрыце, якое выйшла ў 1832 г. Гэта быў перадрук з жоўквінскага выдання 1822 г. “…דברי שיר” (“Зборніка песень”), складзенага М. Г. Летэрысам[393].

Мінскія рэлігійныя выданні 1795–1917 гг., што склалі 11,8 % ад агульнай колькасці выдадзенай кніжнай прадукцыі ў горадзе, размясціліся на трэцяй пазіцыі ў адрозненні ад другога месца адпаведна агульнай статыстыкі па Беларусі (15,5 %[394]).

***Медыцына*** (176 выд., або 5,7 %). На першым этапе мінскага кнігавыдання (1795–1864) медыцынская кніга займала больш чым сціплае месца – 0,9 % ад агульнай колькасці выдадзенай на той час прадукцыі (гл. Дадат. 2, табл. 2.1). Гэта былі два выданні: адно (1831 г.), па эпідэміялогіі, было прысвечана прычынам і сродкам лячэння халеры, другое (1836 г.), па фармакалогіі, – лекавым раслінам. Сапраўдны ж уздым у развіцці як мясцовай медыцыны, так і ў выданні кніг медыцынскай тэматыкі адбыўся на другім этапе мінскага кнігавыдання ў 1865–1904 гг. (83 выд.), калі было створана Таварыства мінскіх урачоў. У гэтыя гады было выдадзена ў 40 разоў болей медыцынскіх выданняў, чым да гэтага, – 6,9 % ад агульнай колькасці выпушчаных кніг. Каля паловы з іх з'явілася дзякуючы Таварыству мінскіх урачоў і Ваенна-санітарнаму таварыству. На трэцім этапе мінскага кнігавыдання (1905–1917) медыцынскія кнігі складаюць 5,5 % (91 выд.) ад агульнай колькасці і займаюць даволі стабільнае становішча ў агульнай структуры кнігавыдавецкага рэпертуару (гл. Дадат. 2, табл. 2.1–2.3).

Змест мінскіх выданняў па медыцыне мае шырокі спектр спецыялізаваных кірункаў: фізіялогія, паталогія, хірургія, неўралогія, фармакалогія, гінекалогія, гігіена і санітарыя, стаматалогія, эпідэміялогія, інфекцыяністыка, ветэрынарыя, лячэбная фізкультура, ваенная медыцына і ахова здароўя. Першая пазіцыя – за медыцынскімі выданнямі па *ахове здароўя* (129 выд.). У гэтую групу выданняў увайшлі працы, якія асвятляюць дзейнасць мясцовых органаў улады ў галіне забеспячэння аховы здароўя насельніцтва Мінскай губерні; дзейнасць лячэбных устаноў: бальніц, багадзельняў, таварыстваў. На другім месцы – кнігі *па гігіене і санітарыі.* Выданні па *эпідэміялогіі і інфекцыяністыцы* адлюстроўвалі заклапочанасць медыцынскай грамадскасці Мінска вырашэннем праблем названай галіны на працягу XIX – XX стст. Пачынаючы з 1830-х гг. гэтая тэматы-

[393] Леттерис Меир // Электронная еврейская энциклопедия / Ассоциация по изучению еврейских общин в диаспоре [Электронный ресурс]. URL: http://www.eleven.co.il/?mode=article&id=12424&query=

[394] *Умецкая Я. С.* Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. С. 288.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ка сістэматычна прапаноўвалася для абмеркавання: эпідэміялагічная сітуацыя, эпідэміі сухотаў і халеры. Выданні ў галіне *ваеннай медыцыны* з'явіліся ў мінскім друку толькі ў перыяд Першай сусветнай вайны, у 1915–1917 гг., калі Заходні фронт праходзіў па тэрыторыі Беларусі.

У групу мінскіх выданняў ***гістарычнай тэматыкі*** (172 выд., або 5,5 %) увайшлі працы па гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, гістарычным краязнаўстве. Найбольш распаўсюджанымі мінскімі гістарычнымі друкамі былі выданні па *гістарычным краязнаўстве*, або гісторыка-краязнаўчыя (146 выд. – 84,9 % ад агульнай колькасці выданняў гістарычнай тэматыкі). Яны прадстаўлены календарамі, памятнымі кніжкамі, гісторыка-статыстычнымі аглядамі, зборамі дакументаў, якія былі прысвечаны Мінску і Мінскай губерні. Выданне календароў у Мінску было пачата яшчэ ў XVIII ст. Вядомы іх выданні ад 1799 г. да 1917 г. Рэгулярнымі выданнямі Губернскага статыстычнага камітэта былі "Памятные книжки Минской губернии" (57 выпускаў), а таксма штогадовыя "Обзоры Минской губернии" (32 выд.). У друку названых выданняў быў зацікаўлены і ўрад, якому неабходна было валодаць не толькі інфармацыяй аб прадукцыйных сілах і эканамічных рэсурсах губерні, але і трымаць толькі ў межах краязнаўства развіццё мясцовай гістарычнай навукі. Таму, як адзначаюць даследчыкі, у першую чаргу памятныя кніжкі сталі асноўнымі органамі друку для мясцовай краязнаўчай грамадскасці і адной з дакладных крыніц у гісторыка-археалагічным вывучэнні губерні. Яны змяшчалі гісторыка-этнаграфічныя нарысы, заснаваныя на архіўных і дакументальных крыніцах, а таксама арыгінальныя літаратурна-мастацкія творы.

Асобныя працы (12 выд.) мясцовых гісторыкаў прысвечаны Міншчыне, яе гарадам і мястэчкам. Сярод мінскіх гісторыка-краязнаўчых выданняў неабходна вылучыць і зборнікі гістарычных дакументаў (7 выд.). Адным са старэйшых і адметных выданняў з'яўляецца "Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии" (1848). У 1909–1913 гг. Мінскім царкоўным гісторыка-археалагічным камітэтам былі выдадзены чатыры выпускі "Минской старины" – працы па зборы і друку мясцовых архіўных дакументаў. Калі ў Мінску ў 1795–1864 гг. гістарычная тэматыка была прадстаўлена толькі выданнямі па гістарычным краязнаўстве, то ў 1865–1904 гг. разам з высокай дынамікай па адзначанай тэматыцы (101 выд.) ужо з'явіліся і асобныя гістарычныя і археалагічныя выданні (10), а ў 1905–1917 гг. іх колькасць узрасла яшчэ болей (22 выд.).

У тэматыцы мінскіх уласна *гістарычных выданняў* можна вылучыць агульную гісторыю (сусветную гісторыю, гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, гісторыю Расійскай імперыі, гісторыю Паўночна-Заходняга краю) і галіновую гісторыю (гісторыю царквы, навучальных устаноў, ваенную гісторыю). Мінскія выданні па сусветнай гісторыі (3 выд.) убачылі свет толькі ў 1907–1909 гг. Гэта былі творы рымскіх палкаводцаў Юлія Цэзара і Ціта Лівія. З гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага былі звязаны толькі два выданні: "Zarys dziejów Litewskich" Х. Паяты (К. Скірмунт) – 1901 г. і "Troki i Zamek Trocki" У. Загорскага – 1902 г. Расійскай гісторыі, тэматыка якой стала актуальнай у мінскім друку пачынаючы з другой паловы XIX ст., была прысвечана большасць выданняў (11). У 1905–1917 гг. у Мінску выходзяць дзве кнігі па гісторыі Паўночна-Заходняга краю, а таксама дзве кнігі, прысвечаныя паўстанцкім падзеям першай паловы XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на тэрыторыі краю, у асноўным з пункту гледжання інтарэсаў Расійскай імперыі. Што тычыцца мінскіх выданняў па галіновай гісторыі: гісторыі царквы, гісторыі навучальных устаноў, ваеннай гісторыі, – то яны аднесены і разглядаюцца намі ў адпаведных тэматычных комплексах: "рэлігія", "адукацыя і педагогіка", "ваенная справа".

***Адукацыя і педагогіка*** (120 выд., або 3,9 %). Асноўную частку гэтых выданняў складае літаратура, якая адлюстроўвае дзейнасць органаў кіравання навучаннем у Мінскай губерні (дырэкцыі народных вучылішчаў, земскай управы) – 9 % (14 выд.); дзейнасць навучальных устаноў Мінска (гімназій, рэальных, рамесных і камерцыйных вучылішчаў, нядзельных, прафесійных і прыватных школ, вячэрніх курсаў) – 56 % (84 выд.). Зусім нязначная лічба прыпадае на выданні пра дзейнасць іншых навучальных устаноў Беларусі – 2 % (3 выд.).

Першапачаткова, у 1795–1864 гг., адукацыйна-педагагічная тэматыка была прадстаўлена выданнямі, прысвечанымі выключна дзейнасці Мінскай гімназіі. Адсутнасць вышэйшай школы ў Мінску наклала непасрэдны адбітак і на мінскія выданні, друк якіх быў падпарадкаваны патрэбам мясцовай сярэдняй школы. Хадайніцтвы Мінскай гарадской думы ў 1903 г. перад урадам аб арганізацыі ўніверсітэта ў Мінску, а Мінскага таварыства ўрачоў у 1913 г. аб стварэнні медыцынскага факультэта не мелі вынікаў аж да 1914 г. Тады ў Мінску быў адкрыты Настаўніцкі інстытут. Аднак ваенныя падзеі на пэўны час прыпынілі дзейнасць педагагічнай навучальнай установы горада, у тым ліку і ў галіне выдавецкай справы. Вядома толькі адно мінскае выданне, прысвечанае адкрыццю інстытута ў 1914 г.

Тым не менш, па словах даследчыкаў, яшчэ пад канец XIX ст. менавіта "на базе сярэдніх навучальных устаноў пачалі складвацца своеасаблівыя цэнтры навуковай думкі"[395]. І найбольшае развіццё адукацыйна-педагагічная тэматыка атрымала ў мінскім друку менавіта ў 1865–1904 гг., калі выйшла 64 выданні (Дадат. 2, табл. 2.1–2.3). Яны прадстаўлююць дзейнасць рэальных і рамесных вучылішчаў (20 выд.); гімназій (19 выд.); дырэкцыі народных вучылішчаў (11 выд.). Усяго два мінскія адукацыйна-педагагічныя выданні занатаваны намі па самаадукацыі і выхаванні: адно – на першым этапе і адно – на другім. Асабліва вылучаецца адзінае выданне такога кшталту – "O udoskonaleniu moralnem czyli o ukształceniu samego siebie" ("Аб маральным удасканаленні, або Аб выхаванні самога сябе") Ю. Герандэ (1855, у 3 т.), у якім раскрываецца значэнне ў працэсе выхавання асветы і разважлівага розуму. Неабходна таксама адзначыць, што і некаторыя творы мастацкай літаратуры, выдадзеныя ў Мінску, насілі павучальны характар, напрыклад "Подарок благонравным ученикам и ученицам на новый 1834 год, или Нравоучительные Детские повести, Служащие к образованию ума и сердца" А. Паўлава (1833), "…ספר אמרי אמת" ("Имрей эмес, т. е. Нравственные рассказы") М. Бэрнікера (1913). Пытанні выхавання і маральнасці былі звязаны ў першую чаргу з рэлігійным, духоўным выхаваннем.

***Мастацкая літаратура*** (118 выд., або 3,8 %). Колькасна невялікая група мінскіх выданняў па мастацкай літаратуры, якая займае сёмае месца, можа, аднак, быць адзначана як своеасаблівасць мінскага кнігавыдання. Бо, паводле да-

[395] *Бярозкіна Н.* Асвета: да ведаў доўгі шлях // Увесь Мінск : давед. Мінск : Беларусь, 1993. С. 147.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

следчыкаў, выданні мастацкай літаратуры ў Беларусі таго часу па сваёй колькасці былі на апошнім месцы, іх прадстаўлялі ўсяго 35 выданняў (улічваючы літаратуразнаўчыя)[396]. На самай жа справе адных толькі мінскіх выданняў па мастацкай літаратуры болей чым у тры разы названай лічбы.

У 1795–1864 гг. асноўнымі выданнямі мастацкай літаратуры, што складала амаль 13 % ад усяго выдавецкага рэпертуару на дадзеным этапе ў Мінску, былі паэтычныя творы (17 выд.), выходзілі таксама празаічныя (4) і драматычныя (3 выд.) творы. Было надрукавана пяць зборнікаў прозы і паэзіі. Найбольш папулярныя паэтычныя творы прадстаўлены *зборнікамі вершаў* В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Плуга, Л. Вечара; *аповесцямі ў вершах* Д. І. Сергіеўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча; *апавяданнямі ў вершах* В. Дуніна-Марцінкевіча; *камедыямі ў вершах* Я. Ходзькі, М. Лапіцкага; *паэмамі* У. Сыракомлі, А. Міцкевіча; *вершамі-прысвячэннямі* І. Быкоўскага, І. Легатовіча, М. Лойкі. Мастацкія кнігі азначанага перыяду былі ў асноўным арыгінальныя, мясцовых аўтараў, а таксама перакладныя, напрыклад, на польскую мову з французскай – аповесць "Miłość na doświadczeniu" (1797), з рускай – вершаваная камедыя В. Капніста ў прозе з тлумачэннямі М. Тамашэўскага "Jabieda, to jest Pieniactwo" (1808); на беларускую мову з польскай – пераклад В. Дуніна-Марцінкевіча паэмы ў вершах А. Міцкевіча "Pan Tadeusz" (1859). Вылучаюцца таксама выданні для дзяцей – чытанка М. Лойкі (1860), зборнікі паэзіі і прозы польскіх пісьменнікаў, складзеныя Ф. Чапяліньскім.

Выданне мастацкай літаратуры ў Мінску ў 1865–1904 гг. было параўнальна нязначным, уступала колькасна (23 выд.) і вельмі ў працэнтных адносінах папярэдняму этапу (1,9 % ад агульнай колькасці). 1865–1904 гг. вызначаюцца самым нізкім узроўнем выдання ў Мінску твораў мастацкай літаратуры. Асноўнымі становяцца выданні прозы (11 выд.), паэтычных твораў выдадзена сем, драматычных – два. Паэтычныя творы падзяляюцца на зборнікі вершаў асобных аўтараў, зборнікі розных аўтараў, тэматычныя зборнікі. Сярод празаічных твораў вылучаюцца аповесці Ю. Крашэўскага, А. Круглова; апавяданні – К. Дарэўскай-Вярыгі, А. Паўлава, паданні і легенды Д. Бохана; падарожныя нарысы і мемуары – С. Куклінскага (Кукліна), Ф. Эрбе. Мінскія выданні драматычных твораў – гэта вадэвільныя п'есы М. С. Стравінскага і М. С. Сахарава. Быў выдадзены адзін зборнік паэзіі і прозы "К Сиону" (1903), а таксама два пераклады на рускую мову – адзін Д. Бохана са старажытнарускай мовы паэмы "Игорь князь Северский", другі С. Халюціна з французскай мовы ўспамінаў генерала Эрбе "Французы и русские в Крыму" (1894). Дзіцячую літаратуру прадстаўляюць "Сборник стихотворений для низших классов гимназий" (1886) М. П. Каралёва і ілюстраваныя дзіцячыя апавяданні К. Дарэўскай-Вярыгі "W mieście i na wsi" (1889).

У 1905–1917 гг. выданне твораў мастацкай літаратуры ў Мінску атрымлівае новае развіццё і пэўны колькасны рост (65 выд., або 3,9 %). У рэпертуары мінскіх выданняў з'яўляецца раман – "Спартак" Р. Джаваньёлі (1917) і казкі – "Bajarz polski" ("Казачнік польскі") А. Гліньскага (1907, 1913). Значна павышаецца колькасць апавяданняў (30 выд.) – гэта творы Э. Ажэшкі, Д. Айзмана, Л. Ан-

[396] *Умецкая Я. С.* Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. С. 287.

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

дрэева, Ф. Бернатовіча, Л. Броня, У. Гаршына, М. Гаўлоўскага, М. Горкага, У. Караленкі, І. Перэца, А. Чэхава і г. д. Ёсць паэмы ў прозе – Ш. Аша і І. Перэца, мемуары-эсэ – В. Макоўскага. Сярод паэтычных твораў 1905–1917 гг., выдадзеных у Мінску, вылучаюцца зборнікі вершаў асобных аўтараў, скандоўнікі; зборнікі розных аўтараў. Драматычныя творы – гэта ў асноўным гістарычныя драмы. Шэраг мастацкіх твораў (12 выд.), якія ўбачылі свет у Мінску, з'яўляюцца зборнікамі паэзіі і прозы, напрыклад: “Z nad Wilii i Niemna: książka zbiorowa (Pamieci Adama Mickiewicza i Tomasza Zana w 50-tą rocznice ich zgonu)” (1906), літаратурны альманах на рускай мове “Туманы” (1909), …1905. “קולטור” זאמלבוך (Замельбух “Культур”, т. е. Сборник “Культур”, 1905) на ідыш, «Літаратурны зборнік “Вольнае Беларусі”» (1917). Узрастае колькасць перакладных выданняў (14) і выданняў для дзяцей (8), сярод якіх вершы, апавяданні і казкі на рускай, польскай, беларускай і яўрэйскай мовах.

Неабходна адзначыць, што выдадзеныя ў Мінску кнігі мастацкай літаратуры засведчылі развіццё яе розных жанраў: у прозе з'явіліся раман, мемуары; пашырыліся выданні для дзяцей на розных мовах; пераклады. Адной з вядучых тэматык у мастацкай літаратуры была гістарычная.

***Права*** (98 выд., або 3,2 %). У дадзенай групе вылучаюцца выданні ў галіне судаводства (14 выд.), маёмаснага права (11), зямельнага права (10), сялянскага права (10), адміністрацыйна-дзяржаўнага права (9), паліцэйскага права (7), банкаўскага права (6), фабрычна-заводскога права (3), міжнароднага права (3), гарадскога права (2), саслоўнага права (2), воднага права (1 выд.). Актывізацыю ў Мінску кнігавыдання па праву можна назіраць на другім і асабліва на трэцім яго этапах (гл. Дадат. 2, табл. 2.1–2.3). Першы этап адзначаны адзіным выданнем па маёмасным праве. Наступныя этапы сведчаць аб развіцці такіх галін права, як судаводства (12 выд.), сялянскае права (6), зямельнае права (3 выд.). Асабліва вызначаюцца два шматтомныя выданні В. Л. Ісачанкі. Адно з іх, “Гражданский процесс” (1890–1895), было выдадзена ў якасці практычнага каментарыя да другой кнігі “Устава гражданского судопроизводства” і складалася з шасці тамоў, другое – “Русское гражданское судопроизводство” (1901–1902) уключала два тамы. Патрэбы мясцовай грамадскасці ў вырашэнні прававых праблем забяспечваліся большасцю выданняў па зямельным, сялянскім і паліцэйскім праве. На трэцім этапе мінскага кнігавыдання з'яўляюцца выданні па банкаўскім, міжнародным, гарадскім, фабрычна-заводскім і водным праве, якія сведчылі аб развіцці і пашырэнні прававых інтарэсаў мінскай грамадскасці.

***Прыродазнаўства*** (85 выд., або 2,7 %). Прыродазнаўчую тэматыку прадстаўляюць выданні па *агульным прыродазнаўстве* (7 выд.), *матэматыцы* (33), *хіміі* (6), *балотазнаўстве* (32), *геалогіі і глебазнаўстве* (2), *батаніцы* (1), *геаграфіі* (4 выд). Да пачатку XX ст. выданні па прыродазнаўстве былі эпізадычнымі. Калі ў 1795–1864 гг. па гэтай тэматыцы была выдадзена адна геаграфічная мапа Мінскай губерні (1848), то ў 1865–1905 гг. з'явіліся такія выданні, як “География Минской губернии” А. П. Смародскага (1894), “Почва Минской губернии в связи с геологическим устройством и рельефом” Ф. М. Ястрэмскага (1904), “Записки по ботанике для первоначального знакомства с ботаническими сведениями” М. Ф. Паўлава (1888) і “Przyczyny chorob roslin hodowlanych w pokoju i sposób ich leczenia” Я. Ляскоўскага (1900), “К вопросу осушения Полесья и спе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыяльных Пинских болот" П. К. Твардоўскага (1903). У пэўнай ступені цікавіліся прыродазнаўчымі пытаннямі ў Мінскім таварыстве сельскай гаспадаркі, дзе была створана нават хімічная станцыя. Менавіта дзейнасці гэтай станцыі былі прысвечаны два выданні 1903 г. Вядома таксама адно выданне па хіміі 1915 г. – гэта "Эволюция химических элементов" А. А. Макрыцкага.

У 1905–1917 гг. у выданні кніг па прыродазнаўстве адлюстравалася актыўныя выдавецкая дзейнасць Мінскай балотнай станцыі – 1911–1917 гг., а таксама Мінскага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі – 1912–1915 гг. Асноўную частку выданняў складалі працы па *балотазнаўстве*, якія выходзілі асобнымі адбіткамі з часопіса "Болотоведение", што выдавала Мінская балотная станцыя. Працы па балотазнаўстве прэзентавалі развіццё навуковых даследаванняў па класіфікацыі, гідратэхніцы і культуры балот, лугазнаўстве. *Па геаграфіі* выйшлі ў гэты час у Мінску "Сборник статистических сведений по коммерческой географии" Э. Ф. Рэйсмілера (1907) і, магчыма, "Geografia" Валовіча (1916); *па батаніцы* – "Предварительный отчет о ботанических исследованиях в Могилевской губернии летом 1913 года" Г. К. Крэйера (1914).

Адной з найбольш прадстаўленых у мінскіх выданнях прыродазнаўчага комплексу была *матэматыка*. Выданні па матэматыцы сталі друкавацца ў Мінску з сярэдзіны 1870-х гг. У 1865–1904 гг. у Мінску было выдадзена 14, а ў 1905–1917 гг. – 19 кніг па матэматыцы (гл. Дадат. 2, табл. 2.2–2.3). Сярод матэматычных выданняў вылучаюцца наступныя тэматычныя групы: арыфметыка (13 выд.), алгебра (11), геаметрыя (1), трыганаметрыя (3 выд.). Першымі мінскімі выданнямі па матэматыцы былі працы па алгебры. Большасць жа выданняў па алгебры і арыфметыцы ўяўляла сабой дапаможнікі для рашэння задач.

***Мастацтва і мастацтвазнаўства*** (71 выд., або 2,3 %). Сярод названай групы выдзяляюцца выданні па музыцы, жывапісе, тэатры, мастацтвазнаўстве. Найбольш значная колькасць выданняў па мастацтве і мастацтвазнаўстве была выдадзена ў 1795–1864 гг. – 48 выд., што складае 20,6 % ад агульнай колькасці выдадзеных у гэты час у Мінску кніг. Адным з першых выданняў *па музыцы* была праграма для гімназіі "Śpiew do poloneza" ("Спевы да паланэза") (1817). Трэба зазначыць, што менавіта 1860–1862-я гг. сталі самымі плённымі ў выданні музычных твораў у Мінску, што было звязана з дзейнасцю А. Валіцкага. Выйшлі *песні, песні да аперэты,* у тым ліку рамансы, серэнады, *танцавальная музыка* – полькі, мазуркі, паланэзы, галоп, кантраданс такіх кампазітараў, як С. Манюшка, Ф. Міладоўскі, В. Пшыбора, А. Грунер, К. Лада, А. Бартэльс і К. Марцінкевіч. Творы прызначаліся ў асноўным для выканання на фартэпіяна. Сярод нотнамузычных выданняў вылучаецца аб'ёмісты музычны твор – партытура аперэты для фартэпіяна "Konkurenci" Ф. Міладоўскага (1861). Яна, як і іншыя нотнамузычныя творы, выдавалася асобнымі сшыткамі і цалкам. Тэмы *жывапісу і тэатру* ў гэты перыяд нязначна адлюстраваны ў мінскіх выданнях. Мы можам толькі адзначыць два выданні ў галіне жывапісу – гэта літаграфічныя працы ў адзін аркуш "Портрет. М. А Гинцбург, сочинитель славных еврейских сочинений" і "Мирзах, т. е. Восход", выкананыя ў літаграфіі Ф. Фалька ў 1851 г., і неадшуканае выданне, прысвечанае мінскаму тэатру – "Teatr Miński" (1844).

1865–1904 гг. адзначаны выхадам у свет першых асобных прац *па мастацтвазнаўстве*, а менавіта па музыказнаўстве, – "Иоганн Себастьян Бах и его зна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

чение в музыке" С. Л. Халюціна (1894), а таксама ў перакладзе з французскай мовы таго ж аўтара "Краткий обзор истории русской музыки" А. Субіса (1895). У канцы 1870-х гг. прадоўжыўся друк *нотна-музычных* твораў – выйшлі не менш як сем выданняў М. Грушвіцкага. Былі выдадзены статуты Музычнага таварыства і Таварыства аматараў вытанчаных мастацтваў (1899), каталог выставы карцін (1891), альбом фатаграфій "Виды города Минска" С. А. Някрасава (1904).

Асноўнымі ў 1905–1917 гг. былі выданні ў галіне *жывапісу* – гэта *каталогі* мастацкіх выстаў у таварыстве "Ognisko" (1911), Гарадскім музеі (1913), тэматычнай выставы – "Художники – воинам" (1915), рэтраспектыўнай выставы карцін польскіх мастакоў (1916), а таксама адно выданне правіл і праграмы для вучылішча мастака М. Рубінштэйна (1907) (гл. Дадат. 2, табл. 2.3).

***Палітыка*** (60 выд., або 1,9 %). Гэта выданні па адміністрацыйна-дзяржаўным кіраванні, імперска-прапагандысцкай і рэвалюцыйнай дзейнасці, па нацыянальных пытаннях. Асабліва поўна прадстаўлена акрэсленая тэматыка адпаведнымі мінскімі выданнямі 1905–1917 гг. – 29 выд. Менавіта на дадзеным этапе з'яўляюцца выданні, прысвечаныя нацыянальным пытанням: "Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску" (1917), "Аўтаномія Беларусі" Я. Лёсіка (1917), "די אורזאכען פון אנטיסעמיטיזם" ("Прычыны антысемітызму") А. Бебеля (1906); імперска-прапагандысцкай тэматыцы: "Речь на трехсотлетний юбилей об избрании царя из дома Романовых Михаила Федоровича" М. Марозіка (1913). Новай для мінскіх легальных выданняў была і рэвалюцыйная тэматыка, прадстаўленая разнастайнымі брашурамі сацыял-дэмакратычнага кірунку. Большая частка мінскіх выданняў па адміністрацыйна-дзяржаўным кіраванні асвятляла розныя пытанні выбараў у Думу, на Устаноўчы сход і інш.

***Бібліятэчна-бібліяграфічную*** (58 выд., або 1,9 %) тэматыку мінскіх выданняў прадстаўляюць каталогі бібліятэк (27 выд.), каталогі кнігарняў (17), справаздачы бібліятэк (7), статуты бібліятэк (4), бібліяграфічныя паказальнікі (2), каталогі часопісаў (1 выд.). На розных этапах мінскага кнігадрукавання выданні бібліятэчна-бібліяграфічнай тэматэтыкі складалі ад 1 % да 2 % у агульным патоку выдадзеных кніг (гл. Дадат. 2, табл. 2.1–2.3). Першымі з азначанай тэматыкі ў Мінску выйшлі "Katalog xiąg znayduiących się w Mińsku w xięgarni Antoniego Muszyńskiego" (1805) і "Роспись русских книг Минской губернской библиотеки для чтения" (1849). Бібліятэчна-бібліяграфічная тэматыка атрымала адлюстраванне ў мінскім друку ў асноўным на другім і трэцім этапах (Дадат. 2, табл. 2.1–2.3). У выданнях гэтай тэматыкі – гісторыя стварэння ў Мінску публічных (імя А. С. Пушкіна і імя Л. М. Талстога), грамадскіх і прыватных бібліятэк і чытальняў, дзейнасць прыватных кнігарняў, першы вопыт складання бібліяграфічнага паказальніка зместу часопіса, якім сталі "Минские епархиальные ведомости" (1899–1900); апісанне рукапіснага аддзела і стараддрукаваных кніг бібліятэкі Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта" (1909).

***Тэхніка*** (39 выд., або 1,3 %). Выданні па тэхніцы з'явіліся ў мінскім друку толькі з канца 1870-х гг., што было звязана найперш з развіццём прамысловага, транспартнага і сельскагаспадарчага капіталу, а таксама з будаўніцтвам Лібава-Роменскай чыгункі, дзейнасцю яе друкарні. Найбольш актыўна выходзяць тэхнічныя выданні ў Мінску ў 1909–1917 гг. Вылучаецца наступная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэматыка: выданні па харчовай вытворчасці, транспарце, электратэхніцы, машынабудаванні і апрацоўцы металаў, будаўніцтве, фотатэхніцы і пажарна-тэхнічнай бяспецы.

Асноўную частку мінскіх прац па тэхніцы складаюць выданні *па транспарце*, сярод якіх можна вылучыць выданні *па чыгуначным* (напрыклад, "Технические условия на постройку товарных крытых вагонов, платформ и угольных полувагонов", 1878), *гарадскім* (два выданні па тэхнічных пытаннях пабудовы мінскага гарадскога трамвая (1911, 1913) і *ваенным* транспарце (адно выданне 1890 г.). Тэхнічная тэматыка прадстаўлена і выданнямі па *электратэхніцы*, напрыклад, у 1917 г. – "Записки по электротехнике слабых токов" А. Д. Бачкоўскага і "Elementarna radjotelegrafija i radjotelefonja z pobieznym kursem elektrotechniki" ("Элементарны радыётэлеграф і радыётэлефон з беглым курсам электратэхнікі") З. Тарло-Мазіньскага; *па машынабудаўніцтве і апрацоўцы металаў, па будаўніцтве і будаўнічых матэрыялах.* Адзначаюцца адзінкавыя выданні па *фотатэхніцы* (1903) і *пажарна-тэхнічнай бяспецы* (1898).

Мінскія выданні ***па ваеннай справе*** (33 выд., або 1,1 %) прадстаўлены загадамі Мінскай ваеннай акругі на тэатры ваенных дзеянняў за 1914–1915 гг., матэрыяламі пра дзейнасць ваенных арганізацый, па гісторыі ваеннай справы, па ваеннай адукацыі. Найбольшую цікавасць уяўляюць выданні па гісторыі ваеннай справы – гэта "История Харьковского полка" (1897) і "История Иркутского полка" (1902) Я. Альбоўскага. Дзейнасць Таварыства польскіх вайсковых ведаў у Мінску ў 1917 г. папоўніла кнігавыдавецкі рэпертуар у галіне ваеннай адукацыі васьмю брашурамі, такімі як "Podręcznik dla żołnierza piechoty" ("Падручнік для жаўнера пяхоты") Г. Багіньскага (1917).

***Мовазнаўства*** (26 выд., або 0,8 %). У 1795–1864 гг. – гэта 1,72 % (4 выд.), у 1865–1904 гг. – 1,2 % (14), у 1905–1917 гг. – 0,5 % (8 выд.) (Дадат. 2, табл. 2.1–2.3). Гэтыя выданні можна размеркаваць па моўнай прыкмеце: на беларускай, рускай, польскай, англійскай, нямецкай, французскай мовах. Па *гісторыі мовазнаўства* вылучаецца кніга А. М. Чарнышова "Биография науки о языке" (1871). Выданне, якое выйшла ў Мінску ў 1909 г. – "Белорусы, их разговорный и книжный язык при свете истории" Д. В. Скрынчанкі, мы аднеслі *да гісторыі беларускай мовы.*

Асноўную ж частку літаратуры па мовазнаўстве складаюць выданні па *рускай мове.* Уяўляюць яны сабой выданні па правапісе, граматыцы, фанетыцы, сінтаксісе, па этымалогіі і славеснасці. Выходзілі і даследаванні па паходжанні прозвішчаў, напрыклад Сяўрук і Курчэвіч (1895, 1897), а таксама развіцці каранёў і слоў з гукаў ("Опыт русского генеалогического словаря" А. Рубероўскага, 1914).

Нязначнай колькасцю мінскіх выданняў прадстаўлена *польская мова* – гэта азбукі Ф. Фалька (1852, 1856, 1858), граматыкі польскай мовы Ф. Чапяліньскага (1859), (?) Пашкевіч (1916), а таксама руска-польскі і польска-рускі вайсковы слоўнік (1917).

Адзінкавыя выданні былі па *англійскай мове* – "Ключ и пособие к методу Берлитца английского языка" С. К. Ліхтэрмана (1903); *французскай* – "Французско-русский словарь к методе Берлица" Х. Вадагінскага (1905) і *нямецкай* – "ABC in Bildern für Kinder" Ф. Фалька (1854), "Руководство к практическому

изучению немецкого языка с изложением важнейших грамматических правил" В. Бекю (1882).

Да ***літаратуразнаўчых*** прац, якія выдаваліся ў Мінску, мы аднеслі рускамоўныя дапаможнікі па вывучэнні мастацкіх твораў на латыні С. Самуйлава (1913, 1914), выданне "Дети в еврейской литературе" І. Е. Рубіна (1917). Трэба адзначыць, што некаторыя літаратуразнаўчыя працы змяшчаліся ў літаратурна-мастацкіх зборніках, календарах, памятных кніжках. Названыя выданні разглядаюцца намі ў адпаведных нашай тыпалагічнай схеме групах. У групе мастацкай літаратуры змешчаны літаратурныя зборнікі: аўтарскія і калектыўныя; у групе выданняў па краязнаўстве – мінскія календары (на рускай, польскай і яўрэйскіх мовах) і памятныя кніжкі Мінскай губерні.

Зусім нязначную колькасць складаюць кнігі па ***філасофсіі, псіхалогіі, логіцы.*** Не адшукана мінскае выданне *па філасофіі* на лацінскай мове 1811 г., занатаванае Я. Умецкай як "Projtoictiones philosophia"[397]. У назву, як відаць, укралася памылка. Магчыма, яго прыкладная назва магла быць "Projectiones philosophiae", або гэта было перавыданне віленскіх "Тэзісаў па філасофіі" 1780 г. – "Propositiones philosophicae…", аўтарам якіх выступаў Bernardus S. F.[398], а не Bernas [Józef]? Такім чынам, "філасофскае пытанне" застаецца адкрытым для наступных пошукаў.

З'яўленне мінскіх выданняў *па псіхалогіі* звязана з дзейнасцю А. Ельскага, які ставіў сваёй мэтай распаўсюджванне новых навуковых поглядаў і ідэй у грамадстве, робячы пераклады твораў польскага вучонага-філосафа, псіхолага і прыродазнаўца Ю. Ахаровіча, два з якіх выйшлі ў Мінску ў 1876 і 1877 гг. Адно выданне прысвячалася крымінальнай псіхалогіі. Была і аўтарская праца А. Ельскага "На сколько развитие чувства сострадания к животным обеспечивает нравственность человека" (1879). Па *логіцы* вядома толькі адно выданне – І. І. Цунзера "Первая мысль. Вып. 1: Сборник систематически расположенных первоначальных упражнений в изложении мыслей" (1909).

Такім чынам, пастунальнае развіццё і пашырэнне галінова-тэматычнага складу мінскага кнігавыдавецкага рэпертуару прасочваецца па яго колькасных і якасных паказчыках. У 1795–1864 гг. рэпертуар кніжнай прадукцыі, выдадзенай у горадзе, быў прадстаўлены па 15 асноўных галінова-тэматычных групах (геаграфія, сельская гаспадарка, медыцына, гісторыя, сацыяльна-эканамічная, права, адукацыя, бібліяграфія, мовазнаўства, літаратуразнаўства, мастацкая літаратура, мастацтва і мастацтвазнаўства, рэлігія, філасофія, псіхалогія) (гл. Дадат. 2, табл. 2.1); у 1865–1904 гг. – па 22 (новыя – агульнае прыродазнаўства, матэматыка, хімія, балотазнаўства, геалогія, тэхніка, палітыка, ваенная справа, бібліятэчная справа, а астатнія – тыя ж, што і на першым этапе, акрамя геаграфіі, філасофіі) (гл. Дадат. 2, табл. 2.2); на трэцім – па 23 (новая – батаніка) (гл. Дадат. 2, табл. 2.3).

На розных этапах мінскага кнігавыдання галінова-тэматычны склад яго рэпертуару меў свае колькасныя прыярытэты. Так, у 1795–1864 гг. – гэта выданні рэлігійнай тэматыкі, па мастацтве і мастацтвазнаўстве, мастацкай літаратуры

---

397 *Умецкая Я. С.* Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. С. 278.

398 *Бирало А. А.* Философские проблемы в науке эпохи Просвещения в Беларуси и Литве. С. 152.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і адукацыі. У 1865–1904 гг. – гэта ўжо, у першую чаргу, выданні сацыяльна-эканамічнай тэматыкі, потым – сельскагаспадарчай, рэлігійнай і гістарычнай. У 1905–1917 гг. – зноў выданні сацыяльна-эканамічнай, а таксама сельскагаспадарчай, рэлігійнай і медыцынскай тэматыкі. У агульным жа за ўвесь перыяд 1795–1917 гг. у рэпертуары кнігавыдавецкай прадукцыі Мінска вызначыліся наступныя колькасныя галінова-тэматычная прыярытэты: сацыяльна-эканамічныя выданні – 41 %, сельскагаспадарчыя – 11,9, рэлігійныя – 11,8, гістарычныя – 6,7 і медыцынскія – 5,7 %.

## Функцыянальнае прызначэнне выданняў

Мінскія выданні, як прадукт сацыяльнай дзейнасці грамадства, надзелены адпаведнымі функцыямі, якія адлюстроўваюць грамадскую ролю, сацыяльнае і мэтавае іх прызначэнне. Што тычыцца тэарэтычных пытанняў, то пра функцыі кнігі, выдання, дакумента назапашаны даволі значны матэрыял[399]. Праўда, тут перашкаджае адсутнасць адзінай распрацаванай мадэлі. Можна аспрэчваць існаванне тых ці іншых функцый, пацвярджаць іх ці адмаўляць, дадаваць ці выключаць. Аднак асноўным усё ж застаецца падыход да разгляду функцыянальнага прызначэння выданняў з пункту гледжання іх ролі і месца ў сістэме сацыяльнай камунікацыі[400]. Грунтуючыся на сучасных навуковых меркаваннях, мы павінны адзначыць, што мінскія выданні з’яўляюцца па сваёй сутнасці поліфункцыянальнымі аб’ектамі. Для іх характэрны шэраг узаемазвязаных сацыяльных функцый. Каб паказаць гэта, зробім аналіз складу мінскіх выданняў па мэтавым прызначэнні, прадстаўленых афіцыйнымі, навуковымі, навукова-папулярнымі, вытворча-практычнымі, вучэбнымі, масава-палітычнымі, даведкавымі, выданнямі для вольнага часу, літаратурна-мастацкімі і рэлігійнымі.

Самай колькаснай відавой групай у рэпертуары мінскай выдавецкай прадукцыі з’яўляюцца ***афіцыйныя выданні.*** Складаюць яны 60 % (1863 выд.) ад усёй выдадзенай у 1795–1917 гг. у горадзе кніжнай прадукцыі. У залежнасці ад мэтавага прызначэння і характару інфармацыі іх можна падзяліць на *распарадчыя* і *выканаўчыя* дакументы. На кожным з этапаў мінскага кнігавыдання яны мелі свой склад, былі падпарадкаваны дзейнасці тых ці іншых органаў дзяржаўнага і грамадскага кіравання.

Так, на першым этапе мінскага кнігавыдання (1795–1864) афіцыйныя выданні былі прадстаўлены наступным складам: *распарадчыя* дакументы – вытрым-

[399] *Барэнбаум И. Е.* К вопросу об универсальном понятии “книга” // Книга. Исследования и материалы. Сб. 34. С. 5–13; *Кушнаренко Н. Н.* Документоведение : учеб. 2-е изд., перераб. и доп. Киев : Знання, 2000. – 459 с.; *Столяров Ю. Н.* Соотношение книги с иными видами документа // Книга. Исследования и материалы. 1989. Сб. 58. С. 67–79; Типология изданий / НПО ВКП ; рук. авт. кол. Э. В. Гольцева. Москва : Кн. палата, 1990. 231 с.; *Швецова-Водка Г. Н.* Функции и свойства документа в системе социальных коммуникаций // Книга. Исследования и материалы. 1994. Сб. 69. С. 37–57; *Она же.* Функциональная сущность и свойства книги // Там же. 1995. Сб. 71. С. 69–96.

[400] *Швецова-Водка Г. Н.* Функции и свойства документа в системе социальных коммуникаций // Там же. 1994. Сб. 69. С. 37–57; *Соколов А. В.* Общая теория социальной коммуникации : учеб. пособие. Санкт-Петербург : Изд-во В. А. Михайлова, 2002. 461 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

кі з законаў (1 выд.), прадпісанні (2), распараджэнні (1), дэкрэты (2), інструкцыі (1), статуты (3 выд.); *выканаўчыя* дакументы – адозвы (3 выд.), спісы (4), матэрыялы (1), справаздачы (2), перапіска (1), прамовы (1 выд.). На гэтым этапе ўжо можна заўважыць некаторую перавагу выданняў выканаўчага характару. Актыўнае развіццё адміністрацыйна-кіраўнічага апарату, арганізацыя новых грамадскіх інстытутаў (аб`яднанняў) у Мінску сталі асноўнай прычынай значнага павелічэння выпуску адпаведных выданняў.

На другім этапе (1865–1904) у мінскім кнігавыданні ўдзельнічалі больш за 20 дзяржаўных і больш за 40 грамадскіх устаноў (на першым былі адпаведна дзве і адна). У групу, якую складаюць выданні *распарадчага* характару, увайшлі: законы і законапалажэнні (2 выд.), пастановы (5), палажэнні (9), цыркуляры (1), інструкцыі (10), правілы (21), ведамасці (4), праекты статутаў (5), статуты (77), настаўленні (2), планы (1), аб'явы і паведамленні (3 выд.); у групу выданняў *выканаўчага* характару: пратаколы (96 выд.), журналы (113), матэрыялы (14), каштарысы (20), справаздачы (342), даклады (8), статыстычныя звесткі (7), прашэнні (1), прамовы (3 выд.).

На трэцім этапе мінскага кнігавыдання (1905–1917) з павелічэннем колькасці грамадскіх (больш за 80) і дзяржаўных (да 25) устаноў працягваўся працэс пашырэння і папаўнення выдавецкай групы распарадчых дакументаў. Стабільнасцю характарызавалася група выканаўчых дакументаў: *распарадчыя* – законы і законапалажэнні (42 выд.), загады і распараджэнні (43), маніфест (1), пастановы (17), палажэнні (8), інструкцыі (27), правілы (17), ведамасці (14), праекты статутаў (5), статуты (169), планы (6), праграмы (3), рэзалюцыі (2), дамовы (1), запіскі (14), паведамленні (5); *выканаўчыя* – пратаколы (11), журналы (107), праекты каштарысаў (33), каштарысы (54), балансы каштарысаў (4), справаздачы (447), даклады (138), статыстычныя звесткі (12), пісьмы (2), прамовы (7 выд.).

Трэба адзначыць, што асноўнымі афіцыйнымі выданнямі, якія выдаваліся ў Мінску, сярод распарадчых дакументаў былі статуты, загады і законы, інструкцыі; сярод выканаўчых дакументаў – справаздачы, журналы, каштарысы і пратаколы.

Афіцыйныя выданні ў сваёй большасці былі прадстаўлены сацыяльна-эканамічнай (1232 выд., або 63 %), сельскагаспадарчай (264, або 13,5 %), медыцынскай (123, або 6,3 %), адукацыйна-педагагічнай (116, або 6 %), прававой (63 выд., або 3,2 %) тэматыкай.

Дамінуючай функцыяй, уласцівай афіцыйным выданням, з'яўлялася *ўпраўленчая функцыя*, аб яе актыўнай рэалізацыі сведчыць і большасць надрукаваных афіцыйных мінскіх выданняў. Між іншым, акрамя ўпраўленчай функцыі, мінскія афіцыйныя выданні, такія як выданні распарадчага характару (законы, загады, распараджэнні), валодалі *рэгулятыўнай функцыяй*. Значная колькасць справаздач аб дзейнасці тых ці іншых устаноў, грамадскіх аб'яднанняў і таварыстваў сведчыць аб іх *агульнакультурнай функцыі*. У складзе афіцыйных выданняў выканаўчага характару ёсць і статыстычныя матэрыялы, якія прадстаўляюць *статыстычную* і *інфармацыйную функцыі*.

***Рэлігійныя выданні*** (357 выд., або 11,5 %). Пытанне аб функцыянальным прызначэнні рэлігійных выданняў, іх пэўным функцыянальным складзе з'яўля-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ецца цалкам не асветленым і патрабуе дэталізацыі і глыбокага вывучэння ў перспектыве. Нашай задачай было даць агульнае ўяўленне аб рэлігійных выданнях у складзе кнігавыдавецкай прадукцыі. Па нашым меркаванні, рэлігійныя выданні валодаюць поліфункцыянальнасцю незалежна ад таго, які пункт гледжання будзе прыняты: культуралагічны ці тэалагічны. У тым выпадку, калі прымаецца культуралагічны падыход[401], мы можам лічыць дамінуючай функцыяй *агульнакультурную*. Так, некаторыя з рэлігійных выданняў могуць быць суаднесены з такім відам свецкіх выданняў, як навуковыя – гэта выданні па патрыстыцы («Немезий, епископ Эмесский, и его сочинение "О природе человека"», 1909), багаслоўі ("Ясное в науке и неясное в религии", 1905; "Ответы католикам по вопросам веры", 1909); а таксама вучэбныя выданні, якія адлюстроўваюць дадаткова і *пазнавальную* падфункцыю мінскіх рэлігійных выданняў. *Вучэбныя рэлігійныя кнігі*, што выйшлі ў Мінску, прадстаўлялі ў асноўным інтарэсы католікаў (на першым этапе кнігавыдання) і праваслаўных (на другім і трэцім). Як, напрыклад, "Nauka czytania piśma polskiego dla małych dziatek z różnem nabożeństwem i katechizmem katolickim" (1831; 1835), ці праваслаўныя выданні Ф. Міткевіча «Вопросы для повторения уроков по учебнику протоиерея А. Лаврова "Первоначальное учение о главных истинах христианской православной веры"» (1888), "Объяснение праздников и постов православной церкви для детей младшего школьного возраста" (1888, 1889, 1897, 1901), "История христианской православной церкви в общедоступных рассказах, составленная применительно к программам городских училищ и церковно-приходских школ" (1889, 1895, 1901).

Некаторыя рэлігійныя выданні па гісторыі царквы адпавядаюць такім свецкім выданням, як навукова-папулярныя і выданні для вольнага часу ("История христианской православной церкви в общедоступных рассказах священника Ф. Миткевича", 1888), жыццеапісанні беларускіх святых Еўфрасінні Полацкай, Соф'і Слуцкай, Гаўрыіла Слуцкага, асноўнай функцыяй якіх была *агульнакультурная*, а разам з тым – *асветная і выхаваўчая*. Аналагічнай функцыяй валодалі і выданні па гамілетыцы, і рэлігійныя мастацкія творы. Выданні статутаў і справаздач праваслаўных брацтваў сведчаць і аб прысутнасці *інфармацыйнай функцыі*. Такім выданням, як "Памятные книжки Минской епархии", а таксама апісанням цэркваў характэрна *статыстычная функцыя*. Некаторым выданням дакументальных матэрыялаў па гісторыі царквы ўласціва і *крыніцазнаўчая функцыя*.

Аднак пэўная частка рэлігійных выданняў – па біблейскай гісторыі, хрысталогіі, богаслужэбныя кнігі, па патрыстыцы, багаслоўі, царкоўных спевах, па кананічным праве і інш. – мелі і спецыфічныя функцыі. Як вылучае Т. А. Самайлюк, яны наступныя: *дагматычная*, *веравучыцельная*, *богаслужэбная*, *багаслоўская*, *пасрэдніцкая*, *свяшчэнна-эмацыянальная*, *малітоўная* і інш.

***Даведкавыя выданні*** (273 выд., або 8,8 %). Найбольш раннімі даведкавымі выданнямі ў Мінску былі *календары*. У 1795–1864 гг. выйшла 9 найменняў: на польскай і рускай мовах (3 выд.) і на іўрыце (6 выд.). Календары былі ўніверсальнымі выданнямі і прызначаліся шырокаму колу чытачоў. З сярэдзіны

[401] *Крукоўскі М. І.* Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. Мінск : Універсітэцкае, 2000. С. 125.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XIX ст. у Мінску пачалі выдавацца *памятныя кніжкі*, якія прысвячаліся Мінскай губерні. Яны замянілі ў некаторай ступені ранейшыя выданні календароў і сталі выконваць даволі шырокія ўніверсальныя функцыі. У 1864 г. выйшаў першы мінскі *даведнік*, падрыхтаваны Мінскім губернскім статыстычным камітэтам – "Карманная книжка Минской губернии на 1865 год", якая таксама мела ўніверсальны характар. Да групы даведкавых выданняў спецыяльнага прызначэння можна аднесці *каталогі* (2 выд.), першы з іх выйшаў у 1805 г. – гэта "Katalog xiąg znayduiących się w Mińsku w xięgarni Antoniego Muszyńskiego"; другі, "Роспись русских книг Минской губернской библиотеки для чтения (устроенной в 1845 г.)", – у 1849 г.

У 1865–1904 гг. адбыўся даволі рэзкі ўсплёск у друку даведкавай літаратуры ў Мінску. Іх колькасць павялічылася у сем разоў (гл. Дадат. 2, табл. 2.2), з'явіліся новыя віды дапаможнікаў. Праўда, на гэтым этапе ў Мінску як асобныя выданні амаль не выходзілі календары (выключэннем стаў "Календарь и справочный указатель правительственных учреждений, фабрик, заводов и проч. в гор. Минске и окрестностях…" на 1895 і на 1896 гг.), аднак іх адсутнасць даволі паспяхова замянялі *памятныя кніжкі*. У групу *статыстычных аглядаў* увайшлі "Обзоры Минской губернии" (з 1882 г. выйшла 32 выд.), статыстычна-эканамічныя нарысы (2) і іншыя выданні, якія змяшчалі статыстычныя звесткі і агляды (12). Статыстычным аглядам была характэрна не толькі функцыя ўніверсальных, але і спецыяльных выданняў (напрыклад, у галіне эканомікі). Пашырылі свае функцыі і *даведкавыя выданні*, сярод якіх вылучаюцца даведнікі ўніверсальнага характару: даведнікі Мінска (2 выд.), Мінскай губерні (1); а таксама спецыяльнага прызначэння: галіновага – даведнікі для паліцэйскіх (2 выд.), кішэнная кніжка па праве (1 выд.), даведнік для паступаючых (1); ведамаснага – даведнік устаноў Лібава-Роменскай чыгункі (1 выд.). Большую разнастайнасць набылі *каталогі*: акрамя каталогаў кніг бібліятэк (11 выд.) і кнігарняў (1 выд.) з'яўляюцца каталогі выстаў мастацкіх твораў (1), сельскагаспадарчыя каталогі (2 выд.). Як відаць, даведкава-інфармацыйныя выданні пашыраюцца ў розных галінах грамадскай дзейнасці. Новымі для даведкавых выданняў 1865–1904 гг. сталі *спісы* (10 выд.). Гэта былі спісы населеных месц (1 выд.), дваранскіх родаў (1), землеўласнікаў (3), служачых (3), дзяцей пад апекай (1 выд.). Яскрава прасочваецца іх сацыяльнае назначэнне.

На працягу 1905–1917 гг. колькасць даведкавых выданняў у Мінску папаўняецца новымі пазіцыямі. У 1907–1911, 1913, 1914 гг. узнаўляецца выданне асобных *календароў* (9 выд.). Да 1916 г. прадаўжаецца выданне *памятных кніжак* (12 выд.); *статыстычных аглядаў*: "Обзоры Минской губернии", "Базарные цены" (20 выд.), іншыя статыстычныя звесткі (5); *даведнікаў* (20 выд.), як, да прыкладу, "Спутник по городу", "Карманная книжка", "Весь Минск", якім былі ўласцівы функцыі ўніверсальных даведкавых выданняў.

У гэты перыяд працягвалі выдавацца і значна ўзраслі па колькасці і пашырыліся па тэматыцы даведкавыя выданні спецыяльнага прызначэння – *каталогі*: каталогі кніг і часопісаў бібіятэк (11 выд.), кнігарняў (11); каталогі выстаў мастацкіх твораў (5), сельскагаспадарчыя (3), тэхнічныя (1) і іншыя (1 выд.); *спісы* (16 выд.): населеных месцаў, землеўласнікаў, сяброў Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, служачых духоўных навучальных устаноў, абанентаў, упаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наважаных Мінскага таварыства ўзаемнага крэдыту і інш. З'явіліся выданні *паказальнікаў* спецыяльнага прызначэння (18 выд.): банкаўскія, урачэбныя і інш. Новай з'явай стаў выхад у Мінску такога віду даведкавых выданняў, як *слоўнікі* (3 выд.) – вучэбны і тэрміналагічныя.

Найбольш тыповай для даведкавых выданняў была гісторыка-краязнаўчая тэматыка (126 выд.). Больш сціпла прадстаўлены бібліятэчна-бібліяграфічная, сацыяльна-эканамічная, адукацыйна-педагагічная, палітычная, сельскагаспадарчая, тэхнічная, прававая, мастацтвазнаўчая, медыцынская, мовазнаўчая, гістарычная і прыродазнаўчая тэматыкі (гл. Дадат. 2, табл. 2.1–2.3). Даведкава-інфармацыйныя выданні, якія выйшлі ў Мінску ў 1795–1917 гг., маюць наступны склад: статыстычныя агляды (73 выд.), памятныя кніжкі (67), каталогі (49), даведнікі (29), спісы і аб'явы (29), календары (20), паказальнікі (18), слоўнікі (3 выд.), – па якіх можна скласці і пэўнае ўяўленне аб функцыях даведкавых выданняў. Дамінуючай, зразумела, з'яўлялася *інфармацыйная функцыя*. Аднак значнай частцы, напрыклад статыстычным аглядам, уласціва і *статыстычная функцыя*. А такім выданням, як памятныя кніжкі, – яшчэ і *крыніцазнаўчая*, і *агульнакультурная функцыі*. Слоўнікам – *пазнавальная*.

***Літаратурна-мастацкія выданні*** (122 выд., або 3,9 %) разгледжаны намі больш падрабязна адносна іх зместу ў раздзеле "Галінова-тэматычны склад выданняў", дзе мы паказалі творы мастацкай літаратуры ў адпаведнасці з іх жанравымі прыкметамі, што і з'яўляецца іх асноўнай тэматычнай своеасаблівасцю і акрэслівае іх *агульнакультурную* функцыю як літаратурна-мастацкіх выданняў. Аднак спецыфіка твораў мастацкай літаратуры заключаецца яшчэ і ў тым, што яны адначасова з'яўляюцца як крыніцай задавальнення эстэтычных патрэб, так і "матэрыялам для гістарычных, лінгвістычных і іншых навуковых даследаванняў"[402]. Розныя выданні аднаго і таго ж твора могуць мець рознае функцыянальнае прызначэнне, розны чытацкі адрас.

Функцыянальны склад мінскіх літаратурна-мастацкіх выданняў 1795–1917 гг. можа быць прадстаўлены наступным чынам: навукова-масавыя і масавыя выданні. У першай групе мы яшчэ вылучаем выданні, якія змяшчаюць творы мастацкай літаратуры для далейшага навуковага вывучэння (мемуарная літаратура) і выданні ў дапамогу навучанню.

*Навукова-масавыя выданні.* Літаратурна-мастацкія выданні, якія належалі да групы выданняў мемуарнай літаратуры, з'явіліся ў канцы 1860-х гг.: "От г. Пинска до г. Новогрудка" Кукліна (С. Ф. Куклінскага) (1869) – гэта былі мясцовыя падарожныя нарысы. У 1894 г. у перакладзе на рускую мову выйшлі мемуары Ф. Эрбе "Французы и русские в Крыму. Письма франц. офицера к своей семье во время восточной войны 1853–1855 гг." На пачатку XX ст. з'явіліся мемуары-эсэ на польскай мове В. Макоўскага – "Godzina pogardy: (wrazenia)" ("Час пагарды") (1906), "Wrażenia i studia" ("Уражанні і даследаванні") (1913).

Адным з першых выданняў у дапамогу навучанню стала выданне зборніка прозы і паэзіі Ф. Чапяліньскага "Wypisy z pisarzów polskich" ("Выпісы з польскіх пісьменнікаў") у трох частках (1860–1861). У 1886 г. выдадзены "Сборник стихотворений для низших классов гимназий" М. П. Каралёва. У 1909–1910 гг. –

---

402 Типология изданий / В. С. Агриколянский [и др.] ; рук. авт. кол. Э. В. Гольцева. С. 93.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скандоўнікі да "Энеиды" Вяргілія і да одаў Гарацыя (чатыры выданні), крыху пазней – чытанкі для дзяцей на рускай мове М. С. Гаўлоўскага (1911), на іўрыце М. Бенсмана (1913), на польскай Л. Жыцкай (1916), Я. Варанецкай (1916). У 1917 г. з'явілася і беларускамоўная "Дзіцячая чытанка".

Асноўную частку літаратурна-мастацкіх выданняў Мінска 1795–1917 гг. складалі *масавыя выданні*, сярод якіх вылучаюцца літаратурна-мастацкія выданні 1795–1864 гг. – гэта творы В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Плуга, У. Сыракомлі, А. Міцкевіча, якія змяшчалі невялікія прадмовы да чытачоў пра назначэнне і задачы пэўных твораў мастацкай літаратуры.

Такім чынам, *агульнакультурная функцыя*, з'яўляючыся дамінуючай для літаратурна-мастацкіх выданняў, дазваляе выдзеліць *крыніцазнаўчую функцыю*. Літаратурна-мастацкім выданням у значнай ступені характэрна і *геданічная* падфункцыя (як трактуе яе Г. М. Швяцова-Водка[403]), якая спрыяла вольнаму адпачынку, забавам, рацыянальнаму выкарыстанню вольнага часу. Для некаторых выданняў гэтай групы характэрна і *выхаваўчая* падфункцыя.

***Вучэбныя выданні*** (116 выд., або 3,7 %). Хаця мінская вучэбная кніга і мела пэўныя гістарычныя традыцыі яшчэ з XVIII ст. (у 1799 г. была надрукавана адна з ранніх мінскіх вучэбных кніг – "Łatwy sposób nauczenia się czytać po rossyisku y po polsku" ("Лёгкі спосаб навучыцца чытаць па-расійску і па-польску"), аднак сфарміравалася яна менавіта ў XIX ст., і першыя яе крокі былі звязаны з дзейнасцю Мінскай гімназіі і яе выкладчыкаў. Адны з першых вучэбных выданняў мы аднеслі да *вучэбна-метадычных матэрыялаў для гімназій* (13 выд.) – гэта вучэбныя праграмы, напрыклад "Treść nauk, dawanych w Gymnazyum Mińskiem … na popis publiczny uczniów tegoz Gymnazyum" ("Змест навук … у Мінскай гімназіі для публічнай праверкі ведаў навучэнцаў гімназіі", 1810, 1818–1823); матэрыялы па падрыхтоўцы да экзаменаў –"Wykład materyi podanych na popis publiczny uczniów Mińskiego Gubernskiego gimnazyum w dniach ostatnich czerwca 1818 roku" ("Пералік прадметаў, packadзеных для публічнага іспыту вучняў Мінскай гімназіі", 1818). Названыя выданні склалі палову вучэбных выданняў 1795–1864 гг. Другая палова – гэта падручнікі і дапаможнікі (13 выд.). *Падручнікі* 1795–1864 гг., выдадзеныя ў Мінску, былі прысвечаны, у асноўным, пачатковаму навучанню (9 выд.): "Abecadło w rycinkach dla dzieci" ("Азбука ў малюнках для дзяцей") (1852, 1854, 1856, 1858). Для гімназій прызначаўся падручнік Ф. Чапяліньскага "Praktyczno-teoretyuczna Gramatyka języka polskiego" ("Практычна-тэарэтычная граматыка польскай мовы") (1859). *Дапаможнікі* –два выданні па каліграфіі: "Wzory kaligraficzne" ("Узоры каліграфічныя") (1848, 1860). Пра вучэбныя рэлігійныя выданні гл. таксама вышэй.

У 60-я гг XIX ст. для пачатковых навучальных устаноў Беларусі была характэрна разнастайнасць вучэбных праграм і дапаможнікаў. Настаўнікі самі складалі і падавалі ў дырэкцыі народных вучылішчаў праграмы і спісы неабходных для навучання кніг. Толькі ў 1871 г., а пасля ў 1881 г., былі створаны праграмы для пачатковых народных вучылішчаў, у 1871 г. зацверджаны статут гімназій, у 1872 г. – праграма. Згодна з адзначанымі праграмамі асаблівая ўвага ў навучанні надавалася вывучэнню Закона Божага, спевам малітваў, умацаван-

[403] *Швецова-Водка Г. Н.* Функции и свойства документа в системе социальных коммуникаций. С. 45.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ню праваслаўнага маральна-рэлігійнага выхавання. Для пачатковых царкоўна-прыходскіх школ, якія атрымалі развіццё ў гэты час, меў права выдаваць падручнікі і вучэбныя дапаможнікі толькі вучылішчны савет Сінода.

Названыя праграмы ўнеслі пэўныя змены і ў вучэбнае кнігавыданне ў Мінску ў 1865–1904 гг. Так, з 1877 г. тут актыўна пачынаюць выдавацца *падручнікі*, у першую чаргу па рэлігіі. Акрамя таго, выходзяць падручнікі для гімназій па мовазнаўстве (3 выд.) – падручнікі па граматыцы; арыфметыцы (1), геаметрыі (1 выд.). Педагогамі Беларусі ў другой палове XIX ст. узнімалася пытанне аб паляпшэнні выкладання матэматыкі. Да распрацоўкі яе методык далучыліся і настаўнікі з Міншчыны А. К. Жбікоўскі, С. А. Кацэнеленбоген, М. А. дэ Жорж, С. А. Казлоўскі, М. К. Лаўроў. Так, у класічных гімназіях адным з асноўных прадметаў лічылася матэматыка. У 1880-я гг. у Мінску выдаецца “Учебник геометрии” (1883), складзены гомельскім выкладчыкам А. Ляўшыным, і “Элементарный курс арифметики” Э. Жэлена ў перакладзе з французскай мовы выкладчыка Мінскай гімназіі М. А. дэ Жоржа (1889). Як зазначыў перакладчык у прадмове да чацвёртага выдання, гэта быў падручнік, які карыстаўся ў Францыі папулярнасцю і быў прызнаны лепшым выданнем дапаможніка па арыфметыцы[404]. У 1892 г. выйшлі два падручнікі для вучылішчаў па гісторыі П. Аляксандрава і У. Ярмаловіча, а таксама падручнік для пачатковага навучання.

Сярод мінскіх *дапаможнікаў* 1865–1904 гг. выдзяляюцца дапаможнікі для гімназій – хрэстаматыя па мастацкай літаратуры, кіраўніцтвы па мовазнаўстве С. К. Ліхтэрмана і В. Бекю, дапаможнікі па матэматыцы (2 выд.), арыфметыцы (3), алгебры (1 выд.); дапаможнікі для студэнтаў – па праве (3 выд.). *Вучэбна-метадычныя выданні* прадстаўлены праграмамі для гімназій (2 выд.), планамі і праграмамі для вучылішчаў (1), праграмамі спецкурсаў па сельскай гаспадарцы (2 выд.).

З 1905 г. па 1917 г. асноўнымі вучэбнымі кнігамі, якія выдаваліся ў Мінску, былі *падручнікі* для гімназій па матэматыцы М. К. Лаўрова, Б. П. Чыханава, М. Б. Пятрова; для гарадскіх вучылішчаў па рэлігійным навучанні Ф. І. Міткевіча, У. Кузюрубы; для сярэдніх навучальных устаноў (4 выд.), для пачатковага навучання (3 выд.) – серыя падручнікаў І. Цунзера па граматыцы і славеснасці “гарадской школы” для пачынаючых навучанне, якія падзяляліся на падручнікі па навучанні роднай мове і па правапісе; для спецыяльнага навучання (3 выд.) – падручнікі па прафесійнай (спецыяльнай) адукацыі (па ваеннай медыцыне, курсы лекцый паліцэйскіхураднікаў), якія сталі новай з`явай для Мінска і для яго вучэбнай кнігі на пачатку XX ст.

Папоўнілі цыкл вучэбных выданняў мінскія *дапаможнікі*: для пачатковага навучання (2 выд.) І. Фёдарава, М. Бенсмана; для гімназій (20 выд.) І. Эльперына, І. Семяновіча, С. Самуйлава. Асноўную іх частку склалі дапаможнікі па матэматыцы (11 выд.). Для гарадскіх вучылішчаў былі прызначаны дапаможнікі (3 выд.) па геаграфіі і міжнародным праве. Дапаможнікі для спецыяльнага навучання прысвячаліся ваеннай справе (9 выд.), ваенна-пажарнай падрыхтоўцы (1), самавучэнню манцёраў-слесараў (2 выд.). Былі дапаможнікі і для вышэйшай школы (3 выд.).

---

404 *Желен Е.* Элементарный курс арифметики. Минск : Типолит. Б. И. Соломонова, 1889. С. IV.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбна-метадычныя выданні* – правілы і праграмы для вучылішчаў (1 выд.) – “Правила и программы музыкального училища свободного художника Н. Рубинштейна” (1907), праграмы для настаўнікаў (1 выд.) – “Wskazówki dla nauczycielek ludowych i program Szkołek początkowych” (1917).

Вучэбныя кнігі, выдадзеныя ў Мінску, у асноўным былі па матэматыцы і мовазнаўстве (славеснасці, граматыцы і замежных мовах). Дамінуючай функцыяй выступала *пазнавальная*. Прызначэннем мінскіх вучэбных выданняў было забеспячэнне агульнага і прафесійнага (спецыяльнага) працэсу навучання. Гэтаму служылі падручнікі, дапаможнікі, метадычныя матэрыялы. Акрамя таго, нельга не адзначыць, што вучэбным выданням характэрна і *агульнакультурная (выхаваўчая і асветная) функцыя*.

***Навуковыя выданні*** (108 выд., або 3,5 %). Толькі на другім і трэцім этапах навуковыя выданні ў Мінску сталі ўяўляць сабой больш поўны і разнастайны рэпертуар, які пачаў складвацца ў 1865–1904 гг. і быў прадстаўлены наступнымі выданнямі: *крыніцазнаўчымі* – дакументы (2 выд.); *навукова-даследчымі* – працы (14), манаграфіі (6 выд.). У 1905–1917 гг. – гэта зноў група *крыніцазнаўчых* – дакументы (3 выд.); *навукова-даследчыя выданні* – працы (13 выд.), дысертацыі (1), планы (1), матэрыялы даследаванняў (13), асобныя даследаванні (21), нарысы (2), агляды (2), даклады (19 выд.).

Усе названыя навуковыя выданні па характары інфармацыі адносяцца да навукова-даследчых прац, асноўнай функцыяй якіх было асвятленне вынікаў даследаванняў у пэўнай галіне навукі і распаўсюджванне адпаведных навуковых ведаў у грамадстве. Нязначнае месца займала выданне навукова падрыхтаваных дакументаў.

Асноўная частка мінскіх навуковых выданняў была разлічана на спецыялістаў у галіне медыцыны (42 выд., або 36,2 %), сельскай гаспадаркі (26 выд., або 22,4 %), прыродазнаўства (18 выд., або 15,5 %), гісторыі (13 выд., або 11,2 %), адукацыі (5 выд., або 4,3 %). У якасці дамінуючай мінскім навуковым выданням уласціва *пазнавальная функцыя*. Навуковыя патрэбы забяспечваліся выданнем прац, манаграфій, дакладаў, дысертацый, дакументаў, некаторыя з якіх выконвалі таксама і *крыніцазнаўчую функцыю*. Акрамя таго, нельга не адзначыць, што навуковым выданням, якія выступалі як сродкі замацавання і перадачы культурнай традыцыі, засваення сістэмы каштоўнасцей, эстэтычных нормаў, характэрна і *агульнакультурная функцыя*.

***Выданні для вольнага часу*** (86 выд., або 2,8 %). Менавіта 1860-я гг. сталі самымі плённымі ў друку ў Мінску музычных твораў, якія і склалі асноўную групу азначаных выданняў (50 выд.). Гэта былі танцавальна-песенныя музычныя творы свецкага характару. Мы можам прывесці таксама два выданні ў галіне жывапісу – гэта літаграфічныя працы “М. А. Гинцбург: Портрет” і “Мирзах, т. е. Восход” Ф. Фалька (1851); і тэатра – “Teatr Miński” (1844).

1865–1904 гг. былі для дадзенага віду выданняў не самымі спрыяльнымі. Аднак у 1879 г. выпускаецца не менш як сем нотадрукаў, што адлюстроўвалі патрэбы ў танцавальных музычных творах для выканання ў шляхецкіх сем’ях – гэта паланэзы, мазуркі, полькі, вальсы, напісаныя М. Грушвіцкім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку XX ст. друкаваліся такія забаўляльныя выданні, як “Шарады для взрослых в стихах”, “Записки туриста”, “Виды города Минска” (1904). (гл. Дадат. 2, табл. 2.2).

У 1905–1917 гг. друк у Мінску выданняў для вольнага часу зноў павялічваецца. Вылучаюцца ўспаміны і жыццеапісанні (2 выд.); нарысы (2); чытанні (8); прамовы (1); парады (5); тлумачэнні (4); памяткі (1); асобныя працы (5) і зборнікі (1). Дамінуе палітычная (11 выд.) і гістарычная (8 выд.) тэматыка. Ёсць таксама выданні сацыяльна-эканамічнай, медыцынскай, сельскагаспадарчай тэматыкі. Асноўным функцыянальным прызначэннем папулярных выданняў з’яўляецца садзейнічанне займальнаму адпачынку, аматарскай творчай дзейнасці. Разам з *геданічнай функцыяй* важнай застаецца і *выхаваўчая*.

***Навукова-папулярныя выданні*** (80 выд., або 2,6 %). У 1795–1864 гг. іх колькасць і разнастайнасць у мінскім кнігавыданні былі даволі абмежаваныя. З васьмі навукова-папулярных выданняў пяць – гэта парады і настаўленні. Большасць з іх складалі перакладныя творы па сельскай гаспадарцы: два з нямецкай мовы – “Краткое наставление о скотских падежах” І. Элізена (1798), “Ziemianin, albo Gospodarz Inflandski” (“Землеўладальнік, або Інфлянцкі гаспадар”) Я. Германа (1823) і адно з французскай – “Uprawa, zbiór i zachowanie buraków” (“Вырошчванне, уборка і захоўванне [цукровых] буракоў”) М. Дамбаля (1852); а таксама два выданні парадаў па медыцыне. Адну геаграфічную мапу мы таксама аднеслі да навукова-папулярных выданняў.

Навукова-папулярныя выданні 1865–1904 гг. маюць наступны склад: матэрыялы па гісторыі, асобныя працы, лекцыі, нарысы, апісанні, даклады, гутаркі, парады і павучанні, прамовы. Асноўнай тэматыкай навукова-папулярных выданняў была гісторыка-краязнаўчая – гэта нарысы, апісанні. Можна таксама вылучыць навукова-папулярныя выданні медыцынскай тэматыкі – гэта “Гигиенические беседы”, парады “Что нужно знать”, “Подарок ближнему”, “Несколько слов”, а таксама сельскагаспадарчай тэматыкі – “Беседы о лесе”, даклады і асобныя працы.

Былі выдадзены па адной аўтарскай навукова-папулярнай працы па псіхалогіі, мастацтвазнаўстве і мовазнаўстве.

У складзе навукова-папулярных выданняў 1905–1917 гг. дамінуе гістарычная тэматыка (9 выд.) – хронікі, нарысы, замалёўкі, эцюды, успаміны; а таксама сельскагаспадарчая (9 выд.) – парады, даклады, асобныя працы; медыцынская (7 выд.) – даклады, асобныя працы. Па функцыянальным прызначэнні навукова-папулярныя выданні былі закліканы распаўсюджваць і прапагандаваць навуковыя, спецыяльныя веды сярод шырокага кола грамадскасці. Для іх характэрна ўніверсальнасць тэматыкі. У залежнасці ад чытацкага прызначэння вылучаюцца навукова-папулярныя асветныя выданні для масавага чытача і навукова-папулярныя выданні для спецыялістаў.

Дамінуючай выступае *пазнавальная функцыя*. Для шэрагу навукова-папулярных выданняў характэрна і *геданічная* падфункцыя, якая спрыяла вольнаму адпачынку, забавам, рацыянальнаму выкарыстанню вольнага часу. Некаторым з выданняў гэтай групы ўласціва *асветная* і *выхаваўчая* падфункцыі.

***Масава-палітычныя выданні*** (68 выд., або 2,2 %). Выпуск масава-палітычных выданняў у Мінску адзначаецца ў 1865–1904 гг. (6 выд.) – гэта *памяткі* і *агі-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*тацыйныя імперска-прапагандысцкія матэрыялы.* У 1905–1917 гг. масава-палітычныя выданні склалі 62 найменні: *агітацыйны матэрыял*, *хронікі падзей*, *дэкларацыі*, *праграмы*, *клятва*, *прывітанні*. Масава-палітычныя выданні прадстаўляюць палітычную і гістарычную тэматыку. Іх функцыянальным прызначэннем была прапаганда і асвятленне палітычных і ваенных падзей. Па характары інфармацыі вылучаюцца дакументальныя, тэарэтыка-прапагандысцкія і публіцыстычныя выданні. Дамінуючыя функцыі ў масава-палітычных выданнях *упраўленчая*, а таксама *інфармацыйная*.

***Вытворча-практычныя выданні*** (59 выд., або 1,8 %). Вытворча-практычныя выданні, якія з'явіліся ў Мінску ў другой палове XIX ст., падзяляюцца на тэхнічныя характарыстыкі, тлумачэнні да карыстання, практычныя кіраўніцтвы. У асноўным дадзеныя друкаваныя матэрыялы прызначаліся спецыялістам па тэхніцы (18 выд.), праве (11), сельскай гаспадарцы (9), эканоміцы (7), матэматыцы (2 выд.).

Мінскія вытворча-практычныя выданні служылі практычнымі кіраўніцтвамі ў прафесійнай дзейнасці, выконвалі функцыю садзейнічання павышэнню прафесійнай кваліфікацыі. Прыкладным выданням у якасці дамінуючай уласціва *пазнавальная функцыя*. Акрамя таго, адзначым, што для прыкладных выданняў характэрна і *агульнакультурная функцыя*.

Такім чынам, па функцыянальным прызначэнні пэўнага віду выданняў можна прасачыць сувязь і функцыянальную залежнасць дадзенай групы выданняў ад патрэб адпаведнай сферы грамадскага жыцця і практыкі. Прытым назіраецца двухбаковая залежнасць: з аднаго боку, практыцы патрэбны адпаведныя выданні, з другога – у асобных галінах жыццядзейнасці ствараюцца творы, якія выдаюцца ў выглядзе навуковых, навукова-папулярных, вучэбных, літаратурна-мастацкіх і інш.

Кніжная прадукцыя Мінска 1795–1917 гг., як паказвае аналіз яе складу па мэтавым прызначэнні, была разлічана галоўным чынам на задавальненне патрэб менавіта спецыялістаў розных галін дзейнасці: сацыяльна-эканамічнай, сельскагаспадарчай, адукацыйна-педагагічнай, медыцынскай, прававой, па ваеннай справе, гісторыі, прыродазнаўстве, тэхніцы.

У 1795–1864 гг. пачынаюць выдавацца першыя навуковыя, вучэбныя і даведкава-інфармацыйныя выданні. Атрымліваюць далейшае развіццё рэлігійныя выданні (78 выд., або 33,5 %), для вольнага часу (43 выд., або 18,5 %), літаратурна-мастацкія (33 выд., або 14,2 %), вучэбныя (29 выд., або 12,4 %) і афіцыйныя выданні (22 выд., або (9,4 %), якія адпаведна займаюць вядучыя пазіцыі (гл. Дадат. 2, табл. 2.1). Афіцыйныя выданні прадстаўлены ў асноўным сацыяльна-эканамічнай, прававой і гістарычнай тэматыкамі, навуковыя выданні – філасофскай, навукова-папулярныя – сельскагаспадарчай і медыцынскай, вучэбныя – мовазнаўчай, даведкавыя – гістарычна-краязнаўчай, выданні для вольнага часу – музычнай тэматыкай. Дамінуючымі функцыямі былі *агульнакультурная*, *геданічная*, *пазнавальная*, *упраўленчая*.

Рэпертуар мінскіх выданняў у 1865–1904 гг. дапаўняецца новымі відамі – гэта вытворча-практычныя і масава-палітычныя выданні (гл. Дадат. 2, табл. 2.2). Змяняюцца акцэнты ў кнігавыданні: павялічваюцца колькасна афіцыйныя выданні, якія выходзяць на першае месца – 738 выд. (61,3 %); на другое месца пера-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мяшчаюцца рэлігійныя – 158 выд. (13,1 %); на трэцяе – даведкавыя (133 выд., або 11,1 %); на чацвёртае – навуковыя (39 выд., або 3,2 %); на пятае – навукова-папулярныя і вучэбныя (па 32 выд., або па 2,7 %). Афіцыйныя выданні прадстаўлены ў асноўным сацыяльна-эканамічнай, сельскагаспадарчай і медыцынскай тэматыкай. Навукова-папулярныя выданні – гэта выданні па медыцыне, сельскай гаспадарцы і гісторыі. Навуковыя выданні – гэта ў асноўным выданні па медыцыне, гісторыі і сельскай гаспадарцы. Вытворча-практычныя – па праве, тэхніцы, сельскай гаспадарцы, матэматыцы. Вучэбныя – па рэлігіі, мовазнаўстве, матэматыцы. Масава-палітычныя – па грамадска-палітычнай тэматыцы. Даведкавыя – па гістарычным краязнаўстве, бібліяграфіі, адукацыі. Найболей праяўляюцца *ўпраўленчая*, *агульнакультурная*, *пазнавальная*, *інфармацыйная* функцыі.

Відавы склад мінскіх выданняў у 1905–1917 гг. выглядае даволі стабільна (гл. Дадат. 2, табл. 2.3). Вядучыя пазіцыі застаюцца за афіцыйнымі (1103 выд., або 66,2 %), рэлігійнымі (121 выд., або 7,3 %) і даведкавымі выданнямі (120 выд., або 7,2 %). Актыўна на гэтым этапе развіваюцца навуковыя выданні. Павялічваецца іх колькасць, і яны выходзяць ужо на чацвёртае месца (68 выд., або 4,1 %). На пятым – літаратурна-мастацкія (65 выд., або 4 %). На шостым – вучэбныя (55 выд., або 3,3 %). Што датычыцца тэматыкі выданняў, якую яны прадстаўляюць, то для афіцыйных выданняў яна ў асноўным сацыяльна-эканамічная, сельскагаспадарчая і медыцынская. Сярод навуковых дамінуюць выданні па медыцыне, сельскай гаспадарцы, прыродазнаўстве і гісторыі; сярод навукова-папулярных – па гісторыі, медыцыне і сельскай гаспадарцы. Вытворча-практычныя выданні ў асноўным прысвечаны тэхніцы і сельскай гаспадарцы. Вучэбныя – матэматыцы, мовазнаўству і мастацкай літаратуры. Даведкавыя выданні прадстаўляюць сацыяльна-эканамічную, гісторыка-краязнаўчую і бібліяграфічную тэматыкі. Выданні для вольнага часу – сацыяльна-эканамічную тэматыку. Першынство застаецца за ўпраўленчай, інфармацыйнай, пазнавальнай, агульнакультурнай функцыямі. На фарміраванне відавога складу мінскіх выданняў па функцыянальным прызначэнні мела значны ўплыў дзяржаўная палітыка Расійскай імперыі, пераважаючая ў грамадстве рэлігійная свядомасць, якія праявіліся ў дамінуючым становішчы афіцыйных і рэлігійных выданняў. Адлюстраваннем сацыяльных патрэб мінскага грамадства былі ў асноўным даведкавыя, навуковыя, вучэбныя і літаратурна-мастацкія выданні, для якіх характэрнымі функцыямі з'яўляліся *пазнавальная*, *агульнакультурная*, *асветная*, *выхаваўчая* і *геданічная*.

Такім чынам, адпаведна высновам Г. М. Шляцовай-Водкі[405] і Н. М. Кушнарэнкі[406] аб разнастайнасці функцый дакумента можна меркаваць, што яна была ўласціва і мінскім выданням, якія, у сваю чаргу, з'яўляліся поліфункцыянальнымі. Прадстаўляючы і разглядаючы кожны з відаў мінскіх выданняў, мы паспрабавалі паказаць вядучыя, дамінуючыя функцыі кожнага. Усе названыя функцыі з'яўляюцца спецыяльнымі, як іх прадстаўляе Н. М. Кушнарэнка, характэрнымі толькі для пэўных відаў выданняў, у якіх яны праяўляюцца як дамінуючыя ў адпаведнасці з сацыяльнымі запатрабаваннямі грамадства. Праўда, аўтар не ды-

---

405 *Швецова-Водка Г. Н.* Функции и свойства документа в системе социальных коммуникаций. С. 37–57.

406 *Кушнаренко Н. Н.* Документоведение : учеб. С. 39–41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ферэнцыруе вылучаныя функцыі на падфункцыі, як гэта прапануе Г. М. Швяцова-Водка. На наш погляд, такая дыферэнцыяцыя неабходна ў сувязі з тым, што яна дазволіць паказаць усё мноства і разнастайнасць структуры пэўнага віду выданняў, у якой дадзеная функцыя дамінуе, пацвердзіўшы тым самым яе як шматфункцыянальную сістэму, што пастаянна знаходзіцца ў развіцці. Гэта тычыцца як асобнага віду выданняў, так і кожнага выдання гэтага віду. Дакумент, а ў нашым выпадку кніжнае выданне, – субстанцыйны (часовы) камунікат. З цягам часу могуць мяняцца і яго функцыі. Так, што тычыцца мінскіх выданняў 1795–1917 гг., то з пункту гледжання сённяшняга часу іх функцыянальнае прызначэнне не стасуецца з ўпраўленчай ці прававой функцыямі, а, хутчэй, абмяжоўваецца інфармацыйнай, агульнакультурнай, у некаторай ступені пазнавальнай і найбольш мемарыяльнай (помнікавай) функцыямі. Мемарыяльная функцыя, як адзначае Н. М. Кушнарэнка, уласціва дакументам-помнікам, якія валодаюць асаблівай сацыяльна-культурнай і гістарычнай каштоўнасцю[407]. А мінскія выданні якраз такімі і з’яўляюцца не толькі па сваёй бібліяграфічнай рэдкасці, але і па ўнікальнасці зместу, які адлюстроўвае гісторыю і жыццядзейнасць тагачаснага мінскага грамадства.

## Мова і аўтарства выданняў

Моўная і аўтарская характарыстыкі мінскіх выданняў да гэтага часу таксама не з’яўляліся прадметам асобных даследаванняў. У агульным моўная сітуацыя разглядалася ў працах Я. С. Умецкай па гісторыі кнігавыдання ў Беларусі[408]. Большасць жа прац беларускіх навукоўцаў па праблемах развіцця беларускай мовы і літаратуры закраналі толькі пытанні беларускамоўных выданняў (С. Х. Александровіч[409], Г. В. Кісялёў[410], А. І. Мальдзіс[411] і інш.). Ёсць некалькі прац і польскіх даследчыкаў, у іх браліся пад увагу польскамоўныя выданні Беларусі адпаведнага перыяду, – Т. Зянкевіча[412], Я. Кушлейкі[413], Я. Кастэцкага[414]. Невядомы

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

[407] *Тамсама.* С. 40.

[408] *Умецкая Е. С.*: 1) История книгопечатания в Белоруссии в первой четверти XIX века (1801–1832). 27 с.; 2) Казенное книгопечатание в Белоруссии (1797–1832). С. 63; 3) Книгоиздание в Белоруссии в первом тридцатилетии XIX века (1801–1832). С. 76–91; 4) Книгопечатание в Гродно в конце XIX в. (1861–1900). С. 93–98; 5) Цензурно-правовое положение книги в Белоруссии (1801–1832 гг.). С. 45–59; 6) Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. С. 273–290; 7) Кнігавыдавецкая справа ў пачатку XIX ст. С. 37–38; 8) Прыватнае кнігадрукаванне ў Беларусі. С. 22–24.

[409] *Александровіч С.* Гісторыя і сучаснасць: літаратурна-крытычныя артыкулы. 256 с.; *Яго ж.* Пуцявіны роднага слова. Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. 248 с.

[410] *Кісялёў Г.* Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі. 303 с. : іл.; Пачынальнікі: з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў. 543 с. : іл.

[411] *Мальдис А. И.:* 1) Из истории издательской деятельности Э. Ожешко. С. 249–251; 2) Кнігадрукаванне Беларусі ў XVIII стагоддзі. С. 130–151; 3) На скрыжаваннях славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII – XVIII ст.). 352 с.

[412] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku … 235 s.

[413] *Kuszlejko J.* Książka polska w Rosji na przełomie XIX i XX wieku. 258 s.; *Idem.* Polska książka historyczna w Rosji w latach 1914–1918. Cz. I. T. 2. S. 172–194; Cz. II. T. 4. S. 225–242.

[414] *Kostecki J.* Ruch wydawniczy na ziemiach polskich (1877–1886). S. 153–224.

працы па яўрэйскамоўных выданнях. Зразумела, што агульнай карціны моўнай сітуацыі менавіта ў мінскім кнігавыданні гэтыя даследаванні не стваралі. Вынікі ж нашых навукова-бібліяграфічных пошукаў – як спроба першага падобнага кроку – даюць магчымасць вылучыць сем асноўных моўных груп, якія прадстаўляе кніжная прадукцыя, выдадзеная ў Мінску: беларуская, лацінская, нямецкая, польская, руская, французская, яўрэйская (іўрыт, ідыш) (гл. Дадат. 3).

У 1795–1864 гг. у мінскім кнігавыданні асноўнае месца займалі *польскамоўныя* выданні (146 выд.). Адначасова шэраг кніг, якія выдаваліся ў Мінску, разам з польскай мовай уключалі тэксты і на іншых мовах. Напрыклад, каталіцкія касцёльныя календары, “Directoriumy”, змяшчалі лацінскія і польскія тэксты (36 выд.). Вучэбныя кнігі выпускаліся з тэкстамі на рускай і польскай мовах, як “Łatwy sposób nauczenia się czytać po rossyisku y po polsku” (1799), на нямецкай, рускай і польскай, як “Abecadło” (1852, 1857, 1858). Былі і малітоўнікі з тэкстамі на польскай і на царкоўнаславянскай мовах – “Ojcze nasz” (1854). Урэшце, мастацкія творы В. Дуніна-Марцінкевіча на беларускай (лацінкай) і польскай мовах (3 выд.). Асноўныя пераклады рабіліся на польскую мову: з французскай – мастацкіх твораў (у 1797 г., 1855 г.), сельскагаспадарчых прац (у 1852 г.); з рускай – мастацкіх твораў (у 1808 г., 1843 г.); з нямецкай – сельскагаспадарчых прац (у 1798 г., 1823 г.).

Другое месца займалі выданні на рускай мове (21 выд.). У дадзенай групе таксама былі выданні з тэкстамі на некалькіх мовах: рускай і польскай – 1799, 1848, 1854 гг.; рускай, польскай, французскай і нямецкай – 1848 г. Па-руску і па-польску быў аформлены тытул такой гісторыка-дакументальнай крыніцы, як “Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии” (1848), дзе змяшчаліся тэксты на рускай, польскай, старабеларускай і латыні. Быў выдадзены адзін пераклад на рускую і польскую мовы з нямецкай – 1798 г. Найбольш раннія асобныя рускамоўныя мінскія выданні з’явіліся ў 1828, 1831, 1833 гг. – гэта былі арыгінальныя мастацкія творы А. Паўлава.

Трэцяе месца па колькасці належала мінскім выданням на іўрыце (17 выд.). З 1808 г. па 1832 г. мінскія выданні на іўрыце (па нашых бібліяграфічных звестках) былі толькі рэлігійнай тэматыкі. У 1832 – 1836 гг. рэпертуар мінскіх друкаў на іўрыце папоўніўся календарамі, а таксама медыцынскімі выданнямі.

На чацвёртым месцы былі першыя мінскія выданні з тэкстамі на беларускай мове (лацінскім шрыфтам): “Hapon”, “Wieczernice i Obłąkany” (1855), “Ciekawyś? – Przeczytaj!” (1856), “Dudarz białoruski” (1857) В. Дуніна-Марцінкевіча. Адначасова ў гэтых выданнях змяшчаліся і польскамоўныя тэксты. У 1859 г. В. Дунінам-Марцінкевічам было ажыццёўлена самае адметнае выданне гэтага часу на беларускай мове лацінскім шрыфтам – пераклад “Pana Tadeusza” Адама Міцкевіча.

Асноўнымі аўтарамі і перакладчыкамі ў Мінску ў 1795–1864 гг. былі *мясцовыя аўтары* – тыя, хто знаходзіўся на службе ў Мінску, або ўраджэнцы Мінска і Міншчыны (больш 40 асоб, што перавышае 70 % ад агульнай колькасці аўтараў азначанага перыяду). Каля 20 аўтараў – гэта, будзем лічыць, *немясцовыя аўтары*, творы якіх перакладаліся і выдаваліся ў Мінску (Іаган Георг Давід Элізен, Жозэф Аляксандр Мацье Дамбаль, Ян Герман, [Ю.] Герандэ, С. Бернардус, святы Бернардын, славянскі тэолаг і філосаф святы Банавентура, рэктар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Любешаўскага калегіума піяраў А. Т. Машыньскі, В. Капніст, А. С. Пушкін, Я. Мікульскі). Між іх асноўнымі немясцовымі аўтарамі былі аўтары твораў рэлігійнага зместу. Папулярнасцю карысталіся творы ў перакладзе з французскай і нямецкай моў на сельскагаспадарчую тэматыку. Да прыкладу, "Ziemianin, albo Gospodarz Inflandski" Я. Германа (1622) узноўлены па-польску І. Легатовічам у Мінску ў 1823 г. Вылучаецца мастацкі твор у перакладзе з рускай мовы – камедыя В. Капніста "Jabieda, to jest Pieniactwo" (1808).

Сярод аўтараў і перакладчыкаў, творы якіх былі выдадзены ў Мінску, большасць складаюць *празаікі і паэты*. У якасці перакладчыкаў вызначыліся такія аўтары, як нехта "B. O. W. K." – перакладчыца з французскай мовы на польскую, В. Дунін-Марцінкевіч – з польскай мовы на беларускую, І. Легатовіч – з нямецкай на польскую, Х. Прушыньска – з французскай на польскую, М. Тамашэўскі – з рускай на польскую, М. Б. Шышка – з французскай на польскую. Найбольш актыўна ў Мінску выдаваліся мастацкія творы В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Паўлава, А. Плуга, М. Лойкі.

Значную аўтарскую групу ў мінскім кнігавыданні 1795–1864 гг. складаюць *музыканты і кампазітары*: А. Бартэльс, А. Грунер, К. Лада, С. Манюшка, К. Марцінкевіч, Ф. Міладоўскі, В. Пшыбора. Супольна з кампазітарамі выступалі аўтары вершаваных тэкстаў: П. Янкоўскі (друкаваўся пад псеўданімам John of Dycalp), А. Шэмеш і Ф. Князьнін, М. Лапіцкі і У. Сыракомля, Я. Прусіноўскі і У. Вольскі. Найбольш выдаваемымі аўтарамі-кампазітарамі былі Ф. Міладоўскі (вядома 29 выд.), А. Грунер (6), С. Манюшка (3) і В. Пшыбора (3 выд.).

Вылучаецца яшчэ адна група – гэта *аўтары-выкладчыкі, вучоныя і спецыялісты* ў галіне сельскай гаспадаркі, мовазнаўства, філасофіі, медыцыны, псіхалогіі. У названай групе аўтараў найчасцей выдаваліся працы Ф. Чапяліньскага. Наступную групу аўтараў складаюць *святары і рэлігійныя дзеячы* каталіцкага, а таксама іўдзейскага веравызнання. Самая меншая група аўтараў – *афіцыйныя асобы*.

Адзначым, што колькасць мінскіх кніжных выданняў 1795–1864 гг. пад індывідуальным аўтарствам была значна меншай, чым колькасць выданняў аўтарскіх калектываў ці выданняў без указання аўтарства, – прыкладна ў 4,2 разы. Па нашых падліках, індывідуальным аўтарам належыць каля 60 мінскіх выданняў 1795–1864 гг., што складае 24 % ад агульнай колькасці выдадзеных у гэты перыяд кніг.

Наступны этап мінскага кнігавыдання, 1865–1904 гг., характэрны рэзкім павелічэннем групы выданняў на рускай мове – 1177 выданняў, што ў 5 разоў больш у параўнанні з 1795–1864 гг.; а таксама павелічэннем перакладаў на рускую мову (сем супраць аднаго перакладу на рускую мову ў 1795–1864 гг.) і поўнай адсутнасцю перакладаў на іншыя мовы; эпізадычнымі выданнямі на польскай мове (18 выд.), французскай (5) і на лацінска-польскай мовах (2 выд.).

Характарыстыка рускамоўнай кніжнай прадукцыі падаецца ў раздзелах, прысвечаных тэматыка-тыпалагічнаму і функцыянальнаму аналізу мінскіх выданняў у адпаведных храналагічных межах. Адзначым толькі выданні перакладаў на рускую мову, якія былі зроблены ў 1870–1890-я гг. Змены ў моўнай палітыцы пасля 1863–1864 гг. атрымалі яскравы адбітак у перакладных выданнях – яны сталі толькі рускамоўнымі. Мясцовыя аўтары, прыстасоўваючыся да но-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вай моўнай сітуацыі, імкнуліся ўсё ж даносіць да мінскага грамадства лепшыя ўзоры еўрапейскай думкі. Гэта пацвярджаюць выданні прац па псіхалогіі польскага вучонага Ю. Ахаровіча ў перакладзе з польскай мовы на рускую А. Ельскага (1876, 1877); у перакладзе з польскай мовы працы па сельскай гаспадарцы Дэлінгера (1893); у перакладах з французскай мовы – "Элементарный курс арифметики" доктара геалогіі і філасофіі, прафесара вышэйшых матэматычных навук Э. Жэлена (пераклад выкладчыка Мінскай гімназіі М. А. дэ Жоржа ў 1889 г.) і два пераклады, выкананыя С. Л. Халюціным: першы – лісты французскага афіцэра Эрбе з вайны 1853–1855 гг. у Крыме (1894) і другі – "Краткий обзор истории русской музыки Альберта Субиса. Париж, 1893. Presis de l`histoire de la musigue russe. Par. Albert Soubies" (1895). Быў яшчэ адзін пераклад са старыжытнарускай мовы з уводзінамі, заўвагамі і каментарыем Д. Бохана паэмы "Игорь князь Северский" (1897).

Друкі польскамоўных выданняў у Мінску з сярэдзіны 1860-х гг. і амаль да канца 1870-х гг. намі не выяўлены. Пасля выхаду ў 1866 г. у Мінскай губернскай друкарні каталіцкага "Directoriuma" польскамоўнае кнігадрукаванне, магчыма, прыпыняецца амаль на дзесяцігоддзе. Нязначным яно заставалася і потым: у 1879 г. – два выданні, у 1881 г. – два выданні, у 1883, 1884 і 1889 гг. – па адным выданні, у 1898 г. – два, у 1899, 1900 гг., 1901, 1902 гг. – па адным выданні, у 1903 г. – тры выданні. Большасць з іх (у дадзены перыяд) былі сумеснымі праектамі: мінска-варшаўскімі, мінска-кракаўскімі, мінска-віленскімі. Дзякуючы намаганням мінскіх кнігароў выйшлі выданні твораў мастацкай літаратуры – Ю. Крашэўскага, К. Дарэўскай-Вярыгі, Б. Адамовіча, Ю. Вяржбіцкага, В. Макоўскага, музычнага мастацтва – М. Грушвіцкага і М. Ельскага, гістарычныя – Х. Паяты, У. Загорскага, прыродазнаўчыя – Я. Ляскоўскага, а таксама дзве "Kantyczki" з рэлігійнымі спевамі і адзін каталог кнігарні В. Макоўскага.

Адбыліся ў 1865–1904 гг. таксама змены ў складзе аўтараў мінскіх выданняў. Асноўная частка – калектыўныя аўтары, што яскрава адлюстроўвае тэматыка-відавая структура выданняў: дамінуючае становішча займаюць афіцыйныя выданні сацыяльна-эканамічнай тэматыкі. На долю індывідуальных аўтараў прыпадае, па нашых падліках, каля 250 выданняў, што складае каля 21 % ад агульнай колькасці выдадзенай у гэты перыяд кніжнай прадукцыі.

У колькасных адносінах мінскіх аўтараў найперш прадстаўляюць *святары і рэлігійныя дзеячы* (22 аўт.). Асноўнымі аўтарамі ў дадзенай групе з`яўляліся прадстаўнікі праваслаўнага веравызнання. Былі таксама і прадстаўнікі іншых веравызнанняў: каталіцкага – мінскі біскуп А. Вайткевіч; іўдзейскага – рабін А. Ханелесс. Найбольш актыўныя аўтары – Ф. І. Міткевіч (27 выд.), архіепіскап Аляксандр (17), А. В. Тавараў (9), С. Г. Рункевіч (6), А. Юрашкевіч (4 выд.), Я. А. Варанцоў (3), Г. І. Тарнопальскі (3).

У сувязі з тым, што аўтарская група *выкладчыкаў, вучоных і спецыялістаў*, якая была выдзелена намі на папярэднім этапе, значна пашырылася, мы палічылі мэтазгодным прадставіць дадзеных аўтараў па іх працах у адпаведных галінах. Такім чынам, наступную групу аўтараў склалі *гісторыкі* (15 аўт.). Актыўна ўдзельнічаў у мінскім выдавецкім працэсе сакратар Мінскага губернскага статыстычнага камітэта А. П. Смародскі (24 выд.), выкладчык Мінскай гімназіі, сакратар рады настаўнікаў П. А. Аляксандраў, настаўнік Мінскага пры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ходскага вучылішча У. С. Ярмаловіч, А. І. Мілавідаў, Я. А. Альбоўскі. Групу *медыкаў* склалі таксама 15 аўтараў. Большасць з іх – урачы са ступенню доктара медыцыны. Аўтараў-медыкаў адрознівае нешматлікасць прац. Аднак ёсць некалькі аўтараў, на рахунку якіх па некалькі выданняў, – П. А. Грацыянаў, С. К. Свянціцкі, К. Фангельзен. Наступную групу аўтараў утвараюць *празаікі і паэты* (14 аўтараў арыгінальных мастацкіх твораў і рэдактараў). У якасці рэдактараў выступалі Д. Д. Бохан, Р. Салаўёў. У групе аўтараў *па сельскай гаспадарцы* (13 аўт.) – у асноўным спецыялісты, сябры Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Найбольш часта выдаваліся аўтары з тэматыкай па лясной гаспадарцы Я. Ф. Хрушчоў і В. І. Цюндзявіцкі. Сярод аўтараў у галіне *мовазнаўства* (9 аўт.) вядучае месца займаюць выкладчыкі Мінскай класічнай гімназіі М. П. Каралёў (8 выд.) і В. М. Курчэвіч-Сяўрук (2 выд.). Неабходна адзначыць, што сярод *аўтараў-матэматыкаў* асноўнае месца належыць таксама настаўнікам: С. А. Кацэнеленбогену, М. К. Лаўрову, С. А. Казлоўскаму, М. А. дэ Жоржу, А. Ляўшыну. Як ужо адзначалася, у гэты перыяд у Мінску выйшла адно перакладное выданне французскага матэматыка Э. Жэлена. Аўтарамі прац *па адукацыі* ў асноўным былі прадстаўнікі з адміністрацыйна-ўпраўленчага апарату: дырэктар Мінскай гімназіі М. Адо, сакратар педагагічнай рады Мінскай гімназіі В. П. Сазановіч, епархіяльны наглядальнік С. Пянкевіч, інспектар Мінскай духоўнай семінарыі А. Чарніцын. Па пытаннях *права* асноўныя выданні былі ажыццёўлены супрацоўнікамі судова-прававых органаў (6 аўт.). *Эканамічныя* пытанні асвятляліся ўпраўляючым Мінскай казённай палатай Ф. М. Ястрэмскім (9 выд.) і іншымі службовымі асобамі. Сярод аўтараў мінскіх выданняў былі *кампазітары* (7 выд.), *тэхнолагі-практыкі* (4), *прыродазнаўцы* (3); *мастацтвазнаўцы* (3); *педагогі-псіхолагі* (2), *бібліёграфы* (3 выд.). Сярод перакладчыкаў і рэдактараў у гэты перыяд вызначаюцца А. Ельскі, М. А. дэ Жорж, С. Л. Халюцін, Д. Бохан, Р. Салаўёў.

Групу немясцовых аўтараў склалі названыя ўжо аўтары перакладных твораў – Ю. Ахаровіч, Э. Жэлен, Дэлінгер, Ж. Эрбе, А. Субіс, а таксама арыгінальных твораў – Ю. Крашэўскі, Я. Ляскоўскі, У. Загорскі, Р. Белін, В. Перапечын. У працэнтных суадносінах немясцовыя аўтары складаюць у гэты перыяд каля 17 %. Агульная ж колькасць індывідуальных аўтараў 1865–1904 гг. – каля 140 асоб.

Асаблівасцю рэпертуару мінскіх выданняў з 1905 г. па 1917 г. былі не столькі замацаванне і колькасны рост кніжнай прадукцыі на рускай мове (у 1,3 раза больш выдадзена кніг у параўнанні з папярэднім этапам), колькі пачатак працэсу адраджэння і актывізацыі мясцовага разнамоўнага кнігавыдання, у першую чаргу на беларускай мове – 19 выданняў, яўрэйскай – 50, польскай –54 (гл. Дадат. 3).

Што тычыцца рускамоўнага кнігавыдання ў Мінску, то працэс колькаснага росту ў дадзенай групе спалучаецца з пашырэннем тэматыкі і функцыянальнага прызначэння гэтай літаратуры. З’яўляюцца першыя выданні па хіміі (“Эволюция химических элементов” А. А. Макрыцкага, 1915), ваеннай справе (29 выд.), логіцы (падручнік І. І. Цунзера “Первая мысль”, 1909). Узрастае доля выданняў спецыяльнага прызначэння, асабліва афіцыйных (66,3 %) і навуковых (4,1 %). Павялічваецца колькасць выданняў, якія ўключалі, акрамя рускай мовы, яшчэ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

некалькі моў, напрыклад: лацінскую – творы Вяргілія, Гарацыя (1913, 1914), дапаможнікі да лацінскай хрэстаматыі С. Самуйлава (1913, 1914); польскую – "Отчет Минского благотворительного общества за 1907 год" (1908), французскую – усяго 14 выданняў. З'яўляюцца пераклады на рускую мову з латыні гістарычных твораў Г.-Ю. Цэзара, Ц. Лівія і са старажытнаяўрэйскай мовы "Извлечений (главы VII, VIII, IX и X) из правил о подаянии бедным по еврейской религии, составленных Рабби Моисеем бен Маймоном" (1913).

Другое месца ў рэпертуары мінскіх друкаў 1905–1917 гг. вызначаецца за *польскамоўнымі* выданнямі (54 выд.), асноўны галінова-тэматычны склад якіх прадстаўлены гісторыяй і краязнаўствам (13 выд.), мастацкай літаратурай (12), ваеннай справай (12). Творы гістарычнай тэматыкі польскамоўных выданняў прысвячаліся дзеячам вызвольнага руху ў Беларусі, Польшчы і Літве – гэта Ш. Канарскі і Т. Касцюшка. Мастацкая літаратура прадстаўлена выданнямі і творамі В. Макоўскага – "Godzina pogardy: (wrazenia)" ("Час пагарды") (1906), "Wrażenia i studia" ("Уражанні і даследаванні") (1913); А. Гліньскага – "Bajarz polski" ("Казачнік польскі") (два тамы 4-га перавыдання выйшлі ў 1907 г. у серыі "Wydawnictwo Groszowe" і два тамы 11-га перавыдання ў 1913 г.); Ю. С. Вяржбіцкага "Księga ciszy" ("Кніга цішы)" (1914); Ф. Бернатовіча (1908); І. Янкоўскай (1916), Л. Жыцкай (1916); а таксама адзіным зборнікам – "Z nad Wilii i Niemna" ("З-над Віліі і Нёмана") (1906), прысвечаным 50-годдзю з часу смерці А. Міцкевіча і Т. Зана.

Розныя выдаўцы спрабавалі наладзіць сістэматычнае выданне на польскай мове "календара мінскага". Першыя спробы ў 1907, 1908 і ў 1909 гг. ажыццявіла Таварыства дабрачыннасці. Наступныя выпускі календара 1910, 1914–1917 гг. выйшлі накладам розных выдавецтваў: штомесячніка "Straży im. Maryi", штотыднёвіка "Nad Świsłoczą", кнігарні В. Макоўскага, "Polskiej Macierzy Szkolnej Ziemi Mińskiej". Амаль усе календары былі надрукаваны ў Вільні. Вядомы выпуск аднаго календара непасрэдна ў мінскай друкарні І. Каплана ў 1910 г.

У 1917 г. у Мінску з'явіліся польскамоўныя выданні па ваеннай справе – гэта падручнікі, правілы і слоўнік для польскіх вайскоўцаў, выдадзеныя Таварыствам польскіх вайсковых ведаў пад кіраўніцтвам Г. Багіньскага.

Па чытацкім прызначэнні пераважалі вучэбныя, даведкавыя, літаратурна-мастацкія і рэлігійныя выданні. Толькі адной пазіцыяй прадстаўлены афіцыйныя, навукова-папулярныя, папулярныя і масава-палітычныя выданні.

Мінскія кніжныя выданні на польскай мове гэтага часу з'яўляліся ў асноўным сумеснымі выдавецкімі праектамі: мінска-віленскімі, мінска-віленска-варшаўскімі, мінска-варшаўска-кіеўскімі. Найбольш актыўнымі гадамі ў мінскім польскамоўным кнігавыданні ўказанага перыяду былі 1907 г. (7 выд.), 1913 (5), 1916 (6) і 1917 г. (19 выд.).

Трэцяе месца ў кнігавыдавецкім рэпертуары Мінска 1905–1917 гг. належала *яўрэйскамоўным* выданням, пераважна на ідыш (Дадат. 3), каля паловы іх складалі пераклады з рускай мовы (18 выд.). Своеасаблівы ўсплёск яўрэйскамоўнага кнігавыдання назіраўся ў 1905–1906 гг., калі ў выдавецтве «Verlag "Kultur"» убачыла свет амаль 40 кніг на ідыш і іўрыце (39 выд.), 63 % з іх складала мастацкая літаратура. Выданне ў Мінску мастацкіх твораў вядомых аўтараў спрыяла фарміраванню і развіццю літаратурнага ідыша. Дзякуючы такім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтарам, як М. Мойхер-Сфорым (Ш. Я. Абрамовіч) і асабліва І. Л. Перэц, Шолам-Алейхем (Ш. Рабіновіч), пачынаецца працэс барацьбы за чысціню народнай мовы і пранікненне ў літаратурныя творы на ідыш гуманістычных ідэй. У белетрыстычных выданнях адлюстроўваліся рэвалюцыйныя падзеі (творы Л. Андрэева, Д. Айзмана), барацьба супраць прыгнятальнікаў і народныя паўстанні (гістарычная драма М. Мінскага), антываенныя настроі (творы У. Гаршына), няпростае жыццё яўрэяў як у межах аседласці, так і на эміграцыі (творы Ш. Аша, А. Гаркавы, Э. Кагана, Г. Номберга, І. Перэца, Тана). Псіхалагічныя творы У. Караленкі, У. Гаршына, А. Чэхава і інш., перакладзеныя на ідыш, мелі таксама значную папулярнасць. У 1905–1906 гг. у Мінску былі выдадзены і яўрэйскамоўныя брашуры палітычнай тэматыкі (8 выд.), асноўнай мэтай якіх было распаўсюджванне сацыял-дэмакратычных ідэй, барацьба з самадзяржаўем. Найбольш папулярнымі аўтарамі з’яўляліся І. Перэц, А. Чэхаў, У. Гаршын, Ш. Аш, У. Караленка, Тан.

Значна меншай колькасцю прадстаўлены мінскія выданні на іўрыце (6 выд.). Гэта кнігі па мастацкай літаратуры (аўтары – Л. А. Бронь, М. Бенсман), гісторыі – А. С. Шабад «ספר תולדות הימים ורשמות מפנקסים ישנים של ח״ק ”שבעה קרואים“…» («Хроніка малітоўнага дома і брацтва “Шыва-Круім”») (1911, 1912) і рэлігіі – “האזינו ברכה…” (“Слухайце блаславення (Маісея)” Л. А. Фрыдмана (1913).

Развіццё мінскага кнігавыдання *на беларускай мове* было звязана ў першую чаргу з адраджэнскім рухам у беларускай літаратуры. Выданне твораў мастацкай літаратуры становіцца адным з асноўных кірункаў у беларускамоўным кнігавыданні (6 выд.). Першыя з іх – гэта творы Э. Ажэшкі (1907), Я. Коласа (1917), “Тарас на Парнасе” (1917); пераклады з польскай на беларускую мову Т. Гардзялкоўскай твораў С. Жэромскага, С. Віткевіча (1914); зборнікі “Беларускія жарты” (1915), “Дзіцячая чытанка” (1917), “Літаратурны зборнік “Вольнае Беларусі” (1917). Вядучае ж становішча ў мінскім беларускамоўным кнігавыданні 1905–1917 гг. займалі творы сельскагаспадарчай тэматыкі (7 выд.). У 1917 г. у беларускамоўным кнігавыданні пачынае пераважаць палітычная тэматыка. Выходзяць працы “Аўтаномія Беларусі” Я. Лёсіка, “Як Мікіта бараніў сваіх” М. Міцкевіча і Я. Лёсіка, “Мэморыя”, “Пратакол з’езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску”, “Пратакол III з’езду Беларускай сацыялістычнай грамады”, “Чаго хоча Беларуская сацыялістычная грамада”.

Асноўнай аўтарскай групай у вызначаны перыяд становяцца *празаікі, паэты, перакладчыкі* (42 асобы). Павялічваецца група складальнікаў, рэдактараў. Стабільна па колькасці аўтараў выглядае група *святароў і рэлігійных дзеячаў* (25 аўт.); асноўнымі аўтарамі ў гэтай групе выступаюць прыхільнікі хрысціянскай праваслаўнай канфесіі. Аднак колькасць аўтараў па праваслаўі ў гэты перыяд некалькі змяншаецца. Затое павялічваецца колькасць аўтараў па іўдаізме, у тым ліку перакладчыкаў. Адзіным аўтарам прадстаўлена каталіцкая канфесія (А. Ельскі). У групе *аўтараў-палітыкаў* (24 аўт.) часцей выдаваліся У. І. Ленін (7 выд.), Г. Шмід (6), І. Чыгіроў (4), Я. Лёсік (2 выд.). У гэтай групе вызначыліся і перакладчыкі, такія як Б. Эпімах-Шыпіла, І. Вортсман, С. Левенгарц, Л. Шапіра, і рэдактары – І. В. Уладзіслаўлеў, А. Эльяшаў. У галіне *сельскай гаспадаркі* асабліва вылучаюцца спецыялісты (20 аўт.) па жывёлагадоўлі, аграноміі, паляводстве, сярод іх былі таксама рэдактары і складальнікі, напрыклад сакра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тар Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі С. Ю. Занеўскі, інструктар па малочнай гаспадарцы К. Ф. Купрэвіч, інспектар па жывёлагадоўлі пры таварыстве Т. М. Рыхтар. *Аўтары-медыкі* ўступалі нязначна (19 аўт.). Асабліва вызначыліся С. В. Балкавец, В. Л. Лунц, І. Ц. Офенберг, А. І. Савацееў і рэдактары – М. А. Поляк, А. А. Шахматаў. Сярод *аўтараў-гісторыкаў* (18 аўт.) вылучаюцца вучоныя, настаўнікі і выкладчыкі. Найбольш актыўныя ў гэты перыяд аўтар прадмоў і рэдактар Д. Скрынчанка, складальнік і перакладчык – І. Эльперын (ён жа – П. П. Фрэй). Аднолькавыя групы ўтвараюць аўтары *па праве* (12 аўт.) – Г. А. Дайноўскі, Ф. М. Ястрэмскі, Н. Л. Сагаловіч і *аўтары сацыяльна-эканамічнай* тэматыкі (12 аўт.). У групе *аўтараў-прыродазнаўцаў* (11 аўт.) – інжынер-аграном А. Д. Дубах, гідратэхнік Я. У. Апокаў, вучоны, аграном У. Р. фон Рыдыгер, спецыяліст па культуры балот у Мінскай губерні А. А. Сядлецкі, а таксама рэдактар Я. У. Апокаў. Вылучаюцца таксама аўтары-мовазнаўцы і *літаратуразнаўцы* (11 аўт.); *аўтары-матэматыкі* (10 аўт.). Найменшыя аўтарскія групы ўтвараюць *афіцыйныя асобы* (7 аўт.), сярод іх – мінскія губернатары А. Ф. Гірс, Я. Я. Эрдэлі, сябры Дзяржсавета Лапацінскі і Скірмунт, начальнік аддзела Мінскай казённай палаты Я. П. Смірноў; *тэхнікі* (6 аўт.), *вайскоўцы* (5) – генерал Ю. Доўбар-Мусніцкі, падпаручнік Г. Ю. Багіньскі; *прыродазнаўцы* (3), *хімікі* (1), *бібліёграфы* (1 аўт.).

З 1905 г. па 1917 г. намі зафіксаваны 280 аўтараў (72,5 % з іх – мясцовыя аўтары), якія прычыніліся ў Мінску да друку 373 прац. Ад усёй выдадзенай прадукцыі ў дадзены перыяд – гэта 22,4 %.

Аналіз кнігавыдавецкага масіву Мінска за 1795–1917 гг. па моўнай прыкмеце пацвярджае вывад аб залежнасці мовы выдання ад дзяржаўнай палітыкі, якая выяўлялася праз пэўныя законы, цыркуляры, палажэнні аб друку. Так, мова мінскіх выданняў 1795–1864 гг. была падпарадкавана шэрагу законаў аб друку, асноўныя з якіх дазвалялі прыватны друк (урадавыя загады 1801 г. і 1802 г.), забаранялі яўрэйскае кнігадрукаванне (1836), польскі шрыфт і друк (1864).

У кніжным рэпертуары гэтага часу вылучаюцца выданні на польскай (146 выд.), лацінскай і польскай (35), рускай (21), яўрэйскай (17), беларускай і польскай (3), беларускай (2), лацінскай (2), нямецкай (1 выд.) мовах. Паступова праз пасрэдніцтва польскай мовы ўзмацняўся рускамоўны ўплыў на кніжны друк у Мінску. Гэта прасочваецца ў двухмоўных выданнях на рускай і польскай мовах, чатырохмоўных (на рускай, польскай, французскай, нямецкай) выданнях, у перакладах з рускай мовы на польскую. Аднак польская мова захоўвалася ў мінскіх выданнях як дамінуючая да 1865 г. Асноўныя пераклады з іншых моў (рускай, французскай) рабіліся на польскую мову. У шэрагу мінскіх рэлігійных выданняў гэтага часу выкарыстоўваліся лацінская і польская мовы. Дзякуючы польскамоўнаму пасрэдніцтву і лацініцы з'яўляюцца першыя мінскія беларускамоўныя выданні і пераклады з польскай на беларускую мову В. Дуніна-Марцінкевіча. Другой дамінуючай мовай у 1795–1864 гг. была руская, трэцяй – іўрыт.

На працягу 1865–1904 гг., калі быў уведзены і дзейнічаў часовы цэнзурны статут (1865), узмацнілася русіфікатарская палітыка царызму, адбылася моўная пераарыентацыя ў кнігавыданні і асноўнай мовай стала руская. Колькасць мінскіх кніжных выданняў на ёй узрасла амаль у 56 разоў у параўнанні з папярэднім

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКИ

перыядам. Больш стала перакладаў на рускую мову, зніклі пераклады на іншыя мовы, эпізадычнымі былі выданні на польскай мове, адзінкавыя – на латыні.

1905–1917 гг. сталі для Мінска гадамі адраджэння разнамоўнага кнігавыдання ў сувязі з увядзеннем у дзеянне дазволу друкаваць на мясцовых мовах (1905). Адначасова са значным колькасным ростам рускамоўнага кнігавыдання (у 1,3 раза) у Мінску з'яўляюцца і перакладныя выданні на рускую мову (з латыні). На другое месца ў мінскім кнігадруку ў 1905–1917 гг. выходзяць польскамоўныя, на трэцяе – яўрэйскамоўныя выданні. Пачынае развівацца беларускамоўнае кнігавыданне. Пры ўсёй бессістэмнасці і выпадковасці ў выданні беларускіх кніг у Мінску назіраецца і пэўная заканамернасць. Дамінуючае становішча займаюць літаратурна-мастацкія выданні – 1907–1917 гг., навукова-папулярныя выданні па сельскай гаспадарцы – 1914–1915 гг., масава-палітычныя выданні – 1917 г.

Разам з тым можна зазначыць, што выданне кніг у Мінску на розных мовах не толькі залежала ад цэнзурнага заканадаўства, але было падрыхтавана і выклікана патрэбамі грамадскага жыцця. Па-першае, Мінск па складзе свайго насельніцтва з'яўляўся не толькі шматнацыянальным полісам, але і горадам, у якім асноўныя нацыянальныя групы ўтваралі яўрэі (болей 50 %), рускія (каля 18 %), беларусы (каля 17 %) і палякі (каля 6 %)[415]. Па-другое, кожная з нацыянальных груп стварала ў горадзе свае нацыянальныя асяродкі культуры[416] – гурткі, таварыствы, школы, кнігарні, бібліятэкі, што сведчыла аб захаванні і развіцці ў яго межах нацыянальнай самабытнасці розных народаў. І нарэшце, з 1905 г. падчас шырокага нацыянальна-вызвольнага руху было "адваявана" права легальнага друку і распаўсюджвання выданняў на мясцовых мовах – беларускай, польскай, яўрэйскай, што пачалі актыўна выкарыстоўваць і ў Мінску. У сваю чаргу, мясцовы кнігадрук стаў значным стымулам у развіцці нацыянальных культурных асяродкаў. Адну з вядучых пазіцый у разнамоўным кнігавыданні ў гэты час займаюць вучэбныя і літаратурна-мастацкія творы.

Як адзначыў З. Шыбека, "прадстаўнікоў розных культур аб'ядноўваў усё ж беларускі горад"[417]. Адпаведна мы можам сказаць, што і беларускае кнігавыданне складалася з разнамоўных нацыянальных кнігавыдавецкіх плыняў, цесна звязаных паміж сабой тэматычна і функцыянальна, а асноўнае аўтарства заставалася за мясцовымі, мінскімі, аўтарамі. Так, у 1795–1864 гг. яны складалі 70 %. Сярод аўтараў можна вылучыць пяць асноўных груп: празаікі і паэты; музыканты і кампазітары; святары і рэлігійныя дзеячы; выкладчыкі і спецыялісты; афіцыйныя асобы. Пераважалі ў гэты час сярод іх дзве групы: празаікі і паэты, музыканты і кампазітары. У 1865–1904 гг. адбыліся змены ў колькасным і якасным складзе аўтараў мінскіх выданняў. Мясцовыя аўтары складалі ўжо каля 83 %. Вызначаюцца 14 груп аўтараў: святары і рэлігійныя дзеячы; настаўнікі;

---

415 *Шыбека З.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя). Мінск : ЭўраФорум, 1997. С. 169.

416 Тамсама. С. 197–211.

417 *Шыбека З.* Мінск у складзе Расійскай імперыі (культурны генезіс будучай сталіцы) // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый" (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снежня 2000 г.) / рэдкал.: В. Скалабан (гал.рэд.) [і інш.]. Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. С. 199. (Беларусіка=Albaruthenica ; кн. 21).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

спецыялісты ў галіне гісторыі, медыцыны, сельскай гаспадаркі, мовазнаўства, матэматыкі, права, эканомікі, прыродазнаўства, мастацтвазнаўства, псіхалогіі, празаікі і паэты, тэхнолагі. Найбольшую групу складаюць святары і рэлігійныя дзеячы. У 1905–1917 гг. мясцовыя аўтары налічваюць каля 73 %. Асноўныя аўтарскія групы (15) – гэта празаікі і паэты; святары і рэлігійныя дзеячы; настаўнікі; спецыялісты па сельскай гаспадарцы, медыцыне, палітыцы, гісторыі, эканоміцы, праве, філалогіі, прыродазнаўстве, філасофіі, геаграфіі і геалогіі; афіцыйныя асобы; вайскоўцы. На вядучыя пазіцыі сярод аўтараў зноў выходзяць, як і ў 1795–1864 гг., празаікі і паэты.

## Мінскія кніжныя рэдкасці

*Нотна-музычныя выданні*

Гісторыя нотавыдавецкай справы ў Беларусі з'яўляецца важнай часткай, з аднаго боку, музычнай культуры, а з іншага – гісторыі выдавецкай справы і адпаведна – кніжнай культуры Беларусі. Першыя друкаваныя беларускія нотныя зборнікі з'явіліся напрыканцы XVIII ст. – гэта выданні каталіцкай царквы[418], аднак на тэрыторыі Беларусі ноты друкаваліся, як вядома, яшчэ з сярэдзіны XVI ст.[419]

Са з'яўленнем новага, літаграфічнага спосабу друку ў канцы XVIII ст., які значна паскорыў нотадрукаванне, на пачатку XIX ст. і ў Мінску выйшлі ў свет першыя выданні, якія змяшчалі нотны матэрыял. Вядомае нам сёння, дзякуючы даследаванню Я. С. Умецкай[420], адно з ранніх мінскіх выданняў – гэта "Śpiew do poloneza", было надрукавана ў Мінскай губернскай друкарні ў 1817 г. на патрэбу мясцовай гімназіі ў якасці вучэбнай праграмы па музыцы. Можна, аднак, меркаваць, што, напэўна, на пачатку XIX ст. існавалі і іншыя нотныя выданні, надрукаваныя ў Мінску, бо дастаткова назваць прозвішчы вядомых музыкантаў і кампазітараў Пятра Карафа-Корбута, дырыжора і музычнага педагога Дамініка Стафановіча, яго брата, педагога і кіраўніка мінскага аркестра Вінцэнта Стафановіча, кампазітара і педагога Канстанціна Кжыжаноўскага, якія працавалі на ніве музычнай культуры Мінска, і, пра якіх часта згадваюць мастацтвазнаўцы як пра педагогаў С. Манюшкі, Ф. Міладоўскага, К. Марцінкевіч, М. Ельскага і інш. З паступовым пашырэннем кола спажыўцоў музычных твораў, узрасталі і патрэбы ў іх, якія спрабавалі задавальняць і мінскія выдаўцы, друкары, выкарыстоўваючы ў першую чаргу просты і танны літаграфічны спосаб друку нотных формаў.

Найбольш значныя колькасныя вынікі ў галіне нотавыдання ў Мінску адзначаюцца ў 1850–1860-я гг., калі выпускам музычных твораў мясцовых кампазіта-

418 *Костюковец Л. Ф.* Кантовая культура в Белоруссии: массовые канты-гимны, лирические канты-псальмы. Минск : Выш. шк., 1975. С. 45.

419 *Касцюкавец Л. П.* Нотадрукаванне // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. Т. 4. С. 86; *Дадзіёмава В.* Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі. Мінск : Беларус. дзярж. акад. музыкі, 2001. С. 51.

420 *Умецкая Я. С.* Выданні на рускай мове: XIX – пачатак XX ст. С. 278.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раў-рамантыкаў заняўся Аляксандр Валіцкі[421], які падтрымліваў цесныя сувязі з шырокім колам прагрэсіўнай інтэлігенцыі. Як уладальнік кнігарні, а такса-ма склада музычных матэрыялаў “piśmiennych i rysunkowych oraz fotepianów z celniejszych fabryk warszawskich” ён прымаў замовы на ўсялякія “druki i litografje w Mińsku”[422]. Накладам А. Валіцкага ў Мінску рыхтаваліся да выдання творы С. Манюшкі, Ф. Міладоўскага, В. Пшыборы, А. Грунера, А. Бартэльса і інш. Найбольш пашчасціла дайсці да нашага часу мінскім нотна-музычным творам ***Фларыяна Міладоўскага***. Творчасць кампазітара і музыканта ў 1850–60-я гг. прынесла яму вядомасць і славу. Яго кампазіцыі выконваліся і друкаваліся побач з творамі С. Манюшкі і Ф. Ліста ў Вільні, Варшаве, Парыжы, Гамбурзе, Вене, Бруселі, Штутгардзе, Страсбурзе.

Да музычнай спадчыны Ф. Міладоўскага звярталіся беларускія даследчыкі А. Мальдзіс, А. Ахвердава, Л. Касцюкавец, В. Скарабагатаў, А. Капілаў. Вядома, што Ф. Міладоўскі быў аўтарам каля 50 аркестравых, камерных, вакальных, інструментальных твораў. На яго рахунку і аперэта “Konkurenci”. Паводле В. Скарабагатава, аперэта на лібрэта У. Сыракомлі і М. Лапіцкага, упершыню выкананая ў Мінску ў 1861 г., была выдадзена ў тым жа годзе А. Валіцкім у Мінску асобнымі музычнымі нумарамі і асобна як лібрэта[423]. У Караля Эстрайхера занатавана камедыя-опера пад аўтарствам М. Лапіцкага “z muzyką Floryana Miładowskiego” “Konkurenci”. Яна пазначана як віленскае выданне таго ж 1861 г.[424] У беларускага бібліёграфа М. Васілеўскай яно падаецца так: “Łapicki M. Konkurenci. Opera komiczna w 2 akty. Mińsk, 1861”[425]. У Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбурзе, у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве і ў Ягелонскай бібліятэцы Кракаўскага ўніверсітэта знаходзяцца па адным асобніку выдання “Konkurentów” (“Konkurenci: Komedjo-operetka we dwych aktach, przez Michała Łapickiego z muzyką Fłorjana Miładowskiego. Grana po raz pierwszy w teatrze Mińskim 12 Lutego 1861 roku”), якія выйшлі ў Мінску “nakładem Alexandra Walickiego drukiem E. Adamowicza”. Такім чынам, прагледжаныя de visu асобнікі выданняў аперэты дазваляюць удакладніць шэраг момантаў, і асабліва важны для нас бок – іх друк, які быў здзейснены мінскім літографам Эмерыкам Адамовічам[426].

Аднак выяўленыя асобнікі “Konkurentów” змяшчаюць толькі вершаваныя тэксты аперэты. Асобныя нота-музычныя нумары з аперэты, як і сама музыка да аперэты Ф. Міладоўскага, якія, па меркаванні даследчыкаў, выдаваліся ў Мінску, лічыліся незваротна страчанымі[427].

---

421 *Касцюкавец Л. П.* Нотадрукаванне. С. 87.

422 AGAD. III. Archiwum Przezdzieckich. B–1430. Aleksander Walicki do niewiadomego. 1862. L. 1.

423 *Скорабагатаў В.* Зайгралі спадчынныя куранты: цыкл нарысаў з гісторыі прафесійнай музычнай культуры Беларусі / Беларус. фонд “Беларус. капэла”. Мінск : Тэхналогія, 1998. С. 67.

424 *Estrejcher K.* Bibliografia polska. Cz. 1. 1876. T. 3. S. 6.

425 *Василевская М. А.* Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия : библиогр. на иностр. яз. Минск, 1983. Ч. 2. С. 371. № 2020.

426 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1077. Арк. 78адв.; *Estrejcher K.* Bibliografia polska. Cz. 1. 1870. T. 5. S. 10.

427 *Капилов А. Л., Ахвердова Е. И.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX века. Минск : Ин-т совр. знаний, 2000. С. 42.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Доўгачаканая знаходка адбылася ў Кракаве[428], дзе пашчасціла выявіць асобныя нотныя выданні да вядомай аперэты. Партытурныя нумары “Konkurentów” для фартэпіяна, укладзеныя самім кампазітарам Ф. Міладоўскім, як пазначана на тытуле выданняў, былі выдадзены накладам А. Валіцкага ў Мінску, а іх друк ажыццёўлены ў Ляйпцыгу або, як тады яго называлі, Ліпску, у літаграфіі C. G. Rödera. Дарэчы, паслугамі названага прадпрыемства карысталіся і вядучыя варшаўскія выдаўцы[429]. Да адкрыцця ўласных штыхарань кнігавыдавецкія фірмы Рудольфа Фрыдляйна, а таксама Густава Гебетнера друкавалі свае нотныя выданні менавіта ў Ліпску. У канкурэнтнай барацьбе ў галіне нотадрукавання выходзілі на першыя месцы менавіта спецыялізаваныя прадпрыемствы, такія як Карла Родэра ў Ліпску, Гебетнера і Вольфа ў Варшаве, у якіх былі даволі высокія, што таксама немалаважна, і аўтарскія ганарары[430]. Вось і А. Валіцкі, скарыстаўшы такую ж магчымасць, шэраг падрыхтаваных ім у Мінску нотнамузычных твораў надрукаваў у Варшаве – у друкарні-штыхарні Г. Гебетнера і Р. Вольфа, а таксама ў штыхарні-літаграфіі У. Отта; а найболей у Ліпску – у літаграфіі і друкарні-штыхарні К. Г. Родэра. Тэхніка глыбокага друку дазваляла шматразова выкарыстоўваць зробленыя матрыцы на нотныя творы ў залежнасці ад іх попыту. Інтэнсіўная нотавыдавецкая праца А. Валіцкага ў Мінску ў 1860–1862 гг. прынесла плён у выданні каля 30 назваў музычных твораў: С. Манюшкі, Ф. Міладоўскага, В. Пшыборы, А. Грунера, К. Лады, А. Бартэльса. Гэта былі песні (10 выд.), песні да аперэт (7), полькі (3), паланэзы (3), мазуркі (2), кантраданс (1), галоп (1 выд.) і інш. Па сведчанні У. Тамашэўскага, які займаўся вывучэннем варшаўскага нотавыдання, толькі адны з вядучых накладоўцаў музычных выданняў, а ўсіх у 1851–1865 гг. у Варшаве было 38, перакрывалі паказчык 20 публікацый[431]. Такім чынам, і мінскі выдавец набліжаўся да высокага ўзроўню ў нотавыданні.

Што тычыцца адметнай у свой час аперэты “Konkurenci”, то яна, як значыцца на тытуле кожнага з нотных нумароў да яе, складалася з дваццаці двух вакальных твораў. Сем з іх: №1 – *куплеты Окці* – “Oj gdy młodość się…”, №2 – *песня Окці* – “Konkurentów ilu wzdycha…”, №5 – *песня і Тэрцыя*” – “Ona z kart wielkiego wieszcza…”, №10 – *песня Окці* – “Pawel szczerze mi dowodzi…”, №11 – *раманс Окці* – “Zegnam was…”, №12 – *сэрэнада Эрыка* – “Oktawijo, duszy mojej…”, №15 – *песня Паўла* – “Mówią na nas…” – захоўваюцца ў бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта, а зараз іх копіі ёсць і ў Беларусі і маюць шанц быць не толькі не забытымі, але і адноўленымі ў сучасным выкананні або выданні.

Сярод іншых музычных твораў Ф. Міладоўскага, выдадзеных у Мінску накладам А. Валіцкага, але не “ў мінскай друкарні А. Валіцкага”, як адзначана ў працы “Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX века”[432] – паланэз у чатыры рукі “Michasiowi i Johasi: Cztere roreczny Polonez na Fortepian” – 1860 г.[433]

---

[428] Адзін асобнік аперэты захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

[429] *Tomaszewski W.* Warszawskie edytorstwo muzyczne w latach 1851–1865. Nakładcy – drukarze – repertuar wydawniczy // Instytucje – puliczność – sytuacje lektury. 1990. T. 2. S. 97–100.

[430] Ibid. S. 118.

[431] Ibid. S. 91.

[432] *Капилов А. Л., Ахвердова Е. И.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX века. С. 41.

[433] *Ахвердава А.* Фларыян Міладоўскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1980. № 3. С. 39.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Друк паланэза быў ажыццёўлены ў мінскай літаграфіі Э. Адамовіча. Ноты паланэза таксама захаваліся, пра што сведчаць і ілюстрацыі ў энцыклапедычным артыкуле Л. Касцюкавец, прысвечаным нотадрукаванню ў Беларусі[434]. Аднак арыгіналы застаюцца ўсё ж па-за межамі Беларусі – у С.-Пецярбурзе, Кракаве і Варшаве. Л. Касцюкавец у названым артыкуле быў праілюстраваны і тытул зборніка "Śpiewy polskie" таго ж Ф. Міладоўскага – 1862 г., выдадзены ў Мінску накладам А. Валіцкага.

Адзначым, што А. Валіцкі ўдзяляў значную ўвагу інфармаванню і рэкламе сваіх выданняў, выкарыстоўваючы пры гэтым некаторыя з іх. Дзякуючы таму, што ў такіх выданнях, як "Konkurenci" (1861) М. Лапіцкага, "Do Basi" (1862) С. Манюшкі, "Listek rózany" (1862) А. Грунера быў змешчаны "Katalog nut muzycznych wydanych nakładem Aleksandra Walickiego w Mińsku", удалося значна дапоўніць характарыстыку выдавецкай дзейнасці А. Валіцкага.

Да прыкладу, з абвесткі на апошняй старонцы вокладкі мінскага выдання (тэкставага) камедыі-аперэты "Konkurenci" можна даведацца, што ў 1861 г. А. Валіцкім рыхтаваліся да выдання музычныя творы ***Артура Бартэльса*** з тэкстам паэта Плакіда Янкоўскага (пад псеўданімам John of Dycalp) "Obrazki. Serja 1". Папулярнасць А. Бартэльса, які спачатку жыў у Вільні, а пазней у Варшаве і Кракаве, была шырокай як аб "сатырыку ў вершах і песнях, карыкатурысце ў малюнках". Будучы сам непараўнаным выканаўцам новых песень, якія спяваў пад уласны фартэпіянны акампанемент, ён быў душой мясцовага грамадскага жыцця. Праўда, былі ў яго і запазычаныя музычныя творы[435]. Лічыцца, што толькі ў 1888–1890 гг., ужо пасля смерці А. Бартэльса, у Кракаве яго творы (песні і сатыра) былі надрукаваны. Пазней выйшаў і шэраг твораў з нотамі для спеваў. Аднак не выключана, што менавіта мінскія "Obrazki" былі яшчэ прыжыццёвым выданнем арыгінальных музычных твораў А. Бартэльса.

Рэкламна-інфармацыйная абвестка таго ж мінскага выдання "Konkurentów" данесла да нас і такую навіну, што "wkrótce opuszczą prassę" музычныя творы ***Вітальда Пшыборы*** – "Polonaise pour le piano", "Węgierka. Polka", "Wyrwiduszka. Polka". Што тычыцца звестак пра асобу В. Пшыборы (В. Пржыбора, як падае А. Капілаў), то яны зусім нязначна раскрыты. А. Капілаў узгадвае яго толькі як віленскага музыканта-піяніста[436], а А. Глагоўская, кажучы пра існаванне ў 1840 г. мінскай музычнай школы Вінцэнта Стафановіча, у якой рыхтаваліся музыканты для працы ў аркестры, сярод імёнаў вучняў называе і імя В. Пшыборы[437]. І толькі адзін музычны твор з вядомых і названых мінскіх выданняў В. Пшыборы натрапіўся нам у Кракаве – гэта частка выдання "Polka na fortepian. № 1. Węgierka". Хаця на тытуле выдання пададзена і полька "№ 2. Wyrwiduszka", якая, зразумела, павінна была складаць другую частку выдання, аднак яе не ўдалося выявіць de visu. З інфармацыі на тытуле знойдзенага выдання даведваемся,

[434] *Касцюкавец Л. П.* Нотадрукаванне. С. 86.

[435] Polski Słownik Biograficzny /red. W. Konopczyński, E. Roztworowski. Kraków : Polska academia nauk ; Polska academia umiejętności, 1935. T. 1. S. 311.

[436] *Капілаў А.* Скрыпічнае мастацтва ў Беларусі ў XIX стагоддзі (1800–1880 гг.) // Беларуская музыка : зб. арт. Мінск : Беларусь, 1979. Вып. 4. С. 85.

[437] "Nauczali się w tej szkole Kamila Marcinkiewicz, W. Przybora, F. Pawłowski, A. Linkiewicz". Гл.: *Głogowska H.* Białoruś 1914–1929. Kultura pod presją polityki. Białystok : Orthdruk, 1996. S. 20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што яно з’явілася накладам А. Валіцкага і было надрукавана ў літаграфіі У. Отта ў Варшаве. Можна выказаць толькі меркаванне, што і “Polonaise pour le piano”, і названыя полькі “Węgierka” і “Wyrwiduszka” В. Пшыборы Аляксандру Валіцкаму ўдалося выдаць у 1861 г. ці 1862 г. (гады выхаду з друку музычных твораў на выданнях не пазначаны).

У ліку аўтараў мінскіх нотна-музычных твораў ёсць і прозвішча ***Камілы Марцінкевіч***, піяністкі, кампазітара і педагога, дачкі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Адным з ранніх мінскіх выданняў дзевяцігадовай К. Марцінкевіч сталі “Pierwsze proby muzykalne ofiarowane St. Moniuszce”, надрукаваныя ў літаграфіі Ф. Фалька ў 1845 г. Аб гэтым выданні засведчыла А. Ахвердава ў часопісе “Мастацтва Беларусі” (1985. № 2), дзе была змешчана таксама і ілюстрацыя тытульнага аркуша выдання[438]. Яшчэ адзін музычны твор К. Марцінкевіч, фундаментальны, як называюць яго мастацтвазнаўцы, *“Reve du passe”* – фантазія для фартэпіяна, прысвечаны графіні Марыі Тышкевіч[439], быў выдадзены таксама ў Мінску (1861) і, відаць, дзякуючы А. Валіцкаму, а друк ажыццёўлены ў літаграфіі У. Отта ў Варшаве.

Адным з самых вядомых і значных імёнаў, якое знаходзілася ў цэнтры ўвагі музычнай культуры Мінска, было імя ***Станіслава Манюшкі***. Пачаткам яго творчага супрацоўніцтва з В. Дуніным-Марцінкевічам і К. Кжыжаноўскім з’явілася пастаноўка ў 1841 г. камічнай оперы “Pobór rekrutów” (“Рэкруцкі набор”)[440]. У 1843 г., калі адбыўся паказ у Мінску наступнай камічнай оперы С. Манюшкі “Loteria” (“Латарэя”), кампазітар, як адзначыў А. Мальдзіс, “выдаў [у Мінску] два сшыткі эцюдаў для фартэпіяна”[441]. У спісе важнейшых кампазіцый, уключаных Ю. Проснакам у выданне “Stanisław Moniuszko”, такі факт пацвярджаецца, і гэта былі “Fraszki, dwa zeszyty” – мінска-віленскія “utwory fortepianowe” кампазітара, выдадзеныя ў 1843 г.[442], якія і меў на ўвазе А. Мальдзіс. Магчыма, ноты С. Манюшкі былі надрукаваны ў вядомай нам мінскай літаграфіі Ф. Фалька, а выдаўцом мог выступіць у той час хутчэй А. Завадскі.

“Spisy utworów dramatycznych zawierające decyzie cenzury. 1842–1843” Варшаўскага цэнзурнага камітэта, што захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве, сведчаць аб дазволе друку ў Мінску ў 1844 г. яшчэ адной двухактавай камічнай оперы С. Манюшкі “Walka muzyków” (“Спаборніцтва музыкантаў”), лібрэта да якой напісаў В. Дунін-Марцінкевіч[443]. Праўда, калісьці І. Бас лічыў рукапіс гэтай оперы “загубленым”[444]. Тым не менш надзея, што опера і лібрэта да яе былі надрукаваны, усё ж застаецца.

---

[438] *Ахвердава А.* Пачынальнікі беларускага піянізму // Мастацтва Беларусі. 1985. № 2. С. 68.

[439] *Капилов А. Л., Ахвердова Е. И.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX века. С. 53.

[440] *Бас І.* Падарожжа ў літаратурнае мінулае: літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск, 1971. С. 100–101; Минские губернские ведомости. 1841. 10 окт.

[441] *Мальдзіс А.* Падарожжа ў XIX стагоддзе: З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры. С. 116.

[442] Stanisław Moniuszko. 2 wyd. / oprac. J. Prosnak. Kraków : Polskie wyd-wo muzyczne, 1968. S. 184.

[443] AGAD. II. Warszawski Komitet Cenzury. S. 107: Spisy utworów dramatycznych zawierające decyzie cenzury. 1842–1843, p. 4, N 13: “Walka muzyków. Kom. Op. w 2. A. przez Marcinkiewicza. Минск, 1844. Одобр.”

[444] *Бас І.* Падарожжа ў літаратурнае мінулае… С. 101.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У працы А. Валіцкага “Stanisław Moniuszko”, дзе аўтар змясціў сістэматычны спіс твораў кампазітара, якія былі выдадзены, выдаюцца ці знаходзяцца на той час у рукапісе, сярод надрукаваных названы толькі два мінскія творы, да якіх меў самыя непасрэдныя адносіны сам А. Валіцкі. Гэта былі “Własny strój” і “Do Basi”[445]. Пасля таго як удалося адшукаць гэтыя дзве ўнікальныя песні С. Манюшкі, выдадзеныя накладам А. Валіцкага ў Мінску, у бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта, стала магчымым зрабіць і пэўныя ўдакладненні па іх друку. Так, песня “Do Basi” на словы Ф. Д. Князьніна была надрукавана ў К. Родэра ў Ліпску, а песня “Własny strój” на словы А. Шэмеша выйшла са штыхарні Гебетнера і Вольфа ў Варшаве. Цікавыя даныя змешчаны ў тэматычным каталозе “Pieśni solowe S. Moniuszki”, які ўтрымлівае больш падрабязную інфармацыю, выбраную з ліставання А. Валіцкага з С. Манюшкам, наконт даты замыслу адпаведных музычных твораў, іх выканання, выдання і перавыдання. Нараджэнне задумкі будучых мінскіх выданняў С. Манюшкі аўтар адносіць да 1860 г., аргументуючы лістом кампазітара да А. Валіцкага ад 5 кастрычніка 1860 г.[446] Так, песня “Własny strój” павінна была выконвацца голасам мецасапрана або барытонам, дапускалася выкананне часткі тэксту жаночым голасам, а песня “Do Basi” прызначалася для тэнара[447]. У хуткім часе нотныя выданні выйшлі з друку: першае – у 1861 г., другое – у 1862 г.

Адным з загадкавых імёнаў сярод аўтараў музычных твораў, выдадзеных А. Валіцкім у Мінску, застаецца імя кампазітара ***Адольфа Грунера***. У прыкніжных рэкламных спісах нотна-музычных выданняў А. Валіцкага налічваецца да шасці назваў твораў А. Грунера для фартэпіяна, якія выйшлі ў Мінску. Аднак толькі дзве мазуркі: адна танцавальная – “Doux Souvenir: mazourka élégante pour Piano” і другая для спеваў – “Listek rózany: mazurek do śpiewu”, надрукаваныя накладам А. Валіцкага ў ліпскай штыхарні Родэра, былі адшуканы ў Ягелонскай бібліятэцы. Астатнія ж – паланэз “Pierwiosnek”, полька “Skromna”, кантраданс “Fleurs de neige: contredanses brillantes”, галоп “Vogue la galere!” застаюцца зафіксаванымі толькі ў спісе. Прыкладнай датай выданняў можа быць 1862 г.

Да той самай даты выдання можна аднесці і яшчэ адзін музычны твор – “Śpiew do gwiazdki” ***Казіміра Лады***, польскага скрыпача і кампазітара. Як адзначае “Wielka Ilustrowana Encyklopedja Powszechna” (Т. 9), значнай папулярнасцю карысталіся такія музычныя творы К. Лады, як “Kujawiak”[448] для скрыпкі і фартэпіяна і “Zabawy wiejskie”[449]. Ён жа напісаў і “Historję muzyki” (1861). Аб выхадзе названага “Śpiewu do gwiazdki” К. Лады ў Мінску А. Валіцкі абвясціў у адзначаным ужо “Katalogu nut muzycznych” у выданні “Do Basi” (1862) пад рубрыкай “Śpiewy z towarzyszeniem fortepianu”.

У той самай рубрыцы была змешчана і інфармацыя пра “Śpiewy Polskie. Serja pierwsza” Ф. Міладоўскага, у склад якіх увайшлі пяць наступных песень: “№ 1. Szara godzina”, “№ 2. Pieśń starego hulaki”, “№ 3. Ty tak daleko”, “№ 4. Kaplica”, “№ 5.

---

445 *Walicki A.* Stanisław Moniuszko. Warszawa : Druk. J. Korzeniewskiego, 1873. S. 128–129.

446 *Nowaczyk E.* Pieśni solowe S. Moniuszki : katalog tematyczny. Kraków : Polskie wyd-wo muzyczne, 1954. S. 244.

447 Ibid. S. 40–41, 244.

448 Польскі народны танец.

449 Wielka Ilustrowana Encyklopedja Powszechna. Kraków : Wydaw. Gutenberga, [1929]. T. 9. S. 213.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ślub: Ballada”. Што характэрна для выдання нотных твораў, дык гэта іх набліжанасць да попыту замоўцаў: музычныя творы, якія прадстаўлялі пэўную тэматычную серыю, афармляліся паліграфічна ў адным выданні або выходзілі асобнымі музычнымі творамі з гэтай серыі. Так было, відаць, і з вядомымі “Śpiewami Polskimi” Ф. Міладоўскага, напісанымі на словы Я. Прусіноўскага і У. Вольскага, і твор трапіў да сваіх спажыўцоў як асобным выданнем, пра што гаварылі і Л. Касцюкавец, і А. Ахвердава, так і па адным з кожных пяці музычных твораў, якія складалі гэтую серыю.

У Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве захаваліся таксама два нотадрукі з першай серыі выдання “Śpiewy Polskie” – гэта песні № 2 і № 3, якія датуюцца, аднак, польскімі бібліёграфамі пасля 1865 г. ці 1867 г. Верагодней выглядае версія 1867 г., калі А. Валіцкі вяртаецца пасля высылкі ў Тамбоў на радзіму. Але ці выйшлі ўсе пяць песень і якім часам могуць датавацца ў разе свайго друку – гэта адкрытае пытанне.

Мінскае нотавыданне 1860-х гг. тым не меш колькасна і якасна не толькі прэзентавала музычную культуру горада, але і было шчыльна звязана з агульнаеўрапейскімі музычнымі традыцыямі. Асаблівае значэнне мелі творчыя сувязі мінскіх аматараў музыкі з такім прагрэсіўным часопісам высокага еўрапейскага ўзроўню, як “Ruch Muzyczny”, і яго рэдактарам Юзафам Сікорскім у 1857–1862 гг. Падтрымцы музычнай культуры садзейнічалі і заснаванае ў 1854 г. у Вільні Музычнае таварыства, а ў 1861 г. – Варшаўскі музычны інстытут, да дзейнасці якіх самае наўпростае дачыненне меў С. Манюшка. Дзякуючы менавіта творам С. Манюшкі ў музыцы замацоўвaецца і становіцца папулярным народны стыль. Цесныя сяброўскія і творчыя кантакты лепшых прадстаўнікоў музычнай культуры з Мінскам праявіліся ў ажыўленні музычнага і літаратурнага жыцця горада, у актыўным кніга- і нотавыданні. Адной з галоўных асоб у Мінску, дзякуючы каму пашыралася музычная культура, быў А. Валіцкі.

Па слушным меркаванні гісторыкаў беларускай музыкі, другая палова XIX ст. была таксама вельмі насычана шматлікімі падзеямі ў музычным жыцці горада. Сведчанне гэтаму – канцэртная і выканальніцкая дзейнасць, навучанне і музычная падрыхтоўка, а таксама і выданне чарговых музычных твораў тутэйшых кампазітараў і музыкантаў. Дзякуючы знаходкам С. Немагай[450] сталі вядомыя нотныя творы (1879 г.) кампазітара з Ракава ***Міхала Грушвіцкага***: “Dla godowej uroczystosci. Polonez ułożony na fortepian”, “Emilie: polka pour piano (Á Madame Emilie Gnoińska)”, “Mania-polka pour piano”, “Quatre Mazourkas Originales pour Piano”, “Mazourki de Salon pour piano (Composée et dédiée à Monsieur Michel Jelski)”, “Ty! Spiewek na dane słowa ułożony z towarzyszeniem fortepianu”, “Valse pari à Madame Helene Komar”. Усе выданні з’явіліся ў мінскай друкалітаграфіі Б. І. Саламонава, які дарэчы, набыў прадпрыемства ў Эмерыка Адамовіча, вядомага сваімі нотадрукамі. І таксама спрабаваў займацца напачатку сваёй друкарскай дзейнасці выпускам нот. Выдаўцом названых музычных твораў выступіў сам М. Грушвіцкі, што пацвярджае, напрыклад, і пазнака

[450] *Немагай С.* Кампазітар з Выгнаніч і Ракава. Міхал Грушвіцкі – наноў адкрытае імя // Мастацтва. 2013. № 7. С. 44–47; *Яе ж.* Выганічы – Дудзічы – Замосце: музычныя масты // Ельскія чытанні : матэрыялы канферэнцыі “Шляхецкая культура Беларусі XIX – пачатку XX ст.” (Дудуткі, 27 крас. 2013 г.) / уклад. Д. Ільініч ; пад рэд. Л. І. Доўнар. Мінск : Кнігазбор, 2013. С. 40–52.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

на тытулах выданняў: "Własność autora" або "Propriete de l'Auteur". Арыгіналы выданняў захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Літвы ў Вільні, у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбурзе і Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

Яшчэ адно мінскае музычнае выданне пабачыла свет у 1899 г., калі накладам мінскага кнігара Я. Філіповіча-Дубовіка былі надрукаваны "Studia muzyczne" ***Міхала Ельскага***[451].

У Мінску ў розныя гады – 1880 г., 1886 г., 1893 г., 1898 г., 1906 г., 1913 г. – былі заснаваны і дзейнічалі разнастайныя музычныя таварыствы, пра выдавецкую дзейнасць якіх нічога невядома. Ці, можа, рана і тут ставіць кропку, і не раўняць нявывучанае да неіснуючага або да страчанага?

Прыкладам таму і мінскія нотныя выданні XIX ст., якія па-новаму адкрываюць у музычнай культуры Беларусі імёны такіх кампазітараў, як Адольф Грунер, Вітальд Пшыбора, Казімір Лада, Артур Бартэльс, Міхал Грушвіцкі. З вяртаннем жа страчанай музычнай спадчыны ёсць надзея і яе адраджэння, як на гэта атрымала шанц ужо залічаная да страчанага аперэта вядомага кампазітара і музыканта Ф. Міладоўскага "Konkurenci"[452].

### *Выданні на ідыш «Verlag "Kultur"»*

Узнаўленне ў Мінску кнігадрукавання на ідыш адносіцца да пачатку XX ст. і звязана з дзейнасцю «Verlag "Kultur"» («Выдавецтва "Культура"»). Праўда, працэс адраджэння размоўнага ідыша пачаўся яшчэ ў 1860 – 1880-я гг., калі ў друку з'явіліся творы Мендэле Мойхер-Сфорыма[453], Шолам-Алейхема[454], І. Перэца[455] і інш. Тутэйшыя – мінскія – яўрэйскія аўтары шырока выкарыстоўвалі паліграфічную базу Вільні, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Кракава і інш. У 1903 г. у Расіі было дазволена выданне першай штодзённай газеты на ідыш[456]. Паступова погляд на ідыш як на размоўную мову, якая выконвае толькі асветныя функцыі (бо большасці мясцовага яўрэйскага насельніцтва было недаступным чытанне на іншых мовах), замяняецца меркаваннем, што ідыш – нацыянальна-культурная каштоўнасць і важны фактар нацыянальнага развіцця яўрэйскага народа.

---

[451] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku … S. 89.

[452] Копіі знойдзеных нот знаходзяцца ў асабістым архіве Л. Доўнар, а таксама ў кнігазборы "Беларускай капэлы".

[453] *Абрамовіч Саламон Майсеевіч* (сапр. Шолам-Якаў Бройдэ, па пашпарце Саламон Майсеевіч Абрамовіч, 1836, м. Копыль, Мінская губ. – 1917, Адэса), вядомы пад псеўданімам Мендэле Мойхер-Сфорым, пісьменнік, драматург, заснавальнік яўрэйскай класічнай літаратуры. Пісаў на іўрыце і ідыш. Упершыню ў яўрэйскай літаратуры стварыў абагульняльны вобраз яўрэйскага мястэчка. Славу прынеслі гумарыстычныя мастацкія нарысы з яўрэйскага жыцця. Яму належаць пераклады на ідыш некаторых богаслужэбных кніг, гістарычнай паэмы і інш. Самы вядомы твор – раман "Падарожжы Веніяміна Трэцяга".

[454] *Рабіновіч Шолам Нохумавіч* (1859, Палтаўская губ. – 1916, Нью-Ёрк), вядомы пад псеўданімам Шолам-Алейхем, яўрэйскі пісьменнік, адзін з класікаў новай літаратуры на ідыш. Пачаў друкавацца ў 1883 г. З 1906 г. – у эміграцыі.

[455] *Перэц Іцхок Лейбуш* (1852, Люблінская губ. – 1915, Варшава) – яўрэйскі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Першыя творы на ідыш апублікаваў у 1888 г.

[456] Новый энциклопедический словарь / под общ. ред. акад. К. К. Арсеньева. Петроград : Изд-во Ф. А. Брокгауз и И. А. Ефрон, 1914. Т. 17. Стлб. 246.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё літаратуры, у сваю чаргу, садзейнічала пашырэнню кола чытачоў яўрэйскіх выданняў і прывяло да стварэння новых, легальных, выдавецтваў, найбольшая колькасць якіх узнікла пасля 1905 г.

Першыя звесткі пра існаванне мінскага «Verlag “Kultur”» і яго выданнях былі выяўлены намі ў выніку навукова-бібліяграфічнага пошуку кніг на яўрэйскай мове ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбурзе. Дзякуючы падтрымцы пецярбургскіх вучоных Мікалая Нікалаева і Юрыя Вартанава пашчасціла адшукаць невядомыя да гэтага мінскія выданні XIX – пачатку XX ст. на іўрыце і ідыш, сярод якіх былі і шэсць кніг «Verlag “Kultur”» 1905–1906 гг.[457] Знойдзеныя выданні сталі важнейшымі сведкамі пацвярджэння рэальнага існавання і вызначэння рэпертуару выдавецтва, бо ў розных бібліяграфічных і энцыклапедычных даведніках пра «Verlag “Kultur”» у Мінску звесткі адсутнічалі.

Каштоўнейшай крыніцай інфармацыі пра выдавецкую дзейнасць мінскага «Verlag “Kultur”» з’яўляюцца рэкламныя і інфармацыйныя спісы выданняў (плануемых да друку, а таксама надрукаваных), змешчаныя на старонках вокладак некаторых кніг выдавецтва. Агульная колькасць выяўленых такім чынам выданняў «Verlag “Kultur”» налічвае 38 назваў, большасць з якіх – гэта невялікія па аб’ёме, накладзе, з нізкім коштам (у асноўным – ад 5 да 10 кап.) брашуры. Усе выданні стэрэатыпаваліся і дадрукоўваліся ў залежнасці ад попыту на іх. Выдавецтва прапаноўвала публікацыю кніжнай рэкламы (аб’яў) у сваіх выданнях, планавала выпуск праспектаў і каталогаў. Значнае месца адводзіла рэкламе яўрэйскамоўнага перыядычнага друку з Вільні (“Hachaim wehatewa”, “Hasman”), Санкт-Пецярбурга (“Der Fraind”), Варшавы (“Der Weg”), а таксама рускамоўных выданняў, прысвечаных яўрэйскай тэматыцы, як, напрыклад, газета “Восход”, часопіс “Еврейская жизнь” з Санкт-Пецярбурга. Кніжная рэклама «Verlag “Kultur”» сведчыць і пра яго сувязі з пецярбургскім яўрэйскім выдавецтвам “Новая библиотека”, дзе выдаваліся арыгінальныя і перакладныя творы на яўрэйскай мове У. Караленкі, М. Файерберга, К. Станюковіча, Р. Джаваньёлі, Ш. Ан-скага і інш. Усе выданні “Новой библиотеки” можна было замаўляць праз «Verlag “Kultur”» у Мінску.

Адным з першых ажыццёўленых праектаў у выдавецкай практыцы «Verlag “Kultur”» быў, відаць, «זאמלבוך “קולטור”, 1905» («Зборнік “Культура”, 1905»). Пра гэта сведчыць і рэкламная інфармацыя аб 13 запланаваных выданнях, змешчаная на вокладцы зборніка. Асноўнае месца ў рэпертуары новага выдавецтва займала белетрыстыка І. Перэца, Д. Айзмана, М. Мінскага, М. Файерберга, У. Гаршына, А. Гаркавы. Ёсць у спісе і кніга Л. Андрэева “דער רויטעד געלעכטער” (“Красный смех”) у перакладзе на ідыш Ш. Розенфельда, якая, як адзначалася, “будзе выдадзена у 5 сшытках па 5 капеек”.

Непасрэдна «Зборнік “Культура”. 1905» – найбольш аб’ёмнае выданне ў 260 старонак – змяшчае арыгінальныя творы (паэма І. Перэца “Цуды не адбыліся”, апавяданні Ш. Аша, А. Рэйзіна, Д. Фрышмана), а таксама пераклады на ідыш твораў А. Чэхава, М. Твена, Ф. Стоктана і інш. Акрамя гэтага, у зборнік уключаны геаграфічна-статыстычныя агляды розных краін і народаў, ілюстраваныя навукова-папулярныя артыкулы на разнастайныя тэмы. Рэдактарамі пе-

[457] Гл. у нашым выданні: ч. II: Каталог – 1905 (77, 81), 1906 (87, 90, 91, 104).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ракладаў, якія змяшчаліся ў зборніку, з’яўляліся пісьменнік І. Раўніцкі[458] і доктар А. Эльяшаў[459].

З той самай рэкламнай інфармацыі ў зборніку стала вядома, што І. Раўніцкі і доктар Лур’е рэдагавалі падрыхтаваныя да выдання ў Мінску пераклады кніг. Магчыма, яны таксама з’яўляліся і арганізатарамі мінскага выдавецтва?

Сярод ацалелых выданняў «Verlag “Kultur”» 1905 г. – “עצות פאר עמיגראנטען” (“Парады для эмігрантаў, якія ад’язджаюць у Амерыку”) А. Гаркавы[460]. Навучаны цяжкім вопытам эміграцыі, ён выдаў парады сваім суайчыннікам на ідыш, паказваючы тым самым, што ідыш – такая ж праўдзейсная мова, якая мае сваю граматыку і лексіку, як і любая іншая. Названае выданне надрукавана ў “Издательской Типографии” ў Варшаве, захоўваецца цяпер у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбурзе.

Яшчэ адна кніга 1905 г. (са спісу «“Зборніка “Культура”»), выдадзеная мінскім «Verlag “Kultur”» у падгужскай друкарні Ш. Дойчэра, знаходзіцца ў Ягелонскай бібліятэцы[461]. Гэта гістарычная драма “часоў Багдана Хмяльніцкага” М. Мінскага “די בעלאגערונג פון טולטשין: דראמא…” (“Осада Тульчина”) у перакладзе А. Рэйзіна[462].

Асноўныя, з выяўленых de visu выданняў «Verlag “Kultur”», – гэта кнігі, надрукаваныя ў 1906 г. Сярод іх – два невялікія зборнікі апавяданняў[463] (па два апавяданні ў кожным) папулярных яўрэйскіх пісьменнікаў: І. Перэца – “אויב נישט נאך העכער” (“Калі яшчэ не вышэй”), “משיחס צייטן” (“Час Месіі”) і Ш. Аша[464] – “שמחת תורה אין דער קצבישער חברה” («Свята “Сімхас Тойрэ” сярод мяснікоў»), “א טרויריגע שמחת תורה” («Сумнае “Сімхас Тойрэ”»). Апошні зборнік Ш. Аша, на нашу думку, з’яўляецца адным з заключных выданняў у «Verlag

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

458 *Раўніцкі Іошуа-Хона* (1859, Адэса – 1944, Тэль-Авіў) – пісьменнік, выдавец. У 1887 г. выдаў зборнік “Der Jidischer Wecker”, прысвечаны ідэям палестынафільства, а пазней браў удзел і ў выданні іншых зборнікаў, у тым ліку сумесна з Шолам-Алейхемам. У 1899 г. І. Раўніцкі рэдагаваў тыднёвік “Der Jud”. Выпусціў таксама шэраг зборнікаў і артыкулаў для дзіцячага чытання. У 1902 г. быў адным з заснавальнікаў выдавецтва “Морыя”. У 1908–1910 гг. разам з Х. Бялікам выдаў прыкладны зборнік талмудычных агад у шасці тамах, першая частка якіх была на ідыш і на рускай мове.

459 Больш вядомы пад псеўданімам *Баал Махшовес.*

460 *Гаркавы Аляксандр* (1863, Навагрудак, Мінская губ. – 1939, Нью-Ёрк) – лексікограф, гісторык, пісьменнік, рэдактар яўрэйскіх перыядычных выданняў (“Der Idischer Progress” – першая газета-ўзор фанетычнай арфаграфіі ў ідыш). У 1878 г. А. Гаркавы пераехаў у Вільню, дзе працаваў у друкарні братоў Ромаў. З 1882 г. жыў у эміграцыі ў ЗША і Францыі. Аўтар англа-ідыш і ідыш-англійскага слоўнікаў (42 выданні). Пераклаў на ідыш “Дон Кіхота” М. Сервантэса, “Гісторыю яўрэйскага народа” Г. Грэца і інш.

461 Гл. у нашым выданні: ч. II: Каталог – 1905 (82).

462 *Рэйзін Аўраам* (1876, м. Койданава, Мінская губ. – 1953, Нью-Ёрк) – паэт-лірык і наэвіст. З 1914 г. – у ЗША. Пры напісанні твораў большую перавагу аддаваў ідыш. А. Рэйзіну па праву належыць адно з першых месц у народнай яўрэйскай літаратуры. Многія яго вершы пакладзены на музыку і сталі народнымі песнямі, п’есы ставіліся на сцэнах яўрэйскіх тэатраў.

463 Захоўваюцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы.

464 *Аш Шолам* (1880, Кутна, Варшаўская губ. – 1957, Лондан) – яўрэйскі пісьменнік. Пісаў на ідыш і іўрыце. Карыстаўся вялікай папулярнасцю ў Расіі і за мяжой. Амаль усе яго творы былі перакладзены на рускую і нямецкую мовы. У 1908 г. у Варшаве выйшаў першы поўны збор яго твораў, які сцвердзіў і замацаваў імя Ш. Аша як аднаго са значных майстроў літаратуры на ідыш. Найбольш прыкметны твор – трылогія “Да патопу”.

“Kultur”». Тут быў змешчаны самы поўны спіс кніг, якія выпусціла выдавецтва, куды былі ўключаны 35 назваў, аднак пра выданне менавіта названага зборніка ні ў адным са спіскаў выдавецтва не аб’яўлялася. А вось пра публікацыю твора Ш. Аша “א שטעדטעל” (“Мястэчка”) абвяшчаецца ва ўсіх трох рэкламных спісах. На жаль, мінскае выданне паэмы “Мястэчка”, якая была напісана Ш. Ашам у 1904 г. і прынесла яе аўтару шырокую вядомасць, не ўдалося адшукаць, і кніга пакуль што застаецца зафіксаванай толькі ў спісах выдадзеных кніг.

Найбольшая ўвага ў «Verlag “Kultur”» удзялялася, як сведчаць усё тыя ж прыкніжныя рэкламна-інфармацыйныя спісы, белетрыстыцы (каля 63 %). Самым папулярным аўтарам з’яўляўся І. Перэц. Прааналізаваўшы рэкламныя аб’явы, можна выказаць меркаванне, што ў мінскім выдавецтве было падрыхтавана і выдадзена не менш як сем кніг апавяданняў І. Перэца, сярод якіх “די פארשטויסענע. מענדיל בריינעס. די פרומע קאץ” (“Адвержаная. Сын Брайны. Набожная кошка”), “דער דין תורה. א שמועת” (“Суд. Дыспут”), “צווישן צוויי בערג” (“Паміж дзвюх гор”), “דאס שטראיימל” (“Штраймл”) і інш. Усе названыя творы былі на ідыш.

У фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі захаваліся два выданні «Verlag “Kultur”», зафіксаваныя ў рэкламна-інфармацыйных аб’явах выдавецтва[465]. Адно з іх – гэта аповесць У. Тана[466] “אוודאטיא און רבקה” (“Авдотья и Ривка”) у перакладзе на ідыш доктара А. Маркава (1906), у якой апавядаецца аб эмігранцкім жыцці ў Амерыцы. Паводле штампаў у дадзеным асобніку можна зрабіць вывад, што спачатку кніга знаходзілася ў Мінскай гарадской публічнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, потым – у 2-й Яўрэйскай Савецкай бібліятэцы імя І. Перэца ў Мінску і нарэшце – у Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна.

У адной з картатэк на фонд яўрэйскай літаратуры навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі зафіксаваны яшчэ два апісанні кніг «Verlag “Kultur”». Першае з іх – апавяданне Д. Айзмана[467] “ראס אייז געהט” (“Ледоход”) (1906), другое – апавяданне А. Чэхава “אין טיפן טאהל” (“В овраге”) (1906) у перакладзе на ідыш А. Маркава. Хоць кніг de visu не ўдалося выявіць, аднак гэтыя знаходкі, безумоўна, могуць сведчыць, што і іншыя выданні з прыкніжных рэкламных спісаў былі надрукаваны і з поўным правам могуць прадстаўляць рэпертуар «Verlag “Kultur”».

Сярод папулярных аўтараў, творы якіх выходзілі ў перакладах на ідыш у «Verlag “Kultur”», акрамя А. Чэхава, У. Тана, М. Мінскага, Л. Андрэева і Д. Айзмана, былі: У. Гаршын (“Ночь”, “Встреча”, “Аясларское дело”), У. Караленка (“Дом № 13”, “Мгновение”), М. Файерберг[468] (“Камея”). Дапаўняюць гэты пералік аўта-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[465] Гл. у нашым выданні: ч. II: Каталог – 1906 (107).

[466] *Тан* – псеўданім Уладзіміра Германавіча Багараза (1865 – 1936), рускага і яўрэйскага этнографа, лінгвіста, паэта, празаіка.

[467] *Айзман Давід Якаўлевіч* (1869, Херсонская губ. – 1922) – рускі і яўрэйскі белетрыст. Галоўныя тэмы яго апавяданняў – праблемы адносін інтэлігенцыі да свайго народа, руска-яўрэйскія пытанні, яўрэйскі быт. Мова яго твораў напоўнена характэрнымі выразамі мясцовай гаворкі. Збор твораў выйшаў у 8 т. у 1911–1919 гг. у Пецярбурзе.

[468] *Файерберг Мардэхай Зееў* (Фейерберг Е.; 1874, Наваград–Валынскі, Валынская губерня, Украіна – 1899), ярэйскі пісьменнік. Пісаў на іўрыце. Першы збор твораў М. Файерберга з’явіўся ў

ры арыгінальных твораў Г. Номберг[469] ("У хасідскім доме") і Э. Каган ("Дзмітры і Зігрыда"), а таксама перакладчыкі мастацкай літаратуры А. Маркаў, І. Пропус, Ш. Розенфельд, Д. Касель, А. Рэйзін.

У тэматычны рэпертуар «Verlag "Kultur"» уключаны таксама "палітычныя, вучэбныя і іншыя выданні". 21 % (8 экз.) ад агульнай колькасці кніжнай прадукцыі – гэта выданні палітычнай тэматыкі, два з іх прадстаўлены ў фондзе Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбурзе. Абодва яны з'яўляюцца перакладамі. Так, "רי ווינער רעוואלוציאן אין 1848־ען יאהר" ("Венская революция в 1848-ом году") у перакладзе на ідыш доктара І. Вортсмана, ажыццёўленым з аналагічнага рускамоўнага выдання выдавецтва "Донская речь", выйшла ў друкарні Іосіфа Фішэра[470] ў Кракаве (1906). Недалёка ад Кракава знаходзіцца і Падгужа, дзе ў друкарні Ш. Дойчэра таксама выходзілі мінскія выданні «Verlag "Kultur"». Сярод іх была кніга С. Вжосэка "די יסודות פון דער שטאטס־ארדנונג אין אייראפא און אמעריקא" ("Основы городского положения в Европе и Америке") у перакладзе Л. Шапіры[471] і пад рэдакцыяй А. Эльяшава (1906). У выданні выкарыстоўваліся ідыш і іўрыт.

Адзіным (на сёння) выданнем «Verlag "Kultur"», якое атрымала адлюстраванне не толькі ў выдавецкіх спісах, але і было зафіксавана ў бібліяграфічным дапаможніку "Bibliografia Polska, 1901–1939"[472], з'явілася брашура А. Бебеля "…די אורזאכען פון אנטיסעמיטיום" ("Прычыны антысемітызму") у перакладзе на ідыш С. Левенгарца (1906). Друк гэтага выдання быў ажыццёўлены ў "Издательской Типографии" ў Варшаве, цяпер захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве [473]

Поспехі мясцовай яўрэйскай выдавецкай справы садзейнічалі развіццю кнігавыдавецкіх сувязяў не толькі з Варшавай і Кракавам. Палітычная тэматыка выданняў мінскай «Verlag "Kultur"» мае непасрэдныя адносіны і да выданняў "Донской речи", якая дзейнічала ў Растове-на-Доне[474]. Цікавым аказаўся лёс рускамоўнага выдання С. Свацікава "Созыв народных представителей", якое папярэднічала мінскаму выданню на ідыш. Пасля выхаду з друку ў 1905 г. у вы-

---

1904 г. Ажыццяўляліся шматлікія перавыданні яго твораў, аповесці і нарысы выходзілі ў перакладах на розныя мовы: на ідыш у Пецярбурзе (1903), Мінску (1905), Кіеве (1918).

[469] *Номберг Гірш Давід* (1876, Варшаўская губ. – 1927, Польшча) – яўрэйскі пісьменнік, публіцыст. Асноўная тэматыка твораў прысвечана інтэлігентнаму пралетарыяту. Фельетоны Г. Номберга карысталіся вялікай папулярнасцю. У 1908–1909 гг. выпусціў збор твораў у 5 частках. Пераклаў на ідыш казкі "Тысячы і адной ночы", творы У. Шэкспіра, Р. Тагора і інш.

[470] *Фішэр Іосіф* – уладальнік друкарні ў Кракаве з 1879 г. Аказаў значны ўплыў на развіццё яўрэйскай друкарскай справы. Многія яўрэйскія выдавецтвы і аўтары аддавалі перавагу пры друку сваіх твораў менавіта Кракаву.

[471] *Шапіра Лазар Ісаак* (1835, Сувалкаўская губ. – ?) – пісьменнік і кнігавыдавец. Жыў у Варшаве, супрацоўнічаў з шэрагам перыядычных выданняў, друкаваў аповесці, займаўся перакладамі.

[472] Bibliografia Polska, 1901 – 1939. T. 2. S. 110, N 10476.

[473] Гл. ч. II: Каталог – 1906 (89).

[474] *"Донская речь"* – кніжнае выдавецтва, заснаванае ў 1903 г. прадпрымальнікам Мікалаем Парамонавым, які з'яўляўся і ўладальнікам аднайменнай газеты "Донская речь". Меў аддзяленні, магазіны і склады свойго выдавецтва ў Пецярбурзе, Маскве, Кіеве, Адэсе, Тыфлісе, Вятцы, Томску і іншых гарадах. Выдавецтва падтрымлівалася партыяй сацыял-дэмакратаў. Вядома, што яго кнігі распаўсюджваліся па ўсёй Расіі, у тым ліку і ў Вільні. Выдавецтва выпускала танныя публіцыстычныя кнігі дзеячаў заходнееўрапейскага рабочага руху, мастацкія творы М. Горкага, А. Купрына, А. Серафімовіча, Л. Андрэева, У. Караленкі, К. Станюковіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

давецтве “Донская речь” гэтай брашуры, прапагандаваўшай ідэі сацыял-дэмакратаў і заклікаўшай да звяржэння самадзяржаўя, яна была забаронена, а губернатары на працягу трох месяцаў павінны былі выслаць у Галоўнае ўпраўленне па справах друку рэквізаваныя ў кніжных магазінах экзэмпляры. Аднак, дзякуючы свайму агромістаму выдавецкаму тыражу (70 000), яна распаўсюджвалася шырока па ўсёй Расіі, у тым ліку і ў Мінску. Так, 15 верасня 1905 г. прыстаў 1-й часці г. Мінска паведаміў губернатару горада, што названае выданне ў двух экзэмплярах канфіскавана ў кнігарні Б. Гарадзенскага[475]. Праз некаторы час справа мела ўжо зваротны ход. Забарона была адменена ў сувязі з дзеяннем Маніфеста 17 кастрычніка, і выданне С. Свацікава было дазволена і вернута ў кніжныя крамы. І, як відаць, мела яшчэ, акрамя гэтага, перавыданне ў выглядзе перакладу на ідыш, ажыццёўленае ў Мінску, – “די צונויפרופונג פון די פאלקספארטרעטער”.

Указаная брашура была не адзіным перавыданнем, зробленым у супрацоўніцтве з растоўскім выдавецтвам “Донская речь”, якое мела на мэце як асветніцкія, так і палітычныя інтарэсы, пры гэтым добра адчувала патрэбнасці рынку[476]. Перавыданнем з “Донской речи” была і названая ўжо брашура на ідыш “Венская революция в 1848-ом году”. Сярод аўтараў выданняў палітычнай тэматыкі на ідыш мінскага «Verlag “Kultur”» быў М. Балабанаў[477], які займаўся распаўсюджваннем рэвалюцыйных выданняў “Донской речи” як палітычны дзеяч, друкар і аўтар. Растоўскае выдавецтва мела шэраг аддзяленняў у розных гарадах Расійскай імперыі. Магчыма, і Мінск таксама быў уключаны ў кола яго інтарэсаў. Некаторыя выданні “Донской речи”, такія як часопіс “Былое”, выдаваліся ў Пецярбурзе. Праўда, на працягу 1906 г. выдавецтва спрабавалі закрыць, і нарэшце ў лістападзе 1907 г. яно перастала дзейнічаць. Як адзначаюць даследчыкі, выдавецтва ўнесла значны ўклад у распаўсюджванне сацыял-дэмакратычных ідэй, рэалізоўваючы тысячныя наклады кніг для рэвалюцыйна настроеных рабочых[478]. Нават на першы погляд у рабоце растоўскага і мінскага выдавецтваў прасочваецца пэўнае падабенства ў падборы аўтараў і рэпертуары, арганізацыі работы: пераважаў перадрук найбольш злабадзённых твораў мастацкай і палітычнай тэматыкі, выданні мелі вельмі танны кошт, дадрукоўваліся ў выпадку неабходнасці.

Некалькі кніг «Verlag “Kultur”» пазначаліся ў прыкніжных спісах як “іншыя” – гэта папулярныя брашуры па медыцыне “די סוחאטע…” (“Сухоты і як ад іх уратавацца”), “די חאלערא…” (“Халера і сродкі, як ее уратавацца”) і пра падарожжы “א רייזע אין יאפאניע…” (“Падарожжа ў Японію”) У. Тана.

Дзейнасць мінскай «Verlag “Kultur”», такім чынам, прасочваецца на працягу двух гадоў (1905, 1906). Як паказваюць выяўленыя асобнікі выданняў, іх друк ажыццяўляўся ў “Издательской Типографии” ў Варшаве, друкарні Іосіфа Фі-

475 НГАБ. Ф. 300. Воп. 1. Спр. 10. Ч. 4. Арк. 272, 275.

476 *Травушкин Н. С.* Издательство “Донская речь” // Книга. Исследования и материалы. 1970. Сб. 21. С. 122.

477 *Балабанаў М. С.* – журналіст, літаратар, адзін з удзельнікаў сацыял-дэмакратычнага Данецкага саюза горназаводскіх рабочых, арганізатар і кіраўнік адной з падпольных друкарняў РСДРП у Растове-на-Доне. Таксама гл.: ч. II: Каталог – 1906 (88).

478 *Травушкин Н. С.* Издательство “Донская речь” // Книга. Исследования и материалы. 1970. Сб. 21. С. 107.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэра ў Кракаве, друкарні Ш. Дойчэра ў Кракаве і Падгужы (паблізу Кракава). Як і праца асобных таварыстваў нацыянальнага кірунку, яна не магла быць працяглай. Дараваная свабода для арганізацыі саюзаў і таварыстваў, паводле Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г., на справе абмежавалася толькі дазволам адкрыцця дабрачынных таварыстваў, дзейнасць якіх магла быць спынена за ўсялякае адступленне ад статута. У заснаванні навуковых, мастацкіх, літаратурных, спартыўных, артыстычных і іншых таварыстваў, а тым больш з нацыянальным ухілам, на розных падставах адмаўлялася ці за імі ўсталёўваўся жорсткі нагляд. У дзейнасці ж яўрэйскіх саюзаў дзяржаўныя органы нагляду выяўлялі палітычную падаплёку Бунда[479].

Відавочна, што выдавецкая дзейнасць «Verlag “Kultur”» у Мінску была звязана з сацыял-дэмакратычным рухам, распаўсюджвала яго ідэі праз свае выданні, у першую чаргу палітычнай тэматыкі. Такія выданні, як “וועגן פאלקספארטרעטער” (“Народное представительство”), (“3 פאליטישע פלוג־בלעטער” (“Тры палітычныя лістоўкі”) і іншыя, можна аднесці да твораў з яскрава выражаным дэмакратычным гучаннем. І нават у літаратуры белетрыстычнага характару адлюстроўваліся рэвалюцыйныя падзеі (творы Л. Андрэева, Д. Айзмана), барацьба супраць прыгнятальнікаў і народныя паўстанні (гістарычная драма М. Мінскага), антываенны настрой (творы У. Гаршына). Не магло абысціся выдавецтва і без тэматыкі аб няпростым жыцці яўрэйскага народа – як у межах аседласці, так і ў эміграцыі. Гэтай тэматыцы былі прысвечаны выданні Ш. Аша, А. Гаркавы, Э. Кагана, Г. Номберга, І. Перэца, У. Тана. Да глыбокіх псіхалагічных твораў У. Караленкі, У. Гаршына, А. Чэхава і інш., перакладзеных на ідыш у асноўным тутэйшымі мінскімі аўтарамі, мелася таксама вялікая цікавасць у справе асветнай працы выдавецтва.

У цэлым дзейнасць у Мінску ў 1905–1906 гг. яўрэйскага кніжнага выдавецтва адпавядала патрабаванням зменлівага часу, якія выводзіў на арэну гісторыі лёсы нацыянальных культур, наймацнейшым чынам звязаных з лёсамі кніг.

[479] НГАБ. Ф. 306. Воп. 1. Спр. 4.; Спр. 34.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

**Кніжныя сувязі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Кнігавыдавецкія сувязі са сталіцамі

### *Вільня*

На працягу вызначанага перыяду Вільня, у параўнанні з Мінскам, працягвала займаць дамінуючае становішча, маючы шэраг прыярытэтаў: гістарычны, адміністрацыйны, навукова-культурны[480]. Мінск займаў становішча аднаго з губернскіх гарадоў Расійскай імперыі, у якім толькі ў 1914 г. было дазволена закласці асновы вышэйшай школы, да пачатку XIX ст. існавала толькі эпізадычнае кнігадрукаванне. Культурная і гістарычная тэрытарыяльная блізкасць давала магчымасць усталяванню і развіццю плённых кнігавыдавецкіх сувязяў Мінска і Вільні: мінскія аўтары друкаваліся ў Вільні; віленскія кнігавыдаўцы працавалі ў Мінску; ажыццяўляліся сумесныя кнігавыдавецкія праекты.

Разгледзім у першую чаргу стан і дынаміку кнігавыдання ў Мінску і ў Вільні ў іх параўнанні. У Вільні, цэнтры адміністрацыйнага і культурнага жыцця краю, ужо на 1864 г. налічвалася 12 друкарняў[481], у Мінску – тры (Губернская, Ёкеля Дворца, Эмерыка Адамовіча). Толькі за 10 гадоў, з 1854 г. па 1864 г., у Вільні, як паведамляў "Виленский вестник" (1866. № 95), было надрукавана 2108 выданняў: 1216 – на польскай мове і латыні, 706 – на яўрэйскай, 152 – на рускай, 34 – на замежных мовах. У Мінску ж нават за перыяд з 1800 г. па 1864 г. было здзейснена, па нашых даных, 234 выданні, а менавіта з 1854 г. па 1864 г. – 101 (12 з іх – рускамоўныя). Як і ў Вільні, пераважалі выданні на польскай і лацінскай мовах. Калі ў Вільні з 1854 г. па 1864 г. польскіх кніг "в 8 раз было издано больше русских – это по официальному показанию, на самом же деле, при отсутствии надлежащего правительственного контроля, цифра эта была гораздо крупнее"[482], то і ў Мінску польскамоўныя выданні ў той самы час таксама пераважалі рускамоўныя прыкладна ў 7 і болей разоў. Мінскія выданні з польскімі і лацінскімі тэкстамі складалі 81,2 %, а віленскія – 57,7 %; адпаведна рускамоўныя ў Мінску – 12 %, у Вільні – 7,2 %.

У Вільні, па меркаванні А. І. Мілавідава, штогод "выпускали тысячи белорусских и жмудских букварей на польском языке"[483] – маецца на ўвазе, відаць, шрыфт і наклад названых выданняў. Па назвах жа гэта адзінкі, а дакладней, вядома два такія віленскія выданні лацінкай для беларусаў-католікаў (1835 г. – "Krótkie zebranie nauki Chrześciańskiej. Dla wieśniaków mówiących językiem polsko-ruskim" і 1845 г. – "Katechizm…"), а таксама выданні з беларускамоўнымі тэкстамі ў польскіх – гэта творы Я. Чачота (1844, 1846), В. Дуніна-Марцінкевіча (1846). У Мінску, хоць і не "заўважнымі" накладамі, аднак таксама выйшлі

---

480 *Шыбека З.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя). С. 206.

481 *Миловидов А. И.* Судьба русской книги в Северо-Западном крае в связи с его культурной историей. С. 27.

482 Тамсама.

483 Тамсама.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чатыры выданні на лацініцы з беларускай мовай – мастацкія творы В. Дуніна-Марцінкевіча.

Пасля 1864 г. кнігавыдавецкая карціна і ў Вільні і ў Мінску, як і ва ўсім Паўночна-Заходнім краі, даволі рэзка змянілася ў сувязі з забаронай друку на польскай мове і жорсткімі ўмовамі папярэдняй цэнзуры. Аднак, нягледзячы на гэта, у Вільні рабіліся спробы выдання польскамоўнай літаратуры: у 1860-я гг. А. Кіркорам, у 1870–1880-я гг. Э. Ажэшкай. У Мінску па прыкладзе Вільні таксама знаходзілі пэўныя магчымасці, каб выдаць штосьці з "забароненага" – на польскай мове. На сёння вядома, што ў гэты час, з 1865 г. да 1905 г., легальна былі выпушчаны не меш, чым 18 тэкставых выданняў: па мастацкай літаратуры, гісторыі, рэлігіі, прыродазнаўстве, а таксама 7 нотных выданняў (у 1879 г.). Выданні, якія змяшчалі тэкст на польскай мове, надрукаваны, у асноўным, дзякуючы падтрымцы варшаўскіх друкароў і былі таксама сумеснымі праектамі, у дадзеным выпадку – З. Савіцкай і Ю. Сікорскага, Я. Філіповіча-Дубовіка і В. Каўтза, Я. Філіповіча-Дубовіка і Гебетнера-Вольфа, В. Макоўскага і М. Арцта. У выпадку з дазволенымі да друку і надрукаванымі ў Мінску нотнымі выданнямі, відаць, выручыла французская мова (як замежная і дазволеная), выкарыстаная ў назвах танцавальна-музычных твораў. Адначасова ў двух выданнях захаваны польскія назвы, і гэтыя ноты пазначаны як уласнасць аўтара, М. Грушвіцкага.

Імкненню ўладаў падпарадкаваць русіфікатарскай палітыцы кнігадрукаванне, а ў нейкай ступені і стрымліваць яго развіццё ў Паўночна-Заходнім краі, супрацьстаяла эканамічнае развіццё ў гэтым рэгіёне, дзе попыт на кнігі і друкаваную прадукцыю ўвесь час узрастаў, спрыяючы з'яўленню хоць бы спарадычных выданняў, якія ўсё ж давалі надзею на змяненне існуючай сітуацыі.

Да пачатаку XX ст. Вільня ў пяць разоў павялічыла свой друкалітаграфскі патэнцыял: 35 друкарняў, 10 літаграфій, 15 скорасных друкарняў. З выдадзеных у 1902 г. у Вільні 638 кніг – 438 на рускай мове, 200 – на замежных[484]. У Мінску колькасць друкарняў і друкалітаграфій на пачатку XX ст. таксама вырасла ў параўнанні з першай паловай XIX ст., як і ў Вільні, у 5 разоў. У 1902 г. у Мінску выйшла 77 выданняў на рускай мове. Хаця Мінск за паўстагоддзя вырас у адзін са значных прамысловых і гандлёвых гарадоў Беларусі[485], а яго насельніцтва павялічылася за гэты перыяд болей чым у 4 разы і адной з найбольш развітых вытворчасцей ў Мінску стала друкалітаграфская[486], але колькасны і якасны патэнцыял віленскага кнігадруку быў усё ж у 2 разы большы. Мінск заставаўся прывабным месцам для віленскіх друкароў, якія спрабавалі адкрыць тут аддзяленні сваіх прадпрыемстваў. Так, у 1897 г. уладальнікі "Русской книжной торговли и типографии А. Г. Сыркина" ў Вільні мелі сур'ёзны намер удзельнічаць у таргах, аб'яўленых Упраўленнем Лібава-Роменскай чыгункі з мэтай адкрыцця ў Мінску філіяла сваёй фірмы. Аднак атрымалі ад мінскага губернатара адмоўны адказ[487]. Пазней, у 1912 г., у Мінску ўсё ж было адкрыта аддзяленне «Акционерного издательского и книготоргового общества "Лектор"» з Вільні[488].

---

484 Тамсама. С. 33.

485 Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1910 год. Минск : Губ. тип., 1909. С. 127.

486 Тамсама. С. 131

487 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6422. Арк. 1–2.

488 Тамсама. Спр. 8150. Арк. 1–12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля 1905 г., калі ўступіў у дзеянне закон аб свабодзе друку і афіцыйна быў дадзены дазвол ужываць у Паўночна-Заходнім краі мясцовыя мовы, у развіцці мінска-віленскага кнігавыдання наступае так званы "нашаніўскі" этап[489]. Праўда, пэўныя "вольнасці" праяўляліся, як адзначаецца даследчыкамі, яшчэ і раней, да прыкладу ў 1901 г. на выставе ў Мінску, а праз год у Вільні было заўважана шмат надпісаў на польскай мове[490]. Незадаволенасць русіфікатарскай палітыкай праяўлялася і ў духоўнай семінарыі ў Мінску, і ў настаўніцкім інстытуце ў Вільні. А Аляксандр Цвікевіч сцвярджае, што ўжо з сярэдзіны 1880-х гг. у паўсядзённым жыцці Віленскага настаўніцкага інстытута ўжывалася беларуская мова[491].

За гады дзейнасці дазволенага кнігадрукавання на мясцовых мовах Вільня, Мінск, Пецярбург і Масква становяцца галоўнымі цэнтрамі па выданні беларускамоўнай кнігі[492]. Мінск падтрымліваў цесныя кнігавыдавецкія сувязі практычна з усімі віленскімі выдавецтвамі, якія прычыняліся да беларускага друку, – гэта "Наша Ніва", "Беларускае выдавецкае таварыства", "Зніч", "Саха", "Гоман", "Беларус", "Палачанін", "Наша Хата", друкарня М. Кухты, выдавецтвы Б. А. Клецкіна, В. Ластоўскага.

Мінска-віленскія кнігавыдавецкія праекты 1800–1917 гг. грунтаваліся ў асноўным на прыватных ініцыятывах. Яшчэ на пачатку XIX ст. развіццё кнігадрукавання і яго поспехі ў краі былі ў многім звязаны з дзейнасцю ў Вільні друкарні Юзафа Завадскага, а пазней яго сыноў Адама і Фелікса. "Апрача сталых філій, Завадскія ўтваралі цэлую распаўсюджвальніцкую сетку, якая абслугоўвала мясцовыя кірмашы, даходзячы з кніжкамі да малых мястэчак, якія ў той адзіны кантрактавы дзень станавіліся вялікім скупішчам людзей"[493] (пер. з пол. – *Л. Д.*). У кірмашовыя дні да Ю. Завадскага маглі прыносіць свае творы і такія мясцовыя аўтары, як І. Легатовіч, А. Плуг. Ва ўспамінах Тадэвуша Корзана зафіксаваны выпадак, калі ён, дачакаўшыся маёвых "кантрактаў" занёс сваю першую працу (цэлы сшытак вершаў), "да адной з дзвюх прыезджых віленскіх хрысціянскіх кнігарняў, а менавіта ў кнігарню Завадскага"[494].

У друкарні Ю. Завадскага ў Вільні актыўна выпускаў свае творы Ігнат Легатовіч – гэта "Dawna przodków naszych obyczajność" (1859), "Epigrammata" (1854), "Gościniec dla dzieci" (1849), "Myśli Ignacego Piotra Legatowicza" (1857), у якіх аў-

---

489 *Галенчанка Г., Герасімаў В.* Кнігадрукаванне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1997. Т. 4. С. 211.

490 *Pozniak T.* Polacy w białoruskim odrodzeniu kulturalno-literackim // Studia Polono-Slavica Orientalia. Acta Litteraria / Polska Akademia Nauk ; Komitet Słowianoznawstwa. Wrocław : PAN Komitet Słowianoznawstwa, 1992. T. 13. S. 10.

491 *Цьвікевіч А.* "Западно-руссизм": нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / пасьляслоўе А. Ліса. 2-е выд. Мінск : Навука і тэхніка, 1993. С. 246.

492 *Głogowska H.* Białoruś. 1914–1929: Kultura pod presją polityki. Białystok : T-wo Hist., 1996. S. 55.

493 "Oprócz stałych filii tworzyli Zawadzcy całą sieć kolporterską, obslugując okoliczne jarmarki, docierając z książkami do małych miasteczek, które w ten jedyny dzień kontraktowy stawały się dużym skupiskiem ludności". Гл.: *Stolzman M.* Nigdy od ciebie, miasto…: Dzieje kultury wileńskiej lat międzypowstaniowych (1832–1863). Olsztyn : Wyd-wo Pojezierze, 1987. S. 65.

494 "<…> do jednej z dwu przyjezdnych księgarń wileńskich, chrześciańskich, mianowicie do księgarni Zawadzkiego". Гл.: *Korzon T.* Mińsk w połowie XIX wieku // Kalendarz Miński na rok 1908. Mińsk : Nakł. Minskiego T-wa Dobroczynnosci, 1908. S. 60.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тар таксама выступае як выдавец. Адначасова на друк некаторых выданняў у Мінску сродкі выдзяляліся і з Вільні. Накладам віленскай друкарні Ю. Завадскага, як занатаваў К. Эстрайхер[495], была надрукавана, да прыкладу, у Мінску Ё. Дворцам кніга мінскага капелана ксяндза С. Фяліньскага "Majowa Nowenna, czyli Dziewięcio-dniowe nabożeństwo do Najświętszej Panny Maryi" ("Майская Навэна, або Дзевяцідзённае набажэнства да Найсвяцейшай Панны Марыі") (1861). С. Фяліньскі з'яўляўся своеасаблівым "вытворцам такіх апавяданняў", у аснове якіх былі ідэі хрысціянскай маралі. Тут, у Вільні, выйшла яшчэ некалькі яго твораў у 1861 г. і 1863 г.[496] Супрацоўніцтва Завадскіх з Мінскам у рэалізацыі сумесных выдавецкіх праектаў працягвалася і на пачатку XX ст., калі ў Мінску дзейнічаў яшчэ адзін віленскі кнігар і выдавец – Вацлаў Макоўскі. У Вільні ён пэўны час кіраваў друкарняй Завадскага[497]. Таму і некаторыя ўласныя выданні В. Макоўскі друкаваў у Завадскіх.

У 1826 г. у Вільні на аснове кнігарні Рубэна Рафаловіча была заснавана фірма Альберта Сыркіна. З 1830-х гг. пачынаюць выдавацца кнігі накладам Сыркіна[498]. У хуткім часе фірма заняла другое месца пасля Завадскіх, выдаўшы кнігі Крашэўскага, Нарбута, Снядэцкага, Сыракомлі, Ярашэвіча. Сумесна з мінскімі кнігарамі-выдаўцамі братамі Бейлінымі віленскі друкар А. Сыркін выдаў у 1859 г. збор вершаў Адама Плуга "Głos z Litwy" ("Голас з Літвы") (творы А. Плуга выдаваліся ў Вільні і ў Юзафа Завадскага); у 1860 г. самастойна – другую частку падручніка выкладчыка мінскай гімназіі Ф. Чапяліньскага "Praktyczno-teoretyuczna Gramatyka języka polskiego" ("Практычна-тэарэтычная граматыка польскай мовы"). Намаганнямі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў 1859 г. у друкалітаграфіі А. Сыркіна быў выдадзены яго пераклад на беларускую мову "Pana Tadeusza" А. Міцкевіча. Выданне было забаронена, а тыраж у тысячу экзэмпляраў, дастаўлены А. Сыркіным у Віленскі цэнзурны камітэт, спалены. Праўда, некалькі яго асобнікаў усё ж захаваліся і дайшлі да нашага часу[499]. Можна меркаваць, што Завадскі і Сыркін, кнігарні якіх былі асноўнымі цэнтрамі па распаўсюджванні адпаведна польскамоўнай і рускамоўнай літаратуры ў Вільні, і былі тымі двума віленскімі кнігарамі, якія сістэматычна прыязджалі ў Мінск на кірмашовыя кантракты і стала падтрымлівалі кнігавыдавецкія сувязі з Мінскам. Па сцвярджэнні акурат А. Валіцкага, першым у краі, хто адважыўся выдаць творы С. Манюшкі, быў менавіта Завадскі[500].

З віленскай друкарняй Тэафіла Глюксберга меў зносіны і яшчэ адзін аўтар з Міншчыны – Ксаверы Вайніловіч (псеўданім Jacek Burczymucha). На працягу 1843–1852 гг. ён выпусціў дзякуючы накладам Т. Глюксберга некалькі ўласных мастацкіх твораў, сярод якіх і пераклады на польскую мову твораў А. С. Пуш-

[495] *Estreicher K.* Bibliografia polska. Część 1. XIX stólecie. (A–F). 1872. T. 1. S. 490.
[496] *Stolzman M.* Nigdy od ciebie, miasto… S. 205.
[497] *Sowiński J.* Polskie drukarstwo: Historia drukowania typograficznego i sztuki typograficznej w Polsce w latach 1473–1939. 2 wyd., popraw. i rozszersz. Wrocław : TART, 1996. S. 148.
[498] *Stolzman M.* Nigdy od ciebie, miasto… S. 76.
[499] *Кісялёў Г.* Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі. С. 243–247.
[500] *Walicki A.* Stanisław Moniuszko. S. 68.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіна "Кавказский пленник" ("Jeniec Kaukazu"), "Братья разбойники" ("Bracia rozbójnicy") – змешчаны ў выданні "Tłómaczenia" (1843)[501].

У 1870–1900-я гг. да сумесных мінска-віленскіх кніжных праектаў далучыўся яшчэ адзін віленскі друкар – І. Блюмовіч. Накладам мінскіх кнігароў Б. Гарадзенскага, Ё. Фрэнкеля, В. Макоўскага ў яго друкуюцца, напрыклад, даведкавыя выданні: "Календарь и справочный указатель правительственных учреждений" (1895), "Katalog pism księgarni W. Makowskiego" (1908); вучэбныя: "Полное руководство к решению арифметических задач" С. А. Казлоўскага (1897); а таксама рэлігійныя: "Взгляд на дело распространения и утверждения православия в Западном крае России" архімандрыта Анастасія (1871).

У 1906 г. з Пецярбурга ў Вільню была перанесена буйная друкарня Эдмунда Навіцкага з першай у Вільні ратацыйнай машынай, тут сталі друкавацца "Nowiny Wileńskie" і "Kurier Litewski"[502]. З Э. Навіцкім ладзіў кнігавыдавецкія сувязі А. Ельскі, які надрукаваў у яго некалькі сваіх твораў. Адно з выданняў, "Dzieje Dyecezyi Mińskiej" ("Гісторыя Мінскай дыяцэзіі") на польскай мове (1907), было пазначана як мінска-віленскае выданне, іншыя – "Hutarka ab tom, jakaja maja być "Ziamla i Wola" Sielskamu narodu" (1906) і "100 prykazak, zahadak, prydumak i gawendaù dla pażytku Biełaruskaho (Krywickaho) narodu" (1908) лацінкай на беларускай мове – толькі як віленскія. Аднак вядома, што А. Ельскі выдаваў свае творы за кошт уласных сродкаў і распаўсюджваліся яны з мінскіх кнігарняў, таму і іх можна лічыць сумеснымі праектамі.

Адно з загадкавых выданняў, надрукаванае на беларускай мове, паралельна лацінкай і кірыліцай, – верш пад назвай "Пазнаў праўду. Paznaû praûdu", які склаў "Міншчук. Minszczuk", залічваецца бібліёграфамі на рахунак віленскай друкарні "Адмунда Навіцкага". Брашура выйшла нібыта ў 1904 г.[503] Паводле Я. Карскага, аўтарам верша, накіраванага супраць праваслаўя, быў Аляксандр Валіцкі. Калі прыведзеныя даныя наконт таго, што друкарня Навіцкага пачынае сваю дзейнасць у Вільні толькі з 1906 г., праўдзівыя, то тады пад сумненне падпадае 1904 як год выдання названага твора. Аднак застаецца падабенства да выданняў Аляксандра Ельскага ці з яго бібліятэчнай калекцыі.

З Э. Навіцкім спрабавала супрацоўнічаць і Мінскае таварыства дабрачыннасці, накладам якога выйшаў "Kalendarz Miński na rok przestępny 1908" (1907). Аднак у хуткім часе друкарня была прададзена больш канкурэнтаздольнаму прадпрыемству Завадскіх.

У 1911 г. кнігавыдавецкія сувязі з Мінскам падтрымлівалі яшчэ дзве віленскія друкарні: "Русский почин", дзе былі надрукаваны два выпускі "Минской старины" (выдаўцом быў Мінскі царкоўны гісторыка-археалагічны камітэт), і "Edytor", дзе пабачыла свет кніга мінскага літаратара Д. Бохана "Адам Мицкевич. Биографический очерк" з перакладамі на рускую мову вершаў паэта "Bachczysaraj" і "Ruiny zamku w Bałakławie"[504].

Мінскія перыядычныя выданні пачатку ХХ ст. рэкламавалі паслугі друкарні "Znicz", заснаванай у Вільні А. Жукоўскім, дзе выпускаліся мінскія тыднёвік

[501] *Estreicher K.* Bibliografia polska. Część 1: XIX stólecie. … T. 5. S. 140.

[502] *Sowiński J.* Polskie drukarstwo… S. 151–152.

[503] Кніга Беларусі, 1517–1917 : зв. каталог. С. 243.

[504] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku. S. 200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Nad Świsłoczą" і аднайменны каляндар (у 1914 г.). У 1913 г. у гэтай друкарні быў выдадзены каталог Мінскай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна, які ўключаў польскамоўную літаратуру гэтай бібліятэкі. Тэхнічныя магчымасці новай друкарні прыцягнулі ўвагу Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, якое ў 1913 г. надрукавала справаздачныя матэрыялы аб дзейнасці арганізацыі, а таксама В. Макоўскага, які выпусціў тут мінскі польскамоўны "Kalendarz Ilustrowany na rok 1916".

Кнігарня В. Макоўскага з'яўлялася адным з самых актыўных удзельнікаў сумесных віленска-мінскіх выдавецкіх праектаў, у якіх пераважалі выданні мастацкія (вершы Ю. Вяржбіцкага, аповесці, гавэнды, казкі А. Гліньскага, аповесці і ўспаміны В. Макоўскага, зборнік-прысвячэнне А. Міцкевічу і Т. Зану), гістарычныя (У. Загорскага, К. Скірмунт), даведкавыя (кніжныя каталогі, календары). В. Макоўскі друкаваў свае наклады таксама і ў Завадскіх, І. Блюмовіча. Праз яго мінскую кнігарню распаўсюджвалася "Наша Ніва" ("Nasza Niwa").

Развіццё кнігавыдавецкіх сувязяў паміж Мінскам і Вільняй спрыяла пашырэнню не толькі культуры польскай, але і замацаванню і развіццю беларускай культуры. Сведчанне таму – дзейнасць беларускіх выдавецтваў у Вільні і Мінску. Адно з іх – таварыства "Минчук"[505]. У стварэнні таварыства бралі ўдзел Багдан Куштэлян, Антон Шабуня, Канстанцін Шпакоўскі, Уладзімір Самойла, Сяргей Скандракоў і Вацлаў Іваноўскі. З архіўных дакументаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні, некаторыя з якіх захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, можна даведацца пра здзейснены сумесна выдавецкі праект таварыства "Минчук" і "Нашай Нівы". Гэта вядомае выданне кірыліцай і лацінкай апавядання Э. Ажэшкі "Гедалі" (1907). Лічыцца, што іншых самастойных[506] ці сумесных выдавецкіх праектаў "Минчука", акрамя падрыхтоўкі да друку "Жалейкі" Янкі Купалы, не было. Разам з тым існаванне таварыства да 30 снежня 1909 г.[507], пацверджанае Вацлавам Іваноўскім, дае падставу меркаваць, што высілкамі сяброў "Минчука" падтрымлівалася дзейнасць "Нашай Нівы" ў Вільні. Сведчанне таму і справаздачныя дакументы таварыства за 1907 г., якія дайшлі да нас, дзе таксама паведамляецца аб павелічэнні колькасці сяброў таварыства з шасці чалавек да 13, сярод іх Пётр Юзэфовіч (з Докшыц), Вікенці Брадоўскі (з Халопеніч), Станіслаў Цюндзявіцкі (з Новабарысава), Ігнат Цюндзявіцкі (з Барысава), Эдвін Піятроўскі (з Зембіна), Баляслаў Свянціцкі (з Зембіна), князь Уладзіслаў Масальскі (з Докшыц), князь Іеранім Друцкі-Любецкі (з Ракава).

Таварыства "Минчук" у асобе Багдана Уладзіслававіча Куштэляна супрацоўнічала і з беларускай выдавецкай суполкай "Загляне сонца і ў наша ваконца" ў Пецярбурзе, займаючыся распаўсюджваннем беларускіх кніг (напрыклад, "Дудкі беларускай")[508]. Пазней, у 1913 г., сябры таварыства "Минчук", дваране К. Шпакоўскі і В. Іваноўскі, сталі заснавальнікамі "Беларускага выдавецкага таварыства" ў Вільні.

---

505 БДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 39. Арк. 3.

506 Тамсама. Арк. 5 адв.

507 У артыкуле "Мінчук" у "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" (Мінск, 1986. Т. 3) пададзена, што таварыства існавала ў Мінску ў снежні 1906–1907 гг.

508 БДАМЛіМ. Арк. 18.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Створаны ў 1912 г. на аснове сельскагаспадарчага аддзела “Нашай Нівы” віленскі часопіс “Саха” праз два гады становіцца мінскім перыядычным выданнем[509], рэдакцыя якога занялася ў Мінску і выпускам навукова-папулярнай літаратуры па сельскай гаспадарцы на беларускай мове. Асноўную ролю ў выданні і распаўсюджванні мінскіх кніг “Сахі” адыграў Аляксандр Уласаў, “самы цярплівы і доўгатэрміновы” выдавец-рэдактар “Нашай Нівы”, заснавальнік таксама і беларускага выдавецтва “Наша Хата”. Яму ж і Алаізе Пашкевіч належыць стварэнне мінскага дзіцячага часопіса “Лучынка”, які адначасова таксама з’яўляўся і выдавецтвам. Дзякуючы выдавецкай дзейнасці А. Уласава, у Вільні і Мінску ўзмацняўся і пашыраўся беларускі нацыянальны рух. Беларускае кнігавыданне паступова выходзіла за межы свайго гістарычнага цэнтра.

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што на фоне гісторыка-культурнага развіцця Мінска і Вільні, акрамя агульных тэндэнцый у кнігавыданні вылучаюцца і спецыфічны рысы, характэрныя толькі для Мінска або Вільні. Карціна кнігавыдавецкіх сувязяў паміж Мінскам і Вільняй на працягу XIX – пачатку XX ст. застаецца адносна стабільнай, хаця мы можам адзначыць, што найбольш актыўнымі яны былі ў першай палове XIX ст. (да 1864 г.), а таксама пасля 1905 г. Першы этап (да 1865 г.) кнігавыдавецкіх узаемаадносін можна акрэсліць схемай “Вільня→Мінск”, дзе Вільня займае пазіцыю цэнтра кнігавыдання ў адносінах да Мінска: робіць адбор мясцовых мінскіх матэрыялаў для друку ў Вільні; фінансуе мінска-віленскія наклады. На другім этапе (да 1905 г.) можна вылучыць наступны тып “Мінск→Вільня→Мінск”, які вызначаецца тым, што фінансаванне накладаў здзяйсняецца з Мінска, Мінск выступае замоўцам і атрымлівае гатовую прадукцыю з віленскіх друкарняў. І, нарэшце, з 1905 г. да 1917 г. дзейнічае трэці тып кнігавыдавецкіх сувязяў “Мінск→Вільня”, асноўнай рысай якога з’яўляецца падтрымка беларускага кнігадрукавання ў Вільні з Мінска як у плане фінансавання, так і ў плане арганізацыі беларускага кнігадрукавання ў Мінску. Такім чынам, кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Вільні на працягу XIX – пачатку XX ст., знаходзячыся ў руху і развіцці, былі ў залежнасці не толькі ад эканамічнага і гісторыка-культурнага фону, але і ажыццяўляліся насуперак цэнзурнаму ўціску.

### *Варшава*

У XIX – пачатку XX ст. Мінск з’яўляўся адным з трох гарадоў Паўночна-Заходняга краю, акрамя Вільні і Гродна, дзе былі найбольш значныя асяродкі польскай культуры[510]. Патрэбы ў польскамоўным кнігадрукаванні да 1864 г. ажыццяўлялі амаль усе мінскія друкарні, якія працавалі на працягу гэтага часу – Губернская, І. Стафановіча, Ё. Дворца, З. Прэса, Ф. Фалька, Э. Адамовіча; выдаўцы – браты Бейліны, А. Валіцкі, І. Легатовіч і інш., іх польскамоўныя выданні складалі 65 % ад усёй мінскай кніжнай прадукцыі.

Запатрабаванні мінскай грамадскасці ў польскай кнізе, як было адзначана, задавальняліся і віленскімі выдаўцамі Ю. Завадскім і А. Сыркіным. Тым не

509 *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 234.
510 *Шыбека З.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя)… С. 199.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менш мінскія кнігавыдаўцы развівалі сувязі з варшаўскімі, кракаўскімі і познаньскімі. У гэтых сувязях значнае месца, як пасрэдніку, належала менавіта Вільні, якая на пачатку XIX ст. займала другое месца, пасля Варшавы, па друку польскамоўных кніг, а ў 1854–1863 гг. уступіла першынство Львову і Кракаву[511]. Найбольшыя віленскія кнігавыдавецкія фірмы мелі трывалыя сувязі з варшаўскімі выдаўцамі – Завадскія, Глюксберг, Оргельбранд, дзякуючы сваяцкім і партнёрскім сувязям, ажыццяўлялі сумесныя выдавецкія ініцыятывы[512].

Пасля 1864 г. у польскамоўным кнігадрукаванні наступае крызіс. Так, у 1864–1868 гг. колькасць назваў надрукаваных у "Літве, Беларусі і Русі", як зазначае Я. Кушлейка, знізілася ў 10 разоў і нават яшчэ ў 1879–1883 гг. была ў 4 разы меншай, чым да 1864 г.[513] Спад выдання польскай кнігі быў адзначаны і ў Варшаве, але значна меншы. Толькі на ¼ былі зніжаны прапановы варшаўскіх кнігавыдаўцоў у першым пяцігоддзі пасля 1863 г.[514] Захоўвалася выданне польскамоўнай кнігі ў Пецярбурзе ў Б. М. Вольфа (М. Вольфа)[515] 1880-я гг. сталі пачаткам новага паступовага росту польскамоўных публікацый. За перыяд 1880–1899 гг. у Вільні, паводле К. Эстрайхера, было надрукавана 267 польскамоўных выданняў. У 1909–1911 гг. Вільня дасягнула 60 % ад усіх польскамоўных выданняў, надрукаваных за межамі Каралеўства Польскага (21 % – Кіеў, 10 % – Пецярбург, 9 % – 16 гарадоў на тэрыторыі Расійскай імперыі, сярод якіх і Мінск)[516].

У 1800–1864 гг. мінска-варшаўскія кнігавыдавецкія адносіны праявіліся ў шэрагу сумесных праектаў. Імі сталі друкі: мінскіх кнігароў-выдаўцоў братоў Бейліных і варшаўскага выдаўца С. Оргельбранда "Stella Fornarina" (1859) У. Сыракомлі, "Pierwsze wrażenia" (1858) Яна з-над Бярэзіны (Яна Мікульскага); мінскага літографа Ф. Фалька і варшаўскага выдаўца Г. Натансона – "Abecadło w rycinkach" (1852) ("Азбука ў малюнках"). Мінска-варшаўскія выданні былі ў рэчышчы традыцыйнага польскага кнігадрукавання, дзе выдаўцамі выступалі ў тым ліку кнігары. Праца мінскага кнігара-выдаўца А. Валіцкага мела значны ўплыў на развіццё ўзаемаадносін паміж Мінскам і Варшавай. А. Валіцкі падтрымліваў шчыльныя кантакты з выдаўцамі з Варшавы – Сікорскім, Гебетнерам і Вольфам, У. Оттам. У выніку супрацоўніцтва быў выпушчаны шэраг сумесных нотна-музычных выданняў, ажыццёўлена іх распаўсюджванне.

У першай палове XIX ст. паліграфічная база Варшавы ў пэўнай ступені, як і Вільні, была больш прывабнай для шэрагу мясцовых аўтараў, у тым ліку і з Мінска. Так, у 1864 г. у Варшаве было 17 друкарняў, 21 кнігарня, 13 чытальняў[517]. Выключнымі выпадкамі былі перавыданні польскамоўных кніг мінскіх аўтараў у Каралеўстве Польскім (напрыклад, "Abecadło w rycinkach" Ф. Фалька, надрукаванае ў 1857 г. у Познані).

---

511 *Stolzman M.* Nigdy od ciebie, miasto… S. 60.

512 Ibid. S. 83.

513 *Kuszlejko J.* Książka polska w Rosji na przełomie XIX i XX wieku. S. 58.

514 Ibid. S. 59.

515 Ibid.

516 Ibid. S. 37–39.

517 *Płachecki M.* Makrospołeczna sytuacja komunikowania w dobie niewoli (Królestwo Polskie 1864 –1885) // Piśmiennictwo – systemy kontroli – obiegi alternatywne. Warszawa : B-ka Narodowa, 1992. S. 224.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя польскамоўных кнігавыдавецкіх праектаў неабходна адзначыць і беларускамоўныя. Так, у пачатку 1860-х гг. у Варшаве выходзяць два беларускамоўныя выданні лацінскім шрыфтам – нелегальная брашура "Pieśni nabożnyja" (1861) і "Elementarz dla dobrych dzietak katolikaŭ" (1862)[518]. Нацыянальныя беларускія ініцыятывы ў польскім кнігавыданні былі асабліва інтэнсіўнымі ў 1890-я гг. – выданне твораў Ф. Багушэвіча "Dudka Białaruskaja" (1891, 1896), "Tralalonaczka" (1892) у Кракаве, "Smyk Białaruski" (1894) – у Познані (?). Фальклорныя запісы А. Гурыновіча, А. Чэрнага, пераклады на беларускую мову М. Фальскага выдадзены ў пачатку XX ст. таксама ў Кракаве[519]. Непасрэдна з Мінскам была звязана кнігавыдавецкая дзейнасць Марыяна Фальскага. Сваю перакладчыцкую і выдавецкую дзейнасць ён пачаў у 1903 г. у Варшаве выданнем лацінкай кнігі Маўрыцыя Жыха "Da swajho boha"[520]. Як адзначыў С. Александровіч, мінская грамадскасць ахвяравала пэўныя сродкі М. Фальскаму для выдання ў Варшаве і Кракаве беларускіх твораў, якія пасля перапраўляліся і ў Беларусь[521].

У Мінску ў 1865–1905 гг. дамінуючае становішча пачынае займаць рускамоўнае кнігавыданне. Выданні на польскай мове складалі 1,5 %. Колькасць польскамоўных выданняў зменшылася ў 8 разоў (са 146 выд. у 1795–1864 гг. да 18 у 1865–1904 гг.).

У 1880–1890-я гады, калі дзейнічала фактычная забарона на выданне польскамоўнай кнігі ў Паўночна-Заходнім краі, мінскім кнігарам Зоф'і Савіцкай і Яну Філіповічу-Дубовіку ўдалося рэалізаваць сумесныя польскамоўныя кніжныя выданні ў Варшаве. Кнігарня З. Савіцкай падтрымлівала цесныя кантакты з такімі польскімі таварыствамі, як "Oświata", "Towarzystwo przyjacół nauczającej się młodzieży"[522]. У 1881 г. З. Савіцкая арганізавала за свой кошт выданне ў друкарні Ю. Сікорскага ў Варшаве кнігі Ю. Крашэўскага "Dwa Bogi, dwie drogi", якая спецыяльна прысвячалася аўтарам З. Савіцкай. Ян Філіповіч-Дубовік наладзіў супрацоўніцтва з варшаўскім друкаром А. Каўтзам, вынікам стала выданне кнігі мінскага паэта Б. Адамовіча "Melodye" (1898). Сумесна з кракаўскім друкаром В. Л. Анчыцам і варшаўскім выдавецтвам Гебетнера і Вольфа былі выдадзены вершы таксама мінскага паэта Ю. Вяржбіцкага "O brzasku" (1898). Дарэчы, варшаўская фірма Гебетнера і Вольфа з 1890-х гг. выходзіць на першыя пазіцыі ў пастаўках польскай кнігі ў Расійскую імперыю (да 18 %), у тым ліку ў Вільню да Завадскіх і В. Макоўскага[523].

Пасрэдніцтва Вільні ў рэалізацыі мінска-варшаўскіх кнігавыдавецкіх праектаў яскрава адлюстравалася ў дзейнасці В. Макоўскага. Прафесійная працоўная практыка В. Макоўскага, якую ён прайшоў у Густава А. Гебетнера і Аўгуста Р. Вольфа[524], знаёмства з працай фірмы спрыялі развіццю не толькі яго кнігаган-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

518 *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 18–19.
519 Тамсама. С. 120.
520 Тамсама. С. 121.
521 Тамсама. С. 122.
522 *Życka L., Łęska M.* Działalność popowstaniowa polaków ziemi Mińskiej. S. 113.
523 *Lewandowski S.* Poligrafia Warszawska 1870–1914. Warszawa : Książka i Wiedza, 1982. S. 139–143.
524 Ibid. S. 111.

длёвай дзейнасці ў Вільні, а потым і ў Мінску, а і ўсталяванню стабільных кнігавыдавецкіх кантактаў з Варшавай і Кракавам. З 1901 г. у сумесныя польскія праекты В. Макоўскага ўключаецца і Мінск. Накладам мінска-віленскай кнігарні В. Макоўскага ў варшаўскіх друкарнях выходзяць: у М. Арцта – "Zarys dziejów Litewskich" Х. Паяты (К. Скірмунт) (1901), "Troki i Zamek Trocki" У. Загорскага (1902), у П. Ляскаўэра – "Godzina pogardy" (1906), "Z nad Wilii i Niemna" (1906). У 1907 г. мінска-віленская кнігарня В. Макоўскага засноўвае кнігавыдавецкую серыю "Wydawnictwo Groszowe" ("Капеечнае выданне"), у якой выйшла некалькі літаратурна-мастацкіх выданняў. Ажыццёўленыя сумесныя кнігавыдавецкія праекты садзейнічалі ў тым ліку ўмацаванню і пазіцыі кнігарні В. Макоўскага як ажыўленага цэнтра культурнага руху ў Мінску[525].

Афіцыйны дазвол друку на мясцовых мовах актывізаваў і польскамоўнае кнігавыданне ў Мінску: з 18 выд. у 1865–1904 гг. да 54 выд. у 1905–1917 гг. Большасць выданняў 1905–1917 гг. – гэта выданні па сумесных праектах (мінска-віленска-варшаўскіх). Найбольшы ўздым менавіта мінска-варшаўскіх кнігавыдавецкіх сувязяў адзначаны ў 1917 г., калі было створана "Towarzystwo Polskiej Wiedzy Wojskowej", якое са жніўня 1917 г. пачало сваю дзейнасць у Мінску[526]. Усяго да канца 1917 г. рэдакцыя пад кіраўніцтвам Генрыка Багіньскага выдала 40 нумароў "Biblioteki Wiadomości Wojskowych"– кнігі і брашуры культурна-асветнага зместу. Накладам Таварыства былі здзейснены яшчэ некалькі польскамоўных выданняў – "Książnica zołnierza polskiego im. Tadeusza Kosciuszki" і "Słownik wojskowy rosyjsko-polski i polsko-rosyjski".

Па ініцыятыве Польскай рады Мінскай зямлі ў горадзе было заснавана Таварыства падтрымкі польскага друку і чытання, а таксама з 1916 г. пачала працу Выдавецкая суполка польскіх кнігароў-выдаўцоў з уласнай друкарняй, якая ставіла мэтай сваёй дзейнасці выданне школьных падручнікаў[527].

Кнігавыдавецкія сувязі паміж Мінскам і Варшавай служылі падтрымцы і развіццю польскамоўнага культурнага асяроддзя ў Мінску, былі хаця і не асноўнымі ў распаўсюджванні польскай культуры, аднак таксама значна дапаўнялі гэты кірунак.

У 1905 г. пасля амаль 70-гадовай забароны яўрэйскага кнігадрукавання ў Мінску выдаюцца кнігі на яўрэйскай мове (ідыш). Забарона яўрэйскага кнігадрукавання ў XIX ст. не распаўсюдзілася на Вільню, а таксама на Варшаву, дзе прадаўжалі выдаваць яўрэйскія кнігі[528]. У Мінску кнігадрукаванне на яўрэйскай мове было ўзноўлена толькі пачынаючы з 1905 г. Як сведчаць архіўныя дакументы, шэраг мінскіх друкароў хадайнічалі аб дазволе набыць шрыфт і друкаваць на яўрэйскай мове (іўрыце, ідыш). У 1905–1917 гг. у Мінску, па нашых падліках, было выдадзена не менш як 50 кніг на ідыш і іўрыце. На пашырэнне і ўзмацненне яўрэйскага кнігадрукавання значна ўплывалі і ўзаемасувязі ў кнігавыданні. 1905–1906 гг. адзначаны сумеснымі мінска-варшаўскімі выда-

525 *W. D.* Przemysł i handel // Świat. Warszawa, 1909. N 31. S. 12.

526 *Bagiński H.* Z dziejów Towarzystwa Wiedzy… S. 416.

527 *Życka L., Łęska M.* Działalność popowstaniowa polaków ziemi Mińskiej. S. 182; *Makowski W.* Wspomnienia starego księgarza na tle 52-letnich osobistych przeżyć… Cz. 4. 1915–1920. S. 520.

528 Ibid.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вецкімі праектамі, удзельнікамі якіх сталі мінскае выдавецтва «Verlag “Kultur”» і варшаўская “Издательская Типография”.

У аснове мінска-варшаўскіх кнігавыдавецкіх сувязяў ляжалі нацыянальныя культурныя ініцыятывы: польскія, беларускія, яўрэйскія, кожная з якіх удзельнічала ў працэсе кнігавыдавецкіх узаемасувязяў, выпрацоўваючы свой тып стасункаў. Для польскамоўных мінска-варшаўскіх кнігавыдавецкіх узаемасувязяў характэрны тып “Мінск→Варшава→Мінск” (наклад і замова з Мінску) – гэта асноўны тып сувязі, які прасочваецца ў 1800–1864 гг., адзначаецца ў 1865–1905 гг. З 1905 г. па 1917 г. праяўляецца яшчэ адзін тып кнігавыдавецкіх узаемасувязяў – гэта “Варшава→Мінск” (падтрымка польскага кнігавыдання ў Мінску). Беларускамоўныя кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Варшавы выглядаюць як “Мінск→Варшава” (беларускамоўныя выданні падтрымліваліся з Мінска, друкаваліся ў Варшаве). Яўрэйскамоўныя мінска-варшаўскія выданні адносяцца да тыпу “Мінск→Варшава→Мінск”.

### *Пецярбург*

У складзе іншамоўнага насельніцтва Пецярбурга ў другой палове XIX – пачатку XX ст. беларусы “занялі і трывала ўтрымлівалі другое месца”[529]. У 1869 г. на 667,2 тыс. пецярбуржцаў было 3 тыс. беларусаў (0,4 %); у 1881 г. беларусаў у Пецярбурзе было 7 тыс. (0,8 %); у 1890 г. – 13 тыс. (1,4 %); у 1900 г. – 42 тыс. (2,9 %), а пад канец Першай сусветнай вайны – 70 тыс. (3,7 %)[530]. Наяўнасць значнай колькасці беларусаў у Пецярбурзе спрыяла развіццю і розных формаў культурнай і нацыянальна-асветнай дзейнасці. Сталіца Расійскай імперыі Пецярбург прыцягваў магчымасцю атрымаць вышэйшую адукацыю ва ўніверсітэце[531], а развіццю кнігадрукавання спрыялі цэнзурныя ільготы ў гэтай галіне. Найбольш інтэнсіўнае развіццё кнігавыдавецкіх сувязяў паміж Мінскам і Пецярбургам пачынаецца пасля 1864 г. Гэта быў час, калі ўрадавыя мерапрыемствы і загады пацвердзілі палітыку на русіфікацыю і забарону ўсяго польскага ў Паўночна-Заходнім краі. У красавіку 1865 г. пачаў дзейнічаць часовы цэнзурны статут. Так, у 1893 г. са 165 гарадоў Расійскай імперыі асноўная кніжная прадукцыя выдавалася ў Пецярбурзе (3698 кніг) і Маскве (2262), а тым часам у Варшаве было выдадзена 1055, Кіеве – 488, Вільні – 206[532], Мінску – 40 кніг. Кнігі на розных нацыянальных мовах было лягчэй і танней выдаць у Пецярбурзе ці Маскве яшчэ і таму, што там складваліся больш спрыяльныя ўмовы для развіцця паліграфічнай і кнігавыдавецкай базы. Калі мясцовы друк у Расійскай імперыі, у тым ліку і ў Мінску, стрымліваўся, то стрымаць развіццё грамадскай думкі было царскаму ўраду не пад сілу, а ў сталіцы яна канцэнтравалася як нідзе.

---

[529] *Зайцев В. Н., Мыльников А. С.* Слово к читателям // Белорусский сборник : статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. Санкт-Петербург : РНБ, 1998. Вып. 1. С. 3.

[530] Тамсама.

[531] *Нікалаеў М. В.*Беларускі Пецярбург. Санкт-Пецярбург : Агентство “ВиТ-принт”, 2009. 536 с. : іл.

[532] Справочная книга о печати всей России / сост. инспектор типографий и книжной торговли в С.-Петербурге Д. В. Вольденберг. Санкт-Петербург : Т-во художественной печати, 1911. Ч. 1–2. С. 239–240.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку 1870-х гг. ідэі народніцтва ахапілі Расійскую імперыю. Шырыўся народніцкі рух і ў Беларусі. У другой палове 1870-х гг. у Мінску ўтварыўся народніцкі гурток[533], і горад стаў адным з цэнтраў дзейнасці "Черного передела". У распаўсюджванні нелегальнай народніцкай літаратуры актыўны ўдзел бралі беларускія студэнты Пецярбургскага ўніверсітэта, якія арганізавалі ў 1881 г. свой гурток. Іх рускамоўныя пракламацыі (было выдадзена каля 10) і артыкулы ў часопісе "Гомон" былі прысвечаны тэме барацьбы з урадам за інтарэсы беларускага народа, за самастойнае існаванне Беларусі, змены яе грамадскага і эканамічнага ладу[534]. Пасля разгрому друкарні народнікаў у Пецярбурзе, яна была перанесена ў Мінск[535]. З дзейнасцю гуртка ў Пецярбурзе быў звязаны мінчук Лявонці Міхайлавіч Насовіч. Пры яго непасрэднай дапамозе і садзеянні ў Мінск быў перапраўлены друкарскі шрыфт для нелегальнай друкарні "Черного передела"[536].

У 1890-я гг. услед за нелегальным беларускім мінска-пецярбургскім друкам з'явіліся і легальныя выданні на беларускай мове. Іх аўтарам і выдаўцом быў Аляксандр Ельскі, які актыўна карэспандаваў у пецярбугскія перыядычныя выданні (у польскамоўныя часопісы "Kraj", "Chwila"). У Пецярбурзе без перашкод выйшлі яго творы на кірыліцы: у выдавецтвах "Типография Е. А. Евдокимова" – "Сынок!" (1895), "Выбіраймася ў прочкі! Скарэй у Томск!" (1896), "Типография Г. Бернштейна" – "Слова аб праклятай гарэлцы" (1900). Суб'ектыўна яны былі ацэнены ў свой час[537]. Аднак сам факт выхаду беларускамоўнай літаратуры сведчыў аб стане развіцця беларускай мовы, сцвярджаў неабходнасць кнігадрукавання на беларускай мове, паказваў шляхі сувязяў і падтрымкі нацыянальнага кнігадрукавання ў Пецярбурзе. Выданні А. Ельскага распаўсюджваліся ў мінскіх кнігарнях Я. Філіповіча-Дубовіка і Б. Адамовіча.

У выніку супрацоўніцтва Мінска і Пецярбурга легальна выйшлі такія беларускамоўныя выданні, як "Вязанка" (1903) мінскага паэта Янкі Лучыны (Івана Неслухоўскага, 1851–1897), які ў 1890 г. рабіў захады, каб наладзіць у Мінску выданне беларускай газеты. "Вязанка", якая стала першым выданнем зборніка вершаў паэта, была падрыхтавана і надрукавана "Кругам беларускім",[538] або "Гуртком беларускай народнай асветы" – студэнцкай культурна-асветнай арганізацыяй, якая ўзнікла ў Пецярбурзе ў 1902 г. і распачала выданне кніг на беларускай мове. Яе стваральнікамі сталі браты Іван і Антон Луцкевічы, якія прыехалі вучыцца ў Пецярбург з Мінска, дзе яшчэ ў канцы 1890-х гг. у Мінскай гімназіі па іх ініцыятыве таксама дзейнічаў асветны гурток. Мэтай гуртка было вывучэнне Беларусі і распрацоўка беларускага нацыянальнага пытання[539]. Гурток

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

533 *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 51.

534 Тамсама. С. 53–56.

535 Тамсама. С. 52.

536 История белорусской дооктябрьской литературы / редкол.: В. В. Борисенко [и др.]. Минск : Наука и техника, 1977. С. 350.

537 *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 108–109.

538 *Стары Пiлiп [Бурбіс А.].* Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху // Вестник народного комиссариата просвещения ССРБ. Минск, 1921. № 1, окт.. С. 6–5; *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 109–116.

539 Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. Мінск : Беларусь, 1994. Ч. 1 С. 355.

меў сваю бібліятэку. У Пецярбурзе браты Луцкевічы разам з Вацлавам Іваноўскім пачалі і выдавецкую дзейнасць[540]. Акрамя "Вязанкі", легальна, са згоды цэнзуры, выйшлі "Казкі" (у 1904 г.). Абодва выданні былі надрукаваны ў польскай пецярбургскай тыпаграфіі Казіміра Пянткоўскага. Яшчэ два выданні суполкі "Koladnaja Pisanka na 1904 hod" (1903) і "Велікодная пісанка" (1904) з'явіліся нелегальна, пры дапамозе гектографа. Усе аўтары і перакладчык выступалі пад псеўданімамі, фундатары выдання таксама не былі названы ўласнымі імёнамі. З чатырох беларускамоўных выданняў "Круга беларускага" тры былі надрукаваны кірыліцай і адно лацінкай. Як зазначыў С. Александровіч, пецярбургскі "Круг беларускі" стаў першым беларускім выдавецтвам[541].

Браты Луцкевічы, а таксама В. Іваноўскі, А. Пашкевіч, К. Каstravіцкі, А. Бурбіс, Ф. Умястоўскі былі стваральнікамі ў 1902–1903 гг. на аснове нацыянальна-культурных гурткоў беларускай моладзі Мінска, Вільні і Пецярбурга "Беларускай рэвалюцыйнай грамады"[542].

У 1906 г. пецярбургская выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша аконца" распачала сістэматычнае кнігадрукаванне на беларускай мове. Адным з яе арганізатараў стаў Вацлаў Іваноўскі, які адначасова браў удзел у стварэнні мінскага выдавецкага таварыства "Минчук" (1906). Пры садзеянні мінскага журналіста і сябра таварыства "Минчук" Уладзіміра Іванавіча Самойлы ў газеце "Северо-Западный край" (1905. 15 мая) былі ўпершыню надрукаваны вершы Янкі Купалы, таксама з мінскага таварыства ў Пецярбург быў перададзены зборнік "Жалейка", які рыхтавалі да друку ў Мінску ў 1907 г.[543] У сакавіку 1908 г. зборнік "Жалейка" быў выдадзены суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца" ў Пецярбурзе, стаўшы першай беларускай арыгінальнай, аўтарскай мастацкай кнігай выдавецтва[544]. Беларуская пецярбургская выдавецкая суполка актыўна прапагандавала кнігі на роднай мове. У Варшаве, Вільні, Мінску, Гродна, Гомелі, Віцебску і іншых гарадах былі арганізаваны і адкрыты контрагенцтвы выдавецтва[545]. З Пецярбурга актыўна перасылаліся кнігі, распаўсюджвалася інфармацыя пра выданні, што садзейнічала развіццю кніжнага гандлю. Таварыства "Минчук" праз свайго сябра Багдана Куштэляна займалася распаўсюджваннем выданняў пецярбургскай суполкі[546]. Выданні суполкі можна было набыць у мінскіх кнігарнях В. Макоўскага і Ё. Фрэнкеля (напрыклад, "Першае чытанне для дзетак беларусаў" Цёткі, 1906; "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" Я. Коласа, 1909).

Кніжныя сувязі Мінска як пэўнага лакальнага рэгіёна з іншымі лакальнымі рэгіёнамі (Вільняй, Варшавай, Пецярбургам) у пэўны гістарычны перыяд (1795–1917) у межах адной дзяржавы – Расійскай імперыі – пацвярджаюць, што

[540] *Уласаў А.* Дні жыцця / падрыхт. тэксту С. Александровіча // Шляхам гадоў : гіст.-літ. зб. Мінск : Мастац. літ., 1990. С. 145.

[541] *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 115.

[542] Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. Ч. 1. С. 355.

[543] *Александровіч С. Х.* Пуцявіны роднага слова… С. 115.

[544] *Ракіцкая Н.* Беларуская выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша аконца" // Свитязь : альманах библиофилов Белоруссии. Минск : Беларусь, 1989. С. 70.

[545] Тамсама. С. 73.

[546] БДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 39. Арк. 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кожны з гэтых рэгіёнаў выступае цэлым кангламератам гістарычна сфарміраваных шматнацыянальных культур, сярод якіх вылучаны руская, польская, беларуская і яўрэйская; кожны з'яўляўся як спажыўцом, так і вытворцам адпаведных прадуктаў кніжнай культуры; меў свае асаблівасці і дамінанты ў нацыянальнай кніжнай культуры; быў пад уплывам кнігавыдавецкай палітыкі Расійскай імперыі, якая адначасова не была аднолькавай для ўсіх рэгіёнаў.

Склад гарадскога насельніцтва Мінска выглядаў (па перапісе 1897 г.) так: 53,5 % – яўрэяў, 18 % – рускіх, 17 % – беларусаў, 6 % – палякаў[547]. Амаль тое ж можна сказаць і пра Вільню. Прысутнасць нацыянальнай дамінанты ёсць у такіх лакальных рэгіёнах, як Варшава – польская дамінанта; а таксама Пецярбург – руская. Менавіта паміж такімі лакальнымі рэгіёнамі, як Варшава і Пецярбург, дзе нацыянальныя культурныя дамінанты былі яўнымі, і магчыма прымяненне тыпалагічнага тэрміна "міжнацыянальныя", які вылучаны і абгрунтаваны Д. Эльяшэвічам[548]. Шматнацыянальныя кнігавыдавецкія плыні, якія развіваліся ў Мінску ў 1795–1917 гг., з пункту гледжання сённяшняга дня ў цэлым мы можам разглядаць як складнікі гісторыі беларускай кніжнай культуры, як яе спецыфіку. Правамернасць жа першаснага вылучэння менавіта міжрэгіянальных кнігавыдавецкіх сувязяў пацвярджаецца і даследаваннем кнігавыдавецкіх стасункаў паміж Мінскам–Вільняй–Варшавай–Пецярбургам. У сваю чаргу, у кнігавыдавецкіх сувязях паміж лакальнымі рэгіёнамі прасочваюцца і вылучаюцца менавіта нацыянальныя кнігавыдавецкія сувязі, звязаныя з пэўнымі нацыянальнымі групамі дадзеных рэгіёнаў, якія і выступаюць экспедыентамі кніжнай прадукцыі. Так, кнігавыдавецкія стасункі *паміж Мінскам і Вільняй* былі накіраваны: 1) на распаўсюджванне польскай кніжнай культуры; 2) на падтрымку і развіццё беларускай кніжнай культуры; стасункі *паміж Мінскам і Варшавай*: 1) на распаўсюджванне польскай кніжнай культуры; 2) на развіццё беларускай кніжнай культуры; 3) на падтрымку яўрэйскай кніжнай культуры; стасункі *паміж Мінскам і Пецярбургам*: 1) на падтрымку беларускай кніжнай культуры; 2) на распаўсюджванне і ўплыў рускай кніжнай культуры.

Разгледжаныя кнігавыдавецкія сувязі дазваляюць выдзеліць некалькі іх узроўняў, якія характарызуюць пэўны тып кнігавыдавецкіх сувязяў. Першы ўзровень – міжрэгіянальны[549]. Другі ўзровень, *культурны*, звязаны з рознымі тыпамі актыўнасці, накіраванасці і ўплыву пэўнага лакальнага рэгіёна, аб чым было адзначана вышэй. На трэцім, *камунікатыўным*, узроўні вылучаюцца наступныя тыпы кнігавыдавецкага супрацоўніцтва: аўтарска-выдавецкі, выдавецка-друкарскі, выдавецка-кнігагандлёвы. І нарэшце, чацвёрты, *колькасна-якасны*, узровень вызначаюць непасрэдна кніжныя выданні. Іх характарыстыкамі з'яўляюцца колькасная, моўная, функцыянальная, тэматыка-тыпалагічная, паліграфічна-афарміцельская, рэдакцыйна-выдавецкая. Такім чынам, разглядаючы міжрэгіянальныя кнігавыдавецкія сувязі, неабходна адзначыць, што на пэўных этапах праяўляецца розная культурная актыўнасць адпаведных лакальных рэ-

547 *Шыбека З.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя)… С. 169.

548 *Эльяшевич Д. А.* Теория и типология книжных связей : автореф. дис. … канд. филол. наук / Ленингр. гос. ин-т культуры. Ленинград, 1988. С. 10.

549 *Мыльников А. С.* Книга и национальная культура // Книга. Исследования и материалы. 1990. Сб. 61. С. 57–58.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гіёнаў, якая набывае і пэўную накіраванасць у бок аднаго з іх, падтрымліваючы пры гэтым узаемасувязі на камунікатыўным і якасным узроўнях (гл. Дадат. 3).

### Кніжны гандаль у Мінску

Галоўным каналам распаўсюджвання кніг у Мінску ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. былі кантрактавыя кірмашы, якія праходзілі ў горадзе два разы на год: увесну, у сакавіку, і на дзесяты дзень пасля Вялікадня (дзесятуху) – да 1830 г., а пазней адзін кірмаш – з 25 мая па 25 чэрвеня[550]. Мінск і Навагрудак, паводле звестак з перыядычнага друку канца XVIII ст.[551], з'яўляліся тымі месцамі, дзе адбываліся слыннейшыя літоўскія кантракты, у тым ліку кніжныя. Да такіх кірмашоў выпускаліся і спецыяльныя кнігагандлёвыя каталогі[552], якія і сёння сведчаць аб тым, што кнігі на польскай, лацінскай, французскай, нямецкай мовах мелі сталае распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі. Кнігагандлёва-выдавецкія каталогі XVIII ст. (захаваныя і вядомыя), якія былі прызначаны для Беларусі, складаюць 32 % ад агульнай колькасці гарадоў Рэчы Паспалітай. Гэта Гродна, Мінск, Нясвіж, Навагрудак, Супрасль, Свіслач, Вільня, Заслаўе, Зэльва – усяго 9 населеных пунктаў і адпаведна – 19 каталогаў, што дазваляе пацвердзіць факт даволі актыўных кніжных сувязяў, а таксама паказвае і адпаведны ўзровень кніжнай культуры, высвятляе шляхі камплектавання кнігазбораў Беларусі[553].

Яскравым прыкладам служыць дзейнасць у гэтым кірунку вядомага варшаўскага кнігагандляра і выдаўца Міхала Гроля (1722–1798)[554], друкаваныя

---

550 Гісторыя Мінска / пад рэд. чл.-кар. НАН Беларусі У. А. Бабкова. С. 201.

551 Dziennik Handlowy. 1787. Roku Drugiego. Cz. I–III. T. 1. S. 38; гл.таксама: *Karwowska M.* Filie i składy księgarskie Michała Grölla poza Warszawą, 1764–1796 : praca magisterska napisana pod kierunkirm prof. d-ra hab. Józefa Szczepańca / Un-t Wrocławski, Wydzial Filologiczny ; In-t Bibliotekoznawstwa i Informacji Naukowej. Wrocław, 1992. S. 67.

552 У межах Рэчы Паспалітай першыя кнігагандлёвыя каталогі пачынаюць друкавацца ў Гданьску ў другой палове XVII ст. (першы – 1672 г.), у Варшаве – з 1730 г. На XVIII ст. прыпадае самая вялікая колькасць выяўленых друкаваных каталогаў.

553 *Доўнар Л. І.* Чытаючы бібліяграфічныя крыніцы па гісторыі кніжных сувязяў і кнігазбораў Беларусі XVIII – пачатку XX ст. // Материалы Международного конгресса «Национальная библиотека как феномен культуры», приуроченного к 90-летию Национальной библиотеки Беларуси (Минск, 5–7 сент. 2012 г.) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси ; сост. А. А. Суша. Электронные текстовые, графические данные и программы (19,5 Мб). Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2012. 1 электронный оптический диск (CD-ROM). ISBN 978-985-6879-84-8 (VIII Международные книговедческие чтения «Исторические книжные коллекции во времени и пространстве»).

554 Нямецкі друкар, кнігар, выдавец. Вучыўся ў Ляйпцыгу. Пачаў сваю працу кнігара ў Дрэздэне. Завязаўшы кантакты з польскім кнігагандлёва-выдавецкім рынкам, з сярэдзіны 1759 г. працуе таксама і ў Варшаве. З 1762 г. выдае першую ў Польшчы газету аб'яў. Акрамя Варшавы, меў філіі кнігарні ў Львове, Магілёве, Камянцы-Падольскім. Высылаў вялікія партыі кніг на кантрактавыя кірмашы "do miasteczek kresowych", прадстаўляў польскія кнігі ў Ляйпцыгу, утрымліваў кантакты з буйнейшымі кніжнымі фірмамі Парыжа, Амстэрдама, Берліна, Вроцлава. Аднымі з галоўных контрагентаў яго кнігарні былі таксама віленскія фірмы. У працы выкарыстоўваў новыя ў Польшчы формы гандлю і рэкламы: аўкцыйныя, сталыя каталожныя цэны, выдавецкія і кнігарскія рэцэнзіі. З 1778 г. у Варшаве пачала дзейнічаць і друкарня М. Гроля, якая пераўтварылася ў адну з лепшых на той час польскіх друкарняў. Выпускаў ён кнігі і для Адукацыйнай камісіі. Гл., напры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталогі якога пацвярджаюць[555], што асартымент кніжнай прадукцыі для сталіцы (Варшавы) і для правінцыі нічым не адрозніваўся. Паводле газетных абвестак і каталогаў, прызначаных і для жыхароў Мінска[556], можна выказаць меркаванне, што М. Гроль мог пабываць на кантрактах у горадзе ў 1786–1790 гг. і 1795–1796 гг.[557] Аб продажах кніг і дзе яны маюць адбыцца, ён паведамляў, напрыклад, у "Gazecie Warszawskiej" за 1786 г. (nr. 16, 22. II): "Donosi się kochających się w literaturze i uczonych wiadomości, że skład Gröllowski różnego gatunku książek znajdować się będzie w Mińsku i Nowogródku podczas kontraktów tego roku odprawiać się mających"[558].

Акрамя ўласных друкаў, М. Гроль меў на складзе кнігарні ў Мінску выданні, якія выйшлі і ў іншых друкарнях Варшавы, Вільні, Вроцлава, Дрэздэна, Кракава, Любліна, Торуні і г. д., што пацвярджаецца зместам друкаваных кнігагандлёвых каталогаў. У некаторых з іх змешчана і інфармацыя, у якой М. Гролем давалася тлумачаэнне тых ці іншых коштаў кніг, уласнага перамяшчэння з кнігамі да вызначаных кантрактавых месцаў: "Poniewaz cena książek moich jest stosowna do kursu pieniędzy w Warszawie będącego, to jest dukat po zł. polskich 18, nowy rubel po zł. 6, a stary po zł. 7, co i drobnej monecie zarówno jest przyjęte, przeto czuję się być obowiązanym donieść prześwietnej publiczności, że książki moje inaczej nie będą przedawane jak tylko tej ceny. Każdy przyzna umiarkowanie tej ceny, kiedy zważy, iż ja nie rachuję ekspensy podjętych w mojej podroży, które nie są małe. Zaczym nikt mię nie może przekonać, abym co do ceny położonej mógł ustąpić"[559].

Большасць выданняў, паводле каталогаў М. Гроля, датаваных другой паловай XVIII ст., было на польскай мове, напрыклад: "Biblia sacra latino-polonica vulgate…" (Вроцлаў, 1771), "Akt unii kościołów protestanckich" (Дрэздэн, 1791), "Historia narodu polskiego" А. Нарушэвіча (Варшава, 1784–1786. Т. 5–8), творы М. Т. Цыцэрона "O piwinnościach wszechstanów ludzi" ў перакладзе С. Кашуцкага (Вільня, 1766), "Gramatyka francuska krótko zebrana" (Вільня, 1784), "Księgi o stateczności" ў перакладзе Б. Буднага (Вільня, 1766), "Historia Indii Wschodnich" Т. Падлескага (Вільня, 1775), "Bajki" Ф. Д. Князьніна (Варшава, 1776), "Dobra

клад: *Staniszewski Z.* Gröll Michał // Słownik pracowników książki polskiej. Warszawa ; Łódź : PWN, 1972. S. 296–297.

555 *Rudnicka J.* Bibliografia katalogów księgarskich wydanych w Polsce do końca wieku XVIII. Warszawa, 1975. 298, [9] s. (Prace Instytutu Bibliograficznego BN ; nr 9).

556 Kalalog niektorych książek polskich znayduiących się wraz z niektoremi łacińskiemi, niemieckiemi, francuzkiemi [etc.] u Michała Grölla księgarza nadwor[nego] J. K. Mci. w Warszawie, Dubnie, Mińsku, Nowogrodku podczas kontraktów; w Zelwie y Swisłoczy podczas jarmarków, w Poznaniu, Łucku, Lublinie, Grodnie, w składach tegoż. Warszawa : Druk. M. Grölla, 1790. S. [1–3] 4–96; Kalalog niektorych książek polskich, łacińskich, niemieckich, y francuzkich [etc.] znayduiących się u Michała Grölla księgarza nadwornego J. K. Mci. w Warszawie i w Zelwie podczas jarmarku, w Zasławiu, Mińsku, i Nowogrodku podczas kontraktów. Warszawa : Druk. M. Grölla, 1796. S. [1–3] 4–82; Suplement do katalogu książek znayduiących się podczas kontraktów roku 1790 w Mińsku i Nowogrodku w Księgarni Michała Grölla. Warszawa : Druk. M. Grölla, 1790. S. 12 nlb.; Suplement II do katalogu książek Michała Grölla znayduiących się w Dubnie, Mińsku i Nowogródku podczas kontraktów… Warszawa : Druk. M. Grölla, 1795.

557 *Karwowska M.* Filie i składy księgarskie Michała Grölla… S. 68.

558 Ibid.

559 Ibid. Гл. таксама: Suplement II do katalogu książek Michała Grölla znayduiących się w Dubnie, Mińsku i Nowogródku podczas kontraktow. Адв. тыт. арк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

gospodyni" (Кракаў, 1784), "Budowanie wiejskie" П. Світкоўскага (Варшава, 1793) і інш. Паводле каталогаў можна было зрабіць і замовы на тыя кнігі, якія знаходзіліся яшчэ ў друку, як "Bajki wybrane Ezopa Frygijczyka z naukami moralnemi i wierszykami tudzież najpiękniejsze bajeczki Fedra i Filelfa, po polsku, francusku i po niemiecku" (Варшава, "w druku")[560].

Такім чынам, у Мінску стварaўся часовы склад-кнігарня, дзе можна было набыць самыя разнастайныя творы: навуковыя, вучэбныя, для самаадукацыі і вольнага часу; па гісторыі, рэлігіі, арыфметыцы, геаграфіі, граматыцы, мастацкай літаратуры, – перакладныя і арыгінальныя, прызначаныя для дарослых і дзяцей.

Мясцовым калекцыянерам кніг, напэўна, былі вядомыя каталогі друкарні Віленскай акадэміі, дзе змяшчаліся таксама не толькі ўласныя выданні, але і дастаўленыя з замежных друкарняў, "osobliwie krajowych"[561]; каталогі друкарні віленскіх піяраў, якія ўказвалі цану кожнай кнігі без пераплёту "dla wygody kupujących" у іх кнігарні[562]; "Рэестры" Супрасльскай базыльянскай друкарні, у якіх адзначаліся кнігі для чытання[563].

З дзвюма віленскімі друкарнямі – Віленскай акадэміі і піяраў, якія мелі свае кнігарні, падтрымліваў у 1780–1790-я гг. цесныя кантакты і М. Гроль, што занатавана як у каталогах, так і ў публікацыях віленскай і варшаўскай прэсы: "Gazetach Wileńskich", "Gazecie Warszawskiej"[564]. Супрацоўніцтва паміж кнігарнямі М. Гроля і Віленскай акадэміі (кнігарня акадэміі была заснавана яшчэ ў 1681 г.) адбывалася "na zasadzie komisu bądź wymiany księgarskiej"[565]. Таксама ў Вільні варшаўскі кнігагандляр распаўсюджваў сваю прадукцыю і праз прыватныя кнігарні Ігнацыя Бушкевіча і Стажыньскага[566], куды ў выпадку неабходнасці маглі звяртацца і аматары кніг з Мінска. Пра свае выдавецкія і кнігагандлёвыя навіны для жыхароў Літвы і Беларусі М. Гроль часта паведамляў у "Gazetach Wileńskich", напрыклад: "Księgarnia Gröllowska Warszawska uwiadamia Prześwietnie Publicum, iż na następujących kontraktach w Mińsku i Nowogródku znajdować się będą następujące nowo wyszle książki i pisma", сярод якіх "Uwagi obywatela w teraźniejszych okolicznościoch Polski", "Katechizm o tajemnicach rządu polskiego", "O niebiezpieczeństwie wagi politycznej"[567].

Можна дапусціць, што М. Гроль меў пэўныя зносіны і з мінскімі кнігагандлярамі, адным з якіх мог быць, як падказвае мінскае базыльянскае выданне 1790 г., пан Гілевіч: "…Kwestya: Czyli dusza bardziey bywa wzruszona przez roskosz, czyli też przez smutek i inne dzieła tegoż Authora w krótce wyidą z Druku; i będą przedawane w sklepie Jm: Pana Gilewicza za cenę mierną". Такім чынам, маем мы і першае сведчанне аб існаванні ў Мінску ўжо ў канцы XVIII ст. стацыя-

560 *Karwowska M.* Filie i składy księgarskie Michała Grölla… S. 69.
561 *Rudnicka J.* Bibliografia katalogów księgarskich… S. 36–38, nr 5–9, 11.
562 Ibid. S. 241, nr 796.
563 Ibid. S. 41, nr 19.
564 Ibid. S. 78.
565 Ibid. S. 80.
566 Gazeta Warszawska. 1780. N 20. 8. III.
567 Gazety Wileńskie. 1789. N 10. 6. III; 1790. N 12. 20. III.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарнага кніжнага гандлю, і прозвішча аднаго з ранніх мінскіх кнігагандляроў – Гілевіч (?).

Тым не менш на працягу першай паловы XIX ст. важнейшым кнігагандлёвым кірункам для мінчукоў заставалася Вільня. Мінск штогод прымаў віленскіх кнігандляроў, якія "на кантрактныя ярмаркі… прывозілі польскія, рускія, нямецкія, французскія кнігі"[568].

Дзякуючы Юзафу Завадскаму (1781–1838)[569], віленскаму кнігавыдаўцу і кнігагандляру, да 1810 г. у розных гарадах Віленскай навучальнай акругі (Брэсце, Віцебску, Гродне, Мінску, Нясвіжы і інш.) была разгорнута шырокая кнігагандлёвая сетка, хоць і з невялікімі кніжнымі складамі[570]. Менавіта ў такіх "пунктах кнігараспаўсюджвання" прымаліся таксама тэксты для друку ў Вільні. Ю. Завадскі правёў і рэарганізацыю ў кіраванні кніжнай лаўкай Віленскага ўніверсітэта, адкрыў прыватную "бібліятэку-пазычальню", займаўся праектаваннем удасканалення прафесійнай кніжнай справы ў Каралеўстве Польскім, асаблівую ўвагу звяртаў на павелічэнне колькасці кнігарняў у правінцыі, выступаў за арганізацыю кніжных кірмашоў[571].

Актыўная і ўдалая прадпрымальніцкая дзейнасць, распачатая Юзафам Завадскім, паспяхова развівалася і спрыяла росту тэмпаў распаўсюджання кнігавыдання і кніжнага гандлю на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Сямейную справу прадаўжалі і сыны Ю. Завадскага: Восіп, Адам і Фелікс[572], выкарыстоўваючы ў назве фірмы імя бацькі (да 1940 г.). Завадскія мелі свае камісіянерства ў Варшаве ў Глюксберга, у Ляйпцыгу – у Германа Шульцэ і А. Бракгаўза[573]. Вядучая роля ў арганізацыі кніжнага гандлю і выдавецкай справы належала Адаму Завадскаму, які працягваў забяспечваць літаратурай жыхароў беларускіх губерняў, у тым ліку Мінска, задавальняючы адпаведныя замовы шляхам рассылкі выданняў праз пошту[574].

"Выписка из дела о книгопродавцах Завадских", змешчаная І. Карнілавым у выданні "Русское дело в Северо-Западном крае", сведчыць аб пільнай увазе царскай адміністрацыі да "шкоднай дзейнасці" Завадскіх, якая заключалася ў іх "вялікім уплыве на распаўсюджанне польскай і лацінскай культур у краі". Пасля аднаго з вобыскаў на фірме было рэквізавана ліставанне А. Завадскага, у якім утрымліваліся звесткі аб замовах на польскія выданні "решительно со

---

[568] Гісторыя Мінска / пад рэд. чл.-кар. НАН Беларусі У. А. Бабкова. С. 256.

[569] Юзаф Завадскі нарадзіўся ў 1781 г. у Польшчы. Вучыўся ў піяраў у Рыдзыне і Калішы. Набываў практычны вопыт па друкарскай справе ў Вроцлаве (друкарня Корна), Познані (друкарня Кюна), Ляйпцыгу (фірма Breitkopf und Hartel). У ліпені 1803 г. Ю. Завадскі ўладкаваўся падмайстрам у кнігарні Яна Бэйца ў Вільні. У 1804 г. ён заснаваў уласную друкарню, а праз год, 28 жніўня, быў прызначаны тыпографам Віленскага імператарскага ўніверсітэта. З ім на ільготных умовах быў заключаны кантракт на валоданне друкарняй тэрмінам на 10 гадоў (*Янушкевіч Я.* Выдаўцы Завадскія // Роднае слова. 2006. № 8. С. 123).

[570] *Умецкая Е. С.* Из истории распространения книги в Белоруссии в начале XIX в. (1801 – 1832 гг.) // Вопросы библиографоведения и библиотековедения. Минск, 1980. С. 55.

[571] Дадаткова гл., напрыклад: *Poklewska D.* Zawadzki // Słownik pracowników książki polskiej. Warszawa ; Łódź : PWN, 1972. S. 1010–1014.

[572] *Корнилов И.* Русское дело в Северо-Западном крае… С. 368.

[573] Тамсама. С. 369.

[574] LVIA. F. 1135. Ap. 7. B. 160. P. 1–4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

всех точек России: Казань, Пенза, Минск, Витебск, Могилев, Гродно… Все эти и множество уездных, заштатных городов, местечек и имений прислали в 1862 г. 625 требований на 7 слишком тысяч названий. Сверх того, один склад Завадских в Ворнянах с конца 1859 г. по март 1863 г. вытребовал до 8000 жмудских и польских молитвенников разных наименований и книг польско-исторических, польско-народных… и множество книг безусловно запрещенных или позволенных с исключением"[575].

Кнігарні Завадскіх, Альберта Сыркіна, асабліва ў 1830 – на пачатку 1860-х гг., былі асноўнымі цэнтрамі па распаўсюджванні адпаведна польскамоўнай і рускамоўнай літаратуры ў Вільні, а іх уладальнікі таксама з'яўляліся двума віленскімі кнігарамі, якія сістэматычна прыязджалі ў Мінск на кантрактавыя кірмашы і стала падтрымлівалі кнігавыдавецка-кнігагандлёвыя сувязі з Мінскам. Пра гэта сведчыць і ліставанне з Завадскімі, напрыклад, кнігавыдаўца і кнігара А. Валіцкага, кнігара С. Рыўкіна[576]. Акрамя таго, у 1896 г. мінскі губернатар выдае на імя віленскага шляхціца (двараніна) Фелікса Завадскага дазвол на ўтрыманне ў губернскім горадзе Мінску кнігарні і продажы кніг на рускай і замежных мовах (Пасведчанне № 52 ад 14 чэрвеня 1896 г.)[577].

На пачатку XIX ст. у Мінску атрымліваюць далейшае развіццё стацыянарныя кнігарні, як, да прыкладу, прыватная кнігарня Антонія Мушыньскага, аб чым сведчыць надрукаваны ў 1805 г. "Katalog Xiąg znaydujących się w Mińsku w Xięgarni Antoniego Muszyńskiego"[578]. У 1811 г., як паведамляў мінскі грамадзянскі губернатар Г. І. Родзінг, "книгопродавцев находится в городе Минске три: мещанин Адам Макаревич, второй – мещанин Фелициан Калиновский, третий – шляхтич Тадеуш Бильмин, которые имеют по одной лавке для продажи книг"[579].

Праўда, у першай палове XIX ст. яшчэ заўважаецца і сумяшчэнне стацыянарнага кніжнага гандлю і рухомага. Пра існаванне "вандроўнай па ваколіцах кнігарні Бейліных" вядома з цэнзурных дакументаў (за 1833 г.), калі ў кнігароў былі знойдзены забароненыя ўладай кнігі на польскай і французскай мовах[580]. Першымі ўладальнікамі кніжнай лаўкі былі Ілля (Эльля) Мордухавіч Бейлін і яго сын Сымон (Шымон, Сімха), якія нават не валодалі "ўзаконенай граматай", а толькі яўрэйскай. З другой паловы 1850-х гг. Гірш Бейлін і Сымон Бейлін[581] – браты Бейліны, якім належала прыватная кнігарня ў Мінску – далучаюцца і да кнігавыдавецкіх праектаў. Менавіта дзякуючы кніжнаму гандлю (а ў мінскай кнігарні Бейліных налічвалася да 5 тыс. тамоў найноўшых твораў сучасных пісьменнікаў) Бейліны мелі цесныя выдавецкія сувязі з варшаўскімі (І. Унграм, С. Оргельбрандам), віленскімі (А. Сыркіным), мінскімі (Ё. Дворцам) кнігарамі

575 *Корнилов И.* Русское дело в Северо-Западном крае… С. 368.

576 LVIA. F. 1135. Ap. 7. B. 481. P. 3–21; B. 439. P. 199–211.

577 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6251. Арк. 57–58.

578 Katalog Xiąg znaydujących się w Mińsku w Xięgarni Antoniego Muszyńskiego. Sporządzony w roku 1805. [Mińsk, 1805]. 36 s. Гл.: Bibliografia Polska Karola Estreichera / Un-t Jagieloński. Wyd. drugie. Kraków : Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1991. T. XV: Katalogi. S. 177.

579 ГАРФ. Ф. 1165. Д. 245. Л. 3, 45.

580 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 193. Арк. 12–13.

581 История белорусской дооктябрьской литературы. С. 320.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і друкарамі, падтрымлівалі мясцовых аўтараў, а значыць, фінансавалі іх выданні, сярод якіх творы В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Плуга, У. Сыракомлі, М. Шышкі. Бейліны спрабавалі дбаць адначасова як пра камерцыйныя інтарэсы, выпускаючы менавіта мастацкую літаратуру, так і пра асветныя, выдзяляючы гэтыя кнігі "do czytania za pomierną cenę", што высока цанілі і ставілі кнігарню Бейліных на першую ступень у горадзе[582]. Гірш Бейлін таксама браў удзел у спатканнях мясцовай інтэлігенцыі, якія арганізоўваў Аляксандр Валіцкі.

Яшчэ і ў 70 – 80-я гг. XIX ст. адзначаецца дзейнасць у Мінску кнігарні Бейліных, Ёселя і Мордуха Сімхавічаў, відавочна ўжо сыноў Сымона (Шымона-Сімхі)[583]. Як сведчаць польскія крыніцы, у гэты час і Гірш Бейлін пасрэднічаў дзякуючы сваім шырокім сувязям продажу букіністычнай кнігі, кніжных калекцый. Да прыкладу, пінскага кнігазбору Антонія Машыньскага, які быў сабраны ў выніку касацыі піярскіх кляштараў на тэрыторыі Беларусі, Літвы і прадстаўляў больш за 4 тыс. друкаў і рукапісаў XVI–XVIII стст. (частка трапіла да кракаўскага калекцыянера Адама Валяньскага)[584]. У 1882 г. Гірш Бейлін[585] памірае, а ў канцы 1887 г. апошняя ўладальніца кнігарні Рыўка Іцкава Бейліна прадае яе купцу 2-й гільдыі Арону Ельеву Левіну. Паводле пасведчання ад 2 снежня 1887 г. апошняму дазваляўся гандаль рускімі і замежнымі кнігамі, акрамя польскіх[586].

Каля 1836 г. была закладзена стараннем былога "naczelnika gubernji księcia Dawidowa" губернская кнігарня, стан якой, аднак, быў не з лепшых у горадзе[587]. З канца 1840-х гг. існавала ў горадзе кнігарня Сроля Мордухавіча Рыўкіна, кніжныя запасы ў якой на 1860 г. складалі, як паведамляе "Kurier Wileński", каля 1000 тамоў[588].

Скупыя звесткі аб першых кніжных лаўках у Мінску дапаўняюцца некаторымі ўспамінамі, якія пакінулі, да прыкладу, Тадэвуш Корзан, Зоф'я Кавалеўская, засведчыўшы пра ўласны вопыт набыцця кніг у горадзе.

У сваіх успамінах пра Мінск першай паловы XIX ст. Т. Корзан значную ўвагу прысвяціў менавіта характарыстыцы навучання ў дзяржаўнай гімназіі, дзе неабходныя і дадатковыя веды гімназісты атрымлівалі living рознымі спосабамі, а асноўным сродкам былі кнігі, набытыя за плату ў прыватных бібліятэках ці кнігарнях. Нягледзячы на існаванне бібліятэкі ў самой гімназіі, яна, аднак, аўтарам не называецца, узгадваецца толькі публічная бібліятэка: "Istniała biblioteka rządowa, ale z książkami wyłącznie rosyjskiemi. Miałem z niej kronikę Nestora w wydaniu prastarem Schlözera, a w tłómaczeniu Jazykowa: ani korzyści, ani przyjemności z niej nie wyciągnąłem"[589].

Ужо на той час, у 1850-я гг., мінскія гімназісты, каб знаёміцца з тагачасным польскім літаратурным рухам, вымушаны былі таемна стварыць гуртоk

[582] Mińsk z nad Swisłoczy / Antoni z Pohosta // Kurier Wileński. Wilna, 1860. N 71. S. 761.

[583] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3396. Арк. 146; Спр. 2810. Арк. 34.

[584] *Krynicka M.* Moszyński Tomasz // Słownik pracowników książki polskiej… S. 608; *Krynicka M., Schmager G.* Wolański Adam // Ibid. S. 976.

[585] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 88.

[586] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 4308.

[587] Mińsk z nad Swisłoczy / Antoni z Pohosta // Kurier Wileński. Wilna, 1860. N 71. S. 761.

[588] Ibid.

[589] *Korzon T.* Mińsk w połowie XIX wieku… S. 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для чытання польскіх кніг. Гэтаму спрыялі прыватныя бібліятэкі і кнігарні, аднак іх паслугі былі платнымі. Так, атрыманне на месяц кніг з чытальні, закладзенай Фларыянам Чапяліньскім, каштавала пару злотых, якія гаспадар траціў для набыцця новых кніг; падобныя паслугі аказвалі і "żydzi księgarze z placu Katedralnego"[590]. Аднак чытанне польскіх кніг, прынесеных да гімназіі, жорстка праследавалася адміністрацыяй, цягнучы за сабой канфіскацыю выданняў, якіх у кабінеце тагачаснага дырэктара гімназіі Міхаіла Дзясніцкага, як сведчыць Т. Корзан, былі цэлыя стосы[591].

Акрамя кніг на польскай мове, гімназісты цікавіліся французскай літаратурай і мелі магчымасць карыстацца уласнай бібліятэкай выкладчыка гімназіі, якім быў "professor języka francuskiego Borzymowski". У асноўным навучэнцы знаёміліся з парыжскімі альбо брусельскімі выданнямі, ілюстраванымі дрэварытамі. Т. Корзан узгадвае, да прыкладу, адзін з твораў Вальтэра Скота. На чале з Ігнатам Легатовічам, былым прэфектам школ Лепельскага павета, які меў "znak nieskazitelnej służby za lat 25, emerytura, ociemniałego, ale przechowującego w pamięci lepszą tradycyę pedagogiczną", дадаткова займаліся гурткоўцы не толькі французскай літаратурай і мовай, а таксама лацінскай. Магчыма, гімназісты маглі бачыць і знакаміты кнігазбор І. Легатовіча. Сам жа аўтар з удзячнасцю ўспамінае, як ахвотна пазычаў яму кнігі з уласнай нямецкай бібліятэкі лютэранскі пастар Вільямс[592]. Так, праз узаемаабмен кнігамі, радзей – іх куплю, мінская моладзь далучалася да новых павеваў у кніжным свеце, культурным жыцці еўрапейскага грамадства. Знаходзячыся пад уражаннем асабліва папулярных у той час твораў таленавітага земляка з Міншчыны Уладзіслава Сыракомлі, ён таксама паспрабаваў свае сілы ў рыфмаванні, напісаўшы цэлы сшытак вершаў, аднёс іх у спадзяванні (праўда, марным) быць надрукаваным да віленскай кнігарні Завадскага, прадстаўнікі якой прыехалі ў Мінск на маёвы кантрактавы кірмаш[593].

У другой палове XIX ст., калі кірмашовы гандаль ўсё ж саступае пазіцыі стацыянарнаму, як паведамляе З. Шыбека, агульная "колькасць крам ў горадзе вырасла ў 1800–1861 гг. са 124 да 594"[594]. У той час "мінчане чыталі пераважна польскія або яўрэйскія кнігі. Набыць іх не было праблем. У горадзе існаваў шэраг прыватных бібліятэк і кнігарняў. Прадаваліся рускія, польскія, яўрэйскія і замежныя кнігі"[595]. Адным з галоўных распаўсюджвальнікаў і пастаўшчыкоў кніг на цэлы Мінск, паводле некаторых успамінаў, быў у той час "Żyd Charkin"[596], які забяспечваў горад творамі, напрыклад, Зыгмунта Качкоўскага, Юзафа Кажанёўскага, Юзафа Крашэўскага, Элізы Ажэшкі.

Распаўсюджваннем адпаведнай і дазволенай Міністэрствам народнай асветы вучэбнай літаратуры займаліся і навучальныя ўстановы горада. Да прыкладу, пры Мінскай гімназіі і Яўрэйскім вучылішчы 1-га разрада былі створаны

---

590 Ibid. S. 19.
591 Ibid.
592 Ibid. S. 17.
593 Ibid. S. 19.
594 Гісторыя Мінска / пад рэд. чл.-кар. НАН Беларусі У. А. Бабкова. С. 202.
595 Тамсама. С. 257.
596 *Lednicki W.* Pamiętniki. Londyn : B. Świderski, 1963. S. 260–261.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльныя кнігарні, загадванне якімі даручалася ў першым выпадку – настаўніку, калежскаму саветніку Іванову, у другім – "смотрителю" вучылішча Кацану[597]. Калі асноўнымі ў асартыменце (на 1869 г.) кнігарні Мінскай гімназіі былі выданні на рускай мове, то ў кнігарню пры Яўрэйскім вучылішчы паступалі падручнікі і на яўрэйскай мове.

У 1859–1863 гг. у Мінску асабліва вылучалася, закладзеная з размахам, кнігарня *Аляксандра Валіцкага* (1826–1893), удзельніка грамадскага і культурнага руху на Беларусі, літаратара, музычнага крытыка, спевака, публіцыста, выдаўца, бібліятэкара і архівіста[598]. Кнігарня А. Валіцкага была "najnowszą i najwykwintniej może urządzoną w Mińsku … założona w zeszłym roku w pięknym lokalu obywatela Korkozowicza, na rogu Wołoskiej ul. Zakład ten wystąpił z wielkimi nadziejami, a może i pretensjami na przyszlość – wszystko tu nazewnątrz i wewnątrz tchnie przemysłowoscią, aż do czytelni nawet kilku gazet za opłatą miesięczną"[599].

Зоф'я Кавалеўская напісала, што кнігарня не толькі распаўсюджвала кнігі ў грамадстве, але і "budziła zamiłowanie w czytelnictwie"[600].

Разам з кніжным гандлем А. Валіцкі займаўся продажам музычных нот, матэрыялаў для пісьма і малявання, прымаў замовы "na wszelkie druki i litografje w Mińsku"[601], выдаваў за свой кошт ноты і вучэбныя выданні. Супрацоўнічаў з варшаўскімі і віленскімі перыядычнымі выданнямі, як "Ruch Muzyczny", "Kurier Wileński", падтрымліваў сувязі з В. Дунінам-Марцінкевічам, А. Плугам, А. Кіркорам, У. Сыракомлем, Д. Стафановічам, С. Манюшкам, Ф. Міладоўскім, Ю. Сікорскім і інш., збіраў забароненыя творы У. Сыракомлі з намерам іх выдання. Па меркаванні Я. Карскага і Р. Зямкевіча, А. Валіцкі пісаў на беларускай мове пад псеўданімам Місцюк ці Міншчук, а яго мінская кнігарня была месцам спаткання прагрэсіўнай творчай інтэлігенцыі[602]. Пад час паўстання А. Валіцкі быў арыштаваны і 14 лютага 1863 г. высланы ў Тамбоў. У 1867 г. вярнуўся, але не ў Мінск – жыў і працаваў у Варшаве, Кракаве, Нясвіжы, падтрымліваючы кантакты, у значнай ступені кніжныя, з роднымі ў Мінску.

Пераняла кнігарню (у лютым 1863 г.) сястра А. Валіцкага *Зоф'я Савіцкая*. І яшчэ на 30 гадоў працягнула яе дзейнасць. Паміж братам і сястрой захоўваліся цесныя сувязі, у тым ліку дзелавыя, пра што і сведчыць іх ліставанне[603]. У лістах адлюстроўваюцца разнастайныя кніжныя кантакты: кнігагандлёвыя і кнігавыдавецкія, літаратурныя і асветніцкія, якія неабходны былі для існавання кнігарні, для інтэлектуальнай жыццядзейнасці як яе уладальнікаў, так і наведвальнікаў. Падрабязныя справаздачы З. Савіцкай аб сваёй кніжнай дзейнасці наводзяць на думку, што А. Валіцкі фактычна прадаўжаў заставацца ўладальнікам мінскай кнігарні і надалей (да 1893 г.), а ў пасведчаннях на кнігагандлёвую

---

597 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1983. Арк. 2.

598 *Кісялёў Г. В.* Валіцкі Аляксандр // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1994. Т. 2. С. 208.

599 Mińsk z nad Swisłoczy / Antoni z Pohosta // Kurier Wileński. Wilna, 1860. N 71. S. 761.

600 *Kowalewska Z.* Obrazki Mińskie… S. 84.

601 AGAD. III. Archiwum Przezdzieckich. B–1430. Aleksander Walicki do niewiadomego. 1862. L. 1.

602 *Długosz J.* Walicki Aleksander // Słownik pracowników książki polskiej. Warszawa ; Łódź : PWN, 1972. S. 936; *Мальдзіс А. І.* Валіцкі Аляксандр // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. 1984. Т. 1. С. 565.

603 BN. Rkp. 2976. K. 5–88 (Papiery różne ze zbiorów Aleksandra Walickiego z lat 1890–1893).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць, якія сістэматычна атрымлівала З. Савіцкая, адзначаўся год заснавання кнігарні – 1859.

У 1882 г. З. Савіцкая набыла частку зачыненай віленскай кнігарні Э. Ажэшкі, а пад канец 1880-х гг. – мінскай чытальні пры кнігарні Браніслава Гадлеўскага[604] і, такім чынам, "uruchomiła wypożyczalnię książek"[605], а таксама адкрыла ў 1890 г. філіял кнігарні ў Бабруйску, дзе прадаваліся няпольскія кнігі, ноты і матэрыялы для пісьма. Пры мінскай кнігарні заставаўся склад нотаў, у продажы былі не толькі кніжныя і нотныя выданні, але нават і кветкі. Таксама, як і брат, З.Савіцкая спрабавала свае сілы ў кнігавыданні, выпусціла ўласным накладам па адным творы Ю. Крашэўскага, К. Вярыгі-Дарэўскай, "калядную кнігу" для дзяцей.

Заставалася кнігарня і месцам спатканняў для мясцовай творчай інтэлігенцыі. Янка Лучына (Іван Неслухоўскі), напрыклад, кантактуючы з польскімі пісьменнікамі, падаваў для ліставання адрас кнігарні Зоф'і Савіцкай[606]. У сваю чаргу і З. Савіцкая пры неабходнасці такія кантакты наладжвала (з Ажэшкай, Гебетнерам, Крашэўскім, Масоніусам). Падтрымліваліся цесныя сувязі з польскімі таварыствамі ў Мінску[607], выдаўцамі і кнігарамі з Варшавы, Вільні, Пецярбурга, Масквы. Дзякуючы актыўнай кніжнай дзейнасці З. Савіцкай (у Мінску) і яе брата А. Валіцкага (у Нясвіжы), мясцовыя аматары кніг мелі шырокія і разнастайныя магчымасці ў чытанні і набыцці тагачасных сталічных выданняў, аб чым клапаціліся і за што адчувалі адказнасць уладальнікі мінскай кнігарні. Так, да прыкладу, пад час побыту А. Валіцкага ў Вільні Зоф'я просіць яго зайсці "do księgarni Lambecka[608] i zapytać dla czego nie wysyła P. Skirmuntowi do Mińska *Mowy Bismarka* na którą oddał 2 rubli, jezeli trzebo co dopłacić to prosze, dopłacić i zabrać i także zapytać dla czego nie przysyła dla mnie <…> *Chemii* część II dalszy ciąg *(Metale)*…"[609] Сярод пакупнікоў З. Савіцкай быў таксама і князь Радзівіл [Антоні][610], у архіве і бібліятэцы Нясвіжскага замка якога працаваў А. Валіцкі. Кнігі, прызначаныя для брата, З. Савіцкая найчасцей перадавала з аказіяй (напрыклад, праз Вяржбіцкага, Багдановіча, Абламовіча, Рымашэўскага), але і перасылала поштай (9 тамоў твораў М. Я. Салтыкова-Шчадрына – у 1892 г.), сістэматычна рыхтавала для яго спісы і фактуру новых паступленняў, а таксама бібліяграфічныя выданні, як "Bibliograficzny Przegląd".

Нягледзячы на тое, што ў кнігарні было даволі сталае кола прыхільнікаў, пакупнікоў і замоўцаў, фінансавыя праблемы заставаліся заўсёды актуальнымі. Толькі дзякуючы дзелавой актыўнасці З. Савіцкай і атрыманым ёю крэдытам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

604 Паводле ўспамінаў, яшчэ адну частку кніг Б. В. Гадлеўскі ["Бронислав Осипович Годлевский, директор дома призрения" – Памятная книжка-календарь на 1890 г. Минск, 1889. С. 32] ахвяраваў "szkołom samokształcenia młodzieży szkolnej". Гл.: *Życka L., Łęska M.* Działalność popowstaniowa polaków ziemi Mińskiej… S. 112.

605 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 88.

606 BN. Rkp. 2976. K. 74 (List Z. Sawickiej do Aleksandra Walickiego z 26 lutego 1893).

607 *Życka L., Łęska M.* Działalność popowstaniowa polaków ziemi Mińskiej… S. 113.

608 Лямбек Эрнст (Lambeck Ernst), торуньскі кнігар, які з 1866 г. меў кнігарню, склад нот і пазычальню кніг у Вільні. Гл.: *Przybyłowa J.* Lambeck Ernst // Słownik pracowników książki polskiej… S. 496.

609 BN. Rkp. 2976. K. 16.

610 Ibid. K. 25.

у Мінскім камерцыйным банку, падтрымлівалася жыццядзейнасць і існаванне кнігарні[611].

У канцы 1894 г. мінскую кнігарню З. Савіцкай, як адзначае Т. Зянкевіч, набыў паэт і мастак *Багуслаў Адамовіч*, сын мінскага друкара, літографа, настаўніка малявання Эмерыка Адамовіча. На пачатку 1895 г. адбылося яе адкрыццё разам з чытальняй (або "wypożyczlnią książek")[612], дзе можна было атрымаць польскія і беларускія кнігі, напрыклад брашуры А. Ельскага "Выбіраймася ў прочкі" (Пецярбург, 1896), "Нашы перасяленцы. Скарэй у Томск!" (Віцебск, 1896) і інш. Аднак кнігарня Багуслава Адамовіча, які аддаў перавагу паэтычнай дзейнасці (у 1897–1898 гг. выходзяць першыя асобныя выданні яго вершаваных зборнікаў), вясной 1898 г. стала ўласнасцю іншага гаспадара – *Яна (Івана Адамавіча) Філіповіча-Дубовіка.*

Дазвол на кніжны гандаль у Мінску "дворянину Ивану Адамовичу Филиповичу-Дубовику… русскими, французскими, немецкими и польскими книгами" быў выданы мінскім губернатарам 24 кастрычніка 1896 г., што пацвярджаецца атрыманым пасведчаннем № 87[613]. Кнігарня мела ў сталым асартыменце новыя кніжныя выданні, падпісвала абанентаў на газеты, гарантавала добрасумленнае выкананне ўсіх замоў. І надалей у краме можна было набываць беларускамоўныя выданні Аляксандра Ельскага, якія выйшлі ў 1895, 1896, 1900 гг. у Санкт-Пецярбурзе, а ў 1906 г. і 1908 г. – у Вільні. Дзякуючы Я. Філіповічу-Дубовіку былі надрукаваны чатыры польскамоўныя выданні – у тым ліку і вершы Багуслава Адамовіча, Юзафа Вяржбіцкага, музычныя студыі Міхала Ельскага і прыродазнаўчыя парады Яна Ляскоўскага[614]. Дзейнасць кнігарні – паводле рэкламных публікацый віленскага "Kuriera Litewskiego" – вызначаецца да 1908 г.

Каля 1900 г. абывацелі Міншчыны звярнуліся да віленскага кнігара і выдаўца *Вацлава Макоўскага* з прапановай адкрыць і ў Мінску кнігарню, што неадкладна было зроблена. Магчыма, нейкім чынам з гэтым была звязана і папярэдняя "разведка", праведзеная ў 1896 г. віленчуком Феліксам Завадскім аб атрыманні дазволу на кніжны гандаль у Мінску. У верасні 1900 г. В. Макоўскі таксама займеў дазвол ад гарадскіх улад "na otwarcie księgarni wraz z cyztelnią polską; tu poszło to łatwiej niż w Wilnie", – успамінае кнігар[615]. Бо ў заснаванай яшчэ ў 1893 г. віленскай кнігарні яму не ўдалося адкрыць чытальні. Па некалькі раз на год наведваўся В. Макоўскі ў Мінск, дзе яго намесніцай, а потым саўладальніцай, была Эўфемія Вайткевіч, некаторы час дапамагаў Ян Жыценьскі і настаўніца Яніна Вітвіньска[616]. Сістэматычна да мінскай кнігарні з Вільні перасылаліся пасылкі з кнігамі і перыёдыкай. "Kiedy miałem filję w Mińsku, co tydzień otrzymywaliśmy posyłki z Warszawy z książkami i pismami tygodniowemi wagi od

611 Ibid. K. 70.

612 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 89.

613 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6251. Арк. 58.

614 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 89.

615 *Makowski W.* Wspomnienia starego księgarza na tle 52-letnich osobistych przeżyć… Cz. 2. : 1893–1915. S. 319.

616 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 89.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15 do 20 pudów"[617]. Найбольш інтэнсіўнай была праца з лістапада да сакавіка, калі колькасць такіх пасылак асабліва павялічвалася.

Паводле абвестак з розных перыядычных выданняў і календароў можна даведацца, што кнігарні В. Макоўскага ў Вільні і Мінску мелі ў продажы, у адпаведнасці з атрыманым дазволам, "кнігі на рускай і замежных мовах", а таксама ноты, паштоўкі, альбомы і перыядычныя выданні. У 1908 г. тут было 145 назв. перыядычных выданняў на англійскай мове, 139 – на нямецкай, 119 – на рускай, 35 – на італьянскай, 25 – на ідыш і іўрыце, 17 назв. – на польскай, эсперанта і інш. Сярод іх і беларуская "Наша Ніва", на якую ў кнігарні была арганізавана падпіска[618].

Выданні выпісваліся з Вільні, Пецярбурга, Кіева, Варшавы, Кракава, Познані, Любліна, Львова, Адэсы, Лондана, Парыжа, Берліна і г. д. Кнігарня сістэматычна рэкламавала свае магчымасці, нагадваючы, што валодае кніжным асартыментам па ўсіх галінах ведаў: белетрыстыка і тэалогія, філасофія і гісторыя, прыродазнаўства, этыка, медыцына, выхаванне; ілюстраваныя кнігі для дзяцей і моладзі, падручнікі школьныя, "народныя" кнігі, кнігі для набажэнства; асобна вылучаўся аддзел сельскай гаспадаркі. Каталогі для чытачоў высылаліся дарма[619].

Такім чынам, асартымент кнігарні быў накіраваны на задавальненне розных густаў, што сведчыла таксама і пра ўплыў на іх фарміраванне непасрэдна кнігарні. Характарызуючы чытацкае кола сваіх наведвальнікаў, Эўфемія Вайткевіч адзначала, што гэта была "publiczność raczej konserwatywna, niż postępowa", для якой "powieść i książka religijna – to największy towar na naszym księgarskim rynku zbytu"[620]. Гімназісты і інтэлігенцыя набывалі творы як сур'ёзныя па змесце, так і папулярныя, танныя і даступныя ўсім. Сярод улюбёных – шэраг варшаўскіх і віленскіх літаратурна-мастацкіх часопісаў на польскай мове. Аднак, на думку загадчыцы кнігарні В. Макоўскага, запатрабаванне кніг было яшчэ досыць слабым, а канкурыраваць даводзілася з крамамі яўрэйскімі, якія мелі выключна кнігі на рускай мове, чым найбольш і была захоплена так званая група прагрэсіўных чытачоў[621].

Нягледзячы на цэнзурныя прадпісанні, жандармскія рэвізіі, кнігарня патаемна і бясплатна забяспечвала падручнікамі і сшыткамі падпольныя польскія школы, праводзіла работу і па выданні польскамоўных кніг, працягваючы як віленскія традыцыі Э. Ажэшкі, з якой В. Макоўскі супрацоўнічаў пад час выдання

---

617 *Makowski W.* Wspomnienia starego księgarza na tle 52-letnich osobistych przeżyć… Cz. 2: 1893–1915. S. 494.

618 Сярод падпісчыкаў, напрыклад, адзін з прадстаўнікоў шляхецкага роду А. Карыбут-Дашкевіч з мястэчка Стары Свержань, што на Міншчыне. Гл.: *Смалянчук А. Ф.* Віленскія знаходкі: дакументы па гісторыі беларускага друку пачатку XX ст. у фондах Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва // Дакументальная спадчына Беларусі XIV – XX стагоддзяў : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 75-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 26 чэрв. 2013 г.) / Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Мінск: Выд. А. М. Вараксін, 2014. С. 205.

619 Kalendarz Miński na rok zwyczajny 1910 zastosowanej do potrzeb ludności, zamieszkałej na Litwie i Rusi. Mińsk : Nakł. miesięcznika "Straży Im. Maryi", 1910. K. il.

620 *Górski S.* W stolicy Białorusi // Tygodnik Iliustrowany.Warszawa : Gebetner i Wolf, 1905. N 46–47. S. 848.

621 Ibid.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і продажу кніг на польскай мове ў 1879–1882 гг.[622], так і мінскія – кнігарняў братоў Бейліных, А. Валіцкага, З. Савіцкай, Ё. Фрэнкеля, Я. Філіповіча-Дубовіка.

Дзейнасць кнігарні асвятлялася ў варшаўскім, віленскім і мінскім перыядычным друку, як "Tygodnik Ilustrowany", "Świat", "Nowiny Wileńskie", "Goniec Wileński", "Goniec Codzienny", "Dziennik Wileński", "Kurier Litewski", "Nad Świsłoczą". Пра першую рэвізію ў "Księgarni, składzie nut i materialów piśmienych W. Makowskiego w Mińsku lit.", ажыццёўленую ў 1910 г., напісаў "Goniec Wileński" (nr 33, 25 lutego – 12 marca). З інфармацыі можна даведацца аб канфіскаваных выданнях, сярод якіх і ўсе беларускія кнігі, што знаходзіліся на той час у кнігарні. У "росшуку" паліцыі быў і зборнік, выдадзены накладам віленскай кнігарні В. Макоўскага да юбілею Э. Ажэшкі – гэта зборнік твораў пісьменніцы "Gloria victis" (Вільня, 1910). Таксама выданне было канфіскавана з продажу, пра што пісалі "Goniec Codzienny" (1911. N 85), "Kurier Litewski" (1913. N 58). У 1910 г. таксама «nałożono na księgarnię karę za rozpowszechnianie zakazanego "Kalendarza Mińskiego" na rok 1910»[623].

За гады працы ў Мінску В. Макоўскі здолеў тым не менш стварыць на базе сваёй кнігарні і чытальні ажыўлены гарадскі культурны асяродак[624]. У 1914 г. мінскі тыднёвік "Nad Świsłoczą" (Maj. S. 25) адзначаў, да прыкладу, што "польскае найбольш групуецца ў кнігарні В. Макоўскага". Працягвалася яе дзейнасць і ў час Першай сусветнай вайны. Наплыў бежанцаў у Мінску "spowodował masową wyprzedaż książek w księgarni i tłok w czytelni"[625]. З вялікімі складанасцямі цягам месяца кнігі дасылаліся і везліся ў Мінск на фурманках[626]. Нямецкія ўлады жорстка кантралявалі і праводзілі рэвізіі кнігарняў. Некаторыя з польскамоўных выданняў затрымліваліся "w Ober-Ostu"[627], што неспрыяльна адбівалася на кніжным гандлі, які ішоў на спад.

Адначасова ў 1916 г. ствараецца Мінская суполка выдаўцоў, сябрам якой становіцца В. Макоўскі[628], каб падтрымліваць мясцовых аўтараў і друк. У 1919 г. кнігарня В. Макоўскага ў Мінску была муніцыпалізавана, але яшчэ пэўны час заставалася адной з шасці кнігарняў, дзе быў дазволены гандаль і куды звозіліся кнігі пасля рэквізіцыі іншых "кніжных лавак"[629]. У складзе супрацоўнікаў кнігарні на той час значыліся "Ф. К. Войткевич" і "Е. И. Витковская"[630]. Стала, ад самага пачатку, як відаць, у мінскай кнігарні адпрацавала Эўфемія Вайткевіч.

Кнігарня Вацлава Макоўскага, як і большасць польскіх кнігарняў Мінска (канца XIX – пачатку XX ст.) – Яна Філіповіча-Дубовіка, "Księgarnia Polska" і інш., – размяшчалася па вуліцы Захар'еўскай. Паблізу Кафедральнага касцёла знаходзілася невялікая кніжная лаўка з літаратурай рэлігійнай тэматыкі

[622] *Мальдис А. И.* Из истории издательской деятельности Э. Ожешко. С. 249–250.
[623] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 90.
[624] *W. D.* Przemysł i handel // Świat. Warszawa, 1909. Nr 31. S. 12.
[625] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 92.
[626] *Makowski W.* Wspomnienia starego księgarza na tle 52-letnich osobistych przeżyć… Cz. 4. 1915–1920. S. 519.
[627] Ibid. S. 520.
[628] *Życka L., Łęska M.* Działalność popowstaniowa polaków ziemi Mińskiej. S. 90.
[629] ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 23.
[630] Тамсама. Арк. 41–44.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКИ

Юзафа Нарэйкі, аднаго з заснавальнікаў нелегальнай бібліятэкі і чытальні імя А. Міцкевіча. Кнігі знакамітых варшаўскіх выдаўцоў Гебетнера і Вольфа можна было набыць у кнігарні "Nauka" Зоф'і Чарняўскай[631]. Кнігарня, адчыненая не пазней 1906 г.[632], размяшчалася каля гатэля "Libawa"[633], а крыху далей, у іншым будынку таксама па Захар'еўскай – склад падручнікаў і пісьмовых (канцылярскіх) матэрыялаў, якія ўжываліся ў мясцовых "zakładach naukowych i szkołach ludowych". Такія звесткі даносіць да нас "Kalendarz Miński na rok zwyczajny 1910", які быў насычаны разнастайнай даведкавай інфармацыяй: абвесткамі, разгорнутай рэкламнай інфармацыяй пра кнігарні і іх асартымент, змяшчаў нават публікацыю, прысвечаную прапагандаванню чытання – гэта невялічкі артыкул Юзафа Славіньскага пад назвай "Parę słów zachęty do czytania",[634] у якім аўтар папулярызаваў друкаванае слова, асвету, перыядычныя каталіцкія выданні з Варшавы, Вільні, Кіева, Чанстаховы, Пецярбурга і Мінска, тлумачыў, як лепей ажыццявіць іх замову і падсумоўваў, што "oświata ludu, dokona cudu" і гэта трэба неадкладна пачынаць пры дапамозе чытання (S. 95). Пасля спробы рэдактарска-выдавецкай дзейнасці Ю. Славіньскі (быў складальнікам названага календара) заняўся таксама і кніжным гандлем, пераняўшы кнігарню Ю. Нарэйкі.

Сярод буйнейшых кнігароў Мінска ў другой палове XIX – пачатку XX ст., якія аддавалі перавагу рускамоўнаму асартыменту, вызначаліся *Бер Айзікаў Гарадзенскі* (кнігарня дзейнічала з 1846 г., заснавальнік Айзік Сролевіч Гарадзенскі), *Вульф Фрумкін* (з 1882 г.), Ёсель (Іосель, Іосіф) *Фрэнкель* (не пазней 1887 г.).

У 1880-я гг. "Книжный магазин и Библиотека для чтения Б. А. Городенского, Комиссионера Хозяйственного Управления при Святейшем Синоде и Британского Библейного Общества, Губ. г. Минск, Губернаторская ул., д. Блоха" былі забяспечаны вялікім выбарам вучэбных кніг для гімназій (мужчынскіх і жаночых), семінарый, рэальных, ваенных, гарадскіх і іншых вучэльняў.

Б. А. Гарадзенскі стала супрацоўнічаў і забяспечваў кнігамі і вучэбнымі дапаможнікамі Мінскую гімназію, Рэальнае вучылішча, Духоўную семінарыю. Кнігарня мела пастаянныя запасы кніг Свяшчэннага Сінода і Біблейскага таварыства, усе сельскагаспадарчыя кнігі выдавецтва "Девриена", медыцынскія – "Риккера". Што да навін французскай літаратуры, то ўладальнік кнігарні запэўніваў пакупнікоў і чытачоў у "немедленном по выходе из печати" атрыманні іх у кнігарні, пры якой існавала бібліятэка для чытання наступных часопісаў: "1) Артист, 2) Вопросы философии и психологии, 3) Вестник Европы, 4) Русская мысль, 5) Северный Вестник, 6) Русское Богатство, 7) Научное Обозрение, 8) Наблюдатель, 9) Русское Обозрение, 10) Восход, 11) Наука и жизнь, 12) Исторический Вестник, 13) Русская Старина, 14) Книжки Недели, 15) Книжки Нивы, 16) Мир Божий, 17) Природа и Люди, 18) Вестник Воспитания, 19) Вестник Иностранной Литературы, 20) Театральная Библиотека, 21) Новости Иностранной Литературы, 22) Семья, 23) Полезная Библиотека, 24) La lecture, 25) Ueber Land u Meer. Детские: 1) Задушевное Слово, младшего

---

631 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 89–92.

632 У 1906 г. выдадзена пасведчанне на ўтрыманне кнігарні. Гл.: НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7667. Арк. 44.

633 Kalendarz Miński na rok zwyczajny 1910… K. il.

634 Ibid. S. 92–95.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

возраста, 2) Задушевное Слово, старшего возраста, 3) Родник, 4) Вокруг Света, 5) Игрушечка, 6) Журнал для малюток”[635].

У кнігарні можна было аформіць падпіску на ўсе без выключэння кнігі, якія выйшлі ў Расіі. Для настаўнікаў па запатрабаванні бясплатна высылаліся першыя экзэмпляры. У адным з выпускаў “Памятной книжки и календаря Минской губернии на 1909 год” была змешчана разгорнутая рэклама “Книжного магазина и склада учебных пособий Б. А. Городенского”, заснаваная на прапанове значных зніжак: на вучэбныя выданні для народных вучылішчаў Мінскай губерні; на пераплёт выданняў; на закупкі ў вялікай колькасці выданняў Св. Сінода. Своеасаблівым гарантам выступала працяглая дзейнасць кнігарні, на той час – на 1908 г. – больш за 50 гадоў[636].

Кніжная і нотная крама *Вульфа Борухава Фрумкіна*, з бібліятэкай для чытання (па Губернатарскай вуліцы), мела шмат у чым падабенстваў з іншымі кнігарнямі, папаўняючымі мясцовы кніжны рынак рускамоўнай літаратурай. З 1888 г. В. Б. Фрумкін наладзіў трывалыя сувязі з выдавецкім таварыствам “Просвещение” (Санкт-Пецярбург) і стаў пастаўшчыком кніг Дырэкцыі народных вучэльняў у Мінскай губерні. Кнігарня і бібліятэка В. Б. Фрумкіна з’яўляліся асноўнымі кніжнымі складамі-зборамі падручнікаў у Мінску, што былі ўхвалены Камітэтам Міністэрства народнай адукацыі Расійскай імперыі для ўжывання ў розных навучальных установах. Прадаваліся таксама кнігі Св. Сінода і Біблейскага таварыства, танныя выданні маскоўскай і пецярбургскай Сінадальных друкарняў.

Шырокай папулярнасцю карысталіся розныя расійскія календары: медыцынскія, тэхнічныя, фармацэўтычныя, юрыдычныя, вучнёўскія – адрыўныя і настольныя – выдавецтваў “Польза”, А. С. Суворына, І. Д. Сыціна (Масква), Г. Д. Гоппэ (Санкт-Пецярбург).

Ужо ў 1901 г. кнігарня В. Фрумкіна прапаноўвае сваім наведвальнікам і адны з папулярнейшых польскамоўных выданняў[637] – “Kucharka Litewska” (першае выданне – 1854 г., аўтарам з’яўлялася жонка выдаўца Адама Завадскага) і “Gospodynia Litewska” (першае выданне ў 1848 г.), што друкаваліся і шматразова перавыдаваліся Завадскімі ў Вільні, а таксама Гебетнерам і Вольфам у Варшаве (1888)[638]. Аўтаркай найранейшай публікацыі – “Gospodynia Litewska”, дапаможніка па вядзенні гаспадаркі, была ўраджэнка Міншчыны Ганна Цюндзявіцкая (дачка Міхала Прушынскага). Магчыма, у кнігарні было ў продажы дзесятае выданне – 1898 г., якое каштавала 1 рубель 50 капеек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

635 З інфармацыйна-рэкламнага ліста кнігарні на форзацы кнігі: *Белинский В.* Сочинения. 4-е изд. Москва : «Русская» типолитогр., 1885. Ч. 10. – (Асобнік БДУКМ АРК).

636 Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1909 год / издание Минского губернского статистического комитета. Минск : Тип. С. А. Некрасова, 1908. С. 4–5.

637 Краткий каталог книжного магазина В. Б. Фрумкина в г. г. Минске, Губернаторская, д. Гостиницы Европа… Минск : Паровая типолитогр. Б. И. Соломонова, 1901. С. 27.

638 Даследчыца з Літвы налічыла 15 выданняў “Gospodyni Litewskej” за 1848–1898 гг. і назвала выданне ўдалым камерцыйным праектам таго часу. Гл.: *Gasiūnaitė G.* Kucharka Litewska: veikalas, tradicijos, kontekstai // Naujasis Židinys-Aidai. 2014. N 8. P. 46. Таксама: http://www.nzidinys.lt/297073/leidiniai/naujasis_zidinys-aidai/2014-nr-8. Дадаткова: *Шыдлоўскі С. А.* Сістэма рацыянальнага гаспадарання ў рабоце Ганны Цюндзявіцкай “Літоўская гаспадыня” // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. 4. 2013. № 4. С. 2.

Поруч з тым, што кнігарня В. Б. Фрумкіна спецыялізавалася на продажы вучэбнай літаратуры, значная ўвага надавалася і пашырэнню кніжнага асартыменту, асабліва вызначаліся разнастайнасцю выбару дзіцячыя французскія кнігі, медыцынскія выданні (ад вядомага пецярбургскага выдаўца К. Рыкера), электратэхнічныя (ад Ф. Шчапанскага), сельскагаспадарчыя (ад А. Дэўрыена). У краме прымалася падпіска на расійскія і замежныя часопісы па цэнах рэдакцый, праз букіністычны аддзел купляліся і прадаваліся старыя кнігі, ладзіўся кнігаабмен.

В. Фрумкін у 1890 г. адкрыў яшчэ і кніжную лаўку па продажы рускіх кніг на Саборнай плошчы[639], а таксама ў 1900 г. атрымаў дазвол на кніжны гандаль у Саборным скверы.

У 1880–1890-я гг. да асветнай працы далучаецца кнігарня *Ёселя Хаіма Давідава Фрэнкеля*, якая займалася і выдавецкай дзейнасцю. Напрыклад, з 1895 г. па 1905 г. накладам кнігарні выйшла некалькі выданняў падручнікаў па арыфметыцы і алгебры на рускай мове (С. Казлоўскага, М. Крайчыка), французска-рускі слоўнік Х. Вадагінскага, каляндар і даведнік урадавых устаноў і прадпрыемстваў Мінска і яго ваколіц. У мэтах пашырэння і сістэматызацыі ведаў па мастацкай літаратуры і літаратуразнаўстве супрацоўнікі кнігарні некалькі гадоў працавалі над спецыяльным бібліяграфічным паказальнікам – “Каталогом русских книг и журналов для чтения, с указанием критико-библиографических источников к известнейшим произведениям русской и иностранной литературы, находящейся при книжном магазине Е. Френкеля в Минске” (Мінск, 1894). Прадмова да выдання была складзена ўласна ўладальнікам кнігарні, які такім чынам заахвочваў сваіх наведвальнікаў да чытання не толькі мастацкіх, але і крытычных твораў, біяграфій пісьменнікаў, прадстаўленых у адпаведнасці з каталогам у яго кнігарні. У першым раздзеле “Русская и иностранная словесность” прыводзіўся багаты крытычны матэрыял пра А. Пушкіна, Л. Талстога, І. Тургенева, творы якіх з’яўляліся найбольш папулярнымі ў мясцовых чытачоў. У другі раздзел увайшлі навуковыя выданні па гісторыі, мастацтве, этнаграфіі, палітыцы, філасофіі, педагогіцы, медыцыне і інш. У асартыменце кнігарні былі падручнікі, дзіцячыя кнігі, календары, геаграфічныя атласы, мапы, часопісы. Пры кніжным магазіне існаваў склад сельскагаспадарчых выданняў[640].

Разам з буйнешымі кнігарнямі ў Мінску дзейнічаў шэраг дробных кніжных лавак і кнігарняў – Шалома Левіна (з 1877 г. дазволены гандаль рускімі кнігамі), Ашэра Фельдмана (з 1879 г. – рускімі і яўрэйскімі), Моўшы Каганоўскага (з 1893 г. – яўрэйскімі), Ганкі Саламонавай (з 1879 г. – рускімі і яўрэйскімі), Мордуха Ізгура (з 1880 г. – рускімі), Арона Левіна (з 1887 г. – рускімі і замежнымі), Якава Гінзбурга (з 1889 г. – яўрэйскімі), Юдэля Нейфаха (з 1896 г. – рускімі і замежнымі), Меера Гальперына (з 1897 г. – яўрэйскімі) і інш. Некаторым з іх удавалася весці сямейны кніжны бізнэс – Рыўкіны (з 1847 г. гандлявалі кнігамі на рускай і замежных мовах), Машкілейсоны (з 1875 г. – яўрэйскімі кнігамі) (гл. Дадат. 7).

639 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 5516. Арк. 35.

640 *Шыбека З. В.* Минскъ сто гадоў таму. Мінск : Беларусь, 2007. С. 264–265.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некаторыя друкары, як Ілля Ісаакавіч Тасьман, яго жонка Хая-Фейга Тасьман, таксама мелі кнігарню (з 1890 г.)[641], і наадварот, кнігары, як Вульф Гіршаў Янкель Гальперын (у 1908 г.)[642], атрымлівалі дазвол і на тыпаграфскія работы. Функцыі некаторых кнігарняў пашыраліся і за кошт арганізацыі пры іх платных бібліятэк-чытальняў (пазычальняў). Падобныя паслугі было дазволена аказваць З. Савіцкай, Б. Гадлеўскаму, Ф. Фрыдлянду, Б. Гарадзенскаму, Б. Адамовічу, В. Фрумкіну, Ё. Фрэнкелю, В. Макоўскаму, Л. Лаўрэцкай, Е. Міхелесу і інш.

Размяшчаць кнігарні і кніжныя лаўкі імкнуліся ў бойкіх публічных месцах у цэнтры горада (большасць – на Захар'еўскай, Губернатарскай вуліцах і на Сабορнай плошчы), на станцыях Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыгунак (Кацярына Гудвіловіч з 1875 г., а таксама Марыя Ярашэвіч – з 1878 г. мелі правы на продаж рускіх і замежных кніг). Гандаль кнігамі мог мець часовы характар, як, да прыкладу, арганізаваныя кніжныя склады "при чайных" "для продажи населению некоторых одобренных сочинений поэта А. С. Пушкина и брошюр с биографическими сведениями"[643] – да 100-годдзя святкавання юбілею паэта. У горадзе была распаўсюджана і "разносная торговля", якую выкарыстоўвалі не толькі для распаўсюджвання рэлігійнай літаратуры, але і забароненых выданняў[644].

Па сацыяльным статусе большую частку мінскіх кнігагандляроў складалі мяшчане, займаліся кніжным гандлем і мясцовыя дваране, як Т. Більмін, А. Валіцкі, З. Савіцкая, Б. і Ф. Гадлеўскія, Б. Адамовіч, К. Галецкі, Я. Філіповіч-Дубовік, У. Масьціцкая; купцы – Ф. Фрыдлянд, Л. Разоўскі, В. І. Тасьман; сяляне – В. Маркоўскі, В. Карніцкі, Я. Горскі, І. Андрэеў, І. Лойка і інш.

Аўтары-выдаўцы ўласных прац таксама маглі самастойна займацца іх продажам, як адвакат І. А. Бамштэйн ці матэматык С. А. Казлоўскі. Пацвярджэннем могуць служыць інфармацыйныя абвесткі, змешчаныя ў саміх выданнях дадзеных аўтараў. Напрыклад, на форзацы аднаго з выданняў чытаем: "Настоящую книгу можно получить исключительно от издателя… по следующему адресу: (для иногородних) в губ. гор. Минске Израилю Абрамовичу Бомштейну (городской адрес) Губернаторская улица дом Абрама Поляка во дворе Коммерческой Гостиницы"[645]. Матэматык С. А. Казлоўскі, працы якога актыўна друкаваліся ў Расіі, Украіне, сціпла падаў свой адрас таксама ў адным з выданняў: "Составил С. А. Козловский. Адрес автора: м. Узда, Минской губ."[646]

Калі ў першай палове XIX ст. характэрным быў збор сродкаў на выданне па падпісцы і прозвішчы падпісантаў таксама друкаваліся ў тых самых выданнях (напрыклад, у выд. 1828 г. – "Зема" А. Паўлава, 1845 г. – "Пан Дольский" Д. Сергіеўскага), то з другой паловы XIX ст. на іх змену прыходзяць аб'явы. Аб'явы аб продажы сваіх выданняў падавалі і дзяржаўныя выдаўцы – Мінскі губернскі

---

641 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 4941. Арк. 1–7

642 Тамсама. Спр. 7744. Арк. 1–6.

643 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6792. Арк. 10.

644 Тамсама. Спр. 7461а. Арк. 7.

645 *Бомштейн И. Б.* Справочная книга и спутник по Минской губернии. Минск : Типолит. Р. Дворжец, 1889. 562 с.

646 *Козловский С. А.* Полное руководство к решению арифметических задач… Минск : Изд. кн. магазина Е. Френкеля, 1897. (Тип. И. Блюмовича в Вильне). С. 1.

РЭПАЗІТАРЫЙ БДУ

статыстычны камітэт і Мінская губернская друкарня[647]. Губернскае праўленне, нават сам губернатар выступалі нярэдка распаўсюджвальнікамі іншых выданняў ці садзейнічалі гэтаму праз мясцовых "предводителей дворянства", а таксама ўстановы асветы. Аўтары ці зацікаўленыя асобы ў такім выпадку звярталіся да губернатара з просьбамі "об оказании содействия", як, да прыкладу, у справе з распаўсюджаваннем выдання "О обновлении картофеля" ў 1847 г.[648]

З канца XIX ст. гандаль інтэнсіўна развіваўся як унутры горада, ахопліваючы яго густой сеткай рознічных пунктаў, так і прыцягваў да сябе іншагародня фірмы – найбольш з Варшавы, Вільні, Масквы, Пецярбурга, якія адкрывалі свае агенцтвы і склады ў Мінску. Сярод кнігагандлёвых фірм у горадзе перад Першай сусветнай вайной – віленскае «Акционерное издательское и книготорговое общество "Лектор"» (з 1912 г.). З. Шыбека зазначае, што таварыства нават цалкам "кантралявала кнігагандаль" у горадзе[649]. Так гэта было ці не, патрэбна пацвердзіць. Аднак у нашым распараджэнні ёсць толькі некаторыя архіўныя дакументы па справе аб адкрыцці таварыства "Лектор" у Мінску: «Прошение Новоалександровского мещанина Ковенской губернии Носона Янкелева Лонштейна, действующего по доверенности акционерного издательского и книготоргового общества "Лектор", проживающего в Минске… на устройство… склада книг русских, польских и немецких вышеозначенного общества»; "Копия доверенности"; «Устав Акционерного издательского и книготоргового общества "Лектор" (Вильна)»; "Свидетельство"[650]. Пытанне вырашалася мінскімі ўладамі на працягу студзеня – красавіка 1912 г. і мела дадатны вынік для хадайніка – упаўнаважанага кіраваць і распараджацца ўсімі справамі Мінскага аддзялення "Лектора", і ён атрымаў дазвол адкрыць у Мінску па Захар'еўскай вуліцы № 19/87 склад кніг рускіх, польскіх і нямецкіх названага таварыства. Як здаецца, фірма не разгарнула шырокай дзейнасці, магчыма, у сувязі з падзеямі Першай сусветнай вайны.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Мінску штогод дзейнічала да 11–12 кнігарняў (гл. Дадат. 8) ад буйных крамаў да дробных лавак, асноўная частка якіх мела справу з расійскімі выданнямі з Санкт-Пецярбурга і Масквы.

За ўвесь разглядаемы перыяд намі зафіксавана каля 130 кнігарняў, якія працавалі ў горадзе: стала і часова, што сведчыць пра запатрабаванасць кнігі ў горадзе. Большасць кнігарняў паводле свайго асартыменту мелі ўніверсальны характар, спалучаючы гандаль літаратурна-мастацкімі, вучэбнымі і рэлігійнымі выданнямі. Вылучаліся таксама і кнігарні, якія разам з іншай літаратурай займаліся продажам нотна-музычных выданняў – А. Валіцкага, З. Савіцкай, В. Фрумкіна, В. Макоўскага. Ноты прадаваліся таксама і ў крамах з музычнымі інструментамі – М. А. Зубко-Васілеўскай, "Лира" О. М. Гаўсмана, І. А. Шацкінай, З. Б. Протаса, М. А. Фідэльмана. Від выдання як крытэрый спецыялізацыі выступае і ў арганізацыі гандлю перыядычнымі выданнямі, асабліва на пачатку XX ст., калі ў дадзенай сферы робяцца спробы ўзбуйнення і манапалізацыі ў продажы

[647] Памятная книжка Минской губернии на 1911 г. / издание Минского Губернского Статистического Комитета. Минск : Губернская тип., 1910. С. 113.

[648] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 958. Арк. 8–15.

[649] Гісторыя Мінска / пад рэд. чл.-кар. НАН Беларусі У. А. Бабкова. С. 205.

[650] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8150. Арк. 1–12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часопісаў і газет. Прыкладамі служаць стварэнне П.-Л. Эйдэльманам "Газетного бюро" ў 1906 г. і спроба арганізацыі дзейнасці канторы па цэнтралізаваным продажы газет і часопісаў В. І. Тасьманам у 1915 г.

Адным з самых яскравых крытэрыяў, які вызначаў спецыялізацыю кнігарняў, была мова – польская, руская, яўрэйская і замежныя. Менавіта паводле гэтага крытэрыю і пералічаных моваў і выдаваліся пасведчанні на дзейнасць той ці іншай кнігарні, кніжнай лаўкі ў горадзе.

Рэдкай з'явай у асартыменце мінскіх кнігарняў была кніга на беларускай мове. Тым не менш беларускамоўныя выданні з канца XIX ст. паступаюць у продаж і іх распаўсюджваннем, нягледзячы на рэвізіі і канфіскацыі, займаюцца кнігарні Б. Адамовіча, Я. Філіповіча-Дубовіка, В. Макоўскага. У 1918 г. у Мінску пачынае функцыянаваць прыватная "Беларуская кнігарня" Аляксандра Прушынскага (размяшчалася на вул. Захар'еўскай, 18), у якой адпаведна былі прадстаўлены беларускамоўныя выданні з Вільні, Пецярбурга, Мінска. А. Прушынскі (Алесь Гарун – дзеяч беларускага нацыянальна-вызвольнага руху, пісьменнік) укладваў у развіццё кнігарні ўласныя сродкі[651]. Аднак дзейнасць кнігарні на пачатку 1919 г. спыняецца.

У лютым 1919 г., адпаведна прынятым пастановам Савецкай улады, у Мінску пачынаецца муніцыпалізацыя кніжнага гандлю. Быў праведзены ўлік кнігарняў і складзены спіс за подпісам загадчыка аддзела пазашкольнай адукацыі, паводле якога вызначалася тая ці іншая сума для выдачы былым уладальнікам[652]:

| № п/п | Фамилия владельцев книжных магазинов | Прибл. сумма, на которую имеется книг | Причитается к выдаче | Примечания |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Фрумкин | 80.000 | 10.000 | |
| 2. | Фрейнкель | 80.000 | 10.000 | |
| 3. | Городенский | 80.000 | 10.000 | |
| 4. | Кинкулькин | 20.000 | 10.000 | |
| 5. | Соловейчик | 20.000 | 10.000 | |
| 6. | Рывкин | 10.000 | 10.000 | |
| 7. | Прушинский | 30.000 | 10.000 | Книги взяты им на комис. нач. |
| 8. | Маковский | 8.000 | 80.000 | |
| 9. | Шнитман | 8.000 | 80.000 | |
| 10. | Гальпер[и]н | 5.000 | 5.000 | |
| 11. | Машкилейсон | 3.000 | 3.000 | |
| 12. | Фельдман | 1.000 | 1.000 | |
| 13. | Лесник | 2.000 | 2.000 | |
| 14. | «Казбек» | 2.000 | 2.000 | |
| 15. | «Культура» | 2.000 | 2.000 | |
| 16. | Шапиро | 2.000 | 2.000 | |

651 *Гарбінскі Ю. У.* Гарун Алесь // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1994. Т. 2. С. 491.
652 ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Працяг табл.*

| № п/п | Фамилия владельцев книжных магазинов | Прибл. сумма, на которую имеется книг | Причитается к выдаче | Примечания |
|---|---|---|---|---|
| 17. | Консисторум | 1.000 | 1.000 | |
| 18. | «Наука» | 1.000 | 1.000 | |
| Итого | | 355.000 | 105.000 | |

У аддзел народнай адукацыі былі накіраваны таксама і спісы супрацоўнікаў кнігарняў[653]:

| Фамилия И. О. | Чей магазин | Сколько лет в магазине | Сколько вообще | Оклад |
|---|---|---|---|---|
| Левина Э. В. | Фрумкина | 15 лет | 15 лет | 250 руб. |
| Леф Э. В. | Фрумкина | 6 лет | 6 лет | 200 руб. |
| Фрумкина Ц. Т. | Фрумкина | 4 года | 4 года | 200 руб. |
| Гурвич Г. | Фрумкина | 2 ½ года | 2 ½ года | 100 руб. |
| Гурвич Б. | Фрумкина | 1 ½ года | 1 ½ года | 40 руб. |
| Шнитман С. Б. | Фрумкина | 6 месяцев | 6 месяцев | 40 руб. |
| Шнейдер Б. А. | Фрумкина | 9 месяцев | 9 месяцев | 40 руб. |
| Протусевич Н. И. | Френкеля | 20 лет | 20 лет | 350 руб. |
| Радумский М. Б. | Френкеля | 20 лет | 20 лет | 300 руб. |
| Бергер И. А. | Френкеля | 7 лет | 7 лет | 125 руб. |
| Ковянская Л. А. | Френкеля | 2 ½ года | ½ года | 100 руб. |
| Чертова М. И. | Френкеля | 1 ½ года | 1 ½ года | 75 руб. |
| Шер Соня | Соловейчик[а] | | | 300 руб. |
| Шапиро Ревека | Соловейчик[а] | | | 300 руб. |
| Хазанович М. Т. (?) | Кинкулькин[а] | | | |
| Кац М. А. | Казбек [“Казбек”] | 5 лет | 5 лет | 60 руб. |
| Фельдман Б. Т. (?) | Городенского | 22 года | 6 лет | 165 руб. |
| Свирновский Я. | Городенского | 3 года 2 месяца | 3 года 2 месяца | 125 руб. |
| Фельд Э. | Городенского | 1 ½ года | 1 ½ года | 50 руб. |
| Мальдина Г. | Городенского | 16 лет | 20 лет | 180 руб. |
| Войткевич Ф. К. | Маковского | 10 лет | 18 лет | 300 руб. |
| Видковская Е. И. | Маковского | 8 лет | 8 лет | 200 руб. |

Уладальнікі кнігарняў і выдаўцы спрабавалі звяртацца ў выканаўчы камітэт Савета рабочых, чырвонаармейскіх і сялянскіх дэпутатаў Беларусі аб вызваленні іх кнігарняў ад муніцыпалізацыі. Так, у заяве ад імя “Б. А. Городенского, Годеля, Кинкулькина, Консториума [Консисторум], И. Соловейчика, М. И. Ривкина, М. Френкеля, В. Б. Фрумкина, Чернявской” (ад 20 лютага 1919 г.) адзначалася: “Мы, опытные люди этой отрасли, всю жизнь провели за прилавком и у стен наших книг,

653 Тамсама. Арк. 43–44.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

всецело были заинтересованы, чтобы наши магазины, по мере самой малейшей возможности, всегда были пополняемы все новыми и новыми изданиями. Всегда на наших складах были книги, которые требовались всеми местными учебными заведениями. До сих пор гор. Минск недостатка в книгах не ощущал. Это создавалось взаимной конкуренцией и нашим интересом к книжному делу. Опытных служащих нашей отрасли мало, и муниципализацией книжного дела парализуется тот многолетний опыт наш и та инициатива, каковыми мы были бы полезны для общества. <…> Теперь мы заявляем, что если Исполнительный Комитет найдет возможность передать наши книжные магазины вновь в наше ведение, мы обязуемся в самых малейших деталях выполнять все указания Советских Властей в смысле расценки и распределения книг, в каждом отдельном случае малейшего нарушения готовы отвечать перед самыми суровыми мерами взыскания. Готовы всецело работать под абсолютным контролем и, возможно, доказать, что контроль нашей отрасли полезнее муниципализации как для общества, так для Комиссариата Народного Просвещения и без того обремененного. Ввиду всего вышесказанного просим освободить наши книжные магазины от муниципализации”[654].

На пасяджэнні Мінскага Савета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў ад 14 сакавіка 1919 г. быў заслуханы даклад загадчыка аддзела адукацыі і прынята пастанова пакінуць у горадзе толькі тры кніжныя крамы, кнігагандлярам выплаціць па дэкрэту і па цвёрдых цэнах, на выдаткі па закупцы і арганізацыі кнігарняў “испросить у Минского Губревкома Триста тысяч рублей”[655].

У сярэдзіне сакавіка 1919 г., як сведчыць “Докладная записка о книжном деле в гор. Минске”[656], улік кніжных запасаў, што знаходзяцца ў 19 кнігарнях горада, завершаны. На той час у Мінску працавалі дзве вялікія кнігарні – Гарадзенскага і Фрумкіна, а з 17 сакавіка планавалася адкрыць крамы Салавейчыка і Макоўскага. Продаж кніг ішоў інтэнсіўна, нягледзячы на іх адносна высокія кошты, таму планавалася арганізаваць у горадзе “закупочное бюро из наиболее опытных приказчиков и хозяев, которые взялись бы снабжать минские магазины книгами. Это необходимо организовать немедленно, в срочном порядке, ибо книжные центры теперь устремились со всех сторон, идет лихорадочная закупка всего, что только можно достать, и в самом близком будущем опустеют и книжные центры. За короткий период времени оскудели книжные запасы в Вильне. Каждый день, который мы теряем, лишает Минск возможности пополнить полки в книжных магазинах и грозит нам книжным голодом. <…> с 18-го числа (марта. – *Л. Д.*) приостанавливается пассажирское движение, и необходимо послать закупщиков до наступления этого срока”[657].

Асабліва востра адчуваўся недахоп у выданнях на беларускай мове, пра што сведчаць звароты аддзела забеспячэння Камісарыята[658], а таксама беларускіх школ[659]. Так, Савет беларускай савецкай школы для дарослых (вул. Петрапаў-

---

[654] ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 38–38адв.

[655] Тамсама. Арк. 25.

[656] Тамсама. Арк. 24.

[657] Тамсама.

[658] Тамсама. Арк. 28.

[659] Тамсама. Арк. 26, 29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лайская 2/5) звяртаўся ў Аддзел народнай адукацыі пры М. С. Р. Д. з наступнай заявай (па-руску), да якой прыкладаўся і спіс неабходных кніг: «Для школы крайне необходимы указанные в прилагаемом списке книги, каковыя можно иметь из бывш. "беларускае кнігарні" Прушинского (Захарьевская, 18). Школьный совет просит выдать эти книги для пользования учащихся, если возможно, поскорее»[660]. У спісе наступныя выданні:

«1. "Беларуская граматыка", Тарашкевіча. 10 экз.
2. "Першая чытанка", Ластоўскага. 50 экз.
3. "Задачнік" I ч., Юрэвіча. 10 экз.
4. "Sejbit"[661], Lastoŭskaho. 50 экз.
5. "Wypisy iz biełaruskaie literatury"[662], Lastoŭskaho. 50 экз.
6. "Матчын дар", А. Гаруна. 50 экз.
7. "Сымон Музыка", Я. Коласа. 50 экз.
8. "Шляхам жыцця", Я. Купалы. 50 экз.
9. "Što treba wiedać kožnamu biełarusu"[663]. 50 экз.
10. "Курганная кветка", К. Буйло. 40 экз.
11. "Васількі", Ядвігіна Ш. 40 экз.
12. "Родныя зярняты", Т. Гушчы. 40 экз.
13. "Бярозка", Ядвігіна Ш. 40 экз.
14. "Апавядання", Галубка. 40 экз.
15. "Апавядання", Т. Гушчы. 40 экз.»[664]

На просьбу была накладзена наступная рэзалюцыя ад 6 сакавіка за № 1054 – "отпустить, счет оплатить М. С. Р. Д."[665]

У сувязі з попытам на кнігі, быў распрацаваны "Проект организации книжной торговли в городе Минске", паводле якога кніжны гандаль сканцэнтроўваўся ў крамах Фрумкіна, Фрэнкеля, Гарадзенскага і Макоўскага; стваралася крама яўрэйскіх кніг, куды звозіліся б кнігі з кнігарняў Гальперына, Машкілейсона і іншых дробных лавак; уладкоўвалася б невялікая кніжная лаўка ў раёне Траецкай гары, і, такім чынам, усе кнігі планавалася звесці ў азначаныя шэсць кнігарняў. У праект закладваліся і прынцыпы цэнтралізацыі кніжнага гандлю з адной галоўнай крамай як размеркавальным пунктам з аптовым і букіністычным гандлем, а яе загадчык з'яўляўся б загадчыкам усяго кніжнага гандлю. Для агульнага кіраўніцтва прапаноўвалася пры гарадскім Аддзеле народнай адукацыі стварыць аддзел кніжнага гандлю і г. д.[666]

Аднак, як сведчыў спіс служачых муніцыпалізаваных кнігарняў, у Мінску прадоўжылі працу чатыры муніцыпалізаваныя крамы: Фрумкіна (у складзе супрацоўнікаў: Левіна, Радум[н?]скі, Леф[в?], Гурвіч), Гарадзенскага (супрацоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[660] ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 26.
[661] Siejbit: Druhaja, paśla lementara, čytanka dla pačatkowych škol / złažyŭ i wydaŭ W. Łastoŭski. Wilnia, 1918. 96 s.
[662] Wypisy z biełaruskaj literatury. Čaść I / złažyŭ i wydaŭ W. Łastoŭski. Wilnia, 1918. 80 s.
[663] Što treba wiedać koždemu biełarusu? Wilnia : Wyd-wo W. Łastoŭskaho, 1918. 22 s.
[664] ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 27.
[665] Тамсама.
[666] Тамсама. Арк. 23.

нікі – Фельдман, Пратусевіч, Бергер, Свірноўскі), Макоўскага (Вайткевіч, Віткоўская), крама яўрэйскіх кніг (супрацоўнікі – Рабіновіч, Хазановіч)[667].

Адначасова калегія аддзела забеспячэння Народнага камісарыята асветы лічыла "совершенно недопустимым производство каких-либо реквизиций без специальной каждый раз на то санкции Отдела Снабжения и без его общего руководства… Вместе с тем Коллегия Снабжения полагает, что производство учета не должно останавливать работ и операций частных книжных складов и таковые должны протекать в прежних пределах впредь до получения от Отдела Снабжения разрешения на производство реквизиции или проведение национализации. На основании изданного 14 сентября с. г. постановления Народного Комиссариата Просвещения, коим общий учет книжных запасов и реквизиции их <…> возложено исключительно на Центральный Отдел Снабжения Народного Комиссариата Просвещения"[668].

Але ніякія тагачасныя прашэнні, планы і спадзяванні на захаванне і развіццё прыватнай кніжнай справы ў горадзе, як і ў цэлым у савецкай краіне, не маглі быць рэалізаваны, таму што, як, да прыкладу, прама пішацца ў сакрэтнай запісцы аднаго з членаў Губернскага агенцтва, усё, а не толькі "самый светлый магазин (Городенского)" "будет принадлежать партии"[669].

## Мінскія кнігазборы

Да XIX – пачатку XX ст. адносяцца адны з першых публікацый польскіх і расійскіх аўтараў пра каштоўныя бібліятэкі з тэрыторыі Беларусі[670], у іх ліку адзначаюцца і некаторыя буйнейшыя прыватныя кнігазборы Мінска. Адсочвалі і асвятлялі бібліятэчна-бібліяграфічныя пытанні аб рарытэтах і тагачасныя мясцовыя аўтары (І. Легатовіч, А. Ельскі, А. Снітка). Таксама на пачатку XIX ст. Янам Ходзькам былі сабраныя звесткі пра бібліятэкі каталіцкіх кляштараў Мінска – праца была апублікавана (з пэўнымі выняткамі) толькі ў 1998 г.[671] У канцы XIX ст. у друку пачала закранацца і гісторыя мінскіх праваслаўных

---

[667] ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 41.

[668] Тамсама. Спр. 8. Арк. 95.

[669] Тамсама. Спр. 30. Арк. 51.

[670] *Radziszewski F.* Wiadomość historyczno-statystyczna o znakomitszych bibliotekach i archiwach, publicznych i prywatnych, tak niegdyś byłych jako i obecnie istniejących w krajach dawną Polskę składających, a mianowicie: w Królestwie Polskim, Galicyi, W. Ks. Poznańskim i Zachodnich guberniach Państwa Rosszjskiego porządkiem abecadłowym miejsc ułożona. Kraków : Druk. W. L. Anczyc, 1875. 126 s.; *Параделов М. Я.* Адресная книга русских библиофилов и собирателей гравюр, литографий, лубков и прочих произведений печати. Москва : Антикварное книжное отделение при магазине древностей и редкостей М. Я. Параделова, 1904. [2], II, 180 с.; *Шуманский Е. А.* Справочная книга для русских библиофилов и коллекционеров. Одесса : Типолитогр. А. Шульце,1905. XVII, 203 [4] с.

[671] *Chodźko [Jan] Ignacy Borejko.* Diecezja Mińska około 1830 roku. T. 1. Struktury parafialne / oprac. i wydał M. Radwan. Lublin : In-t Europy Środkowo-Wschodniej, 1998. 263 s.; *Chodźko [Jan] Ignacy Borejko.* Diecezja Mińska około 1830 roku. T. 2. Struktury zakonne / oprac. i wydał M. Radwan. Lublin : In-t Europy Środkowo-Wschodniej, 1998. 213 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кнігазбораў[672], на пачатку XX ст. праявілася цікавасць і да лёсаў базыльянскіх (уніяцкіх) бібліятэк[673].

Каб скласці цэласную карціну гісторыі кнігазбораў і бібліятэк Мінска, трэба звярнуцца да разнастайных крыніц: апублікаваных і неапублікаваных, бібліяграфічных і архіўных, а таксама да саміх асобнікаў з тых ці іншых кнігазбораў, якім пашчасціла захаваць сваю ўладальніцкую ідэнтычнасць дзякуючы адпаведным пазнакам – правененцыям (экслібрысам, пячаткам, маргіналіям). Рэшткі колішніх мінскіх кнігазбораў – манастыроў, цэркваў, семінарый, гімназій, вучылішчаў, грамадскіх арганізацый і прыватных бібліятэк (не менш як 150) (гл. Дадат. 8), выяўляюцца і сёння ў розных бібліятэках Мінска. Сучасная гісторыя многіх з іх пачыналася менавіта на аснове рэквізаваных, нацыяналізаваных фондаў былых бібліятэк (у 1919 г.), праўда, за савецкім часам перайначвалася ва ўладных інтарэсах, пераблытвалася без разумення і на шкоду калекцыйнай каштоўнасці кнігазбораў, і за кожным разам іх гісторыя несла вялікія страты, аддаляючы працу па навядзенні "мастоў" паміж мінулай і сучаснай гісторыяй бібліятэк.

Нельга сказаць, што лёс быў больш ашчадным да мінскіх кнігазбораў за часам Расійскай імперыі, наадварот, у гэты перыяд, асабліва да 1864 г., шэраг бібліятэк манастырскіх і царкоўных – "польскіх" – былі ліквідаваны, перамешчаны і ў выніку страчаны. Як адзначае У. Дзянісаў, у канцы XVIII ст. у Мінску існавала 11 каталіцкіх манастыроў[674], 5 уніяцкіх і адзін праваслаўны манастыр, кожны з іх меў уласныя кнігі, бібліятэкі. Большасць манастыроў у 1832 г., а потым у 1860-я гг. было зачынена: дамініканцаў (заснаваны ў 1605 г., зачынены ў 1832 г.), бернардзінцаў (1624–1866), бернардзінак (1633–1852), бенедыктынак (1633–1871), францысканцаў (1680–1832), бенедыктаў (1700–1832), баніфратаў (1700–1832), кармелітаў (1703–1799), рахітаў (1752–1832), марыявітак (1771–1832).

Буйнейшымі з манастырскіх кнігазбораў валодалі бернардзінцы (на 1817 г. – 2596 экз., на 1858 г. – звыш за 1000 тамоў)[675]. З гісторыі існавання вядома, што "klasztor miał dość liczną bibliotekę, – як занатаваў і Я. Ходзька, – zarówno jeśli chodzi o przedmioty nauk duchowych, jak i świeckich", налічвала 1532 тамы, аднак той кнігазбор, калі адбыўся пажар у манастыры ў 1809 г., цалкам згарэў[676]. Звесткі не толькі пра знішчальны пажар, але і пра неверагодна вялікі колькасны аб'ём кнігазбору прыводзяцца ў рукапісе "Wiadomości klasztoru Bernardynów

[672] *Николай.* Историко-статистическое описание минского Свято-Духова мужеского первоклассного монастыря // Минские епархиальные ведомости. 1879. № 8 (ч. неоф.). С. 99; *Вержболович М.:* 1) Первый период существования Минской духовной семинарии (1785–1817 г.) // Минские епархиальные ведомости. 1893. № 2 (ч. неоф.). С. 66–70; 2) Второй период существования Минской духовной семинарии (1817–1840 г.) // Там же. 1895. № 12 (ч. неоф.). С. 328–337; 3) Третий период существования Минской духовной семинарии (1840–1874 г.) // Там же. 1899. № 14 (ч. неоф.). С. 323–332.

[673] *Giżycki J. M.* Bazyliańskie klasztory unickie w obrębie prowincji białoruskiej // Przewodnik naukowy i literacki. Lwów, 1907. R. 35, nr 1–5; *Idem.* Z przeszłości zakonu bazyliańskiego na Litwie i Rusi // Ibid. 1904. R. 32, nr 1–5.

[674] *Денисов В.* Библиотеки минских католических монастырей XVIII–XIX веков. С. 419.

[675] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 256, 265, 266, 285, 340; Воп. 32. Спр. 186, 187.

[676] *Chodźko [Jan] Ignacy Borejko.* Diecezja Mińska około 1830 roku. T. 2. S. 97.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Mińskich…”: “Biblioteka zaś składająca się z 10 000 Ksiąg w roku 1835 przez pożar zniszczona została”[677]. Ці такая, ці іншая, але значная! лічба бернардзінскіх кніг была страчана. Паступова, дзякуючы фундушам, бібліятэка аднаўлялася і папаўнялася кнігамі, якія былі неабходныя для забеспячэння выкладання ў манастыры курса філасофскіх навук (“Studium Philosophicum”[678]) для клерыкаў, а таксама і для пачатковай школы, у якой навучалася звыш за 100 вучняў.

Ранейшы з захаваных інвентарных вопісаў манастырскай бібліятэкі мінскіх бернардзінцаў за 1796 г. быў скрупулёзна прааналізаваны Ю. Лаўрыкам, які адзначыў, з аднаго боку, тыповасць зместу яе фонду (рэлігійны, пераважна творы бернардзінцаў і езуітаў), а таксама і асаблівасці, звязаныя з прысутнасцю значнай колькасці назваў і экзэмпляраў падручнікаў у кнігазборы па граматыцы, рыторыцы, свецкай гісторыі, юрыспрудэнцыі, медыцыне, матэматыцы, паэтыцы, фізіцы, філасофіі. Удалося Ю. Лаўрыку адшукаць 2 рукапісныя асобнікі, што раней належалі мінскім бернардзінцам, а сёння захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь – гэта рукапісныя канспекты выкладаў па філасофіі, што чыталіся генеральнымі лектарамі для клерыкаў, датаваныя 1781 г. (напісаны ў Мінску) і 1786–1788 гг. (напісаны у Гродне)[679].

Наступны па колькасным складзе манастырскі кнігазбор Мінска ў некалькі сотняў тамоў мелі дамінікане: у 1709 г. – да 230 тамоў, у 1796 г. – да 361[680], у 1828 г. – 225 тамоў[681]. Каля 1830 г. у бібліятэцы было занатавана 70 тэалагічных кніг на лацінскай мове і 83 – на польскай мове “rozmaitej treści”[682]. Характэрныя рысы развіцця бібліятэкі дамініканаў і дынаміка фарміравання яе фонду прасочваюцца паводле двух найранейшых захаваных вопісаў за 1708–1709 гг.[683] і 1796 г.[684] Як зазначае Ю. Лаўрык, вылучаліся касцёльны літургічны кнігазбор і ўласна бібліятэка, пераважную большасць якой складалі тэалагічныя творы на лацінскай мове, паадзінкава былі прадстаўлены кнігі па-польску і па-італьянску, згрупаваныя ў першым вопісе адпаведна іх фармату: “Libri in folio”, “Libri in 4to”, “Libri in Octavo”; у другім вопісе – па 9 тэматычных раздзелах: “Libri Theologiae Speculativae”, “Libri Theologiae Moralis”, “Libri Philosophici”, “Libri Concionatorij”, “Kaznodzieje Polscy”, “Libri Historici”, “Libri pertinentes ad Jursprudentiam”, “Liber Ascetarum”, “Libri Miscelanei”. Адна з кніг, ідэнтыфікаваная паводле запісу ў ін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

677 VUB RS. F4-35677. A-2317: Wiadomości klasztoru XX. Bernardynów Mińskich… r. 1848. P. 2.

678 *Лаўрык Ю.* Кніжная культура мінскіх бернардзінцаў напрыканцы XVIII ст. // Нашыя святыні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвеч. 500-годдзю Мін. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўс. архідыяцэзіі, 220-годдзю Мін. дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрв. 2008 г. / Польскі Ін-т у Мінску ; рэдкал.: Т. Кандрусевіч [і інш.]; навук. рэд.: М. Каламайска. Мінск : Выд. В. Хурсік, 2009. С. 168.

679 Тамсама. С. 167–172.

680 *Лаўрык Ю.* Бібліятэка менскага канвенту дамініканаў у XVIII ст. // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4–5 верас. 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2010. С. 47.

681 НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 293, 349, 412; Воп. 32. Спр. 186.

682 *Chodźko [Jan] Ignacy Borejko.* Diecezja Mińska około 1830 roku. T. 2. S. 45.

683 Archiwum Dominikanów w Krakowie. Rkp. Pr–28. K. 231v.–232v.

684 НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 256. Арк. 34–36адв.; Воп. 32. Спр. 186. Арк. 2–7адв.

вентары 1796 г. як "Tractat po prostu Grzechy wstrząsający", па меркаванні даследчыка, магла быць напісана па-беларуску[685].

Фонд бібліятэкі быў старанна ўпарадкаваны ксяндзом Сіпалам: апрацаваны, расстаўлены і апісаны, меўся "katalog działowy" (сістэматычны)[686]. У сувязі з тым, што ў кожным дамініканскім канвенце была школа і асвета займала важнейшае месца ў іх дзейнасці, то і "podstawowym warsztatem takiej pracy musiała być dobrze zorganizowana biblioteka", некаторыя з асобнікаў якой, як зазначае І. Пятшкевіч, дзякуючы правененцыям, знойдзены ў зборах польскіх бібліятэк у Кракаве[687].

Невялікія кніжныя зборы ў Мінску, як занатаваў іх колькасць Я. Ходзька, былі ў манастыры сёстраў бенедыктынак (24 тамы)[688], айцоў кармелітаў (35)[689], братоў баніфратаў (36 тамоў друкаваных і рукапісных кніг на лацінскай мове, 18 – на польскай)[690]. Паводле ж захаваных вопісаў некаторыя з прыведзеных колькасных даных могуць быць удакладнены. Так, да прыкладу, кнігазбор мінскіх кармелітаў у 1799 г. налічваў 112 кніг, якія пасля касацыі ордэна былі перададзены ў бібліятэку кляштара францысканцаў, і, такім чынам, у 1800 г. бібліятэка мінскіх францысканцаў склала 245 кніг (113 – ад кармелітаў). Сціплыя зборы бібліятэк мінскіх баніфратаў і рахітаў, а таксама іх тэматычны склад могуць быць патлумачаны харытатыўнай (дабрачыннай) медыцынскай дзейнасцю манахаў[691] (гл. Дадат. 9).

Перамяшчэннем кляштарных бібліятэк пасля іх закрыцця, разборам і размеркаваннем кнігазбораў займаўся спецыяльна створаны Мінскі губернскі камітэт[692], у склад якога ўваходзіў і губернскі радца, калежскі асэсар, вядомы мінскі калекцыянер Юры Кабылінскі. Як гэта паўплывала на лёсы пакляштарных кнігазбораў з цэлай губерні, што звозіліся ў будынак Мінскай ратушы, цяжка сказаць. Праўда, паводле складзеных у 1841 г. Мінскім губернскім камітэтам каталогаў "для распределения помонастырских библиотек"[693], як спрабаваў высветліць літоўскі вучоны Арвідас Пацявічус, асноўнымі месцамі захавання 23 скасаваных манастырскіх бібліятэк Міншчыны (усяго 6578 экз., з іх 138 –

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

685 *Лаўрык Ю.* Бібліятэка менскага канвенту дамініканаў у XVIII ст. … С. 47.

686 Паводле цыт. І. Пятшкевіч (*Pietrzkiewicz I.* Zakonnicy i książki. O bibliotekach klasztorów męskich Mińska // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 7. С. 11): "Biblioteka. Którey wszystkie księgi znazdujące się za staraniam y przełożeństwem Jmci Xiędza Sipały są rozgatunkowane y wkażdey materyi zasobne w szafach porządnie złozone, wielkiemi Literami w górze, a w dole Numerem oznaczone, y swym porządkiem wciagniete do osobnego nato Sporządzonego Regestru ztymże Rozgatunkowaniem y ztymiz Literami, któren zaw[żdy] w pomienionej Bibliotece znaydować się powinien z podpisem y pieczęcią Wizytatora". Гл. таксама: НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 239. Арк. 11адв.

687 *Pietrzkiewicz I.* Zakonnicy i książki… С. 11.

688 *Chodźko [Jan] Ignacy Borejko.* Diecezja Mińska około 1830 roku. T. 2. S. 27.

689 Ibid. S. 124.

690 Ibid. S. 127.

691 *Pietrzkiewicz I.* Zakonnicy i książki… С. 20–23.

692 *Pacevičius A.* Vienuolynų bibliotekos Lietuvoje 1795–1864 metais: dingęs knygos pasulis … P. 83–85.

693 VUB RS. F. 3. B. 165: Каталог наличным книгам по части Духовной составленный комитетом для распределения помонастырских библиотек, установленным в г. Минске … 1841 года (закрытые в1841 году); VB LMA RS. F. 22. B. 29: Каталог книгам предположенным для публичной библиотеки, составленный Комитетом для распределения помонастырских библиотек, установленным в Губернском городе Минске 1841 года.

мінскіх дамініканаў і 138 экз. – мінскіх францысканцаў) сталі Мінская духоўная (праваслаўная) семінарыя, Рымска-каталіцкая семінарыя і Пецярбургская Імператарская публічная бібліятэка[694]. Польскім даследчыкам Міхалам Шулькіным адзначалася таксама, што багатыя бібліятэкі пасля ліквідавання ў 1832 г. каталіцкіх кляштараў былі ў пераважнай большасці "wcielone do Wileńskiej Biblioteki Publicznej, tworząc jej fundamenty"[695]. Заставаліся, відаць, яшчэ кнігі і ў будынку Мінскай ратушы, а магчыма штосьці трапіла і ў прыватныя зборы ці ўсё ж згарэла ў пажары 1841 г. ці 1842 г.?[696]

Многія кнігі гінулі ў агні не толькі з-за стыхійных пажараў, але і ў выніку рэлігійных змаганняў. Так, на працягу ўсіх 1853–1855 гг. Літоўскай духоўнай кансісторыяй было спалена каля 2000 уніяцкіх выданняў, у іх ліку 14 службаў Іасафату Кунцэвічу[697]. Сляды ўцалелых кляштарных кнігазбораў, згубленыя ў страчаных і перамешчаных прыватных кнігазборах (напрыклад, Г. Х. Татура), вядуць у Вільню, Санкт-Пецярбург, Маскву, Варшаву, Кракаў, Кіеў, Львоў і г. д.[698] У Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбурзе зараз захоўваюцца вопісы царкоўнай і манастырскай маёмасці беларускіх манастыроў, а таксама збор канфіскаваных богаслужэбных кніг[699].

Аднак і ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ёсць рэшткі некаторых вопісаў і інвентароў, што захаваліся з XVIII–XIX стст., пералічаных манастырскіх бібліятэк (гл. Дадат. 9). Да прыкладу, у дапаўненне да адзначаных каталіцкіх кнігазбораў – "Inwentarz Wizyty" касцёла і шпіталя братоў рахітаў (у спісе 14 назваў кніг у 15 тамах)[700] ці праваслаўных – спіс бібліятэкі Мінскага кафедральнага Петра-Паўлаўскага сабора[701]. Так, паводле "Описи книгохранилища и письменности" за 1816 – 1868 гг. у саборы св. Пятра і Паўла налічвалася каля 120 назваў выданняў пераважна XVIII – XIX стст., надрукаваных ў Маскве, С.-Пецярбурзе і Кіеве, два – XVII ст.: "Слово о Священстве" (Львоў, 1614), "Требник Петра Могилы" (Кіеў, 2646). У ліку богаслужэбных выдзяляюцца "Служебники Архиерейские" (Масква, 1788, 1798), апраўленыя ў зялёны і блакітны аксаміт, са срэбнымі элементамі: сярэднікамі, навугольнікамі, пуклямі, "Священнические служебники" (Кіеў, 1806, 1863) у скураным пераплёце і малінавым аксаміце. Акрамя кніг для багаслужэння і царкоўных спеваў, была

694 *Pacevičius A.* Vienuolynų bibliotekos Lietuvoje 1795–1864 metais: dingęs knygos pasulis … P. 83–85.

695 *Szulkin M.* Zamykanie bibliotek polskich na Litwie po roku 1863 // Przegląd Historyczny. Warszawa, 1932. T. 10 (30). S. 87.

696 Ibid. S. 86.

697 *Киприанович Г. А.* Жизнь Иосифа Семашки митрополита Литовского и Виленского и воссоединение западно-русских униатов с православною церковью в 1839 г. Вильна : Тип. И. Блюмовича,1897. С. 321–322.

698 *Караў Д.* Архіўная спадчына Вялікага Княства Літоўскага і беларускія архівы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. // Спадчына. 1996. № 1. С. 3–25; *Запартыка Г.* Страчаныя скарбы манастырскіх бібліятэк // Тамсама. 1997. № 5. С. 40–53.

699 *Нікалаеў М.* Праблема супрацоўніцтва пры выкарыстанні кніжнай спадчыны Беларусі, што захоўваецца ў бібліятэках, архівах і музеях Санкт-Пецярбурга // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 чэрв. 1997 г. / пад рэд. А. Мальдзіса. Мінск : Нац. навук.-асвет. Цэнтр імя Ф. Скарыны, 1997. С. 103.

700 НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 268. Арк. 5адв.

701 Тамсама. Ф. 124. Воп. 1. Спр. 121. Арк. 1–8адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлена таксама патрыстыка і гамілетыка і іншыя рэлігійна-павучальныя і тлумачальныя выданні.

Пасля адкрыцця Свята-Духава манастыра ў Мінск у 1870 г. сюды быў перавезены архіў і бібліятэка Слуцкага Свята-Троіцкага манастыра. Яшчэ ў 1494 г. на манастырскую маёмасць быў складзены першы вопіс. У агульным пераліку рэчаў значыліся 45 рукапісаў манастырскай бібліятэкі[702]. З таго часу бібліятэка зведала шмат змен. У Мінск архіў і бібліятэка трапілі ў "разбітым стане, без вопісу", а пасля былі прыведзены ў парадак. "Самые разнородные бумаги, восходящие древностью до 1754 г., были рассортированы по их содержанию, затем – по хронологии, составив т. о. отдельные тома в количестве 165, которые переплетены в отдельные книги"[703]. На ўсе справы, акты і граматы (ад XV ст.) былі складзены асобныя вопісы. Частка матэрыялаў была надрукавана ў "Собрании древних грамот" (Мінск, 1848), у "Историко-статистическом описании Минской епархии"(Мінск, 1864) і ў "Минских епархиальных ведомостях" (1870–1871). У 1913 г. А. К. Снітка змясціў у "Минской старине" апісанне архіву Слуцкага (Трайчанскага) манастыра, які ў той час згодна з распараджэннем Мінскай кансісторыі быў перамешчаны ў бібліятэку Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта.

На пачатку стварэння Камітэта ў якасці важнейшых клопатаў яго супрацоўнікаў было: "собрать необходимую научную библиотеку, без которой немыслима разработка научных материалов, и 2) положить начало архиву и древлехранилищу, дабы не дать погибнуть и без того быстро исчезающим памятникам старины"[704]. Асноўнай крыніцай папаўнення бібліятэкі былі ахвяраванні, а таксама абмен выданнямі з навуковымі ўстановамі – гэта Віленская камісія для разбору старажытных актаў, Румянцаўскі музей, Мінскі губернскі статыстычны камітэт і інш. Сярод прыватных асоб, якія зрабілі значныя і каштоўныя дары для бібліятэкі – А. Далгоў-Сабураў (47 экз.), А. Снітка (42), Д. Скрынчанка (39), святар Ленскі (22), святар Юрашкевіч (19), святар Гаховіч (17), удава Г. Татура, І. Луцкевіч. У выніку атрыманых за першы год існавання Камітэта ахвяраванняў была створана бібліятэка, у якой выдзяляліся: "Отдел Рукописный" ("рукописи славянские и руские" – 24 экз., "рукописи польские" – 24, "рукописи латинские" – 1 экз.); "Отдел печатных изданий" ("славянские" – 18 экз., "польские" – 17, "латинские" – 5, "на других языках" – 3, "русские" – 120 экз.). На 1910 г. бібліятэка Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта налічвала каля 2000 тамоў. У музеі Камітэта зберагалася і частка прыватнай калекцыі Г. Х. Татура, пра некаторыя з рарытэтаў, як і пра самога ўладальніка, неаднаразова ўзгадвалася на старонках "Минской старины" (напрыклад, у 1911 г. – Вып. 2. С. 144–145, 184, 262).

Пад час Першай сусветнай вайны бібліятэка і музей Камітэта былі эвакуіраваны ў Разань, у 1922 г. вярнулася толькі частка бібліятэкі, якая была перададзена Беларускаму дзяржаўнаму музею (сёння – Нацыянальны гістарычны

---

702 *Покало М. И.* История библиотечного дела в БССР. Минск : Выш. шк., 1986. С. 10.

703 *Николай.* Историко-статистическое описание минского Свято-Духова мужеского первоклассного монастыря. С. 99.

704 Минская старина. 1909. Вып. 1. С. 154.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музей Рэспублікі Беларусь) і Дзяржаўнай бібліятэцы (Нацыянальная бібліятэка Беларусі).

Сляды дадзенага кнігазбору, як можна заўважыць, і адшукваюцца ў адпаведных сучасных беларускіх нацыянальных сховішчах. У свой час спрабавалі прасачыць лёс некаторых мінскіх кнігазбораў А. Шлюбскі, а пазней – В. Цыбуля[705] і інш.[706] Як вядома, не толькі рэлігійныя змены і палітычныя рэпрэсіі паўплывалі на прымусовы "рух" кніг і бібліятэк у розных кірунках, ды з тэрыторыі Беларусі. Так, у 1837 г. загадам Мікалая І пачалася адсылка з беларускіх гарадоў грамат і "сталбцоў" у Пецярбургскую Археаграфічную камісію, у выніку з многіх бібліятэк было забрана "множество редких рукописей"[707]. У сваю чаргу, Мінскі гурток Варшаўскага таварыства апекі над помнікамі мінуўшчыны на працягу XIX ст. займаўся так званай аховай культурнай спадчыны, якая мела каштоўнасць для польскай дзяржаўнасці, ад вывазу ў Расію. У 20-я гг. XX ст. пэўная частка збораў Мінскага гуртка, пазначаная пячаткай гэтай арганізацыі, была перавезена ў сховішчы Нацыянальнага музея ў Варшаве[708].

"Асядалі" рарытэты і ў мясцовых прыватных кнігазборах, але і гэта іх не выратоўвала ад чарговых перамяшчэнняў ці страт. У XIX ст. у Мінску існавала не менш як 20 значных прыватных кнігазбораў, сярод якіх можна вылучыць бібліятэкі-чытальні (Чапляліньскага), бібліятэкі пры кнігарнях (Гадлеўскага, Гарадзенскага, Савіцкай, Адамовіча, Фрумкіна, Фрэнкеля, Макоўскага), "хатнія кабінеты" (Кабылінскага, Гаўсмана), бібліятэкі-калекцыі (Вітаноўскага, Татура, Легатовіча, Зубакіна, Бампі, Рабіновіча).

Паводле расійскіх бібліяфільскіх даведнікаў Парадзелава і Шуманскага, да прыкладу, у кнігазборы Генрыха Татура было каля 6500 тамоў славянскіх, расійскіх і польскіх твораў[709]. Гэта быў адзін з багацейшых мінскіх прыватных кнігазбораў XIX ст. Напаўненнем сваёй калекцыі Г. Татур пачаў займацца "с 14-летнего возраста… собирая памятники местной старины"[710]. З цягам часу аматарскае захапленне набыло прафесійны характар – гісторыка-археалагічны, краязнаўчы. У 1892 г. у Мінску асобным выданнем была надрукавана яго праца "Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и её археологическое значение". Дзякуючы Г. Татуру быў упарадкаваны археалагічна-этнаграфічны музей пры Мінскім губернскім статыстычным камітэце, у якім было каля 1000 тамоў "dawnych druków polskich i lacinskich, z bibliotek

---

705 *Шлюбскі А.* Матэрыялы да крыўскае гісторапісі: Доля кнігасховаў і архіваў // Крывіч. 1925. №9 (1). С. 19–68; *Цыбуля В. А.* Первые библиотеки в Минске. С. 25–30; *Яе ж.* Первые библиотеки Минска // Неман. Минск, 1968. №9. С. 182–184.

706 Звесткі пра лёсы некаторых кнігазбораў з Мінска гл. таксама: *Калубовіч А.* Мова ў гісторыі беларускага пісьменства // Крокі гісторыі: Дасьледаваньні, артыкулы, успаміны / А. Калубовіч. Беласток ; Вільня ; Менск : Наша Ніва ; Мастац. літ., 1993. С. 167–277.

707 *Шлюбскі А.* Матэрыялы да крыўскае гісторапісі … С. 21.

708 *Стэпняк У.* Беларуская дакументальная спадчына ў Польшчы // Беларуская мінуўшчына. 1996. №2. С. 58–61.

709 *Параделов М. Я.* Адресная книга русских библиофилов… С. 116; *Шуманский Е. А.* Справочная книга для русских библиофилов… С. 108.

710 Минская старина. 1909. Вып. 1. С. 6.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

poklasztornych"[711]. Па іншых звестках, гэта была ўсё ж частка прыватных збораў Г. Татура, часова размешчаная ў Статыстычным камітэце, сябрам якога ён з'яўляўся[712]. Пазней кнігі ўліліся ў склад музея і бібліятэкі Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта. Незадоўга перад смерцю Г. Татур зрабіў частковае апісанне сваёй прыватнай калекцыі: абразоў і карцін, але не кніг.

Некаторыя матэрыялы аб кнігазборы Татура сабраў З. Даўгяла[713]. Сярод іх: "№ 1. Протокол Общего собрания Академии наук за № 118. 1907 г., апреля 7; № 2. Доклад Всев. Измаил. Срезневского о библиотеке и Музее Татура в Минске на основании личного ознакомления 2–4 апреля 1907 г.; № 3. Выдержка из писем 1907 г. Андрея Константиновича Снитки к Всеволоду Измаиловичу Срезневскому; № 4. Описание библиотеки и собраний Г. Х. Татура, составленное после смерти для Академии Наук Евгенией Александровной Масальской-Сурин (урожденной Шахматовой, которая жила в 1907 году в Минске)"[714].

Так, у вопісе кніг у аддзеле манускрыптаў значылася 48 рукапісаў XIV–XIX стст. (напрыклад, кнігі з Бібліятэкі Радзівілаў, з мінскіх бенедыкцінскіх збораў), сярод друкаваных – Біблія Скарыны, Статут ВКЛ 1529 г., Біблія на польскай мове (Кракаў, 1540) і г. д. Вызначыўшы каштоўнасць калекцыі, тым не менш Расійская акадэмія навук прапанавала за яе ўсяго 1000 руб., калі ўладальнікі ацэньвалі яе вартасць у 200–300 тысяч. Амаль уся калекцыя Г. Татура была распрададзена розным прыватным асобам, калекцыянерам: трапіла да Тышкевічаў у Лагойск і пад Вільню (у Чырвоны Двор), у Львоўскі музей у зборы графа Рамана Шэптыцкага (праз Івана Луцкевіча), у бібліятэку Урублеўскіх у Вільні. Да сёння даследчыкаў не пакідае цікавасць, і яны спрабуюць шукаць сляды калекцыі. Пра яе пакупку Львоўскім нацыянальным музеем пісалі А. Хадыка і Ю. Піскун[715], пра Г. Татура і калекцыянерскае асяроддзе Мінска – А. Радкевіч[716], А. Дзярновіч[717] і інш. У Літоўскім гістарычным архіве захоўваецца, да прыкладу, ліставанне Г. Татура з Эмерыкам Чапскім[718], Антоніем Радзівілам[719] па справах продажу тых ці іншых антыкварных прадметаў, таксама ў іх ліку кніжных. Што дае падставы для далейшых даследаванняў і распрацовак у галіне гісторыі беларускага бібліяфільства.

---

[711] *Chmara A., Jelski A.* Mińsk // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa : Nakł. W. Walewskiego; Druk. "Wieku" [etc.], 1885. T. VI. S. 468.

[712] *Жмуроўскі А.* Мінскі царкоўна-археалагічны музей // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. 1999. Т. 5. С. 196.

[713] *Даўгяла З. І.* Матар'ялы аб музэі Г. Х. Татура ў Менску // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Менск, 1929. Кн. 8 (Працы клясы гісторыі ; т. 3). С. 553–559.

[714] *Радкевич О.* Минские библиофилы начала XX века: Татур и Зубакин // Здабыткі. Дакум. помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. Мінск, 2005. Вып. 7. С. 183.

[715] Вяртання маўклівая споведзь : Постаці творцаў беларускай гісторыі : гіст.-літ. зб. Мінск : Выш. шк., 1994. С. 17–19.

[716] *Радкевич О.* Минские библиофилы начала XX века: Татур и Зубакин // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. 2005. Вып. 7. С. 158–184.

[717] *Дзярновіч А.* Мінскі антыквар і археолаг Генрых Татур ва ўспамінах і ліставанні // Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. / Польскі Ін-т у Мінску. Мінск : Выд. В. Хурсік, 2011. Вып. 6: Мінск і мінчане ў літаратурных творах на рубяжы XIX–XX стст. С. 178–183.

[718] LVIA. F. 716. Ap. 4. B. 217.

[719] Ibid. B. 222.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значны прыватны кнігазбор, занатаваны ў свой час Ф. Радзішэўскім[720], меў у Мінску член гарадской думы Дамінік Вітаноўскі. Яго бібліятэку складалі да 6 тыс. тамоў па гісторыі, праве, бібліяграфіі, белетрыстыцы (большасць на польскай мове). Пасля смерці Вітаноўскага ў 1848 г. кнігазбор быў распрададзены[721].

У складзе хатняй музейнай калекцыі існаваў і кнігазбор Міхаіла Гаўсмана (1817–1889), гісторыка, краязнаўца, археолага, які з пачатку 1840-х гг. жыў у Мінску (з 1841 г. – на службе ў канцылярыі "Минского дворянского депутатского собрания", з 1850 г. – яго сакратар)[722], удзельнічаў у археалагічных даследаваннях К. Тышкевіча. У 1854 г. дапамагаў У. Сыракомлю ў зборы матэрыялаў да яго гістарычнай манаграфіі пра Мінск, а пазней і сам займаўся гэтай тэмай, вынікам якой стала праца "Историческое описание губернского города Минска и губернии", засталася ў рукапісе і сёння захоўваецца ў Пушкінскім Доме ў Санкт-Пецярбурзе. Праўда, асобныя фрагменты сабраных М. Гаўсманам матэрыялаў выкарыстоўваліся ў публікацыі пра Мінск А. Смародскім (у "Памятной книжке Минской губернии" на 1891 і 1892 гг.), а таксама былі апублікаваны У. Дзянісавым[723].

З 1857 г. па 1863 г. у доме, пабудаваным М. Гаўсманам (пазней належаў Э. Чапскаму) у Мінску, размяшчаўся гарадскі клуб з бібліятэкай і залай для канцэртаў. За падтрымку "польского дела"[724] ў 1863 г. М. Гаўсман быў арыштаваны, вярнуўся ў Мінск у 1876–1877 гг. і працягваў займацца археалогіяй, калекцыяніраваннем. З публікацыі ў "Минских губернских ведомостях" вядома пра "Минскую частную выставку достопримечательностей разного рода"[725], у арганізацыі якой актыўны ўдзел браў М. Гаўсман, выставіўшы таксама 86 прадметаў з уласнай калекцыі. Невядома, аднак, ці былі там прадстаўлены кніжныя рарытэты калекцыянера, хоць на выставе 16 "старинных, замечательных книг и рукописей"[726] прэзентаваў бібліяграфічны аддзел. Паводле ўспамінаў сучаснікаў, М. Гаўсман з'яўляўся вялікім знаўцам даўніны і яе збіральнікам[727].

Пад неаднаразовае перамяшчэнне трапіў прыватны кнігазбор калежскага асэсара Юрыя Кабылінскага (1778? – 1858)[728], у "хатнім кабінеце" якога, як называлі калекцыю, размяшчаліся не толькі карціны розных мастакоў ці абразы,

---

[720] *Radziszewski F.* Wiadomość historyczno-statystyczna… S. 49.

[721] *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku … S. 87–90.

[722] *Денисов В. Н.* К истории одной неопубликованной книги // Книга в Белоруссии : сб. / ЦНБ им. Я. Коласа АН БССР ; редкол.: Г. Я. Голенченко [и др.]. Минск, 1988. С. 125.

[723] Тамсама. С. 125–139.

[724] Rok 1863 na Mińszczyznie (Materjały archiwum wydziału III b. Kancelarji Cesarskiej) = 1863 год на Меншчыне = L`an 1863 dans le district de Minsk / J. Witkowski, O. Janiewicz, L. Lech. Mińsk : Nakładem In-tu kultury białoruskiej, 1927. S. 10: "Имеются сведения, будто-бы секретарь Минского Дворянства, колежский секретарь Михаил Гаусман, отправился недавно заграницу, повез собранные здесь от помещиков деньги в значительном числе в пользу польского дела. Полковник Рейхарт".

[725] Минская частная выставка достопримечательностей разного рода // Минские губернские ведомости. 1880. 19 апр. С. 216–217.

[726] Тамсама.

[727] Kraj. 1889. Nr 43. 27 paźdz. S. 16.

[728] Таксама запісаны як "Кобылинский Егор Севастьянович". Гл.: *Сакалоўская А. С.* Кальварыя. Мінск : Касцёл св. Сымона і св. Алены, 1997. С. 84.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але і старыя выданні і манускрыпты[729]. Віленскі губернатар Ф. Я. Міркові́ч, які 30 чэрвеня 1840 г. аглядаў археалагічную і нумізматычную калекцыі Кабылінскага, адзначыў, што бачыў таксама і Статут Вялікага Княства Літоўскага, мапу Хрыстафора Калумба. З. Кавалеўска занатавала мапу як геаграфічны атлас 1560 г. Свае здабыткі Ю. Кабылінскі паказваў толькі выбраным і добрым знаўцам, у тым ліку і выкладчыкам Мінскай гімназіі[730].

Сярод выкладчыкаў Мінскай гімназіі таксама было шмат знаўцаў і аматараў кнігі, якія незалежна ад пануючай палітычнай кан'юнктуры займаліся фарміраваннем уласных кнігазбораў, даступных і іншым. Гэта спрыяла дэмакратызацыі чытання не толькі ў навучальнай установе, але нават і ў горадзе. Ва ўспамінах Т. Корзана, З. Кавалеўскай падаюцца некаторыя звесткі аб бібліятэцы-чытальні Фларыяна Чапяліньскага, выкладчыка польскай мовы ў гімназіі, аўтара польскай граматыкі, выдадзенай у Мінску. Бібліятэка-чытальня Ф. Чапялінскага была адкрыта ў 1853 г. і існавала за кошт невялікай платы за чытанне. Аднак чытанне польскай літаратуры было небяспечным і праследавалася самім дырэктарам гімназіі[731]. Многія вучні старэйшых класаў гімназіі ўдасканальвалі свае веды ў латыні, беручы прыватныя ўрокі ў колішняга прафесара гімназіі Ігната Легатовіча. Ён меў багаты кнігазбор польскай літаратуры з унікальных выданняў і склаў яго бібліяграфію[732]. Пасля смерці Легатовіча сабраныя кнігі перайшлі ў Галоўную бібліятэку Варшавы[733]. У другой палове XIX ст. існавалі таксама тайныя кнігазборы мінскіх гімназістаў, да прыкладу "Польскі самаадукацыйны гуртуок" – "Koło samokształceniowe" (з 1882 г.) і заснаваная ў 1891 г. "Польская вучнёўская бібліятэка" – "Polska Uczniowska Biblioteka"[734].

У кнігазборы выкладчыка-філолага Мінскай мужчынскай гімназіі, а потым і ўладальніка прыватнай гімназіі[735] Сяргея Пятровіча Зубакіна (канец 1840-х гг. – 1918 г.) у XIX – пачатку XX ст. налічвалася каля 10 000 тамоў па гісторыі, прыродазнаўстве, усеагульнай і расійскай славеснасці[736]. Кнігі са збору Зубакіна былі пазначаны пячаткай (у трох варыянтах), а таксама экслібрысам. Паводле ўспамінаў А. Уласава, "Беларуская рада ў Менску збіралася адкупіць яго вялікую бібліятэку, каторая асталася ў Менску пасля яго смерці"[737]. Аднак бібліятэка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

729 *Грыцкевіч В., Мальдзіс А.* Шляхі вялі праз Беларусь. Мінск : Мастац. літ., 1980. С. 257.

730 *Kowalewska Z.* Obrazki Mińskie… S. 32.

731 *Korzon T.* Mińsk w połowie XIX wieku… S. 19; *Kowalewska Z.* Obrazki Mińskie… S. 57.

732 *Starnawski J.* Legatowicz Ignacy Piotr // Słownik pracowników książki polskiej / pod. red. I. Treichel. Warszawa ; Łódź : Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1972. S. 501.

733 *Radziszewski F.* Wiadomość historyczno-statystyczna… S. 49.

734 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 92–93; *Рамаnoўскі А.* Польскія культурныя ініцыятывы на Беларусі ў 1864–1905 гг. // Шляхам стагоддзяў : матэрыялы дзвюх канф. аднаго года : Ягелонскі ўн-т (Кракаў), 20–25 лют. 1989 г. ; Беларус. ун-т (Мінск), 23–28 кастр. 1989 г. / пад рэд. А. А. Лойкі. Мінск : Універсітэцкае, 1992. С. 51.

735 Минская частная мужская гимназия С. П. Зубакина и К. О. Фальковича (1906–1920).

736 *Параделов М. Я.* Адресная книга русских библиофилов и собирателей гравюр, литографий, лубков и прочих произведений печати. С. 43; *Шуманский Е. А.* Справочная книга для русских библиофилов и коллекционеров. С. 38.

737 *Уласаў А.* Дні жыцця // Шляхам гадоў : гіст.-літ. зб. Мінск : Мастац. літ., 1990. С. 158.

была рэквізавана бальшавікамі і паступіла ў распараджэнне бібліятэчнай камісіі, стаўшы "базай для папаўнення" існуючых і ствараемых бібліятэк[738].

З дзесяцітысячнага прыватнага кнігазбору С. П. Зубакіна сёння ў бібліятэках Мінска апазнаецца каля 60 выданняў XVII–XIX стст. Адна са старэйшых кніг калекцыі Зубакіна – філасофскі трактат Дыягена (Амстэрдам, 1692) – Diogenis Laertii. De vitis, dogmatibus apophtegmatibus glarorum philosophophorum – знаходзіцца зараз у аддзеле рэдкіх кніг Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – помнік нацыянальнага пісьменства і кнігадруку на старабеларускай мове супральскае выданне Л. Кішкі "Собрание припадков краткое" (1722), "Histoire générale de Pologne" (Парыж, 1750) і "История о покорении Мексики" А. Соліса (Санкт-Пецярбург, 1765), "Деяния Петра Великого, мудрого преобразователя России, собранные из достоверных источников и расположенные по годам" І. І. Голікава (Масква, 1788–1789), "Видимый мир = Orbis visibiles" Я. А. Каменскага (Масква, 1788) і інш. У Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці зберагаецца вопіс (спіс) бібліятэкі С. П. Зубакіна[739], праўда, далёка не поўны і схематычны. Аднак пры далейшых пошуках магчыма паспрабаваць ажыццявіць яго бібліяграфічную рэканструкцыю.

Пра кнігазбор Тадэвуша Корзана, які ў свой час вучыўся ў Мінскай гімназіі, няма звестак. Аднак у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі знайшлося некалькі кніг з уладальніцкай пячаткай і запісамі Т. Корзана, напрыклад "Pamiętnik Teodora Jewłaszewskiego, nowogrodzkiego podsędka, 1546–1604" (Варшава, 1860). У канвалюце – пераклады А. Нарушэвіча: "Dzieła wszystkie" (Варшава, 1772. Т. 1) Тацыта і "Historya Jana Karola Chodkiewicza" (Варшава, 1781. Т. 2) з запісам на форзацы: "Od pana Stankiewicza. 1890".

Значнымі кнігазборамі ў Мінску валодалі і бібліятэкі навучальных устаноў[740]: духоўных – грэка-каталіцкай (уніяцкай), праваслаўнай, рымска-каталіцкай семінарый; свецкіх – Мінскай гімназіі і Рэальнага вучылішча.

Адным са старэйшых мінскіх кнігазбораў па часе свайго заснавання з'яўлялася бібліятэка Мінскай гімназіі, створаная на аснове фондаў бібліятэкі школы езуітаў (1654 г.), якая ў 1773 г. была перайменавана Адукацыйнай камісіяй у свецкую, а з 1803 г. стала дзейнічаць як губернская гімназія. У 1805 г. "JP. Melchior Wołodkowicz, Deputat szlachecki Gubernii Mińskiej Powiatu Wileyskiego" ахвяраваў бібліятэцы 469 тамоў, з якіх 361 – на польскай, а астатнія на французскай і нямецкай мовах[741]. Перад тым, як быць разрабаванай французамі ў 1812 г., фонд бібліятэкі налічваў 7500 асобнікаў[742], пасля захавалася ўсяго 600 тамоў лацінскіх філасофскіх і тэалагічных твораў з езуіцкага кнігазбору, а таксама каля

---

738 *Ошерович С. О.* К истории библиотечного дела в городе Минске // Библиотечное дело в БССР: (Из истории библиотек республики) / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина ; ред. Н. М. Колоско, А. Т. Меламед. Минск, 1969. С. 27.

739 ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 195–209; Спр. 38. 10–37.

740 У 1913/1914 навуч. годзе у Мінску налічвалася 62 навучальныя ўстановы, якія, як правіла, мелі свае бібліятэкі.

741 Gazeta Literacka Wileńska. Wilno, 1806. 28 kwietnia (N 17). Słp. 258.

742 *Цыбуля В. А.* Первые библиотеки в Минске // Доклады к XI конференции молодых ученых Белорусской ССР (ноябрь 1967 г.) / АН БССР; редкол.: Н. Е. Завалеев [и др.]. Минск : [б. и.], 1967. С. 27–30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

300 выданняў на польскай мове[743]. У 1835 г. загінуў у агні расійскі аддзел бібліятэкі (S. 15).

Змяніў лёс кнігазбору Мінскай гімназіі і 1863-і год. Палітычнае супрацьстаянне польскага і расійскага бакоў найперш адбілася на стане адукацыі: гімназія павінна была быць чыста расійскай, а таму ўсе кнігі і перыядычныя выданні на польскай мове былі выключаны з гімназіі[744]. Фонд жа стаў паступова папаўняцца за кошт абавязковай рассылкі расійскай літаратуры кнігарнямі пры губернскіх гімназіях: з Санкт-Пецярбурга – ад Смірдзіна і Глазунова, з Масквы – ад Шыраева, з Вільні – ад Завадскага, Сыркіна, Марціноўскага і г. д.[745] Калі ў 1840 г. фонд бібліятэкі налічваў 2330 тамоў[746], а ў 1863 – 3306 тамоў (1491 назва), 88 геаграфічных мапаў і атласаў[747], то ў 1888 г. ён ужо складаў 11 032 тамы (4945 назваў)[748]. Бібліятэка падзялялася на фундаментальную і вучнёўскую, а таксама мела аддзяленне "руководств и пособий"[749]. Акрамя куплі кніг, бібліятэка павялічвала свае фонды за кошт ахвяраванняў, якія атрымлівала ад выдаўцоў і аўтараў. Так, у справаздачы гімназіі за 1891/1892 г. адным з важнейшых набыткаў бібліятэкі лічыўся падарунак М. Доўнар-Запольскага – "Очерк истории кривичской и дреговичской земли до конца XII столетия"[750]. У "Słowniku geograficznym" бібліятэка Мінскай гімназіі называецца найважнейшым навуковым зборам у Мінску, у якім "nie mało starych i pozniejszych druków polskich, zebranych z dawnych zakladów naukowych i bibliotek poklasztornych"[751]. Як відаць, кнігі на польскай мове ўсё ж заставаліся ў бібліятэцы, што стала прэцэдэнтам таму, што частка кнігазбору Мінскай гімназіі трапіла пасля ў Польшчу[752].

Бібліятэка Мінскай духоўнай (праваслаўнай) семінарыі, кнігі з якой таксама ідэнтыфікуюцца ў сучасных буйнейшых бібліятэчных зборах, трапіла ў Мінск са Слуцка ў 1840 г., калі сюды была пераведзена Духоўная семінарыя [753]. Гісторыя бібліятэкі, як і самой семінарыі, пачалася яшчэ ў 1785 г. Некаторы агляд фарміравання кнігазбору бібліятэкі на працягу 1785–1874 гг. можна скласці з публікацый М. Вержбаловіча ў "Минских епархиальных ведомостях" за 1893, 1895, 1899 гг.[754] Большая частка кніг фундаментальнай бібліятэкі прадстаўле-

---

743 *Kowalewska Z.* Obrazki Mińskie: 1850–1863. Wilna : Nakł. księgarni J. Zawadzkiego, 1912. S. 5–6.

744 Ibid. S. 125.

745 *Умецкая Е. С.* Распространение книги в Белоруссии в первой половине XIX в. // Книга в России до середины XIX в. : 3-я Всесоюз. науч. конф., 2–4 окт. 1985 г. : тез. докл. Ленинград : БАН, 1985. С. 86.

746 Журнал Министерства народного просвещения. 1840. Т. XXVI. Л. 89.

747 *Radziszewski F.* Wiadomość historyczno-statystyczna… S. 49.

748 Отчет о состоянии Минской мужской гимназии за 1888–89 учебный год. Минск, 1890. С. 60.

749 Отчет о состоянии Минской мужской гимназии за 1886–87 учебный год. Минск, 1888. С. 11.

750 Отчет о состоянии Минской гимназии за 1891–92 учебный год. Минск, 1893. С. 44.

751 *Chmara A., Jelski A.* Mińsk // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa : Nakł. W. Walewskiego ; Druk. "Wieku" [etc.], 1885. T. VI. S. 454.

752 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 112.

753 *Цыбуля В. А.* Первые библиотеки в Минске. С. 29.

754 *Вержболович М.*: 1) Первый период существования Минской духовной семинарии (1785–1817) // Минские епархиальные ведомости. 1893. № 2 (ч. неоф.). С. 66–70; 2) Второй период существования Минской духовной семинарии (1817–1840) // Минские епархиальные ведомости. 1895. № 12 (ч. неоф.). С. 328–337; 3) Третий период существования Минской духовной семинарии (1840–1874) // Минские епархиальные ведомости. 1899. № 14 (ч. неоф.). С. 323–332.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на старадрукамі XVI–XVIII стст. у пергаменных аправах[755]. Кнігі набываліся ў кнігарнях, ад прыватных асобаў, перамяшчаліся з манастыроў. Так, у 1836 г. была куплена вельмі значная колькасць кніг у рэктара семінарыі архіепіскапа Яўгенія[756]. Не менш каштоўнымі былі ахвяраванні ў бібліятэку ад прафесара семінарыі А. Біруковіча (40 назваў), праасв. Міхаіла (507), праасв. Антонія (377 назваў). Ад Камальдульска-Пажайскага манастыра Ковенскай губерні паступілі 31 кніга на польскай мове і 256 на латыні XVII–XVIII стст.; ад Пінскага Лешчынскага манастыра – 190 тамоў; ад Навасвержаньскага манастыра – 117 (выключна друкаваныя лацінкай XVI–XVII стст.). Такім чынам, фонд бібліятэкі склаў да 7000 назваў. На кнігазбор былі складзены вопісы і каталогі[757].

Захаваліся вопісы за 1827[758], 1845[759] і 1850[760] гг., якія толькі часткова прадстаўляюць фонд бібліятэкі – гэта каля 4000 асобнікаў кніг (рукапісных і друкаваных), перыядычных выданняў. Асноўныя тэматычныя групы складаюць кнігі па багаслоўі, славеснасці і мовазнаўстве, гістарычных навуках і філасофіі на кірыліцы, лацініцы, польскай, нямецкай, французскай і рускай мовах. У фондзе бібліятэкі, паводле вопісаў, выдзяляліся і адпаведныя калекцыі – “библиотеки”: “Библиотека древних языков, Библиотека Российская, Французская, Немецкая, Польская, Библиотека малоизвестных языков”, унутры кожнай літаратура групавалася ў “разряды”. Напрыклад, “Разряд 1. Богословие. Разряд 2. Философия. Разряд 3. Словесность. Разряд 4. Математика. Разряд 5. Исторические науки. Разряд 6. Языкознание”. Кожны з іх меў адпаведныя аддзяленні. У “Разряде 1. Богословие” пералічаны такія, як “Отделение 1. Библия. 2 – Симфонии. 3 – Отцы Восточные и Западные. 4 – Толкователи Священного Писания. 5 – Системы наук богословских. 6 – Проповедники. 7 – Каноническое право и обряды. 8 – Смесь”.

Па моўнай прыкмеце, паводле вопісаў за 1827–1850-я гады, асноўная частка фонду – гэта кнігі на старажытных мовах (900 экз.): царкоўнаславянскай і латыні, на рускай мове – не менш за 738 экз., на нямецкай – 189, на польскай – 183, на французскай – 67 экз. Даволі разнастайна прадстаўлена ў бібліятэцы геаграфія выдавецкай прадукцыі XVI–XVIII стст. – гэта кнігі, надрукаваныя ў Санкт-Пецярбурзе, Маскве, Кіеве, Вільні, Кракаве, Варшаве, Любліне, Адэсе, Казані, Ляйпцыгу, Львове, Антверпене, Амстэрдаме, Базэлі, Нясвіжы, Пачаеве, Познані, Жэневе, Парыжы, Венецыі, Майнцы, Франкфурце, Вене, Лондане, Рыме і інш. Не менш як 69 асобнікаў – гэта выданні з Вільні, Супрасля, Нясвіжа, Брэста, Астрога, Мінска.

Абавязковым было вызначэнне кніг па фармаце: “у ліст”, “у чвэрць”, “у 8-ю долю”, “у 12-ю долю ліста”, што ўлічвалася, відаць, пры расстаноўцы фонду. Складанне вопісаў было адначасова і абследаваннем стану захаванасці кніг, што адзначалася, напрыклад, характарыстыкай іх пераплёту. Данеслі вопісы і прозвішчы некаторых бібліятэкараў Духоўнай семінарыі ў Мінску, як Івана Яхневіча,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

755 НГАБ. Ф. 797. Воп. 2. Спр. 1, 2.

756 *Вержболович М.* Второй период существования Минской духовной семинарии… С. 334.

757 Там же. С. 330. НГАБ. Ф. 797. Воп. 2. Спр. 1–3.

758 НГАБ. Ф. 797. Воп. 2. Спр. 1.

759 Тамсама. Спр. 2.

760 Тамсама. Спр. 3.

святара Слуцкай Васкрасенскай царквы і настаўніка гісторыі і грэчаскай мовы ў семінарыі[761].

З сямітысячнага[762] кнігазбору фундаментальнай бібліятэкі Мінскай духоўнай семінарыі ў фондах сучасных буйнейшых бібліятэк Беларусі "апазнаюцца" 18 друкаваных кніг XVI–XVIII стст. і адна рукапісная кніга XVI ст. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваюцца, напрыклад, "Жыцproperties Грыгорыя Архіепіскапа Амірыцкага" – рукапіс другой паловы XVI ст. беларускім паўуставам; "Sprawy y słowa Jezusa Krystusa Syna Bożego" (Брэст, 1565)[763]; адно з выданняў Эльзевіраў, надрукаванае ў Амстэрдаме ў 1578 г.

Гісторыя першай мінскай публічнай бібліятэкі, адкрыццё якой датуецца рознымі гадамі на працягу 1830-х – 1840-х гг., не паспела пакінуць значнага следу, як відаць, у памяці тагачаснага грамадства, бо не паспелі значна папоўніцца кніжныя фонды бібліятэкі, як у 1865 г. іх паглынуў пажар. Тым не менш пра пачатак грамадскай бібліятэчнай ініцыятывы ў горадзе пісалі ў мясцовых "Минских губернских ведомостях" (1842. № 13. 27 марта), а таксама і ў сталічным часопісе "Современник" (1854. Т. XLVIII). Так, у апошнім П. Шпілеўскі паведамляў, што "в Минске, по просьбе самих жителей, вследствие ходатайства минского губернатора А. В. Семёнова, учреждена публичная библиотека, которая выписывает все русские журналы, газеты и разные отдельные сочинения для доставления необходимым людям возможности следить за ходом отечественной литературы. Библиотека устроена при губернаторской конторе и состоит в ведении правительства" (С. 28).

Пра першую спробу адкрыць у Мінску публічную бібліятэку пісаў пазней і А. І. Мілавідаў: «В 1833 г. два вольноотпущенника крестьянина гр. Шереметьева Ф. и Д. Кривошеевы "собственным иждивением заложили в Минске русскую библиотеку" и просили учебное начальство дозволить пользоваться ею ученикам гимназии, что и было разрешено. Какая была судьба этого книгохранилища, не знаем подробно, но из архивных дел 1863 г. видно, что в 1835 г. в Минске открыта публичная библиотека местным дворянством»[764]. Складальнікі ж "Календаря и справочного указателя правительственных учреждений, фабрик, заводов и проч. в гор. Минске и окресностях" (Вільня; Мінск, 1895) пазначылі, што: "В 1832 г. введен был в делопроизводство русский язык и учреждена в Минске публичная библиотека" (С. 28).

Самым важкім пацвярджэннем існавання публічнай бібліятэкі ў Мінску застаецца надрукаваны ў 1849 г. каталог – "Роспись русских книг Минской губернской библиотеки для чтения (Устроенной в 1845 году)", у якім адлюстраваны змест фонду бібліятэкі. Папаўнялася бібліятэка пераважна за кошт грашовых ахвяраванняў "некоторыми присутственными местами, а именно Губернским правлением, Строительной комиссией и Приказом общего призрения"[765]. Паводле "Росписи", у бібліятэцы налічвалася 12 назваў выданняў XVIII ст.; каля

[761] НГАБ. Ф. 797. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 125адв.

[762] Па некаторых звестках, фонд бібліятэкі Мінскай духоўнай семінарыі складаў 20 000 асобнікаў.

[763] Была зафіксавана і ў вопісе кніг бібліятэкі семінарыі. Гл.: НГАБ. Ф. 797. Воп. 2. Спр. 2. Арк. 183адв.

[764] *Миловидов А. И.* Судьба русской книги в Северо-Западном крае в связи с его культурной историей. С. 23.

[765] Минские губернские ведомости. 1859. № 13. 27 марта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

500 – пецярбургскіх, больш за 250 – маскоўскіх выданняў XIX ст.; па два выданні з Харкава і Арла, было і адно, надрукаванае ў 1843 г. у Вільні ("Собрание древних грамот и актов Виленской губернии")[766]. Самай большай часткай кнігазбору бібліятэкі былі творы мастацкай літаратуры, вылучаўся таксама аддзел гісторыі, дзяржавы і права, сельскай гаспадаркі. Мела бібліятэка і адзін з забароненых твораў А. Міцкевіча – "Конрада Валенрода" (Масква, 1832)[767]. Усяго, як занатаваў Ф. Радзішэўскі, "biblioteka miejska w r. 1849 zawierała 1385 tomów"[768].

Пра змест былых бібліятэк сведчаць і некаторыя іншыя з захаваных друкаваных каталогаў: публічнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна (1909, 1913); чытальняў пры кнігарнях – Б. А. Гарадзенскага (1894), В. Макоўскага (1913), В. Б. Фрумкіна (1891, 1901, 1908, 1910, 1911, 1914), Ё. Фрэнкеля (1894); ведамасных бібліятэк – Мінскага акружнога суда (1895), бібліятэк служачых Мінскай губернскай земскай управы (1913), Лібава-Роменскай (1890, 1900, 1904, 1910) і Маскоўска-Брэсцкай (1911) чыгунак; Мінскай духоўнай семінарыі (1892, 1899), Мінскай прыватнай мужчынскай гімназіі (1911), грамадскіх арганізацый – "Минского общественного собрания" (1881, 1901, 1914), па якіх можна скласці пэўнае ўяўленне аб змесце і значнасці гэтых кнігазбораў.

Асобныя публікацыі і адпаведна каштоўны матэрыял – гэта непасрэдна справаздачы бібліятэк. Выразна і ўсебакова раскрываецца дзейнасць гарадской публічнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна ў адпаведнай справаздачы за 1914 г.[769] Гісторыя ўзнікнення Пушкінскай бібліятэкі была звязана як з нагодай 100-годдзя паэта, так і з ініцыятывай мясцовай інтэлігенцыі, якую выказаў губернатару ў 1899 г. "старший резизор акцизной управы Александр Александров, член Общества минских врачей, Общества изящных искусств"[770].

Значныя змены ў дзейнасці бібліятэкі адбываюцца пасля 1904 г., калі бібліятэка перадаецца гарадскім упраўленнем "в ведение общества". На той час фонд яе складаў 2379 кніг, а праз 10 гадоў, на 1 студзеня 1915 г., – 15117[771]. Вырасла таксама і колькасць падпісчыкаў больш чым у 14,5 раза ў параўнанні з 1905 г. Усяго за 1914 г. бібліятэку наведала 59 196 чытачоў (9361 – платны абанент, 49 835 – бясплатных) (С. 9). Аднак гэты рост у справаздачы тлумачыцца аб'ектыўнымі прычынамі – вялікім прытокам бежанцаў (С. 9).

У 1914 г. бібліятэка атрымлівала 92 назвы перыядычных выданняў: 70 – на рускай мове, 8 – на польскай, 8 – на старажытнаяўрэйскай, 6 – на рускай і яўрэйскай мовах. У ліку мінскіх перыядычных выданняў, выпісаных бібліятэкай, "Минский голос", "Минская Газета Копейка", "Северо-Западная жизнь", "Северо-Западная мысль". Сярод штотыднёвікаў значылася і "Наша Ніва" (па-

---

766 Роспись русских книг Минской губернской библиотеки для чтения (Устроенной в 1845 году). Минск : Губ. тип., 1849. 96 с.

767 *Цыбуля В.* Первые библиотеки Минска // Неман. 1968. С. 182–183.

768 *Radziszewski F.* Wiadomość historyczno-statystyczna… S. 49.

769 Отчет Правления Минской Городской Общественной Библиотеки имени А. С. Пушкина за 1914 г. Минск : Электротип. Я. А. Гринблата, 1915. 72 с.

770 *Цыбуля В.* Первые библиотеки Минска… С. 183.

771 Отчет Правления Минской Городской Общественной Библиотеки имени А. С. Пушкина за 1914… С. 8.

між рускамоўнымі і яўрэйскамоўнымі) (С. 5), але ў агульнай моўнай статыстыцы справаздачы бібліятэкі беларуская мова не знайшла ніякага адлюстравання, хоць бы ў адзінкавай назве (ці была залічана, калі на лацінцы, да польскамоўных, ці, калі кірылічным шрыфтам, – да рускамоўных?). Пры характарыстыцы зместу фонду, які ў асноўным прадстаўлялі белетрыстыка (4611 кніг), гісторыя літаратуры, крытыка, публіцыстыка і бібліяграфія (1237), прыкладныя навукі і педагогіка (937), гісторыя (905), сацыялогія і права (696), філасофія (520 кніг), пазначана, што ў бібліятэцы кніг на польскай мове – 1146, на ідыш – 921, іўрыце (старажытнаяўрэйскай) – 763 і ў 1914 г. набыта 18 на літоўскай (С. 4).

Асобна выдаваліся бібліятэкай каталог кніг на польскай мове (Вільня, 1913), каталог старажытнаяўрэйскіх і яўрэйскіх кніг (Мінск, 1913), каталог дзіцячых кніг (Мінск, 1913), якія прызначаліся як для чытачоў, так і былі абавязковым патрабаваннем улад падчас праверак і рэвізій бібліятэкі. Мясцовыя мінскія выданні ў названых каталогах амаль не прадстаўлены, за выключэннем, напрыклад, польскамоўнага выдання паэзіі Багуслава Адамовіча “Melodje” (1898). Зборнік вершаў быў размешчаны ў тэматычным раздзеле “Belletrystyka swojska” (С. 2–9), дзе ў алфавіце аўтараў значыліся таксама творы З. Кавалеўскай, Ю. Крашэўскага, А. Міцкевіча[772].

Мясцовая, мінская, прадукцыя тым не менш у фондзе бібліятэкі збіралася, пра што сведчаць, да прыкладу, каталог бібліятэкі на 1908 г. і такія яго аддзелы, як “История, исторические материалы, мемуары и археология” (выданні А. П. Смародскага, Г. Х. Татура), “Социология, история культуры, статистика, право” (Ф. Ястрэмскага), “Публицистика и политика” (Ю. Ахаровіча), і асабліва вылучаецца рубрыка “Справочные книги”, дзе прадстаўлены памятныя кніжкі, календары, спісы землеўласнікаў Мінскай губерні, а таксама бібліяграфічныя матэрыялы[773].

Некаторымі мясцовымі выданнямі папаўняліся і іншыя бібліятэкі, што важна, навучальных устаноў – Мінскага рэальнага вучылішча[774] і Мінскага гарадскога 4-класнага вучылішча[775]. Нярэдка гэта былі ахвяраванні ад аўтараў, выдаўцоў, выкладчыкаў (Ф. Ястрэмскі, Б. Чыханаў, К. К. Шышло, К. Я. Ермакоў, А. Ф. Гацкі). Асабліва вызначаўся падборкай гісторыка-краязнаўчых, этнаграфічных выданняў фонд бібліятэкі (фундаментальнай і вучнёўскай) Мінскага рэальнага вучылішча[776] – “Минская старина” (Вільня, 1911), “Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание обиходности” (Віцебск, 1895) і «Белорусские песни “Частушки”» (Вільня, 1911) М. Я. Нікіфароўскага, “Материалы по этнографии Гродненской губернии” (Вільня, 1912) Е. Раманава, “Столетие Минской губернии” А. Смародскага і інш.). Асноўным жа каналам,

[772] Каталог Минской городской общественной библиотеки имени А. С. Пушкина = Katalog Mińskiej Biblioteki Miejskiej imienia A. Puszkina. Wilno : Druk. “Znicz”, 1913. 20 с.

[773] Каталог Минской городской общественной библиотеки имени А. С. Пушкина. 1908-й год. Минск : Тип. Фельдмана и Перского, 1909. 321, I с.

[774] НГАБ. Ф. 473. Воп. 1. Спр. 29.

[775] Тамсама. Ф. 483. Воп. 1. Спр. 15, 16, 121, 122.

[776] Сведения о постепенном росте библиотеки и кабинетов [с 1880 по 1902 г.] // Краткая историческая записка о Минском реальном училище. Минск : паровая типолит. Б. И. Соломонова, 1904. С. 88: на 1902 г. у фундаментальнай бібліятэцы налічвалася 1074 назвы ў 2504 тамах, у вучнёўскай адпаведна – 545 і 1894.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па якім кнігі траплялі ў названыя бібліятэкі, была пакупка ў мінскіх кнігарнях: напрыклад, у Б. Гарадзенскага – "Энциклопедического словаря" Бракгаўза і Эфрона (С.-Пецярбург, 1911. Т. 31), у Ё. Фрэнкеля – таксама пецярбургскіх падручнікаў і дапаможнікаў па будаўніцтве, земляробстве, апрацоўцы металаў; выпісваліся кнігі і ад кнігагандляроў з Вільні, Масквы, Варшавы.

Сярод архіўных дакументаў – вопісаў, інвентарных кніг, каталогаў, спісаў бібліятэк – звяртаюць увагу і справаздачныя дакументы розных устаноў і арганізацый Мінска, якія ўключаюць звесткі пра бібліятэкі. Так, са справаздач Мінскага губернскага статыстычнага камітэта можна даведацца пра пэўныя кніжныя сувязі ўстановы, галоўныя крыніцы папаўнення фондаў бібліятэкі[777], якімі была пераважна бясплатная (абавязковая) рассылка выданняў з/для Цэнтральнага статыстычнага камітэта (з Санкт-Пецярбурга) і іншых дзяржаўных устаноў і навуковых таварыстваў. У абмен на ўласныя выданні Мінскі статыстычны камітэт сістэматычна атрымліваў для сваёй бібліятэкі памятныя кніжкі з розных губерняў (Валынскай, Віленскай, Варонежскай, Ковенскай, Ліфляндскай, Магілёўскай, Арлоўскай, Смаленскай і інш. – усяго 69 губерняў), а таксама абласцей (Амурскай, Архангельскай, Якуцкай і інш. – усяго 9) Расійскай імперыі.

У справаздачы па бібліятэцы Мінскага акружнога суда за 1894 г., напрыклад, адзначаецца, што "книги и периодические издания для Библиотеки суда главным образом приобретались от Минского книгопродавца Городенского, которому уплачено 781 р. 53 к." (усяго расход на бібліятэку склаў 900 р. 17 к.)[778]. Каля ⅓ частка фонду бібліятэкі належала юрыдычнай літаратуры, астатняя – белетрыстыцы і іншым галінам ведаў, перыядычным выданням. Усе паступленні ўносіліся ў "главный (фундаментальный), подвижной и систематический" каталогі, рыхтаваўся і выйшаў у 1895 г. друкаваны каталог (накладам 150 экз.), прызначаўся і для раздачы ўсім членам бібліятэкі[779]. На пачатак 1895 г. у бібліятэцы налічвалася больш за 1000 экз. кніг і 180 назваў перыядычных выданняў на рускай, французскай і нямецкай мовах.

Бібліятэкамі казённых устаноў і ведамстваў мелі права карыстацца адпаведна іх служачыя, а ў некаторых выпадках і родныя супрацоўнікаў. Як занатавана ў "Правилах библиотеки Минского окружного суда", "членами библиотеки могут быть все проживающие в Минске и его уезде члены судебного ведомства, присяжные поверенные и их помощники, частные поверенные… как штатные, так и вольнонаемные, а равно и члены семейств всех выше перечисленных лиц"[780]. Адначасова за чытанне трэба было плаціць. У названай бібліятэцы былі ўстаноўлены наступныя разрады: па першаму разраду – 1 рубель у месяц за 5 кніг і 1 новы часопіс, па другому – 50 кап. у месяц за 3 кнігі і 1 новы часопіс, па трэцяму – 20 кап. у месяц за 2 кнігі і 1 часопіс.

Адной са старэйшых ведамасных бібліятэк ў горадзе была бібліятэка Мінскай губернскай друкарні. Вядома, што на 1850 г. фонд бібліятэкі складаў

---

777 НГАБ. Ф. 21. Воп. 1. Спр. 57, 114, 116.

778 Тамсама. Ф. 69. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1–4.

779 Тамсама. Арк. 6 (Каталог библиотеки Минского окружного суда. Минск : Губернская тип., 1895. 103 с.).

780 Тамсама. Ф. 69. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 13 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2265 кніг[781]. Існаванне бібліятэкі пацвярджаецца і ў 1895 г., калі адзін са звольненых супрацоўнікаў – П. Ф. Карасёў (карэктар з 1893 г. па 1895 г.) – паведамляе аб вяртанні ўзятых кніг у бібліятэку друкарні[782]. Правілы прадугледжвалі і штрафы за затрымку выданняў.

Да прыкладу, бібліятэка служачых пры Упраўленні Лібава-Роменскай чыгункі "за невозвращение в срок книг и журналов" патрабавала "за каждый просроченный день: за книги – по пяти копеек, а за номер журнала текущего года – по десяти копеек", калі ж кніга не вярталася праз месяц, то яна залічвалася да страчаных з выплатай поўнага яе кошту незалежна ад сумы штрафу; чытач, які не вярнуў ці сапсаваў кнігу, яшчэ і выключаўся са складу "членов библиотеки"[783]. Прыведзеныя звесткі могуць служыць пацвярджэннем попыту на чытанне, а таксама і клопатам аб захаванні фонду бібліятэкі, які фарміраваўся пераважна за кошт сродкаў служачых дадзенага ведамства[784].

Папаўняліся ведамасныя бібліятэкі і дзякуючы кнігаабмену, таксама ў значнай ступені прыватным ахвяраванням. Так, бібліятэка Мінскай балотнай станцыі на пачатку свайго існавання атрымала каштоўны дар ад губернатара Я. Эрдэлі – кнігі, мапы, атласы па балотазнаўстве, ад дырэктара Балотнай станцыі А. Флёрава – каля 320 выданняў па прыродазнаўстве і сельскай гаспадарцы[785]. У адной са справаздач Мінскай балотнай станцыі адзначаецца, што "основу библиотеки составила библиотека, пожертвованная директором станции А. Ф. Флеровым, состоящая из 600 экземпляров книг, брошюр и отдельных оттисков по ботанике, лесоводству, почвоведению, сельскому хозяйству, химии и географии, всего по библиотечной книге 448 №№. Вследствие обращения к разным учреждениям и лицам было получено в дар всего 112 №№, приобретено покупкой 116 №№ книг и 22 географические карты"[786].

Грамадскімі намаганнямі збіраліся і адкрываліся бібліятэкі пры разнастайных мінскіх навуковых і культурна-асветных таварыствах, клубах. Такім чынам былі сфарміраваны значныя галіновыя фонды ў бібліятэках Таварыства мінскіх урачоў (на 1909 г. – 7417 экз. кніг на рускай і замежных мовах)[787] і Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (на 1901 г. – 1175 назв. ці 2500 экз. кніг)[788]. У 1912 г. мясцовай інтэлігенцыяй, у іх ліку ўрачамі (С. Балкаўцом, С. Урванцовым), было ініцыявана стварэнне Мінскага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі, кнігазбор бібліятэкі якога быў запачаткаваны за кошт прыватных ахвяраванняў[789]. Пасада бібліятэкара ў таварыствах была выбарнай і магла нават замацоўвацца ў статутах грамадскіх арганізацый, як у Музычным

[781] Тамсама. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1077. Арк. 35.

[782] Тамсама. Ф. 456. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 85.

[783] Первое прибавление к каталогу книг библиотеки служащих при Управлении Либаво-Роменской железной дороги. Минск : Паровая типолит. Л. Г. Дворжец, 1904. С. 3.

[784] ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 35.

[785] Библиотека Болотной опытной станции // Болотоведение. 1912. № 3. С. 294.

[786] Там же. 1913. № 1. С. 93.

[787] *Берёзкина Н. Ю.* Библиотеки и распространение научных знаний в Беларуси (XVI–XX вв.). С. 237–238.

[788] Тамсама. С. 240.

[789] Известия Минского общества любителей естествознания, этнографии и археологии / под ред. Н. П. Масловского. Минск : Электротип. Д. Форина, 1914. Вып. 1. С. 5–6, 11, 20–21, 30, 33–34.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таварыстве, бібліятэкарам таварыства быў абраны Напалеон Амвосьевіч Акалаў. Таксама было пазначана, што для дапамогі бібліятэцы таварыства прымае ахвяраванні нотамі, "у кого окажутся таковые лишними"[790].

Вялікі фонд мела бібліятэка пры польскім клубе "Ognisko" (загадваў урач Ян Малькевіч, пазней – мецэнат Данброўскі). Папаўнялася бібліятэка ў значнай ступені таксама за кошт ахвяраванняў, сярод якіх атрыманы ў дар буйны кнігазбор лекара з Оршы Людвіка Чарніхоўскага (6 тыс. тамоў). У 1913 г. пры таварыстве пачала працу чытальня газет і часопісаў на польскай, рускай, французскай і англійскай мовах[791].

Бібліятэцы таварыства "Oświata", якая існавала ў 1908–1909 гг., была ахвяравана кніжная калекцыя ад графа Іосіфа (Юзафа) Тышкевіча з Лагойска[792]. Кнігі для бібліятэкі закупляліся і ў кнігарні В. Макоўскага. Упарадкаваннем фонду бібліятэкі і яе дзейнасці ў кірунку развіцця і пашырэння чытання займалася спецыяльна створаная бібліятэчная камісія, якую ўзначальвалі ўрач Чэслаў Грабоўскі і сястра Э. Вайніловіча Вікторыя Гродска-Дубіская[793].

Кожная бібліятэка абавязана была мець каталог на свой фонд. Як, да прыкладу, бібліятэка спартыўна-гімнастычнага таварыства "Sokół", якая займала ўсяго дзве шафы (бібліятэкары: у 1907 г. – Міхаіл Маеўскі, Стафан Корзан[794], у 1908 г. – Канстанцін Прашынскі, памешчык са Слуцкага павета[795], загадвала чытальняй кніг і часопісаў Габрыэля Баброўская), мела наступныя алфавітныя каталогі: 1) "кнігі белетрыстычнага зместу" (на канец 1908 г. налічвалася 579 тамоў выданняў), 2) "кнігі навукова-грамадскага зместу" (214 тамоў). У 1909 г. каталог бібліятэкі таварыства з'явіўся ў друкаваным выглядзе[796].

Падрабязны даведкавы апарат у бібліятэцы неабходны быў не толькі чытачам і бібліятэкарам, але і ў значнай ступені паліцыі, каб адпаведна ўрадаваму "Алфавитному перечню запрещенных изданий" ажыццяўляць цэнзурны кантроль бібліятэчных фондаў. Падчас адной з такіх праверак дзейнасці таварыства "Sokół" у канцы 1910 г. у бібліятэцы былі "найдены" акрамя кніг яшчэ і польскамоўныя часопісы, неадлюстраваныя ў каталогу. Пасля чарговай рэвізіі, у чэрвені 1914 г., дзейнасць дадзенага таварыства характарызавалася начальнікам Мінскага губернскага жандармскага ўпраўлення як тэндэнцыйная, бо задачай яго было "объединение польского общества и обособление его на началах националистических" і супрацьстаянне русіфікацыі края, аднак "корректность, сохраняемая при сношениях с русскими властями и представителями русской народности, не дают повода к преследованию его"[797]. Тым не менш у тым самым годзе таварыствы "Sokół" і "Ognisko" прыпынілі сваю дзейнасць.

Задачу "объединения всех русских православных и старообрядцев г. Минска и Минской губернии с целью предоставления им и их семействам разумного

790 Устав Музыкального общества в г. г. Минске. Минск : Скоропечатня Р. Дворжец. 1880. С. 21.

791 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 92–95.

792 *Шыбека З. В.* Минскъ сто гадоў таму. С. 151.

793 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 94.

794 НГАБ. Ф. 306. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 52.

795 Тамсама. Арк. 67.

796 Тамсама. Арк. 127.

797 Тамсама. Арк. 179.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

отдыха, общедоступных и полезных развлечений, а также средств к умственному и нравственному развитию" ставіла перад сабой "Минское русское общественное собрание". Паводле статута, таварыства мела права "выписывать книги, газеты и периодические издания и иметь свою библиотеку"[798], дзейнасцю якой кіравала бібліятэчная камісія і абраны бібліятэкар з вызначанай таварыствам зарплатай. У 1912 г., напрыклад, таварыства на сваім сходзе разглядала пытанне "Об увеличении с 1 июля жалованья библиотекарше Е. А. Андреевой до 20 р. в месяц"[799]. У 1911 г. у бібліятэцы налічвалася 2052 тамы кніг, у год рэквізіцыі, 1919 г., фонд склаў 3200 экз.[800] кніг на рускай мове, пераважна мастацкай літаратуры.

У 1916–1917 гг. практычна ўсе польскія культурна-асветныя таварыствы, якія ўзнавілі сваю працу ў Мінску, звязвалі яе з пашырэннем чытання польскіх кніг, адкрываючы для гэтага пазычальні і чытальні як стацыянарныя, так і "lotne" ("лятучыя") – часовыя, выданні для якіх падбірала кнігарня В. Макоўскага[801].

Значную ролю ў стымуляванні чытання і калекцыяніравання адыгрывалі непасрэдна і самі мінскія кнігарні, пры буйнейшых з якіх – Б. Гадлеўскага, З. Савіцкай, Б. Адамовіча, В. Макоўскага, Б. Гарадзенскага, В. Фрумкіна, Ё. Фрэнкеля і інш. – працавалі бібліятэкі, чытальні, "wypożyczalni książek", а таксама букіністычныя аддзелы (у В. Фрумкіна, Б. Гарадзенскага).

Паслугі ў бібліятэках пры кнігарнях, аднак, не былі таннымі, хоць некаторыя кнігары характарызуюцца і дыферэнцыраваным падыходам пры вызначэнні ўмоў падпіскі на чытанне кніг і часопісаў. Так, у кнігарні Ё. Фрэнкеля існавала ад 1 да 5 разрадаў аплаты за чытанне. Паводле самага высокага, першага, чытач мог атрымаць пад заклад у 4 рублі 4 кнігі, у тым ліку і 1 новы часопіс. Чытанне на працягу аднаго месяца каштавала 1 руб. 25 кап., за 12 месяцаў аплата складала 12 руб. Умовы самага нізкага разраду, пятага, дазвалялі плаціць меней, але і карыстацца мінімальнай колькасцю выданняў: адной кнігай або адным часопісам (праз год пасля яго выхаду) пад заклад у 1 рубель і 30 капеек за месяц.

У бібліятэцы пры кнігарні Б. А. Гарадзенскага таксама чытачу прапаноўвалася 5 розных варыянтаў аплаты за чытанне на працягу месяца: 1 – за тры кнігі, і ў тым ліку 1 новы часопіс, трэба было плаціць 1 руб., 2 – за 2 кнігі, і ў тым ліку 1 новы часопіс, – 75 кап., 3 – за 1 новы часопіс – 50 кап., 4 – за 1 кнігу – 30 кап., 5 – за замежную кнігу – 40 кап. Новыя выданні паступалі ў бібліятэку штомесяц. Штомесячнае папаўненне літаратурай (кнігамі і часопісамі) па розных галінах ведаў гарантавала і бібліятэка В. Фрумкіна, у якой на 1891 г. налічвалася больш за 3000 назваў кніг і часопісаў на рускай і замежных мовах (французскай і нямецкай), у тым ліку і дзіцячыя выданні[802] ці дзіцячая бібліятэка.

Толькі за адзін год дзейнасці кнігарні (у 1901 г.) В. Макоўскага ў Мінску абанентамі бібліятэкі-чытальні сталі 200 чалавек[803]. Большасць з іх аддавалі пе-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

798 Устав Минского русского общественного собрания. Минск : Губерн. тип. 1910. С. 1: § 1–2.
799 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7949. Арк. 29.
800 ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 29. Арк. 16.
801 *Zienkiewicz T.* Polskie życie literackie w Mińsku… S. 95–96.
802 Каталог русских и иностранных книг и журналов библиотеки В. Фрумкина в Минске. Минск : Губ. тип., 1891. 127 с.
803 *Górski S.* W stolicy Białorusi… S. 848.

равагу чытанню кніг мастацкіх і рэлігійных, падпісваліся на перыядычныя выданні, сярод якіх "… nader wielu zapisuje sobie *Kuryera Litewskiego*. Wyrządzi on niemałą konkurencyę miejscowym, dość poczytnym dotychczas dziennikom rosyjskim"[804].

Практыкаваліся і такія формы чытання кніг, як "абаротныя бібліятэкі", асабліва для новай польскай літаратуры. Як пра гэта піша А. Раманоўскі, дванаццаць або больш сем'яў заказвалі пэўную колькасць кніг, іх прывозілі, здавалі ў пераплёт і пускалі ў абарот. Па ланцужку яны пасля вярталіся да ўладальніка ў яго бібліятэку[805].

Каштоўныя асобнікі рукапісаў ці старадрукаў, з'яўляючыся калекцыйным таварам, пераходзілі з рук ў рукі, набываліся больш заможнымі ўладальнікамі, з прыватнага карыстання пераходзілі ў публічнае. Пра гэта сведчыць і справаздача Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта, які за першы год існавання такім чынам набыў 49 рукапісаў, некаторыя з іх атрыманы ад сакратара Мінскага губернскага статыстычнага камітэта і, як відаць, аматара калекцыяніравання А. П. Смародскага – гэта такія рукапісы, як "Деяния апостолов и послания" (267 арк.), "Евангелие апрокосъ 1721 г. в старом кожанном переплёте"[806].

У Мінску меліся багатыя і ўнікальныя кнігазборы яўрэйскай рукапіснай і друкаванай кнігі. Адзін з іх належаў яўрэйскаму вучонаму, філантропу Ісахару-Бер Бампі (1823–1888)[807]. Многія з асобнікаў калекцыі Бампі змяшчалі маргіналіі. Пасля яго смерці каштоўная калекцыя ў 6 тыс. тамоў, пераважна Hebraica, была набыта пецярбургскім купцом Львом Фрыдландам і склала аснову яго бібліятэкі[808]. Пазней папоўнілася яшчэ адной "коллекцией в 1000 томов из библиотеки минского шохера Л. Рабиновича (1830–1887), библиофила и библиографа, около 40 лет собиравшего коллекцию, превышавшую 4000 печатных томов"[809] У 1892 г. Л. Фрыдланд падараваў свой збор кніг Азіяцкаму музею Імператарскай акадэміі навук (Санкт-Пецярбург): каля 300 рукапісных тамоў, частка з якіх на пергамене; болей як 13 тыс. друкаваных кніг, сярод іх 32 інкунабулы; мноства кніг, надрукаваных да 1540 г.[810] Самуэлем Вінэрам, бібліёграфам і таксама калекцыянерам, была распачата праца па складанні каталогу друкаваных кніг бібліятэкі Л. Фрыдланда[811]. Названыя яўрэйскія кнігазборы XIX ст.

---

804 Ibid.

805 *Раманоўскі А.* Польскія культурныя ініцыятывы на Беларусі ў 1864–1905 гг. … С. 51–52.

806 Описание рукописного отдела и старопечатных книг библиотеки Минского церковного историко-археологического комитета / [сост. А. Снитко]. Минск : Электротип. Нахумова, 1909. Вып. 1. С. 3.

807 Еврейская энциклопедия. Свод знаний о еврействе и его культуре в прошлом и настоящем : [в 16 т.]. Санкт-Петербург : Тип. Акц. Общ. Брокгауз-Ефрон, [1909]. Т. 3. Стлб. 752–753. Гл. таксама: http://www.runivers.ru/lib/book7069/

808 Там же. [1909]. Т. 4. Стлб. 448.

809 Там же.

810 Там же. [1908]. Т. 1. Стлб. 554.

811 *Wiener S.* Bibliotheca Friedlandiana : Catalogus librorum impressorum hebraeorum in Museo Asiatico Imperialis Academiæ Scientiarum Petropolitanaæ Asservatorum. Petropoli. Petropoli, 1893–1904. Fasc. 1–7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваюцца зараз у Бібліятэцы філіяла Інстытута ўсходазнаўства Расійскай акадэміі навук у Пецярбурзе.

У Мінску існавала таксама яўрэйская публічная бібліятэка (1862–1863)[812]. Кнігі для яе на рускай, нямецкай і яўрэйскай мовах збіраліся на дабрачынныя ахвяраванні яўрэйскага гарадскога таварыства[813]. Аднак бібліятэка была зачынена ў красавіку 1863 г., калі ў Паўночна-Заходнім краі былі забаронены ўсялякія арганізацыі, і была пераўтворана ў склад старых кніг на кватэры яўрэйскага рабіна[814], напэўна, Мінора, які і хадайнічаў аб яе адкрыцці.

У канцы 1904 – пачатку 1905 г. "Общество доставления бедным евреям г. Минска средств для обучения ремеслам" распачынае чарговую справу аб адкрыцці бібліятэкі, якая разам з кабінетам для чытання была дазволена пры дадзеным таварыстве, што пацвярджалася пасведчаннем (ад 21.03.1905 г.), выдадзеным на імя Грыгорыя Якаўлевіча Сыркіна і Мордуха Хаімава Шапіры[815]. Дзейнасць бібліятэкі адзначаецца і ў пазнейшы час – у 1915 г., а таксама і да 1919 г. (Руска-яўрэйская бібліятэка імя Ю. Нейфаха).

У 1905–1906 гг. працавала агульнадаступная яўрэйская бібліятэка таварыства «"Jad choruzim" ("Рука прилежных"), которая насчитывала 6300 книг, из них 2600 еврейских, и 1000 журналов»[816].

Важную ролю адыгрывала кніга і ў жыцці мінскіх мусульман, асабліва рэлігійным. У XVIII–XIX стст. гэта ў асноўным рукапісныя кнігі[817], напісаныя арабіцай па-беларуску, часткова па-польску, што і стала, як пісаў Я. Станкевіч, асноўнай прычынай іх страт[818]. Шмат рукапісных кніг захоўвалася ў мячэцях яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., але, па меркаванні А. Мухлінскага, "ніхто ў той час іх не збіраў"[819], а пад канец XIX ст., здаецца, аб іх чыста забыліся. Тым не менш, дзякуючы таму, што беларускія татары-мусульмане стала перапісвалі свае даўнейшыя кнігі, рэшткі з іх усё ж захаваліся ў прыватных калекцыях[820], а таксама і сёння захоўваюцца ў фондах дзяржаўных бібліятэк[821]. Сярод рукапісаў сустракаюцца кнігі, перапісаныя ў Мінску ў XVII–XIX стст.: Тэфсір (1686), Каран

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

812 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1453. Арк. 7–12.

813 Еврейская энциклопедия. [1911]. Т. 11. Стлб. 88–89.

814 *Покало М. И.* История библиотечного дела в БССР. С. 37.

815 НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7595. Арк. 1.

816 *Скир А. Я.* Еврейская духовная культура в Беларуси: ист.-лит. очерк. Минск : Мастац. літ., 1995. С. 18.

817 Як адзначаюць С. У. Думін і І. Б. Канапацкі, "друкаваная рэлігійная літаратура беларускіх татар нешматлікая. Яна пачала выходзіць толькі ў першай палове мінулага [XIX] стагоддзя". Гл.: *Думін С. У., Канапацкі І. Б.* Беларускія татары: мінулае і сучаснасць. Мінск : БУК, 1993. С. 179.

818 *Станкевіч Я.* Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом. Вільня : [б. в.], 1933. С. 13.

819 *Мухлинский А.* Исследование о происхождении и состоянии литовских татар. Санкт-Петербург : Тип. Э. Веймара, 1857. С. 40–41.

820 Гл., напрыклад: Рукапісныя і друкаваныя кнігі беларускіх татараў: каталог выставы : (Да 600–годдзя татарскага асадніцтва на Беларусі) / Беларус. ун-т культуры, Бібліятэка. Аддзел рэдкіх кніг ; уклад. Л. Доўнар, Т. Самайлюк, Т. Дзем'яновіч ; кансульт. Л. Станкевіч, І. Канапацкі. Мінск : БУК, 1997. 22 с. ; 28 с. іл.

821 Рукапісы татараў Беларусі канца XVII – пачатку XX ст. : з дзяржаўных кнігазбораў краіны : каталог / НАН Беларусі, ЦНБ імя Я. Коласа ; склад. М. У. Тарэлка, А. І. Цітавец ; рэд. бібліягр. зап. І. П. Гародка; рэдкал.: Н. Ю. Бярозкіна [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2011. 221 с.

(1797), хамаілы XIX ст., а таксама, магчыма, і з мінскіх прыватных кнігазбораў (дваран-магаметан). Як вядома, пры мінскай мячэці былі татары, якія выдатна пісалі арабскім пісьмом і перапісвалі Каран і іншыя творы духоўнага зместу[822], а значыць, існавала і бібліятэка, след якой губляецца з разбурэннем мінскай мячэці ў 30-я гг. XX ст.

Адны з самых значных страт панеслі бібліятэкі і кнігазборы Мінска падчас 1918–1919 гг. На падставе ўрадавага дэкрэта Савецкай Беларусі ад 30 студзеня 1919 г., які быў прыняты ў адпаведнасці з дэкрэтамі СНК РСФСР "Об охране библиотек и книгохранилищ" (1918), "О порядке реквизиции библиотек, книжных складов и книг вообще" (1918 г.)[823], пачынаюць ажыццяўляцца актыўныя мерапрыемствы па нацыяналізацыі ў галіне кніжнай справы і ў Мінску.

На пасяджэннях Мінскага Савета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў слухаюцца пытанні "О национализации книжных и нотных магазинов" (7 лютага 1919 г.), "О муниципализации книжной торговли" (8 лютага 1919 г.) і прымаюцца адпаведныя пастановы: "Все книжные магазины и склады национализируются: они немедленно опечатаются, выпускается воззвание к гр. о том, что Комиссариат Просвещения покупает книги у частных лиц"; "1. Книжная торговля в городе Минске муниципализируется. 2. Все имеющиеся в Минске частные книгоиздательства, книжные склады, магазины, лавки со всеми запасами книг объявляются собственностью Минского Совета Рабочих и Красно-Армейских Депутатов. <…> Все означенные учреждения обязуются до 25 февраля зарегистрировать свои библиотеки в Отделе Народного Образования. 3. Все помещения [по п. 2] переходят в распоряжение Минского Совета Рабочих и Красно-Армейских Депутатов. 4. С момента объявления муниципализации книжных магазинов во главе каждого книжного магазина ставится лицо, ответственное за правильный учет и оценку книг. 5. Весь персонал… ( в том числе и владельцы) объявляется впредь до распоряжения состоящим на службе у Минского Совета Рабочих и Красно-Армейских Депутатов. <…> 7. Организация управления книжными складами, магазинами и лавками поручается комиссии, состоящей из представителей Исполкома Совета, Отдела Народного Образования и Губернского агентства Ц. И. К. 8. Вывоз книг из Минска разрешается только по удостоверениям Минского Отдела Просвещения"[824].

Цікава, што адна з пастаноў выканкама Савета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў ад 16 лютага 1919 г. удакладняла пытанне наконт кніг духоўнага зместу[825], якія не падлягалі муніцыпалізацыі, і кнігандалярам дазвалялася іх прадаваць пад адпаведным кантролем[826].

Кантроль ажыццяўляўся не толькі мясцовымі органамі, але і цэнтральнымі, з Масквы. Так, у Маскоўскі бібліятэчны аддзел Народнага камісарыята па асвеце паведамляліся звесткі, адкуль (з якіх бібліятэк) і куды, у якой колькасці (на рускай, на замежнай мове), якога зместу (па галінах ведаў) перавезены кнігі[827]. Ся-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

822 *Мухлинский А.* Исследование о происхождении и состоянии литовских татар … С. 40–41.
823 *Покало М. И.* История библиотечного дела в БССР. С. 63.
824 ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 68. Арк. 23.
825 Аднак трэба мець на ўвазе, што гэта не тычылася кніг рэлігійнага зместу.
826 ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 68. Арк. 26.
827 Тамсама. Спр. 38. Арк. 10.

род такіх бібліятэк указваліся, напрыклад, прыватныя бібліятэкі з Мінска Чапскай (800 экз.), пракурора Чуліцкага (150), Зубакіна (10 400); грамадскія бібліятэкі Купецкага клуба (2200), "Русского Общественного Собрания" (3200), польская бібліятэка "Ognisko" (3350); бібліятэка пры кнігарні Фрумкіна (4000 экз.) і інш., асноўная частка фондаў якіх была змешчана ў спецыяльна арганізаваным у Мінску кнігасховішчы[828], а таксама была размеркавана па розных бібліятэках.

У лютым 1919 г. паводле спіса ўстаноў, што знаходзіліся ў распараджэнні пазашкольнага пададдзела, пералічваліся наступныя мінскія бібліятэкі[829]: 1) Цэнтральная бібліятэка імя А. С. Пушкіна (фонд – да 18 000 тамоў, падпісчыкаў – 1500, платнае абслугоўванне); 2) Руска-яўрэйская бібліятэка імя Ю. Нейфаха – 2-я Савецкая (фонд – да 8000 тамоў, падпісчыкаў – 1000, бясплатнае абслугоўванне); 3) Чытальня імя Л. М. Талстога – 3-я Савецкая (фонд – каля 3500 тамоў); 4) Аляксандраўская чытальня – 4-я Савецкая (фонд – каля 3000 тамоў); 5) Беларуская – 5-я Савецкая бібліятэка пры Беларускім народным доме (фонд – да 2500 тамоў). Была скамплектавана невялікая бібліятэчка (каля 600 тамоў) і аддадзена камуністычнай ячэйцы Губваенкама, збіралася бібліятэка для Дома асветы Чырвонай Арміі, польская бібліятэка, рухомая бібліятэка для абслугоўвання партыйных бібліятэк і розных гурткоў.

Мінскі гарадскі камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі звяртаўся з просьбай перадаць у яго распараджэнне бібліятэку Купецкага клуба непасрэдна да камісара асветы таварыша Чарвякова, які ўласнаруч пазначыў на лісце: "Минской Коммунистической партии нужно дать одну из библиотек, имеющихся в распоряжении Отдела Народного Образования, т. к. она может оказать содействие в выработке цельного коммунистического миросозерцания у членов партии. Прошу оказать предъявителю сего полное содействие"[830].

Мінскае кнігасховішча, падпарадкаванае Аддзелу народнай адукацыі, ужо ў лютым 1919 г. змяшчала каля 32 000–35 000 тамоў з розных кнігазбораў. Найперш разбіраліся (сістэматызаваліся і дзяліліся паміж бібліятэкамі) кнігі бібліятэкі настаўніка Сяргея Пятровіча Зубакіна, якая была нацыяналізавана па пастанове Часовага ўрада[831]. Як адзначалася Бібліятэчнай камісіяй Аддзела народнай адукацыі, "приобретением этой библиотеки Отдел Народного Образования значительно смягчил крайнюю нужду всех существующих в Минске Городских библиотек в наиболее требуемых книгах"[832]. Далейшы лёс бібліятэкі планаваўся наступным чынам: па адным асобніку ўсіх твораў перадаць у кнігасховішча (Пушкінскую бібліятэку), дублеты размеркаваць паміж астатнімі гарадскімі бібліятэкамі. Праўда, пры разборы бібліятэкі С. П. Зубакіна былі вызначаны і "непригодные" кнігі, сярод якіх аказаліся "старые каталоги несуществующих в настоящее время книжных магазинов и издательств"[833]. Што сталася з кніжнымі выданнямі, якія былі прызнаны "непригодными", можна толькі здагадвацца, а вось сотні іншых кніг трапілі насамрэч у мінскія гарадскія біб-

828 Тамсама. Спр. 29. Арк. 16.
829 Тамсама.
830 Тамсама. Спр. 68. Арк. 41.
831 Тамсама. Спр. 29. Арк. 16.
832 Тамсама. Спр. 38. Арк. 36.
833 Тамсама. Арк. 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ліятэкі – Пушкінскую, Талстога, Аляксандраўскую, Руска-яўрэйскую, нават з пазнакай "купленные"[834]. Магчыма, мела месца адпаведнае рашэнне паводле хадайніцтва Бібліятэчнай камісіі Аддзела народнай адукацыі аб дазволе выдаць дзецям С.П.Зубакіна пэўную суму (35000 рублёў – паводле прашэння, а 10000 – насамрэч), хоць каштоўнасць бібліятэкі вызначалася ў тым самым хадайніцтве ў 100–150 тыс. рублёў[835]. Колькасны аб'ём кнігазбору, паводле падлікаў Бібліятэчнай камісіі, складаў 15–16 тыс. тамоў па розных галінах ведаў, асабліва скрупулёзна былі прадстаўлены руская мастацкая літаратура (нават у двух ці трох асобніках), літаратуразнаўства, мовазнаўства (у іх ліку выданні, прысвечаныя ўкраінскай і беларускай мовам), гісторыя. У меншай колькасці – літаратура па прыродазнаўстве і грамадскіх навуках. У кнігазборы былі вылучаны і кнігі на замежнай мове, пераважна нямецкай і французскай. Бібліятэка ўтрымлівала і шмат каштоўных "старинных книг (имеются книги, напечатанные в 15–18 столетиях)"[836]; толькі адзінкі з іх ідэнтыфікаваны сёння ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, бібліятэк Акадэміі навук, універсітэта культуры і мастацтваў[837].

Як вядома, частка асабліва каштоўных рарытэтаў – інкунабулы, рукапісныя і старадрукаваныя кнігі – адпраўляліся ў Народны камісарыят асветы РСФСР[838].

Бібліятэчная камісія гарадскога Аддзела народнай адукацыі, якая займалася размеркаваннем кніг сярод мінскіх бібліятэк, выконвала распараджэнні Народнага камісарыята асветы і ўрада (спачатку Часовага – ССРБ, потым – ССР ЛітБел). На некаторых дакументах захаваўся подпіс Аляксандра Чарвякова, члена Часовага ўрада, наркама асветы). Пры стварэнні спецыяльнай бібліятэкі па мастацтве пры Мінскім абласным музеі, напрыклад, мастацка-археалагічны пададдзел Аддзела народнай адукацыі выказаў прапанову Бібліятэчнай камісіі "предоставлять из книг, реквизируемых в квартирах бежавшей буржуазии, в распоряжение Библиотеки Музея все старинные и имеющие художественное значение книги и рукописи, а также все исследования и труды по вопросам искусства"[839]. Па меркаванні ж народнага камісара асветы А.Чарвякова, кнігі па пытаннях мастацтва павінны былі накіроўвацца і знаходзіцца ў цэнтральнай бібліятэцы – Пушкінскай.

Адзінкам мінскіх бібліятэк удалося пазбегнуць рэквізіцыі, сярод іх Бібліятэка Лібава-Роменскай чыгункі, якая была вызвалена ад дзеяння дэкрэта Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі (ад 30 студзеня 1919 г.) пасля хадайніцтва Камітэта Саюза служачых Лібава-Роменскай чыгункі перад Аддзелам народнай адукацыі аб захаванні бібліятэкі "как обслуживающей достаточно широкие потребности своего Профессионального Союза и отвечающей прямым интересам службы и самих трудящихся"[840].

---

834 Тамсама. Спр.35. Арк.195–209.

835 Тамсама. Спр.38. Арк.36.

836 Тамсама.

837 *Доўнар Л.І.* Мінскія кнігазборы XIX стагоддзя. С.60–72; *Радкевич О.* Минские библиофилы начала XX века: Татур и Зубакин // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. 2005. Вып.7. С.158–184.

838 *Покало М.И.* История библиотечного дела в БССР. С.64.

839 ДАМВ. Ф.322. Воп.1. Спр.38. Арк.34.

840 Тамсама. Арк.35.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Занепакоенасць аб захаванні былых бібліятэк выказвалі як грамадскія арганізацыі, так і навучальныя ўстановы. Да прыкладу, дырэкцыя Мінскага рэальнага вучылішча, што пераўтваралася ў Працоўную школу, клапацілася не толькі пра захаванне багатых фондаў сваёй бібліятэкі па фізіцы, прыродазнаўстве, літаратуры, гісторыі, геаграфіі, хіміі, якія збіраліся на працягу 40 гадоў, але і спрабавала шукаць шляхі па паляпшэнні становішча, “тем более, что за последние 4 года коллекции и пособия значительно пострадали как при многочисленных переездах… так и от крайне небрежного отношения к ним различных учреждений и Российских и Германских, занимающих под постой здание училища”[841].

Шэраг бібліятэк, якія існавалі пры гімназіях і розных вучэльнях Мінска[842], былі рэквізаваны, як і прыватныя кнігазборы, трапілі пад неаднаразовае пераразмеркаванне. Адны паступілі ў бібліятэкі савецкіх школ, іншыя склалі аснову Беларускай дзяржаўнай і ўніверсітэцкай бібліятэкі – гэта “… каля 40.000 томаў, сабраных у часе рэвалюцыі Наркамасьветам Беларусі, потым 5000 томаў з іншых крыніц, больш за 20.000 томаў б-кі б. Духоўнай сэмінарыі і каля 5000 томаў з Цэнтральнай Беларускай б-кі, што закладалася ў Менску да адчыненьня унівэрсытэту”[843], а іншыя яшчэ доўгі час заставаліся ў становішчы дэпазітных – былыя бібліятэкі Мінскай Марыінскай гімназіі, Мінскага Рускага грамадскага сходу, бібліятэка для чытання Б. А. Гарадзенскага[844] і шэраг тут не названых.

Гісторыя мінскіх кнігазбораў – гісторыя страт і разбурэння разнастайных і каштоўных бібліятэк, назапашаных стараннямі прыватнымі ці грамадскімі з рознымі мэтамі: калекцыйнымі, асветнымі, навучальнымі, што сведчылі аб развіцці даўняй кніжнай культуры, шырыні і нават бязмежнасці кніжнага свету, яго ўнутраных сувязях і адзінстве з цэлым сусветам.

І нават праз напісанне гісторыі тых страт адбываецца вяртанне страчанага, якое пераўтвараецца ў новыя веды, пашыраючы рэканструкцыйную прастору мінулага нашай кніжнай культуры. Як важныя пытанні фізічнага вяртання гвалтоўна вывезеных з Беларусі кніжных помнікаў, якія станавіліся актуальнымі ў часы адраджэнння беларускай дзяржаўнасці (у 1917–1918 гг., у 1920-я гг.[845], у 1990-я гг.[846]), так і не менш важным з’яўляецца захаванне і шанаванне таго, што маем з мінулага, а яно як разнастайнае, так і супярэчлівае, але ў гэтым цалкам і яго важнейшы маральны бок, і перспектывы развіцця нашага грамадства.

[841] Тамсама. Спр. 68. Арк. 15.

[842] Тамсама. Спр. 24. Арк. 1–5, 18.

[843] Беларуская дзяржаўная і унівэрсытэцкая бібліятэка // Адраджэньне: літаратурна-навуковы весьнік Інстытуту Беларускае культуры. Менск, 1922. Сш. 1. С. 303.

[844] Асобныя кнігі з дадзеных кнігазбораў увайшлі, напрыклад, у склад бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (у 1975 г.) і зараз захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх кніг і дакументаў.

[845] *Калубовіч А.* Мова ў гісторыі беларускага пісьменства … С. 200–202.

[846] Гл., напрыклад: Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты) : матэрыялы Міжнар. навук. канф. Мінск, 19–20 чэрв. 1997 г. / пад рэд. А. Мальдзіса. Мінск : ННАЦ імя Ф. Скарыны, 1997. 344 с. (Серыя “Вяртанне”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Заключэнне

Мінскае кнігадрукаванне прайшло ў сваім развіцці шлях, які пачынаўся ў XVII ст., ад рухомага (вандроўнага) да стацыянарнага ў канцы XVIII ст., калі была заснавана базыльянская друкарня, што сведчыла пра ўласныя патрэбы горада ў друкаваным слове – найперш у галіне кіравання і адукацыі.

Паступовa кнігавыданне ў Мінску набірала моц, і перыяд з канца XVIII – да пачатку XX ст. стаў часам яго далейшага станаўлення і развіцця. Для вылучэння і характарыстыкі пэўных этапаў у развіцці мінскай кнігавыдавецкай дзейнасці ў азначаны ў нашай працы перыяд быў распрацаваны комплексны крытэрый, у склад якога ўвайшлі галоўны, асноўныя і спецыфічныя крытэрыі. Галоўны крытэрый – гістарычны – звязаны з вылучэннем перыяду 1795–1917 гг. у гісторыі Беларусі і развіцці яе культуры як гістарычнага перыяду беларускай дзяржавы ў складзе Расійскай імперыі. Асноўныя крытэрыі – сацыяльна-эканамічны, палітычны і культурна-асветны. Прымяненне сацыяльна-эканамічнага крытэрыю дазваляе паказаць рост насельніцтва і яго склад у Мінску, развіццё прамысловасці і эканомікі,ператварэнне Мінска ў вядучы гандлёва-прамысловы і банкаўскі цэнтр; палітычнага – уплыў рэвалюцыйных і ваенных падзей 1830-х гг., 1863–1864 гг., 1870–1880-х гг., 1905–1907 гг., 1914–1917 гг.; культурна-асветнага – аб стане і развіцці культурна-асветных, адукацыйных установ і нацыянальна-этнічных супольнасцяў у горадзе, якія ўплывалі на патрэбы чытацкай аўдыторыі. Спецыфічныя крытэрыі, або кнігавыдавецкія, – гэта крытэрыі, з дапамогай якіх разгледжана дзяржаўная палітыка ў галіне друку, структура кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў, функцыянальныя асаблівасці і тэматыка кнігавыдавецкага рэпертуару, характэрныя асаблівасці кнігавыдання. У выніку вылучаны тры этапы мінскага кнігавыдання: 1795–1864, 1865–1904, 1905–1917 гг. Характэрнымі асаблівасцямі кожнага з іх з’яўляюцца цэнзурная залежнасць, колькасныя і якасныя змены ў развіцці кнігавыдання, кніжнай прадукцыі.

На першым этапе рэформа друку і кніжнай справы, якая пачала ажыццяўляцца на пачатку XIX ст., спрыяла зараджэнню і развіццю прыватнага і дзяржаўнага кнігавыдання. У 1795–1864 гг. прыватныя прадпрыемствы былі асноўным тыпам кнігавыдавецтваў і займалі вядучае становішча ў мінскім кнігавыданні. Колькасць выдадзенай імі кніжнай прадукцыі склала 75 %. Поспехі прыватнага кнігадрукавання ў Мінску ў 1850–1860-х гг. засведчылі большую канкурэнтаздольнасць прыватнага друку перад дзяржаўным. Кніжная прадукцыя, выдадзеная дзяржаўнымі выдавецтвамі, склала 23 %. З 1795 г. да 1807 г. Мінская губернская друкарня была адзінай дзеючай у горадзе друкарняй, дзякуючы якой выйшлі ў свет першыя мінскія навуковыя, вучэбныя і літаратурна-мастацкія кнігі. На трэцім месцы быў грамадскі тып выдавецтваў, прадстаўлены Мінскім таварыствам дабрачыннасці, кнігавыдавецкая прадукцыя якога скалала 2 %. На першым этапе 34,3 % выдадзенай у Мінску кніжнай прадукцыі належала рэлігійным выданням, 20,6 – выданням па мастацтве, 12,9 – мастацкай літа-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

ратуры, 7,3 % – гістарычнай. Відавы склад быў прадстаўлены ў асноўным выданнямі рэлігійнымі (33,5 %), для вольнага часу (18,5), літаратурна-мастацкімі (14,2) і вучэбнымі (12,4 %). Большасць кніжнай прадукцыі была на польскай мове. Выйшлі першыя выданні на беларускай мове (лацініцай).

У 1865–1904 гг. адбываюцца значныя змены ў мінскім кнігавыданні, звязаныя з развіццём кнігавыдавецтваў грамадскага тыпу. Агульная колькасць выдадзенай імі кніжнай прадукцыі склала 34,5 %. Дамінуючае становішча сярод кнігавыдавецтваў дадзенага тыпу занялі Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі і Таварыства мінскіх урачоў. Другое месца – прыватныя выдавецкія прадпрыемствы; іх кніжная прадукцыя склала 40,5 %. Дзяржаўны тып выдавецтваў займаў трэцяе месца. Кніжныя выданні дзяржаўных прадпрыемстваў у агульным патоку налічвалі 25 %. За 1865–1904 гг. адбыўся значны колькасны рост кніжнай прадукцыі ў параўнанні з першым этапам (1204 выд.). Дамінуюць мінскія выданні на рускай мове (1177 выд.). На польскай выйшла 18 выд., французскай – 5 выд., лацінскай – 2 выд. Асноўную тэматыку прадстаўляюць сацыяльна-эканамічныя (34,9 %), сельскагаспадарчыя (16,9), рэлігійныя (13,8) і гістарычныя (8,4 %) выданні. Відавы склад адзначаецца ў асноўным афіцыйнымі (61,3 %), рэлігійнымі (13,1), даведкавымі (11,1 %) выданнямі.

Трэці этап мінскага кнігавыдання звязаны з заваёвамі свабоды друку (1905 г.). Пачынаючы з 1905 г. у Мінску назіраецца значны колькасны рост кніжных выданняў, якіх за 1905–1917 гг. было выдадзена 1666. Асноўную масу кніжнай прадукцыі складаюць выданні на рускай (1524), польскай (54), яўрэйскай (50), беларускай (19) мовах. Пераважае сацыяльна-эканамічная (51,1 %), сельскагаспадарчая (9,7), рэлігійная (7,3), медыцынская (5,5 %) тэматыкі. Відавы склад прадстаўлены ў асноўным афіцыйнымі (66,2 %), рэлігійнымі (7,3), даведкавымі (7,2), і навуковымі (4,1 %) выданнямі. Для дадзенага этапу характэрны найбольшая актывізацыя, далейшае развіццё і канцэнтрацыя прыватнага кнігавыдання і колькасны рост прадукцыі (46,2 %). Узнікаюць выдавецкія і кнігагандлёвыя таварыствы («Verlag "Kultur"», "Минчук", "Вольная Беларусь"). Адпаведна колькасць грамадскіх арганізацый і таварыстваў складае 53 %, а выдадзеная імі кніжная прадукцыя – 26,3 %; дзяржаўных – адпаведна 17 і 27,5 %.

Размеркаванне прыярытэтаў у выданні кніжнай прадукцыі за перыяд з 1795 г. па 1917 г. паміж прыватнымі (53,9 % выданняў), грамадскімі (21 %) і дзяржаўнымі (25,1 %) выдавецтвамі вызначыла будову адпаведнай тыпалагічнай схемы, у аснову якой быў пакладзены лагічны прынцып развіцця формаў уласнасці. Адзначана таксама, што паміж усімі формамі ўласнасці існуе цесная функцыянальна-сістэмная сувязь. У сваю чаргу, кожны з вызначаных тыпаў кнігавыдавецтваў (прыватныя, грамадскія, дзяржаўныя) можа быць прадстаўлены адпаведнай структурай.

1795–1917 гг. – гэта перыяд станаўлення і развіцця мінскага кнігавыдання. Дынамічныя працэсы ў кнігавыдавецкай дзейнасці Мінска сведчаць аб яго актыўнай ролі ў грамадска-культурным жыцці горада.

У канцы XVIII – пачатку XX ст. у Мінску ўзніклі і атрымалі развіццё новыя тыпы кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў: дзяржаўныя, прыватныя і грамадскія. Тыпалагічная структура прыватных прадпрыемстваў прадстаўлена друкарнямі (літаграфіі, друкалітаграфіі, паравыя і электрадрукалітаграфіі), кнігарнямі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдавецтвамі газет і часопісаў, аўтарамі-выдаўцамі, выдаўцамі-прадпрымальнікамі, прыватнымі непрафесійнымі прадпрыемствамі. Як найбольш актыўная вызначаецца дзейнасць прыватных кнігавыдавецтваў З. І. Прэса, І. І. Стафановіча, Г. Э. Бланштэйна, братоў Бейліных, Ё. Дворца, А. Валіцкага, Э. Л. Адамовіча, Б. І. Саламонава, Н. М. Нахумава, С. А. Някрасава, В. Макоўскага, сямейных прадпрыемстваў Дворжацаў, Тасьманаў. Нязначным у мінскім кнігавыданні быў удзел выдаўцоў газет і часопісаў, выдаўцоў-прадпрымальнікаў, а таксама непрафесійных (невыдавецкіх) прадпрыемстваў. Сярод аўтараў-выдаўцоў уласных твораў у Мінску вызначыліся І. Легатовіч, В. Дунін-Марцінкевіч, Л. Шчарбовіч, Ф. Чапяліньскі, А. Валіцкі, Д. Бохан, А. Ельскі.

У дзейнасці грамадскіх кнігавыдавецтваў Мінска, колькасць якіх значна ўзрасла на другім і трэцім этапах (пасля 1865 г.), вызначаюцца таварыствы друкароў і выдаўцоў: "Polskia Spółka Wydawnicza", таварыствы "Минчук", "Саха", "Лучынка", "Вясёлка", "Вольная Беларусь"; выдавецтвы палітычных арганізацый: Беларускай сацыялістычнай грамады, "Звезды" пры Мінскім камітэце РСДРП; культурна-асветных: «Verlag "Kultur"», "Towarzystwo Polskiej Wiedzy Wojskowej"; навуковых: Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, Таварыства мінскіх урачоў, Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта; а таксама прамысловыя, спажывецкія, крэдытныя і страхавыя таварыствы; таварыствы дабрачыннасці, сацыяльнай, медыцынскай дапамогі; рэлігійныя таварыствы і ўстановы.

Асноўным дзяржаўным выдавецтвам у Мінску была Мінская губернская друкарня. За час сваёй дзейнасці ў ёй было выдадзена больш за 13 % ад усёй кніжнай прадукцыі Мінска. Вылучаюцца таксама дзяржаўныя выдавецтвы ў галіне эканомікі, прамысловасці, статыстыкі і крэдыту – гэта Мінскага губернскага статыстычнага камітэта і Упраўлення Лібава-Роменскай чыгункі; сярод ваенных устаноў – Камітэта Заходняга фронту Усерасійскага земскага саюза. Адзначаецца ўдзел у мінскім кнігавыданні і органаў улады (Мінскай губернскай управы па справах земскай гаспадаркі, Мінскай губернскай управы, Мінскай губернскай думы), устаноў у галіне адукацыі і асветы (Мінскай гімназіі), суда і права (Мінскага акружнога суда), аховы здароўя і догляду (Мінскага гарадскога санітарнага камітэта).

Спецыялізацыя ў кнігавыдавецкай дзейнасці адзначаецца ў рабоце друкалітаграфіі І. Каплана, які супрацоўнічаў з Мінскім таварыствам урачоў і выдаваў у асноўным літаратуру па медыцыне; у працы друкалітаграфіі Я. А. Грынблата, які прадоўжыў традыцыйныя сувязі друкарні Дворжацаў з Мінскім таварыствам сельскай гаспадаркі, вызначыўшыся ў выданні сельскагаспадарчай літаратуры; у друкалітаграфіі Я. Ш. Гатоўскага і М. Х. Юршчыка – выданне матэматычнай (вучэбнай) літаратуры; у Н. М. Нахумава – мастацкай літаратуры, вучэбнай філалагічнай на беларускай мове; у Ліўшыца-Баршая – мастацкай літаратуры на рускай мове; у М. Л. Зысьмана – мастацкай літаратуры на іўрыце і ідыш; у В. Макоўскага – мастацкай літаратуры на польскай мове.

Кнігавыдавецкія сувязі паміж Мінскам – Вільняй – Варшавай – Пецярбургам садзейнічалі падтрымцы, развіццю і распаўсюджанню беларускай, польскай, рускай і яўрэйскай кніжнай культуры, адукацыі і асветы. На пэўных гістарычных этапах кнігавыдавецкія сувязі мелі адпаведную накіраванасць у бок

аднаго з дамінуючых лакальных цэнтраў. Непасрэдна сувязі ажыццяўляліся праз аўтарска-выдавецкае, выдавецка-друкарскае, выдавецка-кнігагандлёвае ўзаемадзеянне, вынікам якога былі ў большасці выпадкаў сумесныя кніжныя выданні.

Кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Вільні грунтаваліся ў асноўным на прыватных ініцыятывах, якія праявіліся ў дзейнасці такіх віленскіх выдаўцоў і выдавецтваў, як Ю. Завадскі, А. Сыркін, І. Блюмовіч, Э. Навіцкі, "Edytor", "Znicz", "Наша Ніва", а таксама мінскіх аўтараў і выдаўцоў І. Легатовіча, А. Плуга, С. Фяліньскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Ельскага, Д. Бохана, В. Макоўскага, Ё. Фрэнкеля, таварыства "Минчук".

Паліграфічная база Варшавы ў некаторай ступені, як і Вільні, заставалася на першых пазіцыях у справе кнігавыдання для аўтараў і з Мінска. Мінска-варшаўскія кнігавыдавецкія адносіны праявіліся ў шэрагу сумесных праектаў братоў Бейліных і С. Оргельбранда; Ф. Фалька і Г. Натансона; А. Валіцкага і А. Гебетнера, А. Вольфа, У. Отта; З. Савіцкай і Ю. Сікорскага; Я. Філіповіча-Дубовіка і А. Каўтза, А. Гебетнера, А. Вольфа; В. Макоўскага і М. Арцта, П. Ляскаўэра; выдавецтва «Verlag "Kultur"» і "Издательской Типографии" ў Варшаве. У рэалізацыі мінска-варшаўскіх кантактаў назіраецца пасрэдніцтва Вільні. Найбольшы ўздым мінска-варшаўскіх сувязяў (1917 г.) быў звязаны з дзейнасцю ў Мінску Польскага таварыства вайсковых ведаў.

Кнігавыдавецкія сувязі паміж Мінскам і Пецярбургам, якія найбольш праявіліся пасля 1864 г. у дзейнасці палітычных арганізацый (народнікаў – "Черный передел"), студэнцкіх культурна-асветных арганізацый ("Круг беларускі"), выдавецкіх таварыстваў ("Загляне сонца і ў наша аконца", "Минчук"), аўтараў і выдаўцоў А. Ельскага, Я. Філіповіча-Дубовіка, Б. Адамовіча, В. Макоўскага, Ё. Фрэнкеля, былі накіраваны на самасцвярджэнне беларускай кніжнай культуры, на распаўсюджанне і ўплыў дэмакратычнай рускай кніжнай культуры.

Неабходна адзначыць, што, акрамя вылучаных найбольш тыповых кнігавыдавецкіх сувязяў Мінска з Вільняй, Варшавай і Пецярбургам, мелі месца таксама стасункі мінскіх кнігавыдаўцоў з Ляйпцыгам, Кракавам, Познанню, Кіевам, Смаленскам, Масквой.

Разгледжаныя кнігавыдавецкія сувязі дазваляюць выдзеліць некалькі ўзроўняў, на якіх вылучаюцца і пэўныя іх тыпы. Першы ўзровень – *міжрэгіянальны*, на якім асноўнай з`яўляецца нацыянальная характарыстыка. Другі, *культурны*, узровень звязаны з рознымі тыпамі актыўнасці, накіраванасці і ўплыву пэўнага лакальнага рэгіёна. Трэці, *камунікатыўны*, узровень – гэта наступныя тыпы кнігавыдавецкага супрацоўніцтва: аўтарска-выдавецкі, выдавецка-друкарскі, выдавецка-кнігагандлёвы. І, нарэшце, чацвёрты, *колькасна-якасны*, узровень вызначаюць непасрэдна кніжныя выданні. Іх характарыстыкамі з'яўляюцца колькасная, моўная, функцыянальная, тэматыка-тыпалагічная, паліграфічна-афарміцельская, рэдакцыйна-выдавецкія якасці. Такім чынам, мінскія кнігавыдавецкія сувязі ўяўляюць сабой рознабаковыя, шматузроўневыя тыпы. Разглядаючы міжрэгіянальныя кнігавыдавецкія сувязі, у нашым выпадку Мінска і Вільні, Мінска і Варшавы, Мінска і Пецярбурга, неабходна адзначыць, што іх абумоўленасць характарызуецца гісторыка-эканамічным, нацыянальна-культурным узаемадзеяннем, супрацьстаяннем цэнзурнаму ўціску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1795–1917 гг. асноўныя колькасныя галінова-тэматычныя прыярытэты былі за сацыяльна-эканамічнымі – 41,5 %, сельскагаспадарчымі – 11,9, рэлігійнымі – 11,8, медыцынскімі – 5,7, гістарычнымі – 5,5 і выданнямі па адукацыі, педагогіцы (3,9) і мастацкай літаратуры (3,8 %). Асаблівасцю многіх мінскіх выданняў была іх краязнаўчая тэматыка незалежна ад галіны ведаў.

Дамінуючае становішча ў відавым складзе мінскага кнігавыдавецкага рэпертуару па функцыянальным прызначэнні займалі афіцыйныя і рэлігійныя выданні. Адлюстраваннем сацыяльных патрэб мінскага грамадства былі ў асноўным даведкавыя, навуковыя, вучэбныя і літаратурна-мастацкія выданні, для якіх характэрнымі функцыямі з'яўляліся пазнавальная, агульнакультурная, асветная, выхаваўчая, геданічная.

Мінскае кнігавыданне стала значным стымулам у развіцці нацыянальных культурных асяродкаў. У цэлым можна адзначыць, што беларускае кнігавыданне складалася з разнамоўных нацыянальных кнігавыдавецкіх плыняў, асноўнымі з якіх былі беларуская, польская, руская, яўрэйская, цесна звязаныя між сабой тэматычна і функцыянальна. Адну з вядучых пазіцый у разнамоўным кнігавыданні Мінска займалі вучэбныя і літаратурна-мастацкія выданні. Нягледзячы на рускамоўную дамінанту ў рэпертуары, кнігавыданне Мінска было максімальна набліжаным да мясцовых інтарэсаў, спрыяла развіццю мясцовага аўтарства. Адным са значных дасягненняў мінскага кнігавыдання 1795–1917 гг. з`яўлялася пашырэнне аўтарскай групы за кошт менавіта мясцовых аўтараў–спецыялістаў у розных галінах дзейнасці, што адпавядала стану развіцця пэўнай галіны. Аднак усё ж вядучае становішча заставалася за аўтарамі-пісьменнікамі і педагогамі, што пацвярджае становішча тагачаснага Мінска як значнага культурна-асветнага цэнтра.

Кніжнаму гандлю Мінска характэрны як розныя стадыі развіцця, так і формы. І амаль нязменна на працягу XVIII – пачатку XX ст. Мінск заставаўся рэцыпіентам кніжнай прадукцыі, якая выпускалася ў Рэчы Паспалітай і Вялікім Княстве Літоўскім, краінах Еўропы, у Расійскай імперыі.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. асноўнай формай кніжнага гандлю ў Мінску з'яўляўся рухомы (вандроўны), часова-стацыянарны (кірмашовы) гандаль, які забяспечваўся ў асноўным дзякуючы кнігагандлярам з Варшавы і Вільні. У першай палове XIX ст. разам з рухомым атрымлівае развіццё стацыянарны кніжны гандаль. Пачынаючы з 1860-х гг. кнігарні горада становяцца аднымі з важнейшых культурных цэнтраў, вакол якіх групуецца мясцовая інтэлігенцыя, наладжваюцца кніжныя сувязі.

З канца XIX – на пачатку XX ст. адзначаецца найбольш актыўнае развіццё кніжнага гандлю ў Мінску, дзейнічаюць буйныя кнігарні Б. Гарадзенскага, В. М. Фрумкіна, Ё. Фрэнкеля, В. Макоўскага. На пачатак 1919 г. у Мінску налічвалася каля 20 прыватных кніжных крамаў, пры якіх таксама існавалі прыватныя бібліятэкі-чытальні (або прыватныя публічныя бібліятэкі), развіваўся букіністычны гандаль. Кнігагандляры забяспечвалі доступ для жыхароў горада і губерні да сучасных выданняў на рускай, польскай, французскай, нямецкай, яўрэйскай, беларускай мовах самага шырокага функцыянальнага прызначэння і тэматыкі. Паступова вызначалася спецыялізацыя ў дзейнасці кнігарняў, найперш найбольш выразная па моўнай прыкмеце ці па нацыянальным складзе жы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хароў, спажыўцоў кніжнай прадукцыі (руская, польская, яўрэйская, беларуская кнігарні), а таксама па відах выданняў (кніжныя, перыядычныя, нотныя, вучэбныя, літаратурна-мастацкія). Адначасова кнігарні, дбаючы аб камерцыйным інтарэсе, заставаліся ўніверсальнымі пунктамі па распаўсюджванні выданняў разнастайнай тэматыкі, нягледзячы на пэўны кірунак сваёй спецыялізацыі.

Значная роля ў захаванні кніжнай спадчыны належала мінскім прыватным кнігазборам, якія, нягледзячы на панесеныя страты ў выніку ўздзеяння тагачасных палітычных, ваенных і рэлігійных фактараў, сталі асновай для стварэння дзяржаўных публічных і вучэбных бібліятэк. Большасць манастырскіх бібліятэк Мінска перасталі існаваць у 1832 г., 1860-х гг.; "польскіх" (асабліва вучэбных і грамадскіх) – пасля 1863 г. Адток кніжных рарытэтаў адбываўся пачынаючы з 1837 г. у Санкт-Пецярбург, з 1850–1860-х гг. – у Вільню, з 1919–1920-х гг. – у Варшаву, Маскву.

Кнігазборы знікалі падчас ваенных дзеянняў ад пажараў і рабаванняў, мянялі ўладальніцкую прыналежнасць у выніку продажу і рэквізіцыі. Аднак нават рэшткі захаваных вопісаў, спісаў і каталогаў бібліятэк горада сведчаць аб іх каштоўнасным змесце, а некаторыя з захаваных бібліятэчных рарытэтаў працягваюць і сёння служыць сваім чытачам, нагадваючы пра непарыўную сувязь з сусветнай прасторай кніжнай культуры: учора, сёння і на будучае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Бібліяграфічны спіс

### *Архівы*


БДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 39.

БДАМЛіМ. Ф. 382. Воп. 1. Фонд Палееса.

ГАРФ. Ф. 1165. Д. 245.

ДАМВ. Ф. 322. Воп. 1. Спр. 8, 24, 29, 30, 35, 38, 68.

ДАМВ. Ф. 324. Воп. 1. Спр. 151.

ДАМВ. Ф. 343. Воп. 1. Спр. 1, 25, 28.

НАРБ. Ф. 1737. Воп. 1. Спр. 19.

НГАБ. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 269, 4817, 6971.

НГАБ. Ф. 21. Воп. 1. Спр. 57, 114, 116.

НГАБ. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 1270, 2621.

НГАБ. Ф. 69. Воп. 1. Спр. 1, 3.

НГАБ. Ф. 124. Воп. 1. Спр. 121.

НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 26477, 2866, 44283.

НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 193, 129, 359, 417, 958, 1077, 1296, 1453, 1983, 2810, 3395, 3396, 3397, 3398, 4308, 4845, 4941, 5416, 5418, 5516, 6251, 6422, 6447, 6784, 6787, 6792, 7461а, 7477, 7595, 7667, 7675, 7705, 7744, 7770, 7949, 8150, 8146, 8230, 8297, 9039, 9057, 9243.

НГАБ. Ф. 295. Воп. 2. Спр. 126.

НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 207, 220, 467, 505, 812, 865.

НГАБ. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 9194, 11862а, 13342а, 15204, 15931, 16237.

НГАБ. Ф. 299. Воп. 3. Спр. 1766.

НГАБ. Ф. 299. Воп. 7. Спр. 15.

НГАБ. Ф. 300. Воп. 1. Спр. 10, ч. 4; спр. 66.

НГАБ. Ф. 306. Воп. 1. Спр. 4, 19, 26, 34, 64.

НГАБ. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 10, 31, 94, 7461а.

НГАБ. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 3806.

НГАБ. Ф. 456. Воп. 1. Спр. 1, 5, 8, 9, 10, 11, 262, 264, 267, 268, 276.

НАГБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 160, 222.

НАГБ. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 1, 204, 295, 409.

НАГБ. Ф. 473. Воп. 1. Спр. 1, 3, 5, 8, 28, 29.

НАГБ. Ф. 483. Воп. 1. Спр. 15, 16, 121, 122.

НГАБ. Ф. 491. Воп. 1. Спр. 110.

НАГБ. Ф. 797. Воп. 2. Спр. 1–3.

НГАБ. Ф. 1416. Воп. 2, Спр. 2026.

НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27, Спр.186, 245, 256, 266, 267, 268, 269, 282, 289, 293, 302, 304, 337, 340, 349, 359, 365, 399, 409, 412.

НГАБ. Ф. 1781. Воп. 32, Спр. 186, 187.

НГАБ у Гродне. Ф. 1. Воп. 7. Спр. 2299.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

НГАБ у Гродне. Ф. 1. Воп. 8. Спр. 2638, 2788.
НГАБ у Гродне. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 195, 1062, 2176.
НГАБ у Гродне. Ф. 2. Воп. 13. Спр. 106.
РГИА СПб. Ф. 772. Оп. 1. Д. 74, 912, 2006, 2574, 3025, 5517, 5868.
AGAD. II. Warszawski Komitet Cenzury.
AGAD. III. Archiwum Prozorów i Jelskich.
AGAD. III. Archiwum Przezdzieckich. B–1430.
BN. Rkp. 2976. K. 5–88 (Papiery różne ze zbiorów Aleksandra Walickiego z lat 1890–1893).
LB LMA RS. F. 22. B. 29.
LVIA. F. 378. Ap. BS 1846. B. 1071.
LVIA. F. 439. Ap. 1. B. 166, 178.
LVIA. F. 567. Ap. 2. B. 3381.
LVIA. F. 600. Ap. 1. B. 350.
LVIA. F. 601. Ap. 1. B. 34.
LVIA. F. 716. Ap. 4. B. 217, 222.
LVIA. F. 1135. Ap. 7. B. 160, 439, 481.
LVIA. F. 1240. Ap. 1. B. 43, 208.
LVIA. F. 1241. Ap. 1. B. 17.
LVIA. F. 1242. Ap. 1. B. 10.
VUB RS. F. 3. B. 165.
VUB RS. F4-35677. A-2317.

### ***Бібліяграфія***

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст. : бібліягр. паказ. / склад. Г. Р. Сянькевіч [і інш.] ; пад рэд. С. В. Снапкоўскай (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1995. – Ч. 1. –173 с.; Ч. 2. – 205 с.

*Бібіла, Ю. І.* Летапіс беларускага друку / Беларус. дзярж. б-ка ; склад. Ю. І. Бібіла. – Менск, 1929. – Ч. 2 : Паасобныя выданьні на беларускай мове (з дадаткам проклямацый і адозваў 1863 і 1905 г.), 1835–1916 гг. – 39, [1] с.

*Бібіла, Ю. І.* Летапіс беларускага друку / Беларус. дзярж. б-ка ; склад. Ю. І. Бібіла. – Менск, 1927. – Ч. 3 : 1917–1924, сш. 1 : Выданьні на беларускай мове. – 56, [VIII] с.

*Бибило, Ю. И.* Летопись печати БССР / ГБЛ БССР ; сост. Ю. И. Бибило, Ф. А. Мерина. – Минск : ГБЛ БССР, 1969. – Ч. 3 : 1917–1924, тетр. 2 : Издания на русском, польском, еврейских языках. – 115 с.

Библиотечное дело в Белоруссии (XVI в. – 1917 г.) : библиогр. указ. / сост. Л. Н. Новицкая. – Минск : ГБЛ БССР, 1982. – 194 с.

*Василевская, М. А.* Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия : библиогр. на иностр. яз. / сост. М. А. Василевская. – Минск : ГБЛ БССР, 1980. – Ч. 1 / под ред. А. П. Грицкевича. – 408 с.

*Василевская, М. А.* Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия : библиогр. на иностр. яз. / сост. М. А. Василевская. – Минск : ГБЛ БССР, 1983. – Ч. 2 / под ред. А. И. Мальдиса. – 418 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Василевская, М. А.* Белоруссия в печати XVIII столетия : библиогр. указ. на иностр. яз. / сост. М. А. Василевская ; редкол.: А. П. Грицкевич, А. И. Мальдис, З. А. Корень. – Минск : ГБЛ БССР, 1985. – 288 с.

*Василевская, М. А.* Белоруссия в печати 1917–1939 гг. : библиогр. указ. / сост. М. Василевская ; науч. ред. А. И. Мальдис, А. П. Грицкевич. – Минск : АН БССР, 1990. – Ч. 1. – 193 с. – (Научно-реферат. бюллетень (зарубежная литература) ; № 77–78).

*Голенченко, Г. Я.* Библиографический список белорусских старопечатных изданий XVI–XVIII вв. / сост. Г. Я. Голенченко. – Минск : ГБЛ БССР, 1961. – 127 с.

Затемненное зеркало. Материалы из собраний Романовых и библиотек императорских и великокняжеских дворцов в Нью-Йоркской Публичной библиотеке : перечень и руководство для исследования / сост. Р. Дэвис мл. – Нью-Йорк : Norman Ross Publishing Inc., 1999. – 310 s.

Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог / склад. Г. Я. Галенчанка [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 615 с. : іл. – Таксама гл.: Кніга Беларусі. 1517–1917 : зводны каталог [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі, НДА кнігазнаўства ; склад. каталогу Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч ; склад. электрон. выдання Г. У. Кірэева, А. А. Суша, К. В. Языковіч; адказ. рэд. Г. У. Кірэева. – Электрон. тэкставыя, графічныя дан. і прагр. (196 Мбайт). – Мінск : НББ, 2006. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM); 12 см.

Литература о евреях на русском языке, 1890–1947: Книги, брошюры, оттиски статей, органы периодической печати : библиогр. указ. / Петерб. еврейский ун-т ; Рос. нац. б-ка ; сост. В. Е. Кельнер, Д. А. Эльяшевич. – Санкт-Петербург : Академ. проект, 1995. – 680 с.

Памятные книжки Минской губернии (1845–1916) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (4,5 Гб). – Минск : Нац. б-ка Беларуси, 2014. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM). – Системные требования: II 400 ; RAM 64 ; SVGA ; Windows98. – Заглавие с титульного экрана.

Православие : библиогр. указ. кн. на рус. и церк.-слав. яз. за 1918–1993 гг. / сост. Н. Ю. Бутина, К. К. Тарасов ; науч. ред. и введ. протоиерея В. В. Асмуса. – Москва : Изд-во Правосл. Свято-Тихонов. богослов. ин-та ; Рос. гос. б-ка, 1999. – 512 с.

Русские официальные и ведомственные издания XIX – начала XX века : каталог / сост. Е. К. Авраменко, Н. Г. Маркова, Н. Е. Кащенко. – Санкт-Петербург : БЛИЦ, 1995–1996. –1995. – Т. 1. – 273 с. ; 1995. – Т. 2. – 192 с. ; 1996. – Т. 3. – 287 с. ; 1996. – Т. 4. – 351 с.

*Семенников, В. П.* Дополнительные материалы для истории провинциальных типографий XVIII и начала XIX века и для библиографии книг, в них напечатанных / В. П. Семенников. – Санкт-Петербург, 1913. – 26 с. – (Отт. из ж. "Русский библиофил". 1913. Кн. 7).

Систематический указатель литературы о евреях на русском языке со времени введения гражданского шрифта (1708 г.) по декабрь 1889 г. / [сост. Л. М. Брамсон]. – Санкт-Петербург : Типолитогр. А. Е. Ландау, 1892. – 568 с, VIII с. – (Особое прил. к ж. "Восход").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Benjacob, I. A.* Ozar ha-sepharim: Thesaurus Librorum Hebraicorum Tam Impressorum Quam Manu Scriptorum : bibliographie der gesammten hebraeischen Literatur mit Einschluss der Handschriften (bis 1863) = Оцар Га-Сефарим. Сокровище книг : библиография всеобщей еврейской письменности со включением рукописей (до 1863 г.) в алфавитном порядке / сост. И. А. Бенякоб, [прим. М. Штейншнейдера]. – Wilna : J. Benjacob, 1880. – 678, XXXII, 2 s.

Bibliografia Polska Karola Estreichera / Un-t Jagielоński. – Wyd. drugie. – Kraków : Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1991. – T. XV : Katalogi. – 274 s.

Bibliografia Polska, 1901–1939 / Biblioteka Narodowa. Instytut Bibliograficzny ; pod red. Janiny Wilgat (T. 1–4). – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich Wyd-wo ; Warszawa : Biblioteka Narodowa, 1986. – T. 1. – 549 s. ; 1991. – T. 2. – 689 s. ; Warszawa : Biblioteka Narodowa, 1993. – T. 3. – 623 s. ; 1998. – T. 4. – 706 s. ; 2002. – T. 5. – 593 s. ; 2005. – T. 6. – 656 s. ; 2006. – T. 7. – 746 s. ; 2006. – T. 8. – 662 s. ; 2007. – T. 9. – 733 s. ; 2009. – T. 10. – 751 s. ; 2009. – T. 11. – 734 s. ; 2009. – T. 12. – 707 s. ; 2010. – T. 13. – 691 s. ; 2012. – T. 14. – 748 s. ; 2013. – T. 15. – 696 s. ; 2014. – T. 16. – 678 s. : il. – Таксама: http://www.bn.org.pl/katalogi-i-bibliografie/bibliografia-narodowa/bibliografia-polska-1901-1939.

Biblioteki na wschodnich ziemiach II Rzeczypospolitej : Informator / red. nauk. Barbara Bieńkowska ; oprac. Urszula Paszkiewicz [i in.]. – Poznań : Bogucki, 1998. – 800 s. – (Polskie dziedzictwo kulturalne. Seria B : Wspolne dziedzictwo).

Bibliotheca Friedlandiana : каталог еврейских книг (изданных до 1892 г.) библиотеки Института востоковедения АН СССР / сост. И. Г. Бендер ; под ред. П. К. Коковцова. – Москва ; Ленинград : АН СССР , Ин-т востоковедения, 1936. – Вып.8. – С. 657–696.

Catalog Hebraischen Bűcher in der Bibliothek des Professors D. Chwolson. – Wilna : Buchdruckerei der Wittwe & Gebr.Romm, 1897. – 158 s.

*Estreicher, K.* Bibliografia polska. Część 1 : XIX stólecie / K. Estreicher. – Kraków : Wyd. Akad. Umiejętności; druk. Un-tu Jagel., 1872. – T. 1. A–F. – 523, 48, III s. ; 1874. – T. 2. G–L. – 634 s. ; 1876. – T. 3. Ł–Q. – V, 608 s. ; 1878. – T. 4. R–U. – IV, 629 s. ; 1880. – T. 5. W–Z. – 335 s. ; 1881. – T. 6. Dopełnienia A–O. – II, 577 s. ; 1882. – T. 7. Dopełnienia P–Ż. – 292 s. – Таксама: http://www.estreicher.uj.edu.pl.

*Estreicher, K.* Bibliografia polska. Część 2 : Chronologicznie zestawienie, 1800–1870 / K. Estreicher. – Kraków : Wyd. Akad. Umiejętności ; druk. Un-tu Jagel.,1885. – T. 10. – VIII, 489, XXVIII s. ; 1890. – T. 11. – IV, 400, 187 s. – Таксама: http://www.estreicher.uj.edu.pl.

*Estreicher, K.* Bibliografia polska. Część 4 / K. Estreicher. – Kraków : Nakł. spółki księgarzy polskich ; druk W. L. Anczyca, 1906. – T. 1. – 415 s. ; 1907. – T. 2. – 403 s. ; 1911. – T. 3. – 475 s. ; 1916. – T. 4. – 652 s. – Таксама: http://www.estreicher.uj.edu.pl.

*Paszkiewicz, U.* Bibliografia inwentarzy i katalogów księgozbiorów polskich i założonych w Polsce do 1939 roku / Urszula Paszkiewicz. – Warszawa : Wyd-wo Uniwersytetu Warszawskiego, 1990. – Cz. 1 : Księgozbiory instytucjonalne w układzie topograficznym. – 286 s. ; Cz. 2 : Księgozbiory prywatne w układzie abecadłowym nazwisk właścicieli. – 204 s.

*Paszkiewicz, U.* Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej (spis za lata 1510–1939) / Urszula Paszkiewicz. – Warszawa : Wyd-wo DiG, 1998. – 260 s. – (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Paszkiewicz, U.* Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 1 / Urszula Paszkiewicz. – Warszawa : Wyd-wo DiG, 2000. – 301 s. – (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo).

*Paszkiewicz, U.* Inwentarze i katalogi bibliotek ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Suplement 2 / Urszula Paszkiewicz. – Poznań : Bogucki ; Wyd-wo Naukowe, 2006. – 636 s. – (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo).

*Paszkiewicz, U.* Rękopiśmienne inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej. Spis za lata 1553–1939 / Urszula Paszkiewicz. – Warszawa : Wyd-wo DiG, 1996. – 96 s. – (Polskie Dziedzictwo Kulturalne. Seria B : Wspólne dziedzictwo).

*Rosenfeld, M.* Hebrew printing from its beginning until 1948 : A gazetteer of printing, the first books and their dates with photographed titell-pages and bibliographical notes / M. Rosenfeld. – Jerusalem : M. ben E. Rosenfeld, 1992. – 147 p.

*Rudnicka, J.* Bibliografia katalogów księgarskich wydanych w Polsce do końca wieku XVIII / Jadwiga Rudnicka. – Warszawa : B-ka Narodowa, 1975. – 298, [2] s., [16] s. tabl. : il. – (Prace Instytutu Bibliograficznego BN ; nr 9).

*Wiener, S.* Bibliotheca Friedlandiana : Catalogus librorum impressorum hebraeorum in Museo Asiatico Imperialis Academiæ Scientiarum Petropolitanaæ Asservatorum / S. Wiener. – Petropoli : Commissionaires de l` Academie Imperiale des Sciences, 1893. – Fasc. 1. – 126, [4] s. ; 1895. – Fasc. 2. – 223, [3] s. ; 1897. – Fasc. 3. – 315, [3] s. ; 1902. – Fasc. 4. – 449, [3] s. ; 1904. – Fasc. 5. – 559, [3] s. ; 1918. – Fasc. 6. – 630, [2] s. ; 1918. – Fasc. 7. – S. IV, 631–658.

## *Літаратура*

*Адо, Н.* Краткий исторический очерк Минской мужской гимназии / Н. Адо. – Минск : Тип. И. и В. Тасьман, 1903. – Ч. I (до 1831 года). – 234 с.

*Александровіч, С.* Гісторыя і сучаснасць: Літаратурна-крытычныя артыкулы / С. Александровіч. – Мінск : Беларусь, 1968. – 256 с.

*Александровіч, С. Х.* Пуцявіны роднага слова: Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя / С. Х. Александровіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. – 248 с.

*Анішчанка, Я.* Пасляслоўе / Я. Анішчанка // Часовая мінская газета. 1812 год : пер. з пол. мовы / пад рэд. Я. Анішчанкі. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2008. – С. 176–181.

Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленскаго Учебнаго Округа. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1900. – Т. 12. – 277 с.

*Ахвердава, А.* Пачынальнікі беларускага піянізму / А. Ахвердава // Мастацтва Беларусі. – Мінск, 1985. – № 2. – С. 67–70.

*Ахвердава, А.* Фларыян Міладоўскі / А. Ахвердава // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 1980. – № 3. – С. 38–39.

*Баренбаум, И. Е.* Книжные связи как фактор международного и межнационального культурного общения: (Историография. Источники. Проблематика) / И. Е. Баренбаум // Книга. Исследования и материалы. – Москва : Терра, 1994. – Сб. 69. – С. 18–26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Баренбаум, И.Е.* Соотношение теории, истории, методики и практики книжного дела : (Историко-прогностический обзор) / И.Е.Баренбаум // Книга. Исследования и материалы. – Москва : Терра, 1994. – Сб. 68. – С.5–18.

*Бас, І.С.* Літаратуразнаўчыя эцюды : (Пра беларускіх пісьменнікаў і культурных дзеячаў другой паловы XIX – пачатку XX ст.) / І.С.Бас. – Мінск : Мастац. літ., 1977. – 222с. : іл.

*Бас, І.С.* Падарожжа ў літаратурнае мінулае : Літаратурна-крытычныя артыкулы / І.С.Бас. – Мінск : Беларусь, 1971. – 232с.

*Батяев, В.Ф.* Городские общественные объединения / В.Ф.Батяев // Нарысы гісторыі і культуры Беларусі : у 4 т. / навук. рэд. член-кар. НАН Беларусі А.І.Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2014. Т.2. – С.531–570.

*Белов, С.В.* Книжная торговля в Петербурге и Москве / С.В.Белов // Книга в России. 1861–1881 : в 3 т. – Москва : Книга, 1991. – Т.3. – С.45–68.

*Беловицкая, А.А.* Книговедение. Общее книговедение : учеб. / А.А.Беловицкая ; Моск. гос. ун-т печати. – Москва : МГУП, 2007. – 393с.

*Берёзкина, Н.Ю.* Библиотеки и распространение научных знаний в Беларуси (XVI – XX вв.) / Н.Ю.Берёзкина. – Минск : Белорус. наука, 2011. – 523с.

*Берёзкина, Н.Ю.* Роль печати в распространении научных знаний в Белоруссии. 1861–1917 / Н.Ю.Берёзкина. – Минск : Наука и техника, 1990. – 112с. : ил.

*Бирало, А.А.* Философские проблемы в науке эпохи Просвещения в Беларуси и Литве / А.А.Бирало. – Минск : Изд-во БГУ, 1979. – 160с.

*Біч, М.В.* Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст. : гістарычныя асаблівасці, узаемаадносіны з іншымі народамі / М.В.Біч ; АН Беларусі ; Беларус. камітэт славістаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 30с.

*Біч, М.В.* Гісторыя Беларусі : канец XVIII ст. – 1917 г. : вучэб. дапам. / М.В.Біч – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 336с.

*Бонч-Асмалоўскі, А.* Эпоха 1905 году: Мае ўспаміны / А.Бонч-Асмалоўскі // Полымя. – 1925. – №6. – С.177.

*Блинова, Т.Б.* Иезуиты в Беларуси. Роль езуитов в организации образования и просвещения / Т.Б.Блинова. – Гродно : ГрГУ, 202. – 427с.

*Бяляцкі, А.* Літаратура і нацыя / А.Бяляцкі. – Мінск : Арт Гейзер, 1991. – 103с.

*Бярозкіна, Н.Ю.* Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н.Ю.Бярозкіна. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 199с. : іл.; 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 200с.

*Ватацы, Н.Б.* Выданні на беларускай мове: XIX – пачатак XX ст. / Н.Б.Ватацы // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. – Мінск : БелСЭ, 1986. – С.193–199.

*Вержболович, М.* Первый период существования Минской духовной семинарии (1785–1817 г.) / М.Вержболович // Минские епархиальные ведомости. – 1893. – №2 (ч. неоф.). – С.66–70.

*Вержболович, М.* Второй период существования Минской духовной семинарии (1817–1840 г.) / М.Вержболович // Минские епархиальные ведомости. – 1895. – №12 (ч. неоф.). – С.328–337.

*Вержболович, М.* Третий период существования Минской духовной семинарии (1840–1874 г.) / М.Вержболович // Минские епархиальные ведомости. – 1899. – №14 (ч. неоф.). – С.323–332.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Владимиров, Л. И.* Всеобщая история книги : Древний мир. Средневековье. Возрождение. XVII век / Л. И. Владимиров ; пер. Н. Л. Владимировой. – Москва : Книга, 1988. – 322 с. : ил.

*Галенчанка, Г. Я.* Старадрукаваныя кірылічныя кнігі 16–18 стст. / Г. Я. Галенчанка // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. – Мінск : БелСЭ, 1986. – С. 10–22.

*Герасімаў, В. М.* Гісторыя цэнзуры друку на Беларусі : Стагоддзе за стагоддзем / В. М. Герасімаў // Матэрыялы Першых кнігазнаўчых чытанняў (Мінск, 15 верас. 1998 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск : НББ, 2000. – С. 32.

Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – Ч. 1 : Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – 416 с.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. / НАН Беларусі , Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – Т. 1 : Даўняя літаратура, XI – першая палова XVIII стагоддзя. – 910 с.; 2007. – Т. 2 : Новая літаратура, другая палова XVIII – XIX стагоддзе. – 582 с.

Гісторыя Мінска / пад рэд. чл.-кар. НАН Беларусі У. А. Бабкова. – Мінск : БелЭн, 2006. – 696 с. : іл.

*Голенченко, Г. Я.* История белорусского книгопечатания XVI – XVIII веков (кирилловского) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Голенченко Георгий Яковлевич ; Моск. гос. ист.-арх. ин-т. – Москва, 1965. – 18 с.

*Горшков, Ю. А.* Политико-правовой режим протекционизма книгопечатания и книгоиздания в России первой половины XIX века / Ю. А. Горшков // Книга в пространстве культуры : науч.-практ. сб. / отв. сост. О. Р. Хромов. – Москва, 2008. – № 1(4). – С. 58–71. – (Прил. к ж. "Библиотековедение").

*Гречихин, А. А.* Региональный аспект развития государственной системы НТИ / А. А. Гречихин // Региональные аспекты информационно-культурологической деятельности : тез. докл. Междунар. науч. конф., Краснодар–Новосибирск, 16–18 сент. 1998 г. – Краснодар : КГАКиИ, 1998. – С. 44–46.

*Гречихин, А. А.* Библиотипология как научное направление : особенности становления и развития в российском книговедении : моногр. – Москва : МГУП, 2004. – 432 с.

*Грыбко, І.* Гарадское самакіраванне Мінска напярэдадні першай сусветнай вайны (1909–1913 гг.) / Ірына Грыбко // Старонкі гісторыі і культуры Беларусі / пад рэд. А. Г. Каханоўскага. – Мінск : Красіка-прынт, 1997. – С. 91–96.

*Грыцкевіч, В.* Шляхі вялі праз Беларусь / В. Грыцкевіч, А. Мальдзіс. – Мінск : Мастац. літ, 1980. – 272 с. : іл.

*Гурецкий, А. А.* Политика царизма в области образования в Белоруссии в конце XVIII – первой четверти XIX в. (1772–1825) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Гурецкий Александр Антонович ; Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка. – Минск, 1998. – 20 с.

*Дадзіёмава, В.* Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі / В. Дадзіёмава. – Мінск : БДАМ, 2001. – 254 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Даўгяла, З. І.* Матар'ялы аб музэі Г. Х. Татура ў Менску / З. І. Даўгяла // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. – Мінск, 1929. – Кн. 8 (Працы клясы гісторыі ; т. 3). – С. 553–559.

*Денисов, В.* Библиотеки минских католических монастырей XVIII–XIX веков / В. Денисов // Kultura książki ziem wscodniego i południowego pogranicza Polski (XVI–XX wiek): Paralele i różnice / red. naukowa J. Gwioździk i E. Rożycki. – Katowice : Wyd-wo Un-tu Śląskiego, 2004. – S. 419–425.

*Денисов, В. Н.* К истории одной неопубликованной книги / В. Н. Денисов // Книга в Белоруссии : сб. / ЦНБ им. Я. Коласа АН БССР ; редкол.: Г. Я. Голенченко [и др.]. – Минск, 1988. – С. 125–139.

*Дзянісаў, У. М.* Комплекс базыльянскіх манастыроў у Мінску / У. М. Дзянісаў // Помнікі старажытнабеларускай культуры. Новыя адкрыцці : [зб. арт.] / АН БССР, Ін-т мастацтвазн., этнагр. і фальклору ; [рэд. С. В. Марцэлеў]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – С. 118–126.

*Дзярновіч, А.* Мінскі антыквар і археолаг Генрых Татур ва ўспамінах і ліставанні / А. Дзярновіч // Знакамітыя мінчане XIX–XX стст. / Польскі Ін-т у Мінску. – Мінск : Выд. Віктар Хурсік, 2011. – Вып. 6 : Мінск і мінчане ў літаратурных творах на рубяжы XIX–XX стст. – С. 178–183.

*Долотова, О. В.* Участие интеллигенции в Минском общественном собрании в нач. XX в. / О. В. Долотова // Сборник работ 71-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета. Минск, 18–21 мая 2014 г. : в 3 ч. – Минск : Изд. центр БГУ, 2014. – Ч. 2. – С. 15–20.

*Доўнар, Л. І.* Гісторыя беларускай кнігі : вучэб. дапам. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; Л. І. Доўнар. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 252 с.

*Доўнар, Л. І.* Выданне рэлігійных кніг у Мінску ў XIX – пачатку XX ст. / Л. І. Доўнар // VIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 23–26 мая 2002 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск : БДУК, 2003. – С.58–67.

*Доўнар, Л. І.* Кнігавыдавецкія сувязі Мінска і Варшавы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / Л. І. Доўнар // Матэрыялы Другіх кнігазнаўчых чытанняў "Кніжная культура Рэчы Паспалітай " (Мінск, 15–16 верас. 2000 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск : Красіка-Прынт, 2002. – С. 236–243.

*Доўнар, Л. І.* Мінскія кнігазборы XIX стагоддзя / Л. І. Доўнар // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. – Мінск, 1998. – Вып. 3. – С. 60–72.

*Доўнар, Л. І.* Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795–1917): кнігазнаўчы аспект : аўтарэф. дыс. … канд. пед. навук / Доўнар Ларыса Іосіфаўна; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2005. – 21 с.

*Доўнар, Л. І.* Рэгіянальныя даследаванні гісторыі кнігі ў Беларусі: да пытання аб рэгіянальным кнігазнаўстве / Л. І. Доўнар // Материалы VII Международных книговедческих чтений «Библиотеки и политика открытого доступа к информации и знаниям» (Минск, 10–11 нояб. 2011 г.) / Нац. б-ка Беларуси ; сост. Л. Г. Кирюхина. – Минск, 2011. – С. 62–71.

*Доўнар, Л. І.* Чытаючы бібліяграфічныя крыніцы па гісторыі кніжных сувязяў і кнігазбораў Беларусі XVIII – пачатку XX ст. / Л. І. Доўнар // Материалы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Международного конгресса «Национальная библиотека как феномен культуры», приуроч. к 90-летию Нац. б-ки Беларуси (Минск, 5–7 сент. 2012 г.) [Электронный ресурс] / Нац. б-ка Беларуси ; сост. А. А. Суша. – Электронные текстовые, графические данные и программы (19,5 Мб). – Минск : НББ, 2012. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – (VIII Международные книговедческие чтения «Исторические книжные коллекции во времени и пространстве»).

*Ельников, М. П.* Методология книговедения (Предпосылки формирования) // Книга. Исследования и материалы. – Москва : Терра, 1993. – Сб. 66. – С. 39–62.

*Ельников, М. П.* Познание книги как системы: (методологический аппарат) / М. П. Ельников // Книга в меняющемся мире : Седьмая науч. конф. по проблемам книговедения. Секция теоретических проблем книговедения : тез. докл. / РАН, научный совет "История мировой культуры". – Москва : ВКП, 1992. – С. 13–14.

*Емец, И. П.* Краткий очерк развития библиотечного дела в Белоруссии с древнейших времен до Великой Октябрьской социалистической революции / И. П. Емец // Библиотечное дело в Белоруссии (XVI в. – 1917 г.) : библиогр. указ. / сост. Л. Н. Новицкая – Минск : ГБЛ БССР, 1982. – С. 5–68.

*Загорнов, А.* Цензурная политика самодержавия в Беларуси в первой половине XIX в. / Александр Загорнов // Старонкі гісторыі і культуры Беларусі / пад рэд. А. Г. Каханоўскага. – Мінск : Красіка-прынт, 1997. – С. 81–896.

*Зайцев, В. Н.* Слово к читателям / В. Н. Зайцев, А. С. Мыльников // Белорусский сборник : ст. и материалы по истории и культуре Белоруссии. – Санкт-Петербург : РНБ, 1998. – Вып. 1. – С. 3–4.

*Исаевич, Я. Д.* Роль братств в издании и распространении книг на Украине и Белоруссии (конец XVI – XVIII в.) / Я. Д. Исаевич // Книга и графика : сб. посвящен 80-летию чл.-кор. АН СССР А. А. Сидорова. – Москва : Наука, 1972. – С. 127–136.

*Ісаєвич, Я.* Українське книговидання : витоки, розвиток, проблеми / Я. Ісаєвич. – Львів : Ін-т українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України, 2002. – 520 с.

*Калубовіч, А.* Мова ў гісторыі беларускага пісьменства / А. Калубовіч // Крокі гісторыі : Дасьледаваньні, артыкулы, успаміны / А. Калубовіч. – Беласток ; Вільня ; Менск : Наша Ніва ; Мастац. літ., 1993. – С. 167–277.

Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.] ; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

*Капилов, А. Л.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX века / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск : Ин-т совр. знаний, 2000. – 144 с. : ил.

*Караў, Д.* Архіўная спадчына Вялікага Княства Літоўскага і беларускія архівы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / Д. Караў // Спадчына. – 1996. – № 1. – С. 3–25.

*Кісялёў, Г.* Радаводнае дрэва : Каліноўскі – эпоха – наступнікі / Г. Кісялёў. – Мінск : Мастац. літ., 1994. – 303 с. : іл.

*Запартыка, Г.* Страчаныя скарбы манастырскіх бібліятэк / Г. Запартыка // Спадчына. – 1997. – №5. – С. 40–53.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Карский, Е. Ф.* Белорусы : [в 3 т.] / Е. Ф. Карский. – Петроград : Рос. гос. акад. тип.,1922. – Т. 3 : Очерки словесности белорусского племени, [вып.] 3. Художественная литература на народном языке. – 18, 454 [2] с., [4] л. портр.

*Касцюкавец, Л. П.* Нотадрукаванне / Л. П. Касцюкавец // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1987. – Т. 4. – С. 86–87.

*Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 118, [2] с.

*Киприанович, Г. А.* Жизнь Иосифа Семашки, митрополита Литовского и Виленского и воссоединение западнорусских униатов с православной церковью в 1839 г. / соч. Г. Я. Киприановича. – Вильна : Тип. И. Блюмовича, 1897. – XXIV, 613 с., [3] л. портр.

*Кісялёў, Г. В.* Валіцкі Аляксандр / Г. В. Кісялёў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Саўчанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 208.

*Киштымов, А. Л.* Издательское дело Беларуси в зеркале выставок конца XIX – начала XX в. / А. Л. Киштымов // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 11. – С. 46–51.

Кніжнасць новай Беларусі XIX–XXI стст. / М. В. Нікалаеў [ і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – 436 с. : іл. – (Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. ; т. 2).

*Колосова, В. П.* Иван Вышенский и Павел Домжив-Люткович / В. П. Колосова // Федоровские чтения, 1979. – Москва : Наука, 1982. – С. 24–34.

*Колосова, В. П.* Новые данные к биографии Павла Домжив-Лютковича / В. П. Колосова // Федоровские чтения, 1982. – Москва : Наука, 1987. – С. 115–122.

*Конан, У.* Праблемы рускай культуры ў Беларусі: па матэрыялах перыядычнага друку канца XIX – пачатку XX ст. / У. Конан // Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пачатку XX ст. : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 150-годдзю з дня нараджэння І. Я. Рэпіна і 100-годдзю знаходжання мастака на Беларусі / Віцеб. абл. краязн. музей ; Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны ; Віцебская мастацкая школа ; Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна. – Віцебск : ВАКМ, 1995. – С. 5–13.

*Конон, В. М.* Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. / В. М. Конон. – Минск : Наука и техника, 1985. – 200 с.

*Корнилов, И.* Русское дело в Северо-Западном крае: материалы для истории Виленского учебного округа преимущественно в муравьевскую эпоху / И. Корнилов. – Санкт-Петербург : Тип. А. П. Лопухина, 1901. – 420, VIII с.

*Краснянский, В. Г.* Минский департамент Великого Княжества Литовского (Эпизод из истории войны 1812 г.) / В. Г. Краснянский. – Санкт-Петербург : Сенат. тип., 1902. – 72 с.

Крукоўскі, М. І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

*Кушнаренко, Н. Н.* Документоведение : учеб. / Н. Н. Кушнаренко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Киев : Знання, 2000. – 459 с.

*Лаўрык, Ю.* Базыльянскія бібліятэкі / Ю. Лаўрык // Наша вера. – 2008. – № 2(44). – С. 57–63.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Лаўрык, Ю.* Бібліятэкі на Беларусі ў сярэдзіне XVI – 1-й пал. XIX ст. / Ю. Лаўрык // Наша вера. 2007. – № 2(40). – С. 68–71.

*Лаўрык, Ю.* Вачыма візітатара: Менскі фарны касцёл і яго кніжныя зборы ў XVIII – пач. XIX ст. / Ю. Лаўрык // Нашыя святыні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысв. 500-годдзю Мін. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўс. архідыяцэзіі, 220-годдзю Мін. дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрв. 2008 г. / Польскі Інстытут у Мінску ; рэдкал.: Т. Кандрусевіч [і інш.] ; навук. рэд. Т. Кандрусевіч, А. І. Мальдзіс і М. Каламайска. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2009. – С. 157–165.

*Лаўрык, Ю.* Кніжная культура мінскіх бернардынцаў напрыканцы XVIII ст. / Ю. Лаўрык // Нашыя святыні : матэрыялы Міжнар. навук. канф. , прысв. 500-годдзю Мін. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўс. архідыяцэзіі, 220-годдзю Мін. дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрв. 2008 г. / Польскі Інстытут у Мінску ; рэдкал.: Т. Кандрусевіч [і інш.] ; навук. рэд. Т. Кандрусевіч, А. І. Мальдзіс і М. Каламайска. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2009. – С. 166–172.

*Лаўрык, Ю. М.* Бібліятэка менскага канвенту дамініканаў у XVIII ст. / Ю. Лаўрык // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (Да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. Мінск, 4–5 верас. 2009 г. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – С. 41–48.

